СКАЗКИ и РАЗСКАЗЫ

БѢЛОРУССОВЪ-ПОЛѢШУКОВЪ.

(Матеріалы къ изученію творчества бѣлоруссовъ и ихъ говора).

А. К. Сержпутовскій.

Изданіе Отдѣленія Русскаго языка и словесности Императорской Академіи Наукъ.

С.-ПЕТЕРБУРГЪ.

Типо-Литографія К. Л. Пентковскаго, Большая Подъяческая, 22.

1911.

Напечатано по распоряженію Императорской Академіи Наукъ.

Непремѣнный Секретарь, Академикъ *С. Ольденбургъ.*

2 Мая 1911 г.

СКАЗКИ И РАЗСКАЗЫ

БѢЛОРУССОВЪ-ПОЛѢШУКОВЪ.

Отъ собирателя.

Помѣщенные въ настоящемъ сборникѣ бытовые разсказы и сказки записаны мною въ 1890—1907 г.г. въ Бѣлорусскомъ Полѣсьѣ—въ южной половинѣ Слуцкаго и сѣверной части Мозырскаго уѣздовъ, Минской губерніи.

При записываніи было обращено особенное вниманіе на вѣрную передачу оборотовъ рѣчи разсказчика и, по возможности, на точное воспроизведеніе произношенія. Чтобы приблизиться къ дѣйствительному произношенію живого бѣлорусскаго говора, мною принятъ фонетическій способъ письма, для чего въ русскій алфавитъ введены слѣдующіе знаки: ґ, ŏ, неслоговое ў и ė, произношеніе которыхъ описано ниже. Знакъ ґ произносится такъ же, какъ въ церковно-славянскомъ языкѣ буква г или какъ польское h.

Русское г попадается довольно рѣдко, больше въ словахъ, заимствованныхъ изъ польскаго и нѣмецкаго языковъ. Знакъ ŏ произносится какъ дифтонгъ уо—однимъ звукомъ и почти всегда стоитъ подъ удареніемъ. Неслоговой ў произносится кратко; онъ всегда стоитъ послѣ гласнаго звука, безъ котораго не составляетъ отдѣльнаго слога; даже слоговой у, стоящій въ началѣ слова, въ томъ случаѣ, когда предыдущее слово оканчивается гласнымъ, переходитъ въ неслоговой ў, напр.: з дýру ўрéзаўса аб сцѣну ґалавŏю. Такому измѣненію въ краткое подвергается и и, когда оно стоитъ послѣ гласнаго и не подъ удареніемъ. Знакъ ė произносится какъ закрытое ыэ (дифтонгъ). Онъ почти всегда стоитъ подъ удареніемъ. Кромѣ того, русскія буквы ѐ и ѣ

произносятся такъ: е́—какъ ю͡о (дифтонгъ) или даже і͡уо (трфитонгъ) однимъ звукомъ, а ѣ́—какъ і͡э (дифтонгъ). Послѣднiй—трудно уловимый для непривычнаго уха звукъ, посредствомъ котораго иногда отличаются созвучныя слова, напр.: маѣ́ (множ. число)—мои отъ мае̇ (единств. число)—мое. Звуки е́ и ѣ́ также почти всегда стоятъ подъ ударенiемъ. Изображенiе послѣдняго звука буквой ѣ́ принято мною вслѣдствiе того, что наукой еще до настоящаго времени точно не выяснено, какъ именно нужно произносить букву ѣ, встрѣчающуюся въ самыхъ древнихъ памятникахъ славянской письменности. Между тѣмъ, въ живой бѣлорусской рѣчи звуки ѣ́ и е́ въ большинствѣ случаевъ произносятся въ соотвѣтствующихъ словахъ тамъ, гдѣ въ славянскомъ языкѣ при письмѣ ставили ѣ. Звукъ ы произносится нѣсколько мягче, чѣмъ въ русскомъ языкѣ. Сочетанiя звуковъ дз и дж произносятся слитно—однимъ звукомъ. Слово дождь произносится какъ бы дощджч. Звуки, изображаемые буквами я и е. часто совершенно смѣшиваются, ибо произносятся крайне неясно, если только на нихъ не падаетъ ударенiе.

Приводимые здѣсь разсказы записывались мною при всякомъ удобномъ случаѣ: въ лѣсу, въ полѣ, на ночлегѣ, во время отдыха отъ сѣнокосныхъ или полевыхъ работъ, на ночевкахъ въ пути, въ пасѣкахъ или пчельникахъ, гдѣ-либо у костра или въ домѣ при пылающей подъ лучникомъ *) лучинѣ,—словомъ, вездѣ, гдѣ только приходилось мнѣ слушать непринужденные разсказы любителей-разсказчиковъ.

Хотя хорошiе разсказчики попадаются довольно рѣдко, зато они всегда привлекаютъ много слушателей. Вѣдь, здѣсь устные разсказы замѣняютъ всю литературу, которою пользуются грамотные люди, и потому имѣютъ огромное значенiе въ жизни безграмотныхъ простолюдиновъ. Подъ влiянiемъ разсказовъ, сказокъ, по-

*) Лучникъ—дымовая труба, подъ которою подвѣшивается желѣзная плетушка—свецилно. На плетушкѣ горитъ смолистая лучина, освѣщая своимъ яркимъ свѣтомъ убогую бѣлорусскую избу.

словицъ и другихъ продуктовъ устнаго народнаго творчества вырабатываются отчасти все міровоззрѣніе, вся житейская мудрость и всѣ этическія представленія темнаго деревенскаго люда. Въ самомъ дѣлѣ, образованные и вообще грамотные люди, кромѣ домашняго и школьнаго воспитанія и общенія съ себѣ подобными, въ свободное время, посредствомъ чтенія книгъ, имѣютъ возможность, говоря фигурально, слушать рѣчи великихъ и геніальныхъ людей и поучаться у нихъ. Это непосредственное общеніе съ отсутствующими или уже давно умершими авторами книгъ, доступное грамотному человѣку, нерѣдко даетъ читателю отвѣты на тѣ или иные запросы духа и является величайшимъ благомъ, какое только дано разумному существу. Неграмотный человѣкъ лишенъ этого блага: онъ вынужденъ научаться лишь изъ устныхъ разсказовъ, такъ какъ слушать чтеніе книгъ не всегда возможно, да, кромѣ того, книжный языкъ вообще мало понятенъ простолюдину, а особенно бѣлоруссу-полѣшуку, который знаетъ одно свое мѣстное нарѣчіе. До самаго послѣдняго времени въ полѣсской части Бѣлоруссіи болѣе или менѣе грамотныхъ людей было очень мало; „грамотеи“ еле разбирали „по-печатному“, а такъ какъ книги попадались на непонятномъ церковно-славянскомъ или русскомъ литературномъ языкѣ, то такое чтеніе не давало отвѣтовъ на интересующіе простолюдиновъ вопросы. Богослуженіе, духовно-назидательныя поученія въ храмахъ и чтеніе книгъ нерѣдко вносили въ понятія бѣлорусса превратныя мысли и создавали путаницу въ его міросозерцаніи. Но присущая человѣку потребность отыскать отвѣты на житейскіе вопросы выработала у простолюдина любовь къ разсказамъ, сказкамъ и т. п. произведеніямъ народнаго творчества. Гдѣ бы ни находился бѣлорусскій крестьянинъ, разъ ему позволяетъ досугъ или не чрезмѣрно тяжелый физическій трудъ, онъ приступаетъ къ сказкамъ, разсказамъ и т. п.

Дѣйствительныя событія смѣшиваются, въ разсказахъ бѣлорусса, вмѣстѣ съ чудовищнымъ вымысломъ. Зачастую самъ разсказчикъ

не сознаетъ, гдѣ оканчивается дѣйствительность и гдѣ начинается вымыселъ. Таковы, напримѣръ, разсказы о страхахъ, о хожденіи мертвецовъ, о продѣлкахъ колдуновъ и т. п.

Народъ смотритъ на сказочные эпизоды, какъ на дѣйствительно бывшія событія. Не даромъ, при разговорахъ, ссылаются на тѣ или иныя сказанія, передающіяся въ извѣстныхъ сказкахъ, разсказахъ и т. п. Это напоминаетъ тѣ ссылки изъ области историческихъ фактовъ, какія дѣлаютъ образованные люди для подтвержденія своей рѣчи.

Разсказчиками являются, конечно, болѣе способные и развитые люди. Это, такъ сказать,—интеллигенція. Одни изъ разсказчиковъ обладаютъ выдающимся краснорѣчіемъ, другіе отличаются даромъ художественнаго чутья и творчества, и почти всѣ изъ нихъ имѣютъ склонность къ философствованію. Укажу на нѣкоторыхъ даровитыхъ разсказчиковъ, отъ которыхъ и записаны почти всѣ собранныя здѣсь произведенія.

Въ с. Большой Рожинъ, Вызнянской волости, Слуцкаго уѣзда, въ концѣ прошлаго столѣтія жилъ глубокій старикъ, по прозванію Рѣдкій. По его словамъ, онъ никогда не болѣлъ. Онъ дожилъ до 115 лѣтъ. Несмотря на столѣтній возрастъ, Рѣдкій отличался необыкновенной бодростью, веселымъ характеромъ, способностью разсказывать по цѣлымъ часамъ сказки, а также про различныя приключенія и страхи изъ своей долгой жизни. Рѣдкій, кромѣ хозяйства, занимался кастраціей быковъ и питался почти исключительно продуктами этого послѣдняго ремесла. Кастрацію онъ производилъ посредствомъ раскаленныхъ желѣзныхъ сошниковъ и свѣжія железы тутъ же на кострѣ слегка жарилъ и ѣлъ. Мѣстные жители говорятъ, что такая пища имѣла большое вліяніе на бодрость и продолжительность жизни этого старика. Замѣчательно, что Рѣдкій почти до смерти не потерялъ способности къ половой жизни, а вмѣстѣ съ тѣмъ и жизнерадостнаго настроенія. Рѣдкій обыкновенно заводилъ разговоръ на философскія темы и потомъ, для подтвер-

жденія того или иного своего положенія, переходилъ къ разсказамъ или сказкамъ. Дальше его уже захватывалъ самый процессъ разсказыванія. Тутъ разсказчикъ увлекался, забывалъ прежній разговоръ и весь отдавался во власть фантазіи и художественнаго творчества. Рѣдкій могъ занимательно разсказать самую заурядную сказку. Для этого онъ прибавлялъ отъ себя много побочныхъ обстоятельствъ и украшалъ свой разсказъ образнымъ описаніемъ картинъ и психическаго состоянія дѣйствующихъ лицъ. Словомъ, этотъ старикъ обладалъ недюжиннымъ художественнымъ талантомъ.

Иванъ Аземша, по прозванію Шавецъ, проживаетъ въ с. Лучицахъ, Мозырскаго уѣзда. Это—еще бодрый старикъ, лѣтъ 70. Его отецъ, Павелъ Шавецъ, жилъ болѣе 100 лѣтъ. Онъ заболѣлъ единственный разъ въ жизни за день до смерти и умеръ, кажется, въ 1891 или 1892 году. Передъ смертью онъ выпилъ полбутылки водки, уснулъ и уже больше не просыпался. Павелъ всю жизнь прожилъ въ имѣніи у мѣстнаго помѣщика: прежде—какъ крѣпостной, а послѣ 1861 г.—какъ вольнонаемный, исполняя сапожныя и шорныя работы. Павелъ слишкомъ много пилъ, за что часто подвергался страшнымъ побоямъ. Помѣщикъ очень часто такъ жестоко наказывалъ Павла, что онъ по цѣлымъ днямъ оставался въ безсознательномъ состояніи. По его словамъ, за всю свою жизнь онъ выпилъ столько водки, что если бы ее лить на мельничное колесо, то мельница молола бы нѣсколько сутокъ, и столько выкурилъ табаку, что изъ него могла бы образоваться огромная скирда въ нѣсколько саженъ вышиною. Кромѣ помѣщика, Павла наказывали французы въ 1812 году, когда захватили съ собой въ качествѣ провожатаго. Возлѣ м. Клецка, Слуцкаго уѣзда, Павелъ убѣжалъ отъ французовъ и попалъ къ казакамъ, которые точно такъ же ежедневно угощали его нагайками. Одинъ разъ казаки избили Павла до полусмерти и бросили на берегу рѣки. Павелъ пришелъ въ себя, подползъ къ рѣкѣ, напился воды и поплелся домой. Въ пути онъ питался только ягодами да сыроѣжками.

Павелъ самъ не отличался краснорѣчіемъ, но зналъ множество сказокъ и разсказовъ, которые и передалъ своему сыну Ивану. Иванъ былъ большой охотникъ разсказывать, просиживая за этимъ занятіемъ по цѣлымъ длиннымъ зимнимъ вечерамъ, но достаточно было, чтобы кто-либо другой началъ разсказывать, какъ черезъ пять минутъ Иванъ засыпалъ. Иванъ Аземша особенно любилъ разсказывать про чертей, лѣшихъ, водяныхъ, мертвецовъ, оборотней и, вообще, про всякую нечистую силу. Его сильно занимали вопросы о сотвореніи міра и человѣка, о Богѣ, о душѣ и загробной жизни и т. п.

Хотя каждый бѣлоруссъ знаетъ десятка два бытовыхъ разсказовъ и нѣсколько сказокъ, но не каждый любитъ и умѣетъ разсказывать. Хорошіе разсказчики встрѣчаются довольно рѣдко. Все ихъ искусство заключается въ томъ, что они въ свои разсказы вносятъ личныя черты,—передаютъ разсказъ подъ угломъ зрѣнія своего міросозерцанія. Неопытные же и неискусные разсказчики заботятся, главнымъ образомъ, о томъ, чтобы вѣрно передать содержаніе разсказа. Они припоминаютъ подробности, возвращаются назадъ, передаютъ разные эпизоды крайне непослѣдовательно и сухо, такъ что разсказъ и не производитъ должнаго впечатлѣнія. Хорошій разсказчикъ, наоборотъ, не обращаетъ вниманія на точность содержанія и на подробности какого-нибудь событія. Онъ беретъ въ разсказѣ главную мысль, которая иногда выражается пословицей или одной характерной фразой, развиваетъ эту мысль и образными оборотами рѣчи тутъ же сочиняетъ цѣльный законченный разсказъ. Хорошіе разсказчики—это въ своемъ родѣ художники-романисты плюсъ актеры-разсказчики.

Однажды, лѣтомъ, мнѣ пришлось пробраться изъ с. Комаровичъ, Мозырскаго уѣзда, въ м. Любань, Бобруйскаго уѣзда. Эти два пункта раздѣляются большими болотами, по которымъ протекаетъ рѣка Ореса.

Добравшись до д. Убибатекъ на берегу рѣки, я взялъ лодоч-

ника и поплылъ вверхъ по рѣкѣ. Лодочникъ, еще молодой мѣстный крестьянинъ, оказался интереснымъ разсказчикомъ-поэтомъ. Онъ, лавируя на узкомъ, крайне зыбкомъ челнокѣ и усердно работая весломъ, въ то же время, безпрестанно разсказывалъ разныя побасенки и импровизировалъ довольно длинные отрывки. Все это онъ говорилъ въ стихотворной формѣ съ богатыми риѳмами. Къ сожалѣнію, производить записи на зыбкомъ челнокѣ было крайне трудно. Кромѣ того, этотъ неграмотный полѣшукъ-поэтъ говорилъ довольно быстро. На мои разспросы онъ пояснилъ, что знаетъ всѣ мѣстныя пѣсни и сказки и что у него само собой „складно" говорится. Въ д Юрковичахъ я распрощался съ оригинальнымъ поэтомъ-импровизаторомъ и больше съ нимъ не встрѣчался, даже забылъ, какъ его зовутъ.

Вотъ такіе-то талантливые люди, никѣмъ незамѣченные, всю свою жизнь проводятъ въ глухихъ углахъ. При другихъ условіяхъ, можетъ-быть, они стали бы національной гордостью...

А. Сержпутовскій.

С -Петербургъ,
10 февраля 1910 г.

1. Небо и пекло.

Вѣдамо, маскáль ничóґо не байтца, бо якúх стрáхаў емý не давелóсо на сваéм векý бáчыць, якóе беды́ перабы́ць. Паслáли маскаля́ ў чужы́ край. Ишóў ён, ишóў да й заблудзúўса. Падхóдзиць ён к тамý мѣйсцу, гдзѣ канчáетца земля́. Нѣльґа йци дáлей.—Дай, паначýю,—дýмае маскáль. Убиў ґэто ён у нéбо ґвӧзд, павѣсиў свӧй клýнак, наклáў аґню́, лéґ и пакýрвае люльку. Чýюць у нéбе, што хтось стýкае ў сцѣну (а ґэто маскáль ґвӧзд заґаня́ў) и паслáли двух анéлаў, пабáчыць, хто там. Спусцúлиса два анѣлы па тэ́нчы на зéмлю й падхóдзяць к маскалю́. А маскáль тым чáсам трохи прыкурхнýў. Бáчаць анéлы, што маскáль лежы́ць на ґóлуй землú, падлажы́ўшы кáмень пад ґóлаў; шкóда им стáло маскаля́. Давáй ены́ еґó будзúць. От збудзúли анéлы маскаля́ й павелú еґó ў нéбо. Прыхóдзяць ены́ ў нéбо. Пазирáе маскáль ва ўсѣ куткú: никóли ён такóґо дзúва не бáчыў. Разчýхаўса маскáль, ужэ́ й спаць не хóчэ; пашóў ён аґлядáць нéбо. Дóўґо хадзúў маскáль, ґлядзѣ́ў: вéльми ўсю́ды ґóжэ. Тӧлько захацѣ́ласо емý закуры́ць лю́льку; хапúўса ён, аж лю́льку й цюцю́н зґубúў, як ишóў у нéбо. Прóсиць маскáль у анéлаў цюцюнý, а ты́е кáжуць, што ў нéбе кýрацъ тӧлько лáдунам, а такóґо паґáнаґо зѣлья, як цюцю́н, што вы́рас на мóґлицах з piecielki (vulva) кýрвы, ў нéбе немá. — А ґарéлка е?—пытáе маскáль.—И ґарéлки немá,—кáжуць анѣлы,—бо й ґарéлку чорт вы́думаў.—Пахадзúў, пахадзúў маскáль па нéбу, бáчыць, што светы́е ни кýрацъ лю́ляк, ни пьюць ґарéлки, ни смею́тца, ни пѣсень не паюць, и мóташно емý стáло. Вѣдамо, не мажэ́

чалаве́к ціхенько седзе́ць, бы намалёваны светы́. И пашо́ў маска́ль шука́ць тако́го ме́йсца, гдзе́ ве́село. Ишо́ў ён, ишо́ў, заглядзе́ўса й упа́ў з ра́ю ў низ. До́ўго ён леце́ў, але ось зачапи́ўса на аси́не за сук и пави́с. Хаце́ў маска́ль атчапи́тца, да й упа́ў дало́ў. Чуць не заби́ўса ён: лежы́ць, бы пласт. Ось падхо́дзиць к ему́ яки́сь пани́ч.—Ци нема́ ча́рки гаре́лки?—пыта́е маска́ль.—Е, ка́жэ панич, и прынёс маскалю́ це́лую пляжку. Глыну́ў маска́ль и не лыс. Усхапи́ўса ён да й пыта́е, ци нема́ цюцюну́ й лю́льки.—Е, ўсе е.—Гдзе́ гэто я?—пыта́етца маска́ль.—У пе́кле.—Аджэ́ гэто пе́кне, бо ўсе е: й цюцю́н, и лю́лька, й гаре́лка, а онь сме́х и пе́сни. От гэто дак пе́кне!—И аста́ўса маска́ль у пе́кле, не хо́чэ ў не́бо, бо там ве́льми ўсе свето́е, а чалаве́к гре́шны.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Большой Рожинъ.

---

2. Музыка и чэрци.

Бы́ў адзи́н Музы́ка́. З малёнства ён ничо́го не раби́ў, то́льки йгра́ў. Ещэ́ хлапчуко́м: пасе́ валоў, альбо́ ко́ней, зро́биць з лазы́ ду́дачку да як загра́е, дак валы́ паки́нуць пасци́са, разве́сяць ву́шы да й слу́хаюць; а ў ле́се пту́шки прыци́хнуць, на́ват жа́бы не кру́мкаюць. А як паведзе́ ко́ней на начле́г,—ле́то, но́чы це́плые, аж па́рыць: папрыво́дзяць на дубро́ву ко́ней хло́пцы й дзе́ўки су сего́ села́, сваво́ляць, смею́тца, паю́ць пе́сни—ве́дамо маладо́сь, за́ўжды ве́село; а Музы́ка як загра́е на своёй ду́датцэ, дак атра́зу ўсе́ прыци́хнуць. От им здае́тца, што яка́ясь сло́дыч улила́са им у се́рцэ, а яка́ясь си́ла ухваци́ла на пле́чы й несе́ ўсе́ ўго́ру, й уго́ру, к я́сным зо́ркамъ, у чы́стае не́бо, ў чы́стае, си́няе, шыро́кае не́бо. Седзя́ць ены́, ничо́го не ду́маюць, забы́лиса, што ру́ки й но́ги мле́юць ат ця́жкае́ рабо́ты, што ў жывацэ́ бурчы́ць ат го́ладу. Седзя́ць и ўсе слу́хаюць. И хаце́ласоб им седзе́ць гэтак ўсе жы́це й усе́ слу́хаць, як гра́е Музы́ка. От ён замаўчы́ць. Але́ ни-

хто́ не сме́е паварухну́тца, каб не спужа́ць таго́ го́ласу, што по́е щакам разсыпаўса па дубро́ве, па ле́се й падніма́етца ў са́ма-нёбо. Але́ ось заґра́е Музы́ка жа́ласливо, й запла́чуць и ле́с и дубро́ва, набежыць хму́рка, й з не́ба слёзки такъ и пальютца. Иду́ць по́зно да ґаспо́ды мужыки́ й ба́бы, ўчу́юць ту́ю музы́ку, ста́нуць, слу́хаюць, пла́чуць. От так уся́ их го́ркая жы́дка це́рад ачу́ й стаи́ць, и таки́ их апану́е жаль, што й мужыки́, стары́е, барада́тые мужыки́ пла́чуць, як ба́бы надъ пако́йникам, альбо́ як право́дзяць сынко́ў у салда́ты. Але́ ось па не ма́лым ча́се Музы́ка ат жа́ласливаго да на весёлае звёрне. Паки́дають мужыки́ й ба́бы ко́сы, ґра́бли, ви́лы, ґаршки́ й бикла́ґи, во́зьмутца ў бо́ки й дава́й скака́ць. Ска́чуць малы́е дзе́ци, ска́чуць ко́ни, скачуць кусты́ й ле́с, ска́чуць зо́рки, ска́чуць хма́рки—ўсе́ ска́чэ й сме́етца.

От таки́ то быў Музы́ка-чарадзе́йник: што захо́чэ, то ён з се́рцамъ зро́биць.

Падро́с Музы́ка, зраби́ў сабе́ скры́пачку й пашо́ў у све́т; куды́ пры́дзе—паґра́е, а за то́е еґо́ нако́рмяць, напо́яць, як са́маґо ле́пшаґо ґо́сця й ещэ даду́ць на даро́ґу. До́ўґо хадзи́ў так па све́ту Музы́ка, весели́ў до́брых людзе́й, а лихи́м без нажа́ ре́заў па се́рдцу. Ба́чаць чэ́рци, што куды́ Музы́ка пры́дзе, там ме́ньш лю́дзи ґре́шаць, и дава́й ґастры́ць на еґо́ зу́бы. Идзе́ раз Музы́ка це́рас ле́с' а чэ́рци й нашли́ на еґо́ двана́нцаць ґало́дных ваўко́ў. Заступи́ли ены́ Музы́цэ ў ле́се даро́ґу, стаяць да зуба́ми ляскають, а во́чы ґара́ць як ґара́чае уго́ле. Нема́ у Музы́ки ничо́ґо ў рука́х, то́лько пад па́хаю ў мешэ́чку скры́пка. Што тут рабиць! Ду́мае Музы́ка, што тут пачаць! Прышо́ў ему́ капе́ц. Дастаў ён з мешэ́чка скры́пку й смы́к, каб хаця́ ещэ раз напасле́дак пайґра́ць, прыслани́ўса к дзе́раву да й паце́ґ смыкам па стру́нах. Як жыва́я заґавары́ла скры́пка, разда́ўса по́щак па ле́се. Прытаи́ўса ле́с—и листко́м не варухне́, а ваўки́ як стая́ли разя́виўшы ґо́рла, так и акамене́ли: стая́ць да слу́хаюць, а слёзы так и цеку́ць з во́ўчых ачо́ў. Переста́ў Музы́ка ґра́ць, а ваўки́, бы со́нные пасу́нули ў ле́с. Пашо́ў

Музы́ка да́лей. Идзе́ ён да йдзе, падхо́дзиць к раце́. Со́нейко ўжэ закаци́ласо за лѣс, то̂льки ещэ свѣ́цицъ на са́мые верхи́ й як бы абливае их назало́таю. Ци́хо як у ву́се, ни го́дзин листо́к и не варухнетца. Ве́льми харо́шы ве́чар. Сѣў Музы́ка на ка́мень на круто̂м бе́разе кале́ раки́, даста́ў сваю скры́пачку й загра́ў, да так го́жэ, што его́ заслу́хались й не́бо, й земля́, й вада́ й дава́й усѣ скака́ць. Зо̂рки миту́сятца, як зимо́ю снѣг; хма́рки плыва́юць па не́бе, як ла́стаўки пе́рад дажджо́м, а ры́ба так узгуля́ласа, што рака́ кипи́ць, як вада́ ў гаршку́. Але́ ось падня́ўса ў раце́ вадзяны́ цар да як пача́ў скака́ць, дак вада́ так запля́скала, што залила́ бераги́, а чэрци спужа́лиса й павыска́кали з вады́. Ба́чаць ены́, што им ат Музы́ки нигдзѣ супако́ю нема́, от ены́ дава́й ду́мацъ, як бы его́ загуби́ць. Ба́чыць Музы́ка, што вадзяны́ цар нараби́ў лю́дзям беды́, пераста́ў грацъ, палажы́ў скры́пачку ў мешо́к и хацѣ́ў ици́ да́лей, але́ ось падхо́дзяць два паничы́ й про́сяць пайгра́ць на йгры́щы, абеца́юць заплаци́ць, што зхо́чэ. Паду́маў Музы́ка, што ему́ нѣгдзе начава́ць да й гро́шэй нема́, паслу́хаў паничо̂ў и пашо̂ў з и́ми йгра́ць вечары́нку. Прывели́ паничы́ Музы́ку ў пала́цы. Ба́чыць ён, аж там пано̂ў и пане́нак, хаць гаць гаци́. Паку́ль ён збира́ўса йгра́ць, ба́чыць, што гэто ўсѣ паничы́—падбегу́ць к сталу́, абмо́чаць па́лец у ми́су й ма́жуць сабѣ во̂чы. Пама́заў и ён, да як пама́заў, дак и ба́чыць, што гэто не паны́, а чэрци й вѣдзьмы й што ён не ў пала́цах, а ў пе́кле. От и зайгра́ў ён да так, што ўсе пе́кло разлецѣ́ласо ў ще́пки, а чэрци разбѣ́глиса па ўсему́ свѣ́ту. От з тае̂ пары́ чэрци й баятца Музы́ки й бо̂льш его́ не чапа́юць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

3. Жонка.

Праўду людзи кажуць: не вѣр каню ў дарозе, а жонцы дома.

Была ў аднаго чалавѣка кабыла, да такая плюгавая, леная, што ты еѣ лупи паплискаю, бы цепам, сам утомишса, а ена чуць ноги перастаўляе. Мучыўса, мучыўса Грышко, парываўса прадаць еѣ анучнику, але жонка ўсе не хацѣла. Ена, бачыце, вельми любила тую плюгавую кабылу, што на ей и дзиця малое паѣдзе. Як тольки еѣ ваўки не зъѣли: выганиць еѣ Грышко поўзинаю за плот—стайиць и не варухнетца; та ен перацягне еѣ поўзинаю, альбо чым папало, плюне да й пойдзе да гасподы. А ена пастайиць, пастрыжэ вушами да й пацягнетца ў алес; пасетца там увесь дзень, а ў самую глупась привалачэтца да гасподы. Хиба ўжэ вельми гнюс напечэ, тагды ена трохи закруциць хвастом да суне ў кусты

От наймае раз якись жыдок колькось хурманак везци рыбу ў мястэчко. Пажупиў Грыышко з жонкаю, запрог сваю кабылку й паѣхаў у мястэчко, Завез ен рыбу, купиў сабѣ ў кромцэ цюцюну и ўлегцы паѣхаў да гасподы. Только ен выехаў з мястэчка, аж и наганяюць сусѣдзи. Злѣзли ены з вазоў, идуць сабѣ да люльки кураць. Сусѣдзи Грышка трохи падвыпили: йдуць, калякаюць, смеютца. Потым паўзлазили ены на вазы й паѣхали далей. Кони ў их добрые,—только сцебанули пугами, як тые паскакали су сих ног. Биў-биў Грышко сваю кабылку, а ена—хаць бы што: йдзе сабѣ, як вол —А ты ей пад хвост, пад хвост!.. смеютца сусѣдзи. Сутрымали ены коней и давай смеятца с Грышка. Падъежджаюць ены к карчомцэ; пакинули коней и зайшли выпиць па чарцэ. От адзин сусѣд и кажэ: «прывежы, Грышко, сваю кабылу, а то ещэ ўцечэ, а за ею й нашы кони пабегуць».

— Эгэ, праўду кажэш,—трэба прывезаць кабылу,—кажэ Грышко.

Пасмеялиса сусѣдзи й пашли ў карчму да й давай там раскязваць пра Грышкаву кабылу, як ен абѣручки лупиў еѣ паплискаю. Паслухаў рандар да й кажэ: «ну, а цаму ви не прывезали коней?"— Можэ хибо Грышкава кабыла ўцечэ,—смѣютца дзецюки.—Ну, як прыдзе такая хвиля,—кажэ рандар,—та й Грышкава кабыла можэ уцекци. Хибо ви не вѣдаеце, што кажуць людзи?—Нѣ, не вѣдаем.—Людзи кажуць: не вѣр каню ў дарозе, а жонцэ дома. Пасмеялиса мужыки, выпили па чарцы й только хацѣли закурыць люльки—глядзяць, аж коней нема. Выскачыли ены на двор, бачаць, аж кони паперли су сих ноґ. Ены бѣґци,—куды там,—кони й схавалиса за ўзґорак. Вернулиса ены к карчмѣ й пытаюць у людзей, чаґо ґэто пабѣгли их кони, а тые кажуць, што ѣхаў пан на огиру, от Грышкава кабылка як учула огира, так заюрыла й пабѣґла, а за ею паперлиса й усѣ кони. Пабожкали мужыки, выпили ещэ па чарцэ й пашли дамоў пѣшки. Идуць сабѣ да раздабарваюць.—О то ж, хварэць еґо матары,—кажэ Грышко,—ґэто мабыць той парх у лихую гадзину сказаў.—Сказаў ен праўду,—загаварыў сусѣд.—Хто людзей не слухае, той и Боґа не байтца. Не знарок жэ людзи ґаворяць,—не вѣр каню ў дарозе, а жонцы дома.—Непраўда,—падумаў Грышко,—мая жонка вѣрная.—Падумаў, але ничоґо не сказаў, каб сусѣдзи часам не смеялиса.—Цьфу! згинь мара, прападзи,—закрычаў (крыкнуў) Грышко, зачапиўшыса лапцям за пастырчак.—Чуць не ўпаў,—и пашоў моўчки.

Идуць ены да йдуць, сустракаюць убоґих и пытаютца, ци не бачыли ены коней.

— Нѣ—каа—не бачыли, бо мы слепые, тольки чули, штось тарахцѣло. От можэ павадыр бачыў.—Распытали ены ў павадыра й пашли далей. Але ўбоґи ў даґон им да й кажэ: „не дзивѣце ни на коґо, трэ коней прывязваць, бо праўду кажуць, што не вѣр каню ў дарозе, а жонцы дома". Запало ґэто Грышку ў ґолаў, идзе й усе думае: ци ж ґэто праўда? Ци ж и маей Матруне нѣльга вѣрыць? Усѣ ґаворяць, як у бубен бьюць; мбо й праўда... Трэ, на

еѓо ўсе лихо, хибо й за Матрунаю наѓлядаць.—Гэ ўсюсеньку дароѓу думаў Грышко, пакуль прывалокса да ѓасподы. Зирнуў Грышко пад павѣць, адно-ж кабыла ўжэ там стаиць. Распроѓ ен еѣ, выпусциў на пашу, а сам улѣз у хату. Матруна пытае, ѓдзѣ ен быў; чаму кабыла сама прибѣѓла да ѓасподы. Расказаў Грышко, як было дзѣло, а сам усе пазирае та на Матруну, та на пол, ци нескамѣчана падушка.

Пашоў Грышко даѓлядаць па ѓаспадарцы, але ўсе з ѓалавы не выходзиць тое, што казаў убоѓи. Даў Боѓ вечар. Падала Матруна на стол вечэру. Абмыў Грышко руки, перахрысциўса, й сѣли ены вечэраць. Павечэрали, а Грышко ўсе думае аб сваем. Распеfазаўса ен, зняў калиту й леѓ на пол спачываць. Памыла Матруна ѓаршки, распусцила косы, скинула андарак и леѓла кале Грышка на палу, саѓнуўшыса ў сучок. Палежаў трохи Грышко да й закинуў на Матруну ноѓу. Матруна заойкала, што жывот балиць и пашла на двор. Ждаў, ждаў Грышко,—нема Матруны. Ну, думае, праўда,—не вѣр каню ў дарозе, а жонцы дома.—Ось чуе—йдзе Матруна. От ен прыкинуўса, што спиць. Палежала Матруна, трохи паойкала й зноў пашла на двор. Только ена вышла, усхапиўса Грышко з пала, зирнуў у вакно, ажно Матруна пашла не ў сутачки, а на прыѓумечэ.

Вышаў ен цихенько з хаты й давай красциса на прыѓумечэ. Чуе, ажно там Матруна смеѣтца й з кимсь цалуетца. Падышоў ен бліжей да й кажэ: „Не вѣр каню ў дарозе, а жонцы дома“. И давай лупцаваць та Матруну, та папа, бо ѓэто ен знюхаўса з Матрунаю мабыць ужэ даўно. Дак от якие жанки.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

4. Хвароба над хваробами[1]).

Жыў сабѣ адзи́н чалавѣк. Быў ён не то што б бага́ты, а та сабѣ до́бры ґаспада́р; ґараваў, не ленава́ўса, дак и маў кусо́к хлѣ́ба й гро́ш пра патрэ́бу. То̆льки даў Бо́г ему́ нешча́сце: быў у еґо́ адзи́н сыно́к, ґэ́так хлапчу́к ґадо́ў двана́нцаць. Го́жы быў, цихи хлапчу́к. Ра́дуваўса Се́мко, так называўса той ґаспада́р, што скоро ему́ бу́дзе падмо́ґа. Дак нѣ ж,—захварэ́й Янко. Што ни раби́ли Се́мко з жо̆нкаю, яки́х то̆лько варажбито̆ў не зва́ли, яки́х зельеу́ не дава́ли,—ничо́ґо не памаґло́. Пра́ўду ка́жуць: кали́ Бо́г не дась, та лю́дзи не памо́гуць. Пакача́ўса Янко з недзѣ́льку да й памёр. Го̆рко заплака́ў. Се́мко й стаґо́ ча́су пача́ў пиць. А Матру́на— жо̆нка Се́мка—з жа́лю аж би́ласа аб сцѣ́ну ґалаво́ю. Каб до́брые лю́дзи не прытрыма́ли, та б ена́ й ґо́лаў размажджы́ла. Ена́ хаць была ещэ̆ й маладая, але́ не даў Бо́ґ е́й бо̆льш дзеце́й. Не мажэ́ Матру́на на́ват пла́каць, слёз нема́, вочы́ вы́сахли. По̆йдзе ена́ на мо́ґлицы й седзи́ць там це́лы дзене́к да ґало́сиць. А Се́мко ўсе́ часцѣ́й да часцѣ́й пасѣ́джвае ў карчмѣ́. Вѣ́дамо, без ґаспадара́ й ґаспады́ни ста́ло хаджа́йство ни́шчытца. Паґлядзи́ць Се́мко на хаджа́йство, во́зьме еґо́ жаль и ащэ́ ґарэ́й запье́. От раз ужэ́ мо̆о ў са́мую ґлу́пась вы́шаў Се́мко з карчмы́ Быў ён падвы́пиўшы; па-дышо̆ў кале́ даро́ґи к крыжу, спатыкну́ўса да й су́нуўса ў кана́ву. У кана́ве вады́ не было́, то̆лько тро́хи ґрази́. Но̆чка це́плая.—Атдыхну́,—ду́мае Се́мко, й палажи́ў го́лаў на траву́. А трава́ мя́ґкая, як паду́шка. Лежы́ць Се́мко даґа́ры́ й ґлядзи́ць, ко̆лько зо̆рак на не́бе. Ось адна́ зо̆рка пакаци́ласа й патýхла.—Мо̆о ґэ́то ду́шачка майґо́ Янка,—ду́мае Се́мко. То̆лько ён ґэ́то паду́маў, ба́чыць, ажно́ Янко, от так як жывы́, стаи́ць кале́ крыжа. Спужа́ўса Се́мко, а Янко падышо̆ў к ему́ ближэ́й да й ка́жэ: „не бо̆йса, бацько́, ґэ́то

---

[1]) Сходный по содержанію разсказъ былъ помѣщенъ въ семидесятыхъ годахъ прошлаго столѣтія въ польскомъ журналѣ «Kmjotek»

менѐ Бо́ґ паслáў к табѣ́, каб я перасцеро́ґ цебѐ. Хадзѣм, я табѣ́ усѐ пакажу́". Падняўса Сѐмко й падышо́ў к сыну. Узя́ў Янко бáцька за ру́ку й палецѣ́ли ены́ як ви́хар. Леця́ць ены́, аж вѣ́цер калѐ ўшу́ свищэ. До́ўґо ены́ лецѣ́ли, ци ко́ратко, то̀льки апыни́лиса на ґары́. Ту́пнуў Янко наґо́ю аб кáмень, и атчыни́ўса склеп. Палецѣ́ли ены́ ў склеп, як у кало́дзесь; далецѣ́ли да дна. Сту́кнуў Янко кулако́м у сцѣ́ну, и атчыни́лиса дзвѐры. Вайшли́ ены́ туды́. Бáчыць Сѐмко, ажно́ ґэто — вели́кая хáта, пасеро̀д стаи́ць як бы сто̀л, зро́блены з чалавѣ́чых касцѐй, а пры сцѣ́нах—лáвы. Хацѣ́ў Сѐмко праси́ць сына, каб е́н вывеў егó з ґэстаґо кало́дзеся, алѐ бáчыць, што Янко не вѣ́дамо куды́ дзѣ́ўса. Спужáўса Сѐмко й схавáўса пад лáўку. Седзи́ць е́н у сáмум куцѣ́ й не дышэ ат стрáху: душá ў пъятки схавáласа, чуць з цѣ́ла не выскачыць. Седзи́ць е́н. Алѐ ось раступи́ласа земля́, й вышли дзвѣ́ якие́сь нѐчысци ў пастáци чалавѣ́ка, то̀льки вѐльми касмáтые й з раґáми; пасклáдвали ены́ ў ку́чу чалавѣ́чые чарапы́, павѣ́трыли насáми бы сабáки, ци немá чаґо́ непатрэ́бнаґо й леґли́ калѐ ку́чы. Па немáлум чáсе трэ́снула сценá й нараби́ла тако́ґо ґу́ку, што ў Сѐмки дух спѐрло й у вачу́ пацемнѣ́ло. Ачу́хаўса е́н тро́хи, бáчыць, ажно́ з дзи́рки вылáзиць такáя стрáшная нѐчысь, што не мо̀жна й сказáць. А чэ́рци уселя́каґо кали́бру веду́ць ґэ́тую не́чысь пад ру́ки, шапку́юць, услуґо́ўваюць, от нераўну́ючы бы архирэ́я. Даґадáўса Сѐмко, што ґэто мáбыць сáмы стáршы чорт—Ницыпар. Хацѣ́ў перахрысци́тца, дак пад лáваю так цѣ́сно, што нѣ́льґа руки́ пашавели́ць. Ось Ницыпар узабрáўса на ку́чу з чалавѣ́чыхъ касцѐй да й усѣ́ўса, бы пан накрэ́сле. Седзи́ць, а чэ́рци стая́ць па бако̀х да зу́бы скáляць. Трэ́снула й ещэ адна́ сцена́, й пачали́ вылáзиць атту́ль,—напер̀од смерць з касо́ю (от якурáд, як малю́юць), а за е́ю ўселя́кие хваро́бы. Налѣ́зло ґэтаѣ по́шкудзи по́ўна хáта.—Ну,—кáа Ницыпар,—ты, смерць, садзи́са калѐ мене́, а вы. маѣ́ пахо́лки, кажэ́це, што вы зраби́ли, ци мно̀ґо людзѐў перабáвили з таґо́ свѣ́ту.—Разсѣ́ласа смерць калѐ Ницыпара на ку́чы касцѐй так, што ўсѣ́ й рэ́бра забращáли.

Ну,—ка́а Ницы́пар,—падхадзѣце да кажѣце, што вы зраби́ли.—И пацяѓну́лиса хваро́бы ближе́й к ку́чы. Перш падышла́ хо̆ндзя, ци як жэ ка́жуць тра́сца,—зеле́ная, худа́я, от бы та́я жыдо̆ўка, што ану́чы збира́е. Дрыжы́ць, бы аси́на й ка́жэ то́неньким, пискля́вым ѓаласко́м: ке́пськая наста́ла цепе́р пара́; зелье́ў мно̆ѓо: трасу́-трасу́, ѓнету́-ѓнету́, ничо̆ѓо не пара́джу. Цепе́р лю́дзи ка́жуць, што пуры́мы не свя́то, а тра́сца не хваро́ба.—Глядзи́ ў мене́!—закрычаў Ницы́пар,—я дам табѣ́ тако́ѓо ды́хту, што з цебе́ й духи́ вы́прэ. Пашла́ вон!—Зни́кла тра́сца. Падхо́дзиць хваро́ба сухо́ты —Я,—ка́а,—мно̆ѓо атпраўля́ю людзе́й на ѓэ́ты свѣт, мно̆ѓо падѓатава́ла. Дзя́куваць пъя́нству.—пры ѓэ́тых слава́х ена́ пакланилаcа якьо̆йсьци бо́чцэ, а з таѣ́ то́лько тырчы́ць аблѣ́злая ѓалава́ с си́ним но́сам,—дзя́куваць, ено́ мнѣ́ баѓа́цько памаѓа́е.—До́брэ, до́брэ,—ка́жэ Ницы́пар,—зраблю́ цебе́ ста́растаю.—Да́лей пашли́: во̆спа, раза́чка, халѣ́ра, ѓара́чка, адзе́р и мно̆ѓо друѓи́х хваро̆б. Усѣ́ ены́ ка́жуць, што ве́льми памаѓа́ло пъя́нство. Слу́хаў—слу́хаў Ницы́пар, да й пыта̀е: „Яко̀е-тако́е там пъя́нство, што ўсѣ́ ему́ дзя́куюць? Што ж ено́ само зраби́ло?“ Падсу́нуласа бо́чка, ци бо то́е са́мае пъя́нство, да й ка́жэ: „ѓо-ѓо-ѓо! што я зраби́ло? Я то́е зраби́ло, што цепе́р, каб не я, таб усѣ́ хваро́бы ни ѓо́днаѓо-б чалавѣ́ка не ўмары́ли; смѐрци прышло́со-б ци зу́бы палажы́ць на пали́цу, ци суздро́м здо́хнуць“.—Пра́ўда,—ка́а смерць,—пъя́нство вѐрно мнѣ́ слу́жыць: ено́ ро̀биць бо̆льш, чым усѣ́ хваро́бы ра́зам. А ко̆лько ено́ ащѐ прыѓатаўля́е. Што па ѓато̀ваму хадзи́ць! По́сле пъя́нства вазьме́ й тра́сца, й пухли́на, й раза́чка, й уселя́кая хваро́ба. Нѣ́, а от ты папро́буй к здаро́ваму прыступи́тца! кали ты су́нешса к ему́ ў живо̆т, а е́н цебе́ дава́й вары́ць; кру́цишса, кру́цишса да й вон скаре́й бежы́ш, бо е́н и ка́мень зва́рыць. — Хвалю́, пъя́нство!—закрыча́ў Ницы́пар,—раблю́ цебе́ са́мым ста́ршым, хваро́баю над хваро́бами. Цепе́р усѣ́ цебе́ бу́дуць слу́хаць. Хадзи́ каха̀нае пъя́нство ка мнѣ́, садзи́са кале менѐ. Запища́ли, захры́пали ўсѣ́ хваро́бы, ста́ли винпава́ць пъя́нство да таки́ паднели́ ѓо́ман, што до̆л разступи́ўса, й усѣ́ ены́ па-

лецѣли чо́рт вѣдае куды́. Дрыжы́ць Се́мко пад ла́ваю, не смѣ́е аттуль вы́паўзци, але́ зирну́ў, ажно́ Янко стаи́ць кале́ его́. Узя́ў Янко ба́цька за ру́ку й зно́у ены́ палецѣли. До́ўго лецѣли ены́ кале́ самых зо́рак, чуць не зачапи́лиса за мѣ́сяц, паку́ль не верну́лиса на то́е-ж мѣ́йсцо пад крыж, гдзѣ Се́мко лежа́ў у кана́ўцэ.—Ну, бацько́, ба́чыў?—пыта́етца Янко.—Ба́чыў,—ка́а Се́мко.—А кали́ ба́чыў, та й идзи́ з Бо́гам да гаспо́ды й раскажы́ други́м.—Сказа́ў Янко й зник. Глядзи́ць Се́мко, ажно́ е́н усю но́ч у кана́ве ў грази́ пралежа́ў. Хо́ладно, зуб на зуб не пападзе́. Дрыжы́ць уве́сь, як бы его́ тра́сца трасе́. Падня́ўса гэ́то е́н, перахрысци́ўса да да гаспо́ды суну́ў бы хорт. Але́ ма́быць с таѣ пары́ Се́мко бо́льш не по́йдзе ў карчму́ й не бу́дзе пиць. Мо́о й гэ. А ты як ду́маеш?

Пересказалъ Савицкій.

Дер. Чудинъ.

---

5. Каваль Багатыр.

Жыў сабѣ кава́ль з кавали́хаю. Пабра́лиса ены́ ра́но, але́ да са́маѣ ста́расци не мѣ́ли дзеце́й. Вѣ́льми гарава́ли ены́, што не даў Бо́г им уцѣ́хи. Го́рно, што ўсѣ лю́дзи, як лю́дзи, а то́лько их пакара́ў Бо́г. Чаго́ ни раби́ла кавали́ха, к яки́м варажбито́м не хадзи́ла, яки́х зелье́ў не пила—ништо́ не памага́е. Упра́витца кавалиха з гаспада́ркаю, пры́дзе й кава́ль з ку́зни, ся́дуць ены́ вечэ́раць, кава́ль и ка́жэ: „нещасли́вые мы з табо́ю, ба́бо! Хто нам на ста́расци ваду́ пада́сь? Хто нам во́чы закры́е? Хто нас пахава́е? Хто нас бу́дзе памина́ць?“ Пла́чэ ба́ба й то́льки ащэ гаре́й е́й мо́ташно на се́рцы. От раз быў святы́ дзень. Весна́. Чуць зайшло́ со́нцэ. Вѣ́чар це́плы, паго́дны. Павечэ́рали кава́ль з кавали́хаю да й пасѣ́ли на пры́зьбе. Седзя́ць ены́ да зави́дуюць, як гра́юць на загумѣ́чы сусѣ́дние дзѣ́ци. Ужэ́ пачало́ цемнѣ́ць, на не́бе заблы́скали зо́рки; хацѣ́ли ены́ йци́ спаць, як ось ба́чаць: паказа́ласа на не́бе вѣ́льми вели́кая й я́сная зо́рка.—Мо́о гэ́то ду́шачка майго́ дзиця́ци,—ду́мае кавали́ха. Чуць ена́ гэ́то паду́мала, як та́я зо́рка й пакаци́-

ласа па нéбу: кóцитца ўсе бликѣй да бликѣй и ўсé расцé. От енá ўжэ над сáмым селóм ґарыць, бы капá сѣна. Спужáлиса людзи, а зо̄рка трéснула над сáмым селóм на куски́, то̄льки и́скры пасы́палиса на зе̄млю, й патýхла. От аднá и́скра ўпáла кавали́се к сáмым наґáм, от бы ґарáчы чырвóны камѣньчык. Лежы́ць калé пры́збы камѣньчык, я́сны як зо̄рка. Спужáлиса кавáль з кавали́хаю, а пóтым, як трóхи ачýхалиса, дак и кáжуць у вадзи́н ґóлас: „мо̄о ґэто Бо̄ґ нам даў дзицá“. Узелá кавали́ха той кáмень, палажы́ла еґó ў пелёнки й панеслá ў хáту. То̄льки ўздýла енá аґóнь да запали́ла лучы́ну, бáчыць, ажнó прáўда: ў пелёнках лежы́ць не кáмень, а таки́ ґóжы хлапчýк, што не мо̄жна й сказáць. Не нарáдуютца кавáль з кавали́хаю,—так и не лажы́лиса ены́ ўсю но̄ч. Расцé хлóпец як рыжóк. На трэ́йци дзень ужэ стаў бѣгаць кавальчýк и йгрáць з дзецьми́ на заґумéчы; то̄льки дзѣци еґó баялиса, бо ён каґó хвáциць, альбó пихнé, та той и палеци́ць церэз ґалаў. Цéраз недзѣлю пашо̄ў ён ужэ ў кýзню памаґáць бáцьку й вучы́тца кавáць. Дзи́витца кавáль, што еґó сын таки́ панятливы. А ён цéраз недзѣлю-дзвѣ так навучы́ўса ўсé кавáць, што мудрéй бáцька. А си́ла ў еґó такáя, што як дáсь мо̄латам, дак аж кавáдло ў зе̄млю хавáетца. И празвáли людзи кавалёваго сы́на Баґатырóм. Вы́рас кавáль Баґаты́р, набрáўса си́лы й захацѣласо емý свѣту пабáчыць и себé паказáць. От и стáў ён збирáтца ў дарóґу. Як ни ўпрашáли еґó бáцько з мáткаю, каб ён не пакидáў их, не паслýхаў. Кáжэ: „я цепéр пайдý паґляджý свѣту й скóро вернýса памаґáць вам на стáрасци“. И пашо̄ў Кавáль Баґаты́р у чужы́е зе̄мли, к чужы́м людзям учы́тца, як ґдзѣ людзи жывýць. Ци до̄ўґо, ци кóратко ён хадзи́ў, то̄лько ось вернýўса да ґаспóды. Жáлятца емý бáцько з мáткаю, што як еґó не былó, праяви́ўса стрáшны змѣй и мно̄ґо людзéй паѣў, альбó заґро̄б к сабѣ ў цёмны лѣс. Абазли́ўса Кавáль Баґаты́р на змѣя, вы́каваў сабѣ сакѣру ў дзéсяць пудо̄ў и пашо̄ў шукáць таґó змѣя. Идзé ён да йдзé цёмным лѣсам и вайшо̄ў у такýю ґущэ́чу, што й свѣту Бóжаґо не бачно̀: нѣльга йци́ дáлей

Ухваціў Каваль Баґатыр сваю сакѣру й давай паласкаць: што махне, дак дзесяць дуббў и палеціць, бы чарапіны. Прачысціў ён сабѣ дароґу да й пашоў далей. Идзе ён да йдзе, аж и выбеґаюць зза кустоў дванаццаць разбойникаў—да ўсѣ разам и навалилиса на Каваля Баґатыра. Хваціў ґэто ён самаґо старшаґо разбойника за ноґи да як махнуў круґом себе, дак зу сих разбойникаў и дух выперло. Пашоў ён далей. Падходзиць к рацэ. Рака ґлыбокая й широкая—нема як перайсці, а тут ещэ кале бераґа высокая ґара стаиць, а на той ґары—тры дубы таўщэразные як пѣч. Узышоў Каваль Баґатыр на тую ґору, бачыць, ажно на тых дубох пуґач звиў сабѣ гнездо й напладзиў дзецей Палѣз Каваль Багатыр на дуб, далѣз да ґнезда, бачыць, ажно там люцкие дзицячые косци валяютца Пуґач ухваціць дзиця, занесе еґо ў гнездо, а там пуґачанята й давай клеваць тое дзиця. Абазлиўса Каваль Баґатыр, паскручваў пуґачанятам ґолавы да й чакае, пакуль прылеціць сам пуґач. Ось зашумѣў вѣцер, засвистаў и леціць пуґач, а ў лапах трымае дзиця. Падлецѣў ён к гнезду да як убачыў Каваля, дак и кинуўса на еґо, а дзиця й выпусціў з лап. Ухваціў ґэто Каваль Баґатыр адною рукою дзиця, а друґою пуґача за ґорло й давай еґо душыць. Не душы,—кажэ пуґач,—я табѣ памаґу ў великуй прыґодзе.—Змилуваўса Каваль и кажэ: „ну, добрэ, я пушчу цебе, только ты атнеси ґэтае дзиця на тое мѣсцо, ґдзѣ ўзяў“. Панес пуґач дзиця, а Каваль Баґатыр злѣз з дуба, сыйшоў з ґары да як уперса ў еѣ плечом, дак только земля застаґнала, й ґара з дубами пасунуласа да й шабулдых у воду. Сусим засыпаласа рака. Нема як бѣґци вадзѣ й пашла ена на бераґи, затапила алес и поле. Тут недалеко ў нетры й тхлани седзѣў змѣй. Падышла вада, нема ему куды дзѣтца й вышаў ён у поле, да як раз и наткнуўса на Каваля Баґатыра. Билиса ены, билиса, але бачыць змѣй, што Каваль Баґатыр дужшы й пусциўса ён уцекаць. Дабѣґ да свайґо лоґва, зачыниўса й каладзьем закидаўса. Пашоў Каваль Баґатыр еґо шукаць. Лѣс ґусты, што ни прайсці, а тут ещэ й ноч нахапиласа.

Лёґ Кава́ль Баґаты́р пад ду́бам, лежы́ць и чу́е, ажно́ начына́ютца ґрымо́ты. Зашумѣ́ў лѣ́с, загу́ў, жу́пиць ро̀зными галаса́ми. Але ось блі́снула мала́нка й заґрымѣ́ло да так, што аж земля́ задрыжа́ла. Налецѣ́ў вѣ́цер. Раве́ лѣ́с, сто́ґне. Дубы́ траща́ць, хво́и сто́ґнуць, а ели́ны схиля́ютца чуць не да земли́. А мала́нка блі́сне, блі́сне чуць не це́раз усе́ не́бо, асвѣ́циць це́мны лѣ́с, и зно́ў це́мно, як пад землѐю. Але́ ось и пача́ў перу́н палыска́ць: тре́сне ў хво́ю, дак и распало́суе ат са́маґо ве́рху аж да каре́ня, тре́сне ў ду́ба— раско́ле ду́ба, як це́ўку.—Ну,—ду́мае Кава́ль Баґаты́р,—у ґэ́тую но́чку не аднаму́ чо́рту дастане́тца на абара́нки. Лі́нуў до́ждж. Падня́ўса Кава́ль Баґаты́р з пад ду́ба, вы́браў ґусту́ю ели́ну й лёґ пад е́ю, каб дождж не дастава́ў; лежы́ць и любу́етца, як перу́н чарце́й палю́е (страля́е). Палежа́ў Кава́ль Баґаты́р пад ели́наю да й засну́ў, як мало́е дзиця́. До̀брэ ему́ спаць, як спева̀юць бу́ры й ґрымо́ты. Тым ча́сам як пача́ў перу́н пали́ць у ло̀ґво змѣ́я—заґарѣ́ласо ло̀ґво; наси́лу змѣ́й выскачы́ў. Леци́ць е́н да леци́ц над лѣ́сам, а за им таки́ ви́хар паднима́етца, што усѣ́ дзеравя́ки з каре́нем вы-дзира́е з земли́. Падлецѣ́ў змѣ́й к таму́ мѣ́йсцу, дзѣ́ лежа́ў Кава́ль Баґаты́р, да й счу́ў его́ но́сам, бы саба́ка. Дава́й ґэ́то змѣ́й пад-кра́дватца к Кавалю́ Баґатыру́. каб на его́ со̀ннаго напа́сци. Пад-кра́ўса змѣ́й ужэ́ саўси́м бли́зко, а Кава́ль Баґатю́р спи́ць, беды́ не чу́е. Рад змѣ́й; от, ду́мае, кали́ капе́ц во́раґу. От е́н ужэ́ расча-пи́ў ла́пы, разя́виў ґо́рло, каб схваци́ць Каваля́ Баґатыра́; але́ ось атку́ль ни вазми́са пуґа́ч; падлецѣ́ў е́н к Кавалю́ Баґатыру́ да як зало́пае крылами над са́мым ву́хам,—той и праха́пиўса, аткры́ў во́чы да й абу́дзи́ўса. Зирне́ Кава́ль Баґаты́р, ажно́ ў цемнацѣ́ во́чы змѣ́я ґара́ць, як вуго́лье; ўхваци́ў ґэ́то е́н сваю́ сакѣ́ру да як махну́ў, дак атра́зу сатну́ў сѣ́м дубо́ў и ґо́лаў змѣ́ю. Верну́ўса тагды́ е́н да ґаспо́ды й дава́й ци́хо жыць да пажыва́ць да дабра́ нажы-ва̀ць да стара̀нькихъ ба̀цька з ма̀ткаю даґледа̀ць да шанава̀ць

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

6. Чалавѣчае воко.

Жыў даўнѣй адзін мудры цар. Добрэ жылосо ў его царстве, а ўсе людзи не былі давольны й наракали на цара. Думаў, думаў мудры цар, чаму ґэто ў его царстве людзи не давольны—ничоґо не прыдумае. От ен перадаў сваé царство сыну, а сам пашоў у свѣт, каб паґлядзѣць, як у друґих краех жывуць людзи. Доўґо хадзіў ен, набываў па розных краех и землях. Але куды ни прыдзе—бачыць, што ўсюды людзи не давольны, што ўсе наракаюць та на цара, та на Боґа, альбо на друґих людзей. Хочэтца мудраму цару пазнаць, чаму ґэто чалавѣк николи не давolан тым, што мае, й чаму ен усе хочэ больш. И пашоў мудры цар шукаць такоґо чалавѣка, каторы-б растлумачыў ему ґэто. Доўґо хадзіў ен, ужэ барада атрасла па самы пояс,—не мажэ найці ен такоґо чалавѣка, што-б сказаў ему, калі самы щасливы будзе давolан тым, што мае. Идзе раз цар кале мора; бачыцъ, ажно на беразе ґуляюць дзѣци. Цар падышоў к им паґлядзѣць, што ены робляць (робяць). Зблизиўса ен и бачыць, што дзѣци штось усе важаць на шальках.—Што вы робице?—Пытае цар.—Важым люцкое воко—кажуць дзѣци,—да от налажыли на шальки камѣня цѣлую кучу, а воко ўсе перацяґае. Падзивиўса мудры цар, ничоґо не сказаў и пашоў хадзіць кале мора и ўсе думаць. Думаў ен думаў, ничоґо не прыдумае. А тут ему так захацѣласо пазнаць ґэто, што лѣпш и не жыць. Нѣ,—думае цар,—кали я не пазнаю ґэтаґо, та не вернуса да ґасподы. И хацѣў ен ужэ кинутца ў морэ, але адно дзиця ўхапиласо ему за бораду й кажэ: „отдзѣду, мнѣ так хочэтца падзержаць цебе за бораду, што лѣпш не жыць. Кидайса са мною ў морэ“.—Разумнае ты—кажэ—дзиця. Скажы-ж ты мне, калі чалавѣчае воко не будзе завидуваць, а будзе давольно—А от калі—кажэ дзиця.—З ґэтыми славами ено ухвацило жменю песку й пасыпало на чалавѣчае воко—й шалька з вокам

адра́зу пашла́ ў̆ве́рх. Даґада́ў̆са му́дры цар, што таґды чалаве́к бу́дзе даво̆лан, як ему́ песко́м прысы́плюць во́чы, й пашо̆ў̆ у сва́е ца́рство. Мо̆о ён там и цепе́ръ ещэ́ ца́рствуе.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

7. Илья и Петро.

Даў̆но́ то́е было́, як ещэ́ сам Бо̆ґ па земли́ хадзи́ў̆. Атда́ў̆ Бо̆ґ уве́сь свѣт Ильи́ й Петру́. Але́, вѣ́дамо, ґдзѣ́ два паны́, там нико́ли ладу́ нема́. Адзи́н пасыла́е дождж, а друґи́—паґо́ду. Пла́чуць хму́ры, не вѣ́дають, што раби́ць, каґо́ слу́хаць. По̆йдзе дождж, та Петро́ бежы́ць да крычы́ць, ла́етца, на чо̆м свѣт стаи́ць: „што вы, паташку́хи, ро́бице, на што мо́чыце сѣ́но, цепе́р-жэ лю́дзи ко́сяць!“— Нам—ка́жуць—Илья́ прыказа́ў̆.—Ах вы, засцы́ки—ла́етца Петро́— я вам пакажу́ Илью́! Илья́ заў̆сю́ды наро́биць ґнилья́.—Ухва́циць Петро́ метлу́ й паразґаня́е хма́ры па куткох, а не́бо чы́сценько падмеце́. Та ось, атку́ль ни вазми́са, тарахци́ць, ѣ́дзе Илья́, крычы́ць, як на жыво̆т, аж не́бо й земля́ дрыжа́ць. Хма́ры таў̆ку́тца, як непрыто̆мные, выла́зяць з куткоў̆, и ў̆жэ́ ли́не таки́ до́ждж, што не то̆лько бераґи́, але́ й ґруды́ паплыву́ць. Жа́лятца лю́дзи Бо́ґу, што паны́ дзеру́тца, а ў̆ мужыко̆ў̆ ґи́ры трасу́тца, жа́лятца й про́сяць, каб Бо̆ґ даў̆ паґо́ду. Прызаве́ Бо̆ґ Илью́, насва́рытца на еґо́, а той ка́жэ, што то̆лько развело́со не́чысци-чарце́й, што трэ́э их ґро́мам паби́ць, бо ў̆ве́сь свѣт запаґа́няць. Прызаве́ Бо̆ґ Петра́ й ка́жэ, што нехай Илья́ тро́хи папалю́е чарце́й. А Илья́ тым ча́сам падни́ме таки́е ґрымо́ты, што аж земля́ сто́ґне: нема́ ни дня, ни но́чы; хма́ры таў̆ку́тца, як вьюны́ ў̆ рэ́шаце; на не́бе кипи́ць, як у ґаршку́; мала́нка бли́скае, аж у ачу́ це́мно стано́витца, а перу́н сма́лиць ра́з-па-ра́зу, пало́суе хвои, дубы́ да па́лиць будо̆ў̆лю, альбо́ стаґи́. А Илья́ ѣздзиць сабѣ́ па не́бу да каме́ндуе. „Так, так, так! Го-ґо-ґо! ещэ́, ещэ́... Лупи́, лупи́ еґо́ ґа́да... От так, так... Го-ґо-ґо! Тре́сни

еґо па затылку. Го-ґо-ґо! У патылицу, у патылицу лупи́ еґо́ ґада! Трах, трах! Так-так-так! Го-ґо-ґо! Про́сяць лю́дзи на прами́лы Бо̂ґ, каб уняли́са ґрымо́ты, а Илья́ не слу́хае. Хо́дзиць Петро́ да плюётца беззу́бым ро́там ат зло́сци. Нацѣ́шытца Илья́, пачы́сциць сваю́ каля́ску й паѣ́дзе к со́нейку ў ґо́сци. Тут Петро́ падмеце́ нѐбо да дава́й сушы́ць зе́млю. От ужэ̇ падхо́дзиць пара́ сѣ́яць жы́то, а земля́ суха́я, як пры́сак—зно́ў беда́! Беда́ ўжэ, што нема́ дажджу́. А Илья́ свяво́лиць сабѣ́ з со́нейкам, а пра зе́млю й забы́ўса. Не ма́юць о́ка адзи́н на друґо́ґо Илья́ й Петро́, сердзи́тые, ба́ятца, каб и не сустре́тца. Але́ от раз узду́мали ены́ пахадзи́ць па земли́, папыта́ць людзе́й, каґо́ ены́ бо̂льш лю́бяць, Петра́, ци Илью́. Як сышли́ ены́ на зе́млю, дак па нема́лым ча́се й сустрѐлиса. Иду́ць ены́ ра́зам и спо́раць: Петро́ ка́жэ, што еґо́ бо̂льш лю́бяць лю́дзи, а Илья́ ка́жэ, што еґо́. Як дакана́тца, чыя́ пра́ўда? Ба́чаць ены́, аж чалавѣ́к сѣ́е ґрэ́чку.—От—ка́жэ Петро́—дава́й, папыта́ем, каґо́ мужыки́ бо̂льш лю́бяць.—Папыта́ймасо—маўля́ў Илья́.—Памаґа́й Бо̂ґ!—ка́жэ Петро́. —Дзя́куваць.—Скажы́ до́бры чалавѣ́чэ, каґо́ вы бо̂льш лю́бице, Петра́, ци Илью́?—Мужы́к зня́ў з плѣ́ч сево́к, паста́виў еґо́ на зе́млю, пачаса́ў паты́лицу да й ка́жэ,—а баґи́ еґо́ зна́юць, каґо́ мы бо̂льш лю́бим: мо Илью́, мо Па́ўла-Петра́?—Ты не ґарадзи́ пло́та—ка́жэ Петро́,— а кажы́ про́сто.—И Илья́ й Па́вел-Петро́—до́брые святки́; мы их и лю́бим.—А каґо́ бо̂льш?—Ба́чыць мужы́к, што тут не вы́круцишса и ка́а: „пе́ўнеж Па́ўла-Петра́“. Аж затро̂сса Илья́ ат зло́сци. Пашли́ ены́ да́лей, а Илья́ й ка́жэ: „Ото-ж зпеку́ я за ґэто ему́ ни́ву— ничо́ґо не заро́дзиць“, а Петро́ ка́жэ: „а я намачу́ й зараджу́“.— Кали́ так, дак я зраблю́ ось як: хто пе́ршы ўку́сиць з ґэ́таѣ ни́вы перапѣ́ч, та пада́витца.—Ухмыли́ўса Петро́ и пашли́ ены́ далей. Было́ вѐльми до̂брае то́е лѣ́то: аб дзень паґо́да, цепло́, а ў но̂чы ци це́плая раса́, ци ци́хеньки це́пленьки до̂жджик. Расце́ ўсе́, як на дро̂жджах; здаётца, пасадзи́ на по́ле дзиця́, та й то́е вы́расце. Зрадзи́ла ґрэ́чка па по́яс, аж палеґла́. Наби́ў мужы́к паўґумна́. От намалаци́ў ён ґрэ́чки, намало́ў, и напекла́ ба́ба свѣ́жых перапѣ́ч

поўну пѣч. На той час прыходзяць у тое село Илья з Петром и заначавали ў таго мужыка. Забыўса Илья, не пазнаў таго мужыка. От сѣли ены вечэраць.—От-же дзякуваць Богу—кажэ мужык—зарадзила цепер грэчка,—пробуйце, госцики, свѣжых перапѣч.—А Илья таки добрэ прагаладаўса. От ен як хвациў перапѣч, так и падавиўса. Туды сюды ен, и вадою запиваць, и кулаком биць у грудзи й у спину—от хаць-бы што. Дагадаўса ен, што гэто праклятые им перапѣчки; и давай ен перапрашаць мужыка й Петра, дак насилу ачўхаўса От з таѣ пары годзи Илья мешаць людзям сѣно касиць. Але ўсе было-б добрэ, каб Петро не быў таки стары да глухи. Бог кажэ: „пасылай тагды дождж, як людзи просяць, а ен недачўе да й пасылае дождж, як людзи косяць.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы

---

8. Стары бацько.

Кажуць: што край, та абычай, што село, та нораў, а што галава, та розум. У вадном мѣйсцы быў абычай—дабиваць старых людзей, каб ены дарэмно не ѣли хлѣба, кали не магуць рабиць. Часам и сами старые людзи прасилиса, каб их дабили, бо, вѣдамо, им цяжко было лупаць ачыма, чакаць, пакуль им дадуць ѣсци, або пиць. От жыў адзин чалавѣк; у его было много дзецей да ўсѣ ўдалые, добрые. Саўсим састарэўса бацько, а ены его слухаюць, шануюць. Але от давай сусѣдзи прыставаць, каб ены дабили свайго бацька-дармаѣда, бо ен ужэ вельми стары й никчому не гож. Шкода дзэцям старэнькаго бацька. Й схавали ены его ў пограб да й носяць ему туды цишком ѣсци й пиць. Доўго жыў старэньки ў пографе. Лежыць сабѣ на саломцэ да Богу молитца, а як сусѣдзи разыдутца на работу, от ен высунетца з пограба, пагледзиць на яснае сонейко, пагрэетца й зноў захаваетца ў пограб. Малые ўнуки й праўнуки прынесуць ему туды суниц, або другиих ягад, а ен ѣсь и кажэ

им каски. А то забеґуць к ему маладзицы, або дзеўчата, паюць ему ў пограбе пѣсни, чэшуць ґолаў. А сыны, ўжэ барадатые, часто прыходзяць к старэнькаму бацьку пажупиць пра хаджайство да папытаць старого: кали й ґдзѣ што сѣяць, як лѣпш абрабляць поле, як даґлядаць ґаўядко. Старэньки ўсе им скажэ, ўсему наўчыць. Жыве сабѣ стары бацько, а дзѣци да й унуки рады. Але ось настаў там велики ґолад. Прапаў немаль увесь статак. Пухнуць людзи ат ґоладу, жыватами качаютца,—нема за што рук залажыць. Панесли дзѣци старэнькаму бацьку апошни хлѣб, а ен да й кажэ им, каб ены садрали з харом стрехи да й вымалацили тую салому. Паслухали дзѣци старэнькаґо бацька, садрали стрехи да й давай малациць старую салому. Глядзяць, аж на таку так мноґо зернят, што хвациць хлѣба да новаґо ураджаю. Пытаюць сусѣдзи, аткуль у их хлѣб, а тые й разказали им, што ґэто их наўчыў стары бацько, катораґо ены хаваюць у поґрабе. Пашли ґэто ўсѣ сусѣдзи, старые й малые ў поґраб к старэнькаму да й вынесли еґо аттуль на руках. Доўґо ещэ после таґо жыў старэньки бацько. От з таѣ пары ґодзи дабиваць старых людзей, а пачали им служыць, даґлядаць их да шанаваць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

9. Кузьма.

На свѣце усего нажывеш и
Кузьму бацькам назавеш.
Прыказка.

Ещэ саўсим дзецюком жаниўса Кузьма, а жонку ўзяў маладую, здаровую да вельми ўпраўную. Просто жыдки нема Кузьмѣ: жонка слова не дась кыґаварыць. Штоб ен ни зрабиў—усе не так. З ким-бы ен ни заґаварыў—жонка ўсюды свой язык ваткне, насыпле, як бобу. Урадзиўса хлапчук. Не можна й сказаць, чаґо не нацерпѣўса Кузьма ат жонки! Падрос трохи хлопец, а жонка й не падпускае к ему

бли́зко ба́цька. Расце́ хло́пец и нико́ґо не слу́хае. Наўчы́ла еґо́ ма́ци, каб е́н не зва́ў Кузьму́ ба́цькам.—Кузьма́, идзи́ ара́ць; Кузьма́, свине́й заґани́,—ка́жэ сын, а ба́цькам нико́ли не назаве́. Го́рно Кузьмѣ́, але́ ничо́ґо не зро́биць. Смею́тца лю́дзи,—ду́рэнь,—кажуць—Кузьма́. Перш жо́нка ѣ́здзила на ка́рку, а цепе́р подґадава́ў сы́на, дак то́й сѣ́ў на ка́рак.—От адзи́н раз паѣ́хаў Кузьма́ з сы́нам па сѣ́но. Накла́ли ены́ вели́кие вазы́ да й ѣ́дуць да ґаспо́ды. Маро́з бы́ў не вели́ки, даро́ґа харо́шая, ле́ґкая. Паўзла́зили ены́ на вазы́ да й ѣ́дуць сабѣ́ памале́ньку. Пере́ѣхали ґла́дкае бало́то, падъѣзжджа́ющь к лѣ́су. Пашли́ у́хабы. Злѣ́з Кузьма́ з во́за й на выбо́инах падтрымо́ўвае свой во́з, а сын лежы́ць на во́зе да то́лько каме́ндуе: „Кузьма́, онь уха́ба; падтрыма́й мо́й во́з; праведзи́ жараби́цу тро́хи на цалину́, а то во́з абе́рнетца“. Падтрыма́ў Кузьма́ свой во́з на у́хабе, а во́з сы́на нахили́ўса й ле́ґ на бо́к. Палецѣ́ў Кузьмы́ сын з во́за й упа́ў у снѣ́ґ. Абла́яў сын Кузьму́; падняли́ ены́ во́з и паѣ́хали да́лей. Але́ ось на растанцо́х зно́ў пахили́ўса во́з дзецюка́. Падбе́ґ е́н збо́ку й упе́рса плечо́м, але́ незмо́ґ и у́па́ў у снѣ́ґ, а во́з на еґо́.—Кузьма́!—крычы́ць з пад во́за,—падыми́ во́з, а то жыў не бу́ду.—Маўчы́ць Кузьма́; даста́ў сабѣ́ лю́льку, вы́няў з кишэ́ни капшу́к з цюцюно́м и дава́й заку́рваць.—Лежы́—ду́мае сабѣ́,—кали́ не хо́чеш назва́ць мене́ ба́цькам.—Зваў, зваў дзецю́к Кузьму́, але́ ба́чыць, што той не слу́хае, а сам з пад во́за не мо́жэ вы́лезци, от е́н и ка́жэ: „бацько́, падыми́ во́з“. Рад Кузьма́, што сын назва́ў ба́цькам, падня́ў во́з и аслабани́ў сы́на. Падня́ўса дзецю́к, абтрапа́ў снѣ́ґ, да й ка́жэ: „На свѣ́це у́се́ нажыве́ш и Кузьму́ ба́цькам назаве́ш“.—От з таѣ́ пары́ й пашла́ пры́казка, што на свѣ́це у́сеґо́ нажыве́ш и Кузьму́ ба́цькам назаве́ш.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

10. Бэч рыж.

Жыў сабѣ адзи́н бaґáты чалавѣк. Не то ўжэ, каб ён быў вéльми старэ́нны, абó працави́ты, алé ему́ ва ўсём шанцавáло. Чáсто сусѣ́дзи казáли, што мáбыць ему́ нéчысць памаґáе; да пéўне, што ён з нечы́стым знáўса. Быў у тӧм селѣ́ старэ́нны й ку сему́ здáтвы чалавѣк, алé таки́ бѣ́дны, што чáсам и хлѣ́ба не мáў. Не быў ён ни ґультáй, ни пья́ница, алé штось ему́ не шанцавáло, а мóжэ ґэ́то ён ужэ таки́ нещáсны ўрадзи́ўса. От пашóў раз, бѣ́дны на заґумéчэ; трáпиласо ему́ ици́ калé ґумнá баґáтаґо. Тӧлько ён параўня́ўса з ґумнóм, бáчыць, аж баґáты абсмáльвае ў сваём ґумнѣ́ паўцѣ́не: падпáлиць зу́бленкаю пад сáмым стрóпам, а як аґóнь разґары́тца, та баґáч тӧлько кáжэ: „бэч рыж!“ Гары́ць сабѣ́ ци́хенько паўцѣ́не, а салóма хаць-бы што—от як у вадзѣ́. Абсмали́ў баґáч у ґумнѣ́ ўсé паўцѣ́не, заткну́ў зу́бленку ў стóўп, да й пашóў сабѣ́ ў хáту. Даґарэ́ла зу́бленка да сáмаѣ салóмы да й пату́хла. Бáчыць бѣ́дны, што баґáтаґо аґóнь слу́хае, пашӧў и ён у сваé ґумнó й дава́й апáльваць павуцѣ́не. Тӧльки ён падаткну́ў зу́бленку, як заґары́тца страхá; крычáў ён, крычáў „бэч рыж!“—ничóґо не зрóбиц,—аґóнь не слу́хае. Нараби́ў ён кры́ку, збѣ́ґласо ўсé селó, алé што ни раби́ли,—зґарѣ́ло ґумнó бѣ́днаґо, ўсé рóўно, як еґó языкóм злизáло. Беду́е бѣ́дны чалавѣ́к, немá за штó рук заця́ць. Прышóў ён к баґáтаму да й пытáе: „скажы́ ты, браткó, чаму́ цебé аґóнь слу́хае?“—Ґэ́то мнѣ,—кáжэ,—так шанцу́е, а вѣ́дамо, кали́ шанцу́е, та й у лáпцях танцу́е. Мáбыць мая́ такáя дӧля, што, штоб я ни зраби́ў, та ўсé бу́дзе дóбрэ. От раз быў баґáты ў пóли, бáчыць, аж ґары́ць их селó. Усѣ́ ки́нулиса туши́ць пóжар, альбó ратавáць сваé баґáтство. Пабѣ́ґ и бѣ́дны чалавѣ́к, а баґáты астáўса.—Чаґó я,—кáжэ,—пайду́ ратавáць, мóо ў ґэ́тум маé щáсце.—Зґарѣ́ло селó. Пачáли лю́дзи параґрéбаць пóпел. Гледзи́ць баґáты, аж там, ґдзѣ́ былá еґó хáта, зóлато слилóсо: кусóк, мóо ху́нтаў дзéсяць.—От,—кáжэ,—мнѣ́

й пóжар шанцу́е, ґэто такáя мая́ дóля.—И зажы́ў баґáты з таѣ́ пары́ ащэ́ лѣ́пш, як уперо̆д, а бѣ́дны бѣ́дным так и астáўса

Пересказалъ Данило Кулешъ.

Дер. Чудинъ.

11. Бусел *).

Уперо̆д не было́ ни гадзю́к, ни жаб, ниякаґо ґэтаґо плюґáўства От раз Бо̆ґ падазвáў к сабѣ́ чалавѣ́ка й дáў ему́ завя́заны ґарщо́чак.—На—кáжэ,—занеси́ ґэты ґарщо́чак и ўки́нь у мо́рэ; то̆льки, ґлядзи́, неразвя́звай.—Прышо̆ў чалавѣ́к да ґаспо́ды й пачáў збиратца ў даро́ґу: узлажы́ў чыстую, бѣ́лую саро́чку, абу́ў но́вые лáпци й пранýў чо̆рную свиту.—Куды́ ты збирáешса?—Пытáе жо̆нка.—А ось,—кáжэ,—пасылáе Бо̆ґ занесци́ ґэты ґарщо́чак и ўки́нуць у мо́рэ —А што ў е́м такóе?—Не вѣ́даю.—Давáй паґля́дзим.—Бо̆ґ велѣ́ў не развя́зваць,—кáжэ чалавѣ́к. Хо́четца бáбе паґлядзѣ́ць, што там такóе ў ґаршку́. Вѣ́дамо, бáба ве́льми цикáва. Аж з шку́ры пражэ́тца бáба, хо́чэ паґлядзѣ́ць у ґарщо́чак, але́ чалавѣ́к упӗрса й непазваля́е. Ужэ́ суси́м сабрáўса ӗн у даро́ґу. Бáчыць бáба, што ничо́ґо не зро́биць. Ужэ не так е́й хо́четца вѣ́даць, што ў ґарщэ́чку, як пастáвиць на сваём на перако̆р ґаспадару́.—Ну й куды́ ты по̆йдзеш пе́рад ве́чарам? Лѣ́пш перананачу́й до́ма,—кáжэ енá ґаспадару́.—Што там но̆ч, я не баю́са,—кáжэ чалавѣ́к.—У но̆чы ещэ́ лѣ́пш ици́: не так ґо́рачо.—Бáба ў сле́зы, давáй ґаласи́ць да ўпикáць ґаспадарá, што е́н еѣ́ не лю́биць, кали́ нехо́чэ пераначавáць з е́ю апо̆шнюю но̆чку.—Кали́-ж нибу́ць да ўсе́-ж бу́дзе апо̆шняя но̆ч—кáжэ чалавѣ́к.—Куды́ тут! И слу́хаць не хо́чэ ўпáртка бáба: ґало́сиць, аж разливáетца. Паду́маў сабѣ́ чалавѣ́к, што ўсе́ ро̆ўно, кали́ ни занесци́ ў

*) Варіантъ этой сказки записанъ мною въ д. Чудинѣ, Слуцкаго уѣзда и переданъ для напечатанія въ «Извѣстіяхъ» И. А. Н. въ ст. «Грамматическій очеркъ живого бѣлорусскаго нарѣчія».

мо́рэ ґарщо́чак, и аста́ўса до́ма. Ра́да жо̄нка; напраґла́ ена́ яе́чни, даста́ла ґаре́лки,—часту́е ґаспадара́, як ґо́сця. Нае̄́ўса, напи́ўса чалаве̄́к и леґ з жо̄нкаю спаць.—Не́маль усю но̄ч недала́ ба́ба засну́ць, – ве̄́дамо, малада́я да здаро́вая маладзи́ца. То̄льки ўжэ пе̄́ўни заспева́ли, як е́н звеў во́чы, але́-ж за то́е, як засну́ў, дак як уби́ты. Спиць сабѣ, храпе́ чалаве̄к на ўсе̄́ заста́ўки, а жо̄нка тым ча́сам ци́хенько ўста́ла да й развяза́ла ґарщо́чак. То̄льки ена́ еґо́ откры́ла, а атту́ль и вы́скачыли ўселя́кие ґадзю́ки, я́щарки й жа́бы. Спало́халаса ба́ба, нараби́ла кры́ку. Прахапи́ўса чалаве̄́к да так бо́сы, ў бе̄́ло̄й саро́чцэ, то̄льки наки́нуўшы на пле́чы чо́рную сви́ту, дава́й збира́ць ту́ю не́чысь. Збира́ў, збира́ў,—ничо́ґо не зро́биць. Але́ ось прыхо́дзиць Бо̄ґ и ка́жэ тым лю́дзям: „вы выпусцили ґа́даў, вы́ й збира́йце их“. И аберну́ў Бо̄ґ тых людзе́й у бусько̄́ў. Хо́дзяць з тае̄́ пары́ па бало́це бо́сые, з чырво́ными наґа́ми, у бе̄́лых саро́чках и чо́рных сви́тах буськи́ да й збира́юць уся́кую не́чысь. Ены́ й стара́ютца жы́ць бли́жэ к свайм брато̄́м—лю́дзям,—зна́юць, што их, як брато̄́ў, лю́дзи не бу́дуць биць. От атку́ль узели́са буслы́.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

12. Стралцы.

Пасбира́лиса раз стралцы́ да й выхваля́ютца, чыя́ стрэ́лба лѣпш бъе. Ве̄́дамо, ко̄жын страле́ц сваю́ стрэ́лбу хва́лиць.— Мая́ стрэ́лба,— адзи́н ка́жэ,—хаць и разсыпа́е, але́ не жы́вить: пападзе́ адна́ шыраци́на, и пту́шка па́дае без ду́ху.—А мая́ хаць и не на́дто до́брэ бъе,—ка́жэ друґи́,—дак ве́льми шанцу́е: абы́ вы́шаў у лѣс, дак от на цебе́ ўсе бежы́ць и леци́ць.—И пачали́ ены́ хвали́тца, што тако́е зраби́ли, каб стрэ́лба до́брэ би́ла й шанцава́ла. Быў тут адзи́н страле́ц да таки́ зда́тны, што нихто́ так до́брэ не ўме̄́ў страля́ць як е́н. Усе̄́ ве̄́дали, што е́н чарадзе̄́йник, што е́н замо́виў сваю́ стрэ́лбу. Ен

слу́хае, як другі́е выхваля́ютца, маўчы́ць да тӧльки смеѣтца сабѣ́ ў бо́раду. От и дава́й его́ прасі́ць адзи́н малады́ страле́ц, каб е́н научы́ў, што зраби́ць, каб и его стрэлба шанцава́ла.—До́брэ—маўля́ў чарадзѣ́йник,—хадзѣ́м за́ўтрэ ў лѣс, та я цебе́ научу́. Це́лую нӧч не спа́ў малады́ страле́ц, так ему хацѣ́ласо скарэ́й научы́тца замаўля́ць стре́лбу. Усхапі́ўса е́н чуць свѣт, узя́ў сваю стрэлбу й пабѣ́г к старо́му стралцу́. Той мӧўчки адзѣ́ўса й пацегну́лиса ены́ ў лѣс. Тӧльки схава́лиса ў су́вараты, аж и бежы́ць за́яц. Злажы́ўса малады́ страле́ц, вы́стралиў, а за́яц хаць-бы што: сѣ́ў сабѣ́ пе́рад стралца́ми да тӧлько ву́шы ўхмылі́ў.—Страля́й, дзя́цько́,—ка́жэ малады́ страле́ц,—ма́быць я даў пу́дла.—А той тӧлько смеѣтца сабѣ́ ў бо́раду. Ось малады́ страле́ц стаў набива́ць стрэ́лбу, ба́чыць, аткуль ни вазми́са бежы́ць лӧсь и екура́т кале́ за́йца. Злажы́ўса стары́ страле́ц да як стрэльну́ў, дак лӧсь на мѣ́сце й капыты́ задра́ў, а глушэ́ц про́сто з хвои пакаці́ўса стралцӧм пад нӧги. Глядзя́ць ены́, ажно́ за́йца лӧсь прыбі́ў рога́м, як па́даў далӧў.—От як трээ страля́ць,—ка́жэ стары́ страле́ц. Дзі́витца малады́ страле́ц, аж на его́ страх напа́ў. Вы́пусцили, гэто ены́ ло́сю ки́шки, забра́ли глусца́ й за́йца да й пашли́ да гаспо́ды. Иду́ць да йду́ць, а стары́ страле́ц и ка́жэ: „от кали́ хо́чэш, каб и табѣ́ так шанцава́ла стрэ́лба, дак зраби́, што я табѣ́ скажу́“. Клине́тца малады́ страле́ц, што ўсе́ зро́биць.—Ну дак слу́хай,—ка́жэ стары́ страле́ц—И пача́ў ему штось шапта́ць на́ўхо. Спужа́ўса малады́ страле́ц, пабелѣ́ў як палатно́ й дрыжы́ць, бы асина, але́ слу́хае, бо ве́льми хо́четца, каб стрэ́лба шанцава́ла. Не пье́, не ѣ́сь малады́ страле́ц, вы́сах, тӧльки его́ цѣ́нь аста́ўса. Было́ гэто пе́рад Благавѣ́щанем.—Схадзі́ ты, Се́мко, да спо́ведзи,—ка́жэ жӧнка. Пашӧ́ў малады́ стра́лец у спо́ведзь, а на за́ўтрэ збира́етца к прыча́сцю. Гледзі́ць жӧнка и дзі́витца, чаго́ гэто е́н хо́дзиць, як непрытӧ́мны. Пашӧ́ў Се́мко ў цэ́ркаў, узя́ў прыча́сця, але́ не пракаўтну́ў его́, да затрыма́ў за губо́ю. Вы́шаў гэто е́н хучэ́й з цэ́ркви, забѣ́г да гаспо́ды, ўхваці́ў сваю стрэ́лбу да й суну́ў у лѣс. Гудзе́, сто́гне лѣс И здае́тца́ Се́мку, што ўве́сь свѣт пла́чэ. Мо-

ташно Се́мку на се́рцу, мо́ташно й стра́шно. Вы́браў е́н скаре́й, як учы́ў стары́ страле́ц, крыву́ю аси́ну, ўщами́ў у сук прыча́сце, атыпо̆ўса, злажыўса да й дава́й цэ́литца. Злажы́ўса, хацѣ̆ў вы́стралиць у прыча́сце, але́ ба́чыць, што там хрэ́ст, а на е́м Хрысто́с, да так жа́ласливо гледзи́ць на его́, жто ў Се́мки й ру́ки апусцíлиса. Не мажэ́ страля́ць у Хрыста́. Ки́нуў е́н стрэ́лбу, перахрысци́ўса да дава́й Бо̆г но́ги. Ве́село шуми́ць лѣ́с, от як пѣ́сни спева́е. Зака́яўса з таѣ́ пары́ Се́мко й у ру́ки брац стрэ́лбу.

Дак от як стралцы́ замаўля́юць сваѣ́ стрэ́лбы, каб ены́ шанцава́ли.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

13. Маскаль и смерць.

Быў вели́ки памо̆рак на людзе́й и на гаўя́до. Лю́дзи ме́рли, як му́хи. Прапа́ў уве́сь ста́так. Прышли́ на пасто̆й маскали́—нема́ каму́ даць им ѣ́сци. Сланя́ютца маскали́, як тру́тни, ѣ́сци хо́чэтца, а нема́ чаго́. Зневажа́юць людзе́й, а лю́дзи, хто аста́ўса жыў, нарака́юць на Бо́га да праклина́юць смерць. А ена́ сабѣ́ хо́дзиць ат села́ да села́ да ко́сиць людзе́й. От пашо̆ў адзи́н маска́ль у лѣ́с па грыбы́ й сустрака́е смерць. Спужа́ўса маска́ль и ў вачу́ пацемнѣ́ло. Даста́ў е́н з кишэ́ни ражо́к з таба́каю, хацѣ̆ў панюхаць таба́ки, каб тро́хи ў вачу́ пасветлѣ́ло, а смерць про́сиць у его́ таба́ки.—Ню́хай—ка́жэ маска́ль,—и су́нуў е́й ражо́к пад са́мы но̆с. Панюхала смерць—ничо́го ў но̆с не папа́ло.—Ничо́го—ка́жэ—мнѣ́ ў но̆с не папа́ло, дай мнѣ́ до̆брэ зажы́ць таба́ки.—Лѣ́зь—ка́жэ маска́ль—у ражо́к, там до̆брэ нанюхаешса.—Улѣ́зла смерць у ражо́к, а маска́ль мо̆цно-мо̆цно зачыни́ў ражо́к и схава́ў его́ ў кишэ́ню. Назбира́ў маска́ль грыбо̆ў да й пашо́ў у село́. Седзи́ць смерць у ражку́, не мажэ́ аттуль вы́лезци. Дзиву́ютца лю́дзи, што ни́хто не ўмира́е. Уперо̆д ду́мали, што гэто смерць здаво̆лиласа, атдыха́е, але́ по̆тым ба́чаць, што прайшо́ў го̆д и нихто́ не памӗр. Нараджа́ласо дзеце́й и ўсѣ́

ґадўютца Зноў развелóсо ґаўядо. Пашлí ўраджáйные ґады́. Жывýць людзи да Бóґа хвáляць. Так мóо прайшлó ґадóў з петдзесят. Тóлько пачалí людзи старéць, да ўсé жывýць, а малады́х тóлько напладзíласо, што як земля́ их паднимáе. Састарéўса той маскáль. Ужэ й у Петрóўку апранéтца ў кажýшак, седзíць на прызбе ца на сóнейку ґрéетца. Даўнó парá-б памирáць, да байтца смерць з ражкá вы́пусциць, каб енá на ґалóдные зýбы не накíнуласа на стары́х и малы́х. Пражылí людзи без смéрци мóо ґадóў сто. Цяжко стáло на свѣ́це жыць, бо вéльмо нарóду размнóжыласо, так размнóжыласо, што й земля́ не паднимáе. И пачалí людзи на Бóґа наракáць, што не даé смéрци —От калí-б вайнá, памóрак, альбó якáя пóшасць,— кáжуць людзи, — хацяя́-б прастарнѣ́й былó-б на свѣ́це жыць.—И давáй людзи наседáць на старóґо маскаля́. — Гэто éн—кáжуць— смерць у ражкý трымáе,—сам не ўмирáе и друґíм не даé.—Гóрно зрабíласо маскалю́, што так людзи кажуць за еґó дабрó, нéма чаґо рабиць, вы́пусцiць смерць. И пашлá-ж енá з таѣ́ пары́ на ґалóдные зýбы касиць и стары́х и малы́х.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

14. Круци не круци, а трээ умерци.

Кáжуць—даўнѣ́й быў вéльми велíки памóрак на людзéй. Такóґо памóрку нихтó й не паметáе. Не былó такóѣ хáты, каб двóе-трóе не памéрло, а ў нѣ́катарых усѣ́ паўмирáли, так што й ґаспадáрки запуставáли. Быў адзíн чалавѣ́к; у еґó былó дванáнцацеро дзецéй: сѣм сынóў и пяць дачóк. Усѣ́ ены́ былí ґóжые да ўдáлые. Працавáў éн сам, працавáли й дзéци, й дáў Бóґ им баґáтство й ваўсем дастáтак. А вѣ́дамо, калí дасць Бóґ здарóве, ў семéйцэ лад да худóбку, та не трээ бóльшаґо щáсця. И ґэто былá щаслíвая хáта. Алé-ж кáжуць, што щáсце не вѣ́чнае. Так и на ґэтую хáту пасыпáласо нещáсце аднó па другóм: пóшасць за вéсну скасíла ўсíх

дзецей. Астаўса той чалавѣк адзін з бабаю: да й бабу сагнуло ў сук. У лѣтку змокло ўсе село, и ў таго чалавѣка згарѣла ўся седзіба. Град збіў збожэ, а пакосы паплылі. Прышла осень, и ат паморку прапало ўсе гаўядо. Астаўса той чалавѣк адзін, як кол и гол, як маци радзіла. Цяжко йці жабравацъ. И пашоў ен к рацѣ тапітца. Стаў на беразе й давай наракаць на Бога й зваць к сабѣ смерць. Усхадзілаcа бура; загуў лѣс; затращали вѣтки. Ось и выходзиць смерць да такая страшная, што не можна й сказаць.—Ты зваў мене?—Пытае смерць.—От я прышла, але ты не памрэш.—Чаго-ж ты хочэш? Нашто ты мене мучыш?—кажэ чалавѣк; и давай еѣ зневажаць. Слухае смерць да тольки смеетца так, што аж рэбра ляскаюць.—Ты, —каа смерць,—не только скоро сам не памрэш. але й другіх вылечыш; тольки не лечы тых, у каго мене ўбачыш у галавах.—И знікла. Пастаяў чалавѣк, падумаў и ещэ гарей его апанаваў жаль. Узышоў гэто ен па высоки бераг и кінуўса аттуль у рэку. Упаў у воду, бачыць, ажно смерць стаіць у нагах да пад азадак падтрымоўвае. Як ен ни круціўса, немажэ патануць. Плюнуў гэто ен смерци ў зубы й пашоў у свѣт. Хворых людзей усюды много: куды ни прыдзе, е каго лечыць. От ходзиць той чалавѣк па свѣту й лѣчыць уселяких хворых Паглядзіць, гдзѣ ў хворого стаіць смерць, калі ў нагах, дасць ему выпиць вады, той и выздаравее, а калі ў галавах, та скажэ, што гэтаго хворого берэ к сабѣ Бог. Пашла слава аб том чалавѣку па ўсем свѣце. От захварэў адзін цар. Не хочетца ему памираць. Прызваў ен дахтароў су сего царства: але чаго ены ни рабили, ничогоо не зробяць. И абецаў цар даць таму паўцарства, хто его вылечыць. Але не нашлосо такого дохтура, каб вылечыў цара. Прачуў цар, што е таки чалавѣк, што ўсих, вылѣчвае й паслаў его шукаць. Ци доўго шукали, ци скоро, тольско знайшлі таго чалавѣка й прывезлі к цару. А тут цар ужэ чуць дышэ. Паглядзѣў той, чалавѣк, ажно смерць стаіць у нагах, и велѣў ен дастаць вады з двананцаци крыніць. Дастали вады. Узяў ен карэц таѣ вады, насыпаў туды трошки гліны й даў цару

выпиць. Насилу цар палыкнуў каплю вады, як ему легчѣй зрабиласо, а цёраз тры дни саўсим папрáвиўса. Выздаравѣў цар и обдарыў таго чалавѣка, чым ён захацѣў. Зажыў з тых часаў той чалавѣк, як у Бога за пазухаю: усего ему даволи, ўсѣ его шануюць. Жыве сабѣ ў палацах и ничого не дбае. Але тōлько адно его грызе—гэто, што прыдзѐтца кали нибуць памирáць. А ему цепер ой як не хочэтца памирáць. Вѣдамо, чалавѣк здаровы, багаты. От и прыдумаў ён, як абшукáць смерць и велѣў зрабиць сабѣ такую каравáць, каб ена круцилаcа. Ось па немалым часе й захвареў той чалавѣк. Бáчыць, аж смерць стаиць у галавáх, от ён и пакруциў каравáць так, каб смерць была ў нагáх. Паглядзѣла смерць, што ена стаиць у нагах и пашла далей.

Пажыў трохи чалавѣк, але знōў прышла к ему смерць и стала ў галавáх. Пакруциў челавѣк каравáць, и знōў пашла смерць шукáць другого чалавѣка. Пажыў так той чалавѣк ещэ гадōў з два; але знōў захвареў, и захвареў вельми мōцно. От лег ён на каравáць и чакáе, пакуль прыдзе, смерць. Тōльки зирне, аш ена стаиць у галавáх да смеетца. Пакруциў гэто чалавѣк каравáць, а смерць зноў стала ў галавáх. Чалавѣк зноў пакруциў каравáць, а смерць знōў перебѣгла на други бōк. Доўго ён так круциў каравáць, а смерць усе бѣгала, як не прытōмная, але потым и кажэ: „круци, не круци, а трэз умерци“, и ўзсѣла ему на голаў. Як ён ни круциў каравáць, дак пазирáе, а смерць усе ў галавáх. Нѣ — думае,—праўду кажэ смерць: круци, не круци, а прыдзѐтца ўмерци. Мабыць смерци не абмануць. И памер той чалавѣк тагды, як не хацѣў, бо ўсяки чалавѣк тагды не ўмрэ, як хочэ, а тагды, як Бог дасць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

15. Нехáй.

Алéкса быў вельмí недбáлы, ґультаевáты мужык. Сусѣдзи кáжуць емý: „Алéкса, што ты не залапíш дзíрки ў страсѣ? Бáчыш—хáта цечэ!“ А Алéкса смокчэ сабѣ люльку да й кáжэ: „нехáй цечэ“. Ци кáжуць: „Алéкса, бáчыш,—свíне лáзяць у ваґарóд.—Нехáй лáзяць,—кáжэ Алéкса. Пашóў раз Алéкса ў лѣс драць лýцье, забрáўса ў ґущэчу, дзерэ й не бáчыць, што стрáжник крáдзетца. А стрáжник цíхенько подкрáўса ззáду да й хап Алексу за рýки. Круцíўса, круцíўса Алéкса—ничóґо неймé: трымáе стрáжник, як клéщами. Давáй Алéкса зневажáць стрáжника на чôм свѣт стайць Слýхаў, слýхаў стрáжник, перш маўчáў, алé як стáў Алéкса праклинáць еґо мáтку, невытрымаў, прывезáў ґáда к дзéраву й ну его дубáсиць лýцьями. Палóсаваў, палóсаваў да й кáжэ: „ну, ґад, сдыхáй тут у лѣсе, а калí хто трáпиць, дак скажы, што цебé прывезáў Нехáй“. Пашóў стрáжник, а Алéкса папрóбуваў атвезáтца, алé ничóґо не зрóбиць: вéльми мôцно еґо ўкрампавáў стрáжник. Пачáў ґэто Алéкса крычáць на прамíлы Бôґ. Ишлí тут дзецюкí, пачýли, што хтось крычыць и пашлí па ґóласу цéраз ґущэчу. Падхóдзяць к Алéксе, пытáюць, хто еґó прывезáў, а éн кáа: „Нехáй прывезаў“. Плюнули дзецюкí й пашлí дáлей. Стайць Алéкса, плáчэ. а тут камарэча апанавáла—óчы выедáе. Давáй Алéкса знóў крычáць, звáць людзéй на пóмач. Учýли пастухí, дýмаюць, што мóо каґó медзьвѣдзь дзерэ: беґýць туды; бáчаць—стайць Алéкса пад дзéравам да тôльки галавóю матáе. Зирнýли ены ближéй, ажнó Алéкса прывязаны к дзéраву.—Хто цебé, дзяцькó, привезáў? — пытáюць пастухí. — Нехáй привезáў,—кáжэ Алéкса.—Хацѣли ўжэ й пастухí пакíнуць Алéксу, алé éн знóў пачáў крычáць: „Ратýйце, хто ў Бóґа вѣрыць, атвежéце рýки!“—Хварéць-жэ тваéй мáцеры,—кáжуць пастухí—чамýж ты не хóчэш, каб цебé развезáли, да ўсé кáжэш, што нехáй прывезáў.—Азвезáли ґэто пастухí Алéксу: ухвацíў éн сваю сакѣрку да й

сунуў да ґаспóды, як воўк. С таѣ пары ґóдзи Алéкса казáць зá кáждым слóвам „нехáй“.

Пересказалъ Грышко Бохматъ.

Дер. Чудинъ.

---

16. Зави́сны багатыр.

Былó два браты́: адзи́н баґáты, а други́ бѣ́дны. Абýдва ены́ ґаспадаравáли. Што ни зрóбиць баґáты—ўсé дóбрэ, ўсé ў рýку, бо емý шанцавáло. А бѣ́дны бóльш еґó ґараваў, алé штоб ни зрабиў—усé з рук плыве; так емý не шанцавáло. Мáбыць ужэ́ еґó былá такáя дóля. Вѣ́дамо, даўнѣ́й, ещэ́ светы́е хадзи́ли па земи́. От раз зсыпáе бѣ́дны ў кадýшку жы́то, якóе слемазáрнае Бóґ даў. Тóльки ось падхóдзиць к емý яки́сь дзедóк.—Памаґáй Бóґ!—кáжэ дзедóк.—Дзя́куй, старэ́ньки,—кáжэ бѣ́дны. От як убáчыў бѣ́дны старэ́нькаґо дзедкá, шкóда емý стáло старóґо й пасылáе éн еґó ў хáту к бáбе, каб трóхи пасилкавáўса да отды́хаў. Падзя́куваў стары́ да й пашóў у хату. Пашóў дзедóк, а бѣ́дны ўсе зсыпáе жы́то ў кадýшки; насы́паў éн ужэ́ ўсѣ́ кадýшки, а кýча ўсе як былá, не мéньшытца. Насы́паў ен усѣ засѣ́ки—кýча на такý як и былá ўпéрад. Кли́кнуў бѣ́дны брáта, папраси́ў у еґó кадýшак, алé й ты́е ўсѣ насы́паў жы́там. Даґадáўса таґды́ бѣ́дны, што ґэ́то быў не прóсты дзедóк, а яки́сь светы́. Здавóлиўса бѣ́дны зсыпáць жы́то, бо ўжэ́-ж тóлько назсыпáў, што бýдзе хаць на дзéсець ґадóў, и пабѣ́ґ у хáту, каб падзя́куваць светóму. Прыхóдзиць éн у хáту, бáчыць, аж жóнка закидáла палатнóм усю хáту.—Што ты рóбиш—пытáе; а бáба й кáжэ, што прышóў яки́сь дзедóк, назвáўса Петрóм. Паґлядзѣ́ла я, што ў еґó немá сарóчки, от я ўзелá свóй палатнá, каб атрéзаць дзедкý на сарóчку, а ен и зни́к; я-ж з таѣ́ пары́ ўсé раскрýчваю свóй,—от бáчыш,—кáжэ,—кóлько ўжэ́ палатнá наки́дала; на двáдцаць ґадóў стáне, бýдзе нáшым дзѣ́цям и ўнýкам, а свóй усé таки́, як быў.—Давѣ́даўса баґáты брат, яки цуд зраби́ў светы́ Петрó, й стáло баґáтаму зави́сно. Рас-

пытаўса е́н, як было́ й чака́е, ци не пры́дзе светы́ Петро́. На другі́ дзень ба́чыць бага́ты, што бежы́ць чужы́ саба́ка; ухапиў е́н ка́мень и папусциў у саба́ку. Тым ча́сам идзе́ светы́ Петро́. Про́сиць его́ бага́ты, каб зайшоў у ха́ту. Петро́ зайшоў. От жо̆нка бага́тага пабе́гла скарэ́й па во́ду, а Петро́ й зник. Гледзя́ць лю́дзи да й дзи́вятца, што бага́ты ўсе́ збира́е камёне да но́сиць на свой двор, а его́ жо̆нка ўсе́ но́сиць у ха́ту во́ду. От ена́ нанаси́ла вады́ ўжэ поўную ха́ту да й ещэ́ прэ. Убачыў то́е бе́дны брат и дагада́ўса, што гэ́то так зраби́ў светы́ Петро́, каб не быў таки́ зави́сны бага́ты брат.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

17. По́шасць и памо̆рак.

Даўне́й быў ве́льми до́бры адзи́н год: харо́шая о́сень, ро̆ўная зима́, а весна́ це́плая, паго́дная. Ў но̆чы йдзе цихеньки, це́плы до́ждзжык, а ў дзень я́сно све́ циць со́нейко да так гре́е, што, здае́тца, пасадзи́ на по́ли дзицу́, та й то́е вы́расце. Ўсе́ расце́ на по́ли, бы на дро́жджах. Ра́ды лю́дзи, што даў Бо̆г ураджа́й. Пры́шло́ ле́то. Нихто́ й не памета́е тако́го до́брага, паго́днага ле́та! Ўсе́ зрадзи́ло. Я́гады хаць шуплю́й, а грыбо̆ў у ле́се да ўселя́кае гу́бы — хаць каси́. От идзе́ адзи́н чалаве́к па ле́се, ба́чыць, аж седзи́ц на пни яка́ясь ве́льми го́жая маладзица й трыма́е ў прыпо́ле сно̆п жы́та да тако́го бу́йнага, яко́го той чалаве́к ещэ́ нико́ли не ба́чыў. Падышоў е́н бли́жэ й ба́чыць, аж маладзи́ца пла́чэ да сваи́ми до̆ўгими валаса́ми я́сные во̆чки ўцира́е. Адгарну́ла маладзи́ца валасы́ й аткры́ла гру́дзи. Ба́чыць чалаве́к, аж ву́ж упиўса ў са́мую цы́цку й ссе маладзи́цу. Хаце́ў гэ́то чалаве́к заби́ць таго́ ву́жа, але́ маладзи́ца то̆лько прамо́вила: „вели́ки ураджа́й, да не бу́дзе каму́ спажыва́ць“ И зни́кла. Пришоў чалаве́к у село́ й раска́звае, яки́ ба́чыў цуд. Спужа́лиса лю́дзи. Чака́юць вели́кае по́шасци, ци памо̆рку. То̆лько

ось пѐзно лавили дзецюкѝ рыбу да ѝ заначавали калѐ ракѝ на ґрудкў. От седзяць ены калѐ аґню да апѐкаюць рыбу. Нѐч цѝхая, як у вусе, тѐлько рыба пляскае ў рацѐ. Алѐ ось узышоў мѣсяц. Стало виднѐ, хаць иґолки збирай. Бачаць ены, аж за ракою падышли к бераґу якѝясь дзвѣ вельми страшные бабы. Косы ў их расплѐцены, твар цемны, бы земля, тѐлько вочы блищаць. Падышлѝ ены к рацѐ ѝ просяць дзецюкоў каб перавезлѝ их на друґѝ бераґ. Даґадалиса дзецюкѝ, што гэто не бабы, а пошасць на людзей и памѐрак на ґаўядо. Спалохалиса дзецюкѝ ѝ давай у их кѝдаць ґалавешками да махаць зубленками. Хацѣли тые бабы перш па кладцэ перайцѝ цераз рѐку, алѐ як убачыли аґонь, спалохалиса ѝ пашлѝ назад. Ось и чуюць людзи, што за ракою пашла пошасць ламаць людзей, а памѐрак касиць ґаўядо, ѝ давай ены дзень и нѐч класци су сих канцоў села аґонь, каб не-падпусцѝць поґани близко. От тѐлько так уратавали сваѐ селѐ. Мноґо памерло людзей, мноґо прапало ґаўядка. Тѐлько к зимѣ трохи хваробы атаймавалиса. От з таѣ пары и давай людзи класци аґонь да рабѝць куродым, як пачуюць, што хвароба ци якая пошасць падходзиць.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы

18. Завидны пѐп.

У аднаґо вельми бѣднаґо чалавѣка памерло дзиця. Просиць бѣдны чалавѣк сусѣдзей зрабѝць дамавину ѝ выкапаць маґилу для дзицяци. Алѐ, вѣдамо, калѝ чалавѣк баґаты, та ўсѣ ему памаґаюць, а бѣднаму—нихто. Прасиў, прасиў бѣдны чалавѣк, але нихто не пашоў капаць яму. Гѐрно ему, слѐзы так и цекуць, бы з берэзины сок. Нема чаґо рабиць, трээ йци самому капаць яму для сваґо дзицяци. Кажуць ґэто вельми велики ґрѐх, алѐ што зробиш, калѝ ат бѣднаґо ѝ людзи атступѝлиса. Узяў бѣдны чалавѣк заступ и пашоў, алѐ перш зайшоў къ папу ѝ просиць, каб пахаваў дзиця.—

До́брэ,—ка́жэ поп,—то́льки ты мнѣ́ перш прынеси́ дзе́сяць зло́тых и павасьми́нку аўса́.—Нема́,—ка́а,—ба́цюшко, ў мене́ ни аўса́, ни ґро́шэй.—И дава́й праси́ць, каб по́п пахава́ў дзіця́ так, а што ен ужэ́ по́тым атро́биць. Куды́ там! По́п нехо́чэ й слу́хаць. Як ни праси́ў бѣ́дны, по́п стаи́ць на сваем да й то́лько. Запла́каў бѣ́дны з жа́лю й пашо́ў капа́ць маґи́лу. Ось капа́е ен да капа́е й вы́капаў ґаршчо́к з ґрашы́ма: чырво́нцы аж зъя́юць.. Пане́с ґэ́то бѣ́дны чалавѣ́к ґаршчо́к з ґрашы́ма да ґаспо́ды й схава́ў еґо́ пад пѣ́ч, а адзи́н чырво́нец прыно́сиць папу́. Здзиви́ўса по́п, атку́ль ґэ́то ў бѣ́днаґо зо́лато й дава́й выпы́тваць. Бѣ́дны ўсе й расказа́ў, як было́. От пахава́ли ў бѣ́днаґо чалавѣ́ка дзіця́. Сама́ пападзя́ з папо́м по́тым зайшли́ ў ха́ту к бѣ́днаму на пами́нки. То́лько по́зно разыш-ли́са ўсѣ́. Аста́ўса бѣ́дны чалавѣ́к адзи́н з жо́нкаю. Прышо́ў ґэ́то по́п дамо́ў и хо́чэтца ему́ атабра́ць ат бѣ́днаґо ґро́шы. Зарѣ́заў ґэ́то ен казла́, абверну́ўса ў казли́ную шку́ру, прыла́дзиў и ро́ґи да й пашо́ў у са́мую ґлу́пась к бѣ́днаму пад вакно́. Прышо́ў, высуну́ў у вакно́ ґалави́цу з раґа́ми й ка́жэ нѣ́мым ґо́ласам: „атда́й маѣ́ гро́шы“. Спало́хаўса бѣ́дны чалавѣ́к и атда́ў ґаршчо́к з ґрашы́ма. Ухапи́ў по́п абѣ́ручки ґаршчо́к и пабѣ́ґ дамо́ў. Прыбѣ́ґ, хо́чэ паста́виць ґаршчо́к на сто́л, да нѣ́льґа,—ру́ки прырасли́. Папро́бувала пападзя́ садра́ць з папа́ казли́ную шку́ру. Куды́ там! И шку́ра, й ро́ґи пры-расли́. Што ни раби́ў зави́дны по́п, ничо́ґо не ўра́дзиць. Прышло́со праси́ць бѣ́днаґо чалавѣ́ка, каб е́н забра́ў сваѣ́ ґро́ши. Сабра́лиса лю́дзи, дзи́вятца на папа́, а е́н то́лько казли́наю барадо́ю трасе́. Ось прышо́ў бѣ́дны чалавѣ́к и як узя́ў сваѣ́ ґро́шы, дак и шку́ра з папа́ звали́ласа, да не то́лько казли́ная, але́ й свая́. От яки́ быў зави́дны по́п.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

19. За добрае злым заплата.

Ішоў мужык у восень перад светам з ґумна ў хату. Гумно было далеко ат села, ноч цемная, хаць воко выкаль. Ускинуў мужык на плечы пусты мешок и цеп, закурыў люльку да й памаленьку сунетца, каб у пацемку на што не наткнутца. Заблудзиў мужык и пашоў у друґи бок. Насунуўса мужык на воўка й хацеў еґо малациць цепам. А воўк кажэ „лежачаґо не бъюць Бачыш, мене ўхапила пастка. Аслабани мене, мужычок“. Мужык аслабаниў воўка, бо й вораґа ў бедзе шкода. А воўк и кажэ „цепер я цебе заем“.— За што-ж ты мене зъеси?—пытае мужык,—я-ж цебе з беды вызвалиў?!—За добрае злым заплата,—кажэ воўк —Ну, кали так,— кажэ мужык,—хадзем и каґо сустренем, папытаемса й кали ен скажэ, што за добрае злым заплата, та таґды ты мене зъеси.— Добрэ,—кажэ воўк И пашли ены далей. Идуць ены да йдуць. От пачало свитаць. Бачаць, аж сланяетца ў хмызнику ґалодная, слепая кабыла. От мужык и пытае ее, ци праўда, што за добрае злым заплата.—Праўда,—кажэ старая кабыла —От, як я была маладая, здаровая да добрэ служыла свайму хаджаину, та таґды ен мене карmиў, даґлядаў, а як састаралаcа, упала на ноґи, дак от як ен мене даґлядае, што я падыхаю з ґоладу. Заўсюды за добрае злым заплата —Хацеў воўк зъесци, чалавека, але той атпрасиўса ещэ пачакаць да друґоґо разу. Идуць ены далей: ось валачэтца стары сабака. Зноў пытае мужык и сабаку, ци праўда, што за добрае злым заплата.—Праўда,—кажэ сабака,- бо пакуль я быў малады й добрэ служыў сваму хаджаину, датуль ен сяк-так ещэ мене кармиў и трымаў у дамоўцэ, а от, як я сапсеў да занеґож, дак ен и праґнаў мене з ачоў, и я здыхаю з ґоладу. Эгэ-ж, за добрае злым заплата.—Атпрасиўса мужык у воўка ещэ трэйци раз папытаць, каґо сустренуць. Идуць ены, аж и бежыць лис. Мужык и пытае еґо, ци праўда, што за добрае злым заплата.—А на што

табѣ ґэто знаць?—пытáе лис. И расказáў мужы́к лису, як éн вóўка з беды́ вы́бавиў и што éн за тóе хóчэ еґó зъѣсци.—Брэ́шэш,— кáжэ лис,—як ты, таки́ недóшлы мужы́к, да мóґ вóўка вы́бавиць, хадзѣм, цакажы́.—Пашли́ ены́ на тóе мѣ́йсцэ, залѣ́з вóўк у пáстку, а лис и кáжэ: „а ну, мужы́к, пакажы́, як ты малóциш“.·Даґадáўса мужы́к, замахну́ў цéпам да па вóўку, да па вóўку. Заби́ў мужы́к вóўка да й захацѣ́ласо ему прынесци́ бáбе ли́саву шку́ру, от éн як махнé цéпам да ли́су па ґалавѣ́. Лис и зви́ўса, тóльки ўспѣ́ў прашаптáць: „за дóбрае злым заплáта“, а мужы́к палажы́ў ли́са ў мѣх и папéр да ґаспóды.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ.

---

20. Брахня.

Бы́ў адзи́н таки́ пан, што штоб ему́ хто ни сказáў, та éн усé кáжэ, што прáўда, так. Хто ему́ ни хлуси́ў, нихтó не мóжэ так схлуси́ць, каб éн сказáў, што ґэто непрáўда. Вéльми люби́ў той пан слу́хаць кáски. Хлу́сиць ему́ хто яку́ю бáйку, а ѐн усé за кáждым слóвам кáжэ: „прáўда, так“. От захацѣ́ласо тому́ пáну пачу́ць таку́ю кáску, каб сказáць, што ґэто непрáўда; алé нихтó не мóжэ прыду́маць такóе кáски. Абецáў той пан даць жмéню зóлата тому́, хто скáжэ таку́ю кáску, каб пан не павѣ́рыў. Нашóўса адзи́н пъянчу́жка. Звáли еґо Ахрéмам. Ен свайґó хаджáйства не маў, бо бы́ў вéльми вели́ки ґультáй и пъя́ница. Пашóў Ахрéм к пáну казáць кáски. Дóўґо казáў Ахрéм пáну ўселя́кие бáйки, а пан усе кáжэ: „прáўда, так“. Кажэ Ахрéм,—от иду́ я да йду́ па вадзѣ́, а ракá шырóкая, што й бераґóў не бачнó, алé ось вы́скачыў з вады́ медзьвѣ́дзь, задрáў к вéрху хвóст да ка мнѣ́. Што тут раби́ць! Перш я схавáўса ў бабрави́ну, алé не мóґ там уседзѣ́ць, бо хтóсь наклáў на днѣ́ раки́ аґню́ й нараби́ў токóґо курóдыму, што дым вóчы выедáе, нáвед рыба пачалá пы́рхаць да чмы́хаць нóсам. Вы́лез ґэто

я з баб̆равіны, а медзьвѣдзь ка мнѣ... От я сунуў ему руку ў горло. Ен туды-сюды—тóлько хвастóм круцицъ. Засунуў ґэто я руку далей и ўхапіўса за хвост. От як убраў я за хвост, закруциў его на руку да як уперса, дак и вывернуў медзьвѣдзя трыбухами наверх. Тóльки равé медзьвѣдзь. а кусатца не можэ, бо зубы тырчаць ва ўсѣ стораны. — Праўда, так, — кажэ пан. — Пашоў я далей, аж бачу узсѣло на пчалу двананцать медзьвѣдзей. Я бѣґци да бѣґци, ратаваць пчалу. Бѣґ ад ранку да самаґо змроку. Тым часам медзьвѣдзи зъѣли пчалу, тóльки костачки асталиса. Прыставиў ґэто я пчаліные косци к хмарцэ да й палѣз на нéбо. Узлѣз на нéбо, пабачыўса з бацькам сваим да з дзѣдам. Падпайли ены мене трохи, й немагу я найци астроґи, каб злѣзци з неба. От убачыў я кучу мекины Давай ґэто я з мекины виць верёўку. Звиў верёўку, прывезаў еѣ за нéбо й спускаюса ўниз. Ось лециць матыль. Як махнé éн крылом, верёўка й парваласа, а я палецѣў у низ да й упаў у пекло.— Праўда, так,—кажэ пан. Зирнуў я ў пекле, аж чэрци на панськом бацьку смалу возяць, да ґадами падґаняюць — Хлусиш, галган!— крыкнуў пан —Не можэ таґо быць!—А кали пан не вѣрыш, та паґлядзи сам,– кажэ Ахрéм. Заплациў ґэто пан Ахрему жменю зо-лата да й ґодзи казки слухаць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

21. Вада памагла.

Жалитца адна маладзица, што ёй ат ґаспадара жытки нема: як тóлько сыдутца, та перш сваратца, клинутца, зневажаюць адно другоґо, а потым ґаспадар давай еѣ бицъ. И так нéмаль кожын дзень. Церпѣла, церпѣла маладзица й давай шукаць людзей, каб памаґли. Яких тóлько забабонаў и прымхаў ена не рабила,—ничоґо не памаґае, ещэ ґарей бъе ґаспадар; бо ен перш не пиў, а як пачаў з жонкаю калацитца, дак стаў пиць. Хадзила маладзица й

упрóщу, пасцúла й сѣм пяшниц, давáла ґаспадарý зельёў пиць— ещэ ґарéй идзé ў их калатня. От парáдзили людзи сходзúць ещэ к старэнькаму дзедкý, мóо ён што парáдзиць. Недалёко ат селá, калé паравóза жыў сабѣ той старэньки дзедóк. У лѣтку ен лавúў рыбу й перавóзиў у чóуне, камý трэ, цéраз рéку. За тóе емý давáли хлѣб и стрáву. Так и жывиўса сабѣ дзедóк. От прыхóдзиць к емý маладзúца й жáлитца на сваю бедý. Паслýхаў дзедóк и дáе ёй пляшку вадь.—На,—кажэ,—гэтае зѣлье. Як прыдзе ґаспадáр у хáту, ты наберы еґó ў рот, не каўтáй (ґлытáй), а так и дзержы ў рóце, та ґаспадáр и не бýдзе не тóлько биць, алé й зневажáць.—Падзякувала маладзúца й пашлá да ґаспóды. От як прышóў ґаспадáр у хáту, ена й набрáла ў рот вадь, трымáе й маўчыць. Так прайшóў адзúн дзень, другí, цéлая недзѣлька, а ґаспадáр и пáлцам не зачапиў её. Рáда маладзúца. Хвáлиць зѣлье, што даў дзедóк. Тóльки ось выйшла ўся вадá з пляшки. Зноў давáй ены сварытца да калацúтца. Удрýґае пашлá маладзúца к старэнькаму дзедкý, прóсиць, каб даў ещэ зѣлья. Даў дзедóк пляшку вадь. От и ўтрéйки прыхóдзиць маладзúца к дзедкý па вóду.—Эй,—кáжэ дзедок,—маладзúца, маладзúца, ци ты небáчыш, што ґэто прóстая вадá! Вадá, бáч, табѣ памаґлá, бо як ты наберэш у рот вадь, та й немажэш аскирзáтца, а маўчыш, як-жэ кажуць, бы вадь ў рот набрáўшы. От ґаспадáр хаць аблáе цебé, калú е за што, ты маўчыш и ён замаучыць. Вѣдаеш, што бáбу бьюць за язык. Кáжуць: за ґубý да ў ґубý. От идзúш,—кáжэ,—дзѣтки, з Бóґам да не напрыкрáйса свамý ґаспадарý, а лѣпш прамаўчы, та ўсé бýдзе дóбрэ.—З таѣ пары жывýць маладзúца з ґаспадарóм ладкóм и никóли не свáратца.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

22. Нашоў грошы.

Кали Бог дась, та й в акно падась.

Усѣ людзи кажуць, што на Купало ў ночы цвицé паперáць, и хто найдзе той цвѣт, той можэ з им найцí й узяць заклятые ґрошы. От на Купало зґаварылиса дзецюки йци ў лѣс, шукáць цвѣту паперáци. А ў тöм селѣ жыў адзин чалавѣк ещэ малады, алé разумны. Ен и не баґáты быў, алé не наракáў на Боґа: ґаравáў, маў кусóк хлѣба, никóґо не крыўдзиў, ниякаґо лиха ў еґó не былó на сéрцы, от éн и щасливо жыў. Прихóдзяць к емý дзецюкí й клíчуць иці шукáць ґрóшэй. А éн кáа: „чаґó я пайдý шукáць ґрóшэй? Калí Бöґ дась, та й вакнó падáсь“.—Ну, чакáй,—кáжуць дзецюкí,—пакýль Бöґ у вакнó падáсь!—А сáми й пашлí ў лѣс. Прахадзíли ены ўсю нöч—ничóґо не нашлí, тöльки стрáху нацерпѣлиса. Вѣдамо, нöчу на Купáло пóвен лѣс уселякаѣ нéчысци. Перш их чорт вадзиў па лѣсе, й ены не маґли трáпиць назáд к селý: трэйко падхóдзили к свайм ґýмнам, алé не пазнавáли сваѣ будбўли и знöў варóчалиса ў лѣс Пóтым стáла падмáньваць их якáясь нéчысь и чуць не завелá ў балóто й такýю нéтру, што насилу ены выбралиса. От чýюць ены, што за кýстам плáчэ дзицá. Ены туды, а енó ўжэ плáчэ дáлей. Ены йдýць дáлей, а енó зноў абзывáетца дáлей, мóо за крóкаў двáдцаць: ведзé их у ґущэчу да ў тхлань. Залѣзуць ены ў выжар па сáмае ґóрло,—таґды енó засмеѣтца, зараґóчэ, бы жарабéц и зникне. Мýчылиса ены ўсюсеньку нöчку, тöлько ось стáло свитáць. Бáчаць ены, што забилиса ў сáмую нéтру. Выбралиса ґэто ены аттýль, выхóдзяць на шлях и бáчаць, аж на дарóзе лежыць дóхлы сабáка.—А што,—кáжуць,—Паўлюк казáў, што калí Бöґ дась, та й вакнó падáсь; занесѣм ткалé емý ґэтаґо дóхлаґо сабáку.—Узелí ґэто ены таґó сабáку й паперли ў селó. Паўлюк жый у самöм канцы селá. Нöчка цéплая, аж пáрыць. Бáчаць ены, што

ў Паўлюка́ акно́ атчы́нено: от ены́ й упе́рли праз его́ до́хлаго сабаку Паўлюку́ ў ха́ту. Ки́нули ены́, але́ чу́юць, штось забраща́ло, бы ґро́шы разсы́пались. На за́ўтрэ пыта́юць ены́ Паўлюка́, што ему́ Бо́г пада́ў в акно.—Эгэ́-ж, дзя́куваць Бо́гу,—ка́жэ Паўлю́к.—пада́ў Бо́г це́лую то́рбу ґро́шэй. — Даґада́лиса таґды́ дзецюки́, што ены́ ўки́нули Паўлюку́ ў ха́ту не саба́ку, а то́рбу, зро́бленую з саба́чае шку́ры, по́ўную ґро́шэй. Пабо́жкали ены́, да нема́ чаго́ раби́ць. А Паўлю́к дава́й спажыва́ць ґро́шы.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

---

23. Грошы цвитуць.

Пашла́ ґаво́рка па селу́, што на бе́разе, кале́ раки́, ґдзе зда́ўна мно́го капцо́ў, ґро́шы цвиту́ць. Ка́жуць—ужэ́ ко́лько раз ба́чыли здале́ка, што на якомсь капцы́ ў но́чы ґары́ць аго́нь: але́ то́лько хто зхо́чэ падыци́ ближе́й, як той аго́нь и пату́хне. И пашла́ ґаво́рка, што ў капцо́х зако́паны заклятые ґро́шы; ены́ й цвиту́ць, хо́чуць, каб их хто вы́бавиў з земли́, бо мо́о й им ця́жко лежа́ць без дзе́ла. Дак от ґаво́рaць, што той и той ба́чыў, як цвиту́ць ґро́шы, але́ нихто́ не ве́дае, як их узя́ць. Ве́дамо, к заклятым ґрашо́м не́льга падступи́тца. Ка́жуць, адзи́н чалаве́к ужэ́ про́бував, але́ тако́го набра́ўса страху́, што чуць жыў прыбе́г да ґаспо́ды, да й пракача́ўса ў хо́ндзи недзе́ль з ше́сць. Але́ ось быў у нас лехча́й, зва́ли его́ Ничы́парам. Ма́быць ён тро́хи зна́ўса з уселя́каю пе́чысью, бо быва́ло пады́дзе к жарабцу́, паґла́дзиць его́ па аза́дку,—той и стайць, як уко́паны. Вы́лехчае ґэто Ничы́пар жарабца́, а той и не чу́е, ба́тцэ ґэто му́ха ўкуси́ла. То́льки адзи́н раз ка́жуць Ничы́пар таки́ наско́чыў на тако́го жарабца́, што як трапну́ў, дак у Ничы́пара зу́бы й вы́сыпались. Дак от Ничы́пар и наду́маўса ўзя́ць тые ґро́шы, што цвиту́ць кале́ раки́. Узя́ў ґэто ён залезня́к и пашоў шука́ць ґро́шэй. Ле́то. Но́чка хаць й це́мная, але́ це́плая, ци́хая. То́лько

Ничыпар вышаў за село́, ба́чыць, аж кале́ ракі́ штось свѣ́цитца от бы ґарыць аґе́ньчык, тӧльки си́ним по́ламьем. Су́нуўса Ничыпар туды́, а тут пе́рад им што́сь коцитца чо́рнае, бы капа́; прыкаци́ласо пад са́мые но́ґи да як разсыплетца, дак тӧлько и́скры ґара́ць на травѣ́. Пашо́ў Ничыпар да́лей. Атку́ль не вазмі́са цѣ́лая чарада́ ваўко́ў, от так и са́дзяць на его́. Дава́й ґэто Ничыпар маха́ць залязняко́м, наси́лу атби́ўса. От падхо́дзиць ен к капцу́ й тӧлько чапну́ў залязняко́м земли́, аж як заґрымаци́ць штось, як разсту́питца земля́ да выскачыць атту́ль якое́сь страшылищэ: ў Ничыпара й дух заняло́. Ки́нуў ен залязняк да як суну́ў да ґаспо́ды, дак и саба̀ками не даґо́ниш. Прыбѣ́ґ, дрыжыць, бы аси́на. Таки́ хо̃ндзю схапи́ў, а як вычухаўса, дак дзися́таму заказа́ў, як хадзи́ць шука́ць закля́тых ґро́шэй. Дак от и да ґэтае пары́ нихто́ не вѣ́дае, як падступи́тца к тым ґрашо̃м.

Пересказалъ Рѣдкiй.

С. Б. Рожинъ.

24. Заламка.

У ко̃ждум селѣ́ е сво̃й ведзьма́р, але́ ў ваднӧм до́брэ зна́етца, а ў друго̃м—бо̃льш чму́цицъ. Вѣ́дамо, кали́ ба́цько быў ведзьма́р, та пе́рад смерцю е́н и сына на́ўчыць таму́, што сам умѣ́ў. Пры жыццю немо̃жна друго́ґо наўчыць, бо сам не бу́дзе мацъ мо́цы. Эґэж. Дак я ку, што ведзьмары́ е ў ко̃ждум селѣ́. Ены́ шэпчуць, лѣ́чаць, атрабля́юць уселя́кую хваро́бу, або́ неща́сце. Людзи баятца их, ґо́дзяць им. От быў таки́ ведзьма́р. Еґо́ зна́ли не тӧлько ў сусѣ́дних се́лах, але́ мо́о ў це́луй акру́зе. Гэто быў таки́ вели́ки ведзьма́р, што е́н усе́ знаў. Нихто́ не смѣ́ў ему́ сказа́ць наперако̃р, так еґо́ бая́лиса. Тӧлько быў там адзи́н чалавѣ́к; ен мно̃ґо па свѣ́ту хадзи́ў: ка́жуць—быў аж у кралѣ́ўцу. От ґэты чалавѣ́к не бая́ўса ведзьмара́ й усе́ каза́ў, што е́н тӧлько чму́цицъ. Але́ ему́ не вѣ́рыли. От той чалавѣ́к пашо́ў у свае́ жыто й зраби́ў там за́ламку.

Цéраз недзѣ́лю, а мóо й дзвѣ́ прыхóдзиць к таму́ ведзьмару́ й прóсиць, каб éн вы́рваў тýю зáламку. Пашли́ ены́ на пóле. Падышóў ведзьмáр к зáламцэ на шаѓóў двáдцаць да й кáжэ, што не мóжэ йци дáлей, такáя мóцная зáламка Скинуў ѓэто éн наѓави́цы й сарóчку да так, як мáци радзи́ла й папóўз к зáламцэ рáкам. Паўзé й усé стóѓне, што вéльми мóцно ўдзѣ́яно. Маўчáў ѓэто, маўчáў той чалавѣ́к, а як падышли́ другі́е лю́дзи, ўзсѣ́ў на ведзьмарá вéрхам, дастáў з пад палы́ ѓарáпник да дави́й палóсуваць ведзьмарá.— От-жэ я табѣ́, хварéць,—кáа,—тваей мáтары, пáкажу́, як мóцно ўдзѣ́яно, бо ѓэ́стую зáламку я зраби́ў сам.—Равé нѣ́мым ѓóласам вѣ́дзьмáр, а той еѓó лýпиць. Биў-биў, пóкуль здавóлиўса да й пытáе:—а што,—кáа,—не бýдзеш бóльш дóбрых людзéй чмýциць?— Не бýду,—прóситца ведзьмáр,—тóлько пусци́ жывóѓо.—Пусци́ў той чалавѣ́к ведзьмарá. Усхапи́ўса ѓад, забы́ў и сарóчку й наѓави́цы апранýць да так и сунýў наўцекачá. Падзиви́лиса лю́дзи, дýмали перш, што ведзьмáр таѓó чалавѣ́ка з свѣ́ту зжывé, алé бáчаць, што той чалавѣ́к жывé сабѣ́ й не лыс, пачали́ ѓавары́ць, што мáбыць той чалавѣ́к мацнѣ́йшы áт ведзьмарá, кали́ так з еѓó накпи́ў. Гóдзи ведзьмáр з таѣ́ пары́ чмýциць. Алé не дóўѓо жыў, бо вéльми еѓó збиў той чалавѣ́к. Дак от яки́е е ведзьмары́.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

25. Што майстар, та злодзей.

Жыў сабѣ́ адзи́н пан. У еѓó былó мнóѓо маéнткаў, мнóѓо паддáных Баѓáты быў пан. Мало éн жыў у маéнтках, а ўсé ѣ́здзиў за ѓрани́цу. Маéнтками рóндзили камысáры да акамóны. Набрáў пан з селá хлопцаў и отдáў их у Аршáву, а мóо й за ѓрани́цу вучы́ць каѓó на шаўцá, каѓó на краўцá, альбó ры́мара, каѓó на стальмахá, каѓó на кавалé. Вернýлиса ты́е хлóпцы па наўцэ й рóбяць усé на пáна. От вернýўса раз пан, прызвáў тых майсцербў и пы-

та́е, што ены́ наўчы́лиса й што маґу́ць рабі́ць. А ены́ ка́жуць, што ўсе́ маґу́ць. Рад пан, што ў еґо́ е сваѣ́ майстры́. Ён, ба́чыце, ду́маў, што его́ падда́ные ничо́ґо неўмѣ́ють рабі́ць. Сам е́н, вѣ́дамо як пан, ничо́ґо неўмѣ́ў. От узду́маў той пан жани́тца, Знайшо́ў сабѣ́ харо́шую, маладу́ю пане́нку, а сам ужэ́ си́вы, стары́. Не спадаба́ўса ей стары́ пан, але́ ба́чыць, што ў еґо́ мно́ґо мае́нткаў— пашла́. От жани́ўса пан и паѣ́хаў з жо́нкаю за ґрани́цу. Ци до́ўґо, ци ко́ратко ены́ ѣ́здзили, то́льки па́ни не дае́ па́ну, да й усе́.— Нема́,—ка́а,—ў мене́ таґо́, чаґо ты хо́чэш —Ну, до́брэ,—ка́жэ пан, — у майх маентках е таки́е майстры́, што ены́ ўсе ўмѣ́ють рабі́ць.— Прыѣ́хали ґэ́то ены́ ў мае́нтак, от пан пазва́ў майстро́ў и пыта́е, ци зро́бяць ены́ па́ни то́е, што трэ́э. Адзі́н ґо́жы, малады́ ма́йстар и вызва́ўса зрабі́ць усе́, што трэ́э, то́лько просиць у па́на матаря́лу. Дае́ ему́ пан уселя́каґо матаря́лу, атво́дзиць ему́ у пако́ях мѣ́йсцо кале́ па́ни, каб то́лько е́н скаре́й рабі́ў. Пашо́ў той ма́йстар к па́ни. Паґлядзѣ́ла па́ни на ґо́жаґо ма́йстра. Спадаба́ўса е́й ма́йстар и дава́й ены́ рабі́ць ра́зам. Прахо́дзиць недзѣ́ля, а мо́о дзвѣ́. Ро́биць ма́йстар, што хо́чэ. От здаво́лилиса ены́, таґды́ ма́йстар и ка́жэ па́ну, што зрабі́ў. Даў пан ма́йстру ґасци́нца и велѣ́ў ему́ жыць у пако́ях и рапарава́ць па́ню, кали́ трэ́э бу́дзе. Ось на други́ дзень прызва́ў пан майстра да й ка́жэ: „але́ што ма́йстар, та зло́дзей; я табѣ́ даў це́лую бабро́вую шку́ру, а ты уста́виў па́ни то́лько кусо́чак“.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ

26. Скорам.

Атслужы́ў маска́ль мо́о ґадо́ў два́дцаць и варо́чаўса ў сваѐ село́. Вѣ́дамо, даўнѣ́й чаґу́нки ещэ́ не было́, й маска́ль ишо́ў пѣ́шки. До́ўґо е́н ишо́ў, мо́о недзѣ́ль ше́сць, але́ от ужэ́ падышо́ў бли́зко к ро́днаму селу́ Прыту́паўса маска́ль, не мо́жэ йци́ да́лей и занача-ва́ў е́н у адно́м селѣ́. От пасадзи́ли маскаля́ вечэ́раць, паста́вили ква́рту гарэ́лки. Вы́пиў маска́ль, пасилкава́ўса тро́хи й пача́ў рас-

ка́звацъ, як служы́ў, ґдзѣ што ба́чыў. Вѣ́дамо, маска́ль, хлусі́ць до́брэ ўмѣе. Стаў е́н выхваля́тца, як ему́ до́брэ было́ пад кане́ц, як е́н быў у аднаґо́ ахвице́ра, як ему́ ахвице́ры падвы́пиўшы жме́няю дава́ли ґро́шы. Часту́е хаджа́ин маскаля́, а той ужэ́ й так асалавѣ́ў. Вѣ́дамо, што ў цверо́заґо на мы́слях, то ў пъя́наґо на язы́цѣ́. Выхваля́етца маска́ль, што мно̆ґо нажы́ў ґро́шей и паказа́ў маґалѣ́йку з чырво̆нцами. По̆зно ены́ каля́кали, аб усе́м ґамані́ли, паку́ль маска́ль зсу́нуўса з ла́вы й захро̆п. Паза́рыўса хаджа́ин на маскале́вы ґро́шы й, як усѣ́ леґли́ спаць, падкра́ўса да й заре́заў маскаля́. Но́ч—ма́ци. Нихто́ не чуў и не ба́чыў, як хаджа́ин вы́цяі маскаля́ ў канец села́ да й запе́р еґо пад мо̆ст. Ста́ў е́н разбира́ць маскале́ў клу́нак, ба́чыць, аж там мно̆ґо пиражко̆ў з мя́сам. От е́н вы́нес ґэ́тые пиражки́ да й пихну́ў на ву́лицы пад мо́сцик, от якура́т пе́рад сва́ею седзи́баю, бо ўжэ́ нѣ́льґа было́ несци́ да́лей—ужэ́ свита́ло. Заґи́б маска́ль, як ка́жуць, прапа́ў и щу́рачки не пашли́. Прайшло́ дзе́н пяць и заґамани́ли лю́дзи, што ба́чыли як ишо́ў маска́ль да ґаспо̆ды й ґдзѣ́сь заґи́б. Дачу́ласо нача́лство, и пачали́ таґо́ маскаля́ шука́ць. Саґна́ли людзе́й, абшука́ли лѣ́с, бало́то. Прапа́ў маска́ль, як ка́мень у во́ду. То̆льки ось ґуля́ли на ву́лицы дзѣ́ци, пэрасыпа́ли песо́чак; ба́чаць ены́, што свине штось вы́рыли з пад мастка́. Сышлиса лю́дзи, зирну́ць, аж там маскале́вы пиражки́ з мя́сам. Пачали́ дапы́тватца да дашу́кватца й дайшли́, хто забі́ў маскаля́. Пэратрасли́ таґо́ хаджа́ина, ґдзѣ маска́ль начава́ў, и нашли маскале́во дабро́. Нема́ чаґо́ запира́тца, прызна́ўса той хаджа́ин и паказа́ў, куды́ маскаля́ схава́ў. Закава́ли ґэ́то таґо́ хаджа́ина ў кало̆дки да й павели́ ў вастро̆ґ. Там и пыта́юць, нашто е́н схава́ў пиражки́ пад мо̆ст, а е́н и ка́жэ: „Ба́чыце, пиражки́ з мя́сам, а была́ серада́, ско́рам ѣ́сци мя́со, от я й запе́р скаро̆мные пиражки́ пад масто́к“.—Дак ты бая́ўса ґраху́ ѣ́сци ў се́раду скаро̆мнае, а не бая́ўса ґраху́ забі́ць чалавѣ́ка,—ка́жуць ему́. Не вѣ́даю, так ка́жуць, мо̆о была́ й пра́ўда.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

27. Мужык, пан и ксёндз.

За штось пан вельми абазлиуса на ксендза От и захацѣласо ему накпиць над ксендзом, але так накпиць, каб ксендз не даѓадауса, хто ѓэто так зрабиу. Думау, думау пан, ничоѓо не прыдумае. Седзиць пан сердзиты да тольки вусы кусае. Тым часам прыходзиць к ему мужык. Бачыць мужык, што пан вельмо моцно штось думае, да не можэ аѓарнуць сваею паньскаю ѓалавою й захацѣласо ему памаѓци пану сваим дурным мужыцким розумам. — Памаѓай Боѓ, паночку! — Кажэ мужык, и целюх пану у ноѓи. — Табѣ што? — Пытае пан. — Паночку дараѓеньки! — кажэ мужык, — пан штось думаешь вельми моцно; скажы мнѣ, моо я памаѓу сваим дурным мужыцким розумам, — и плюсь пана у руку. — Што ты — каа — паможэшь! мнѣ трээ накпиць над тым галганам ксендзом. — Добрэ, паночку. Заутрэ пан пабачыць, як я накплю над ксендзом. — Ну ѓлядзи, кали добрэ зробиш, та заплачу, а кали нѣ, та зъеси бизуноу. — Слухаю — кажэ мужык, и пашоу на реку. Налавиу ѓэто мужык ракау, папрыклейвау им свѣчачки, папускау ракау у саду перад ксендзоуськими вокнами да й пазапальвау свѣчачки. Поузаюць раки. Вечар цихи, як у вусе. Гараць свѣчачки у травѣ, бы зорки. Падышоу мужык пад вакно и кличэ ксендза. — Хто там? — пытае ксендз. — Анял з неба. — А чаѓо ен прышоу? — Па ксендзоуськую душу. Велено еѣ атнесци у небо. — Рад ксендз. Атчыниу ен акно, зирнуу, аж у травѣ ѓарацъ свѣчачки, бы зорки. Павѣрыу ксендз да й высунууса у вакно. Мужык падставиу мѣх, а ксендз шусь у мѣх. Ускинуу мужык мѣх на плечы и папер у свинушник, кинуу там мѣх з ксендзом и запер дзверы. На заутрэ, ужэ сонейко высоко, мужык пашоу к пану й просиць, каб пан прадау ему парсюка. От пан и пашоу з мужыком к свинюшнику, паѓлядзѣць парсюка. Падходзяць ены туды. Скрыѓичуць свине у свинюшнику, аж дзверы ѓрызуць. От атчынили дзверы; выбеѓли свине; зирнуць ены

ў свинюшник, аж там седзиць у вуглѣ ксендз у аднôй сарочцэ, чуць жыў ат страху.—Чаго гэто,—пытаетца пан,—сюды забраўса ксендз дабродзей?—Маўчыць ксендз зубы сцяўшы, так ему сорам. Пасмеяўса пан и даў мужыку мнôго грошэй.

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы

28. Радзинки й паминки.

Пашôў адзин чалавѣк у свѣт. Дôўго ен ходзиў, мнôго бачыў уселякаго дзива на бѣлôм свѣце. Мнôго ен обышôў краеў, мнôго бачыў уселяких людзей. Усюды людзи родзятца, жывуць и памираюць; усюды часам плачуць, а часам скачуць; усюды е людзи дôбрые й лихие. Тôлько ўсюды людзи трымаютца свайго абычая. Прышôў ен у вадну вэску да й заначаваў. Тôлько ось даў Бôг дзень, усхапиўса ен, з прасоня да й не разшалопае, чаго гэто ўсѣ ў хаце плачуць. Перш ен думаў, што мôо хто памер, абô друге якое нещасце, да й пытаетца, чаго гэто ены так галосяць. А ему й кажуць, што затым плачуць, што радзиласо дзиця, от ены аплакваюць его долю, бо невѣдаюць, што его ў жытцы стрене. — У нас,—кажуць,— таки звычай, што заўсюды плачуць, як хто родзитца. Падзиваваўса той чалавѣк да й падумаў, што мôо гэто й праўда, бо невѣдамо, якая будзе, жыдка гэтаго дзицяци. Але ось на други дзень прахапиўса той чалавѣк да й чуе, што ўсѣ спеваюць, скачуць да гасцюють, як на весѣли. Ен и знôў пытае, чаго ены так веселятца. А ему кажуць, што памерла маладзица, от ены й рады, паюць, скачуць, веселятца, што ена пережыла гэтую цяжкую жытку.—Як тут не веселитца,—кажуць ему,—кали гэтая маладзица ещэ мало бачыла беды на сваем веку; а цепер, як памерла, та й неўбачыць. У нас усѣ веселятца, скачуць, пѣсни паюць, як хто ўмрэ.—Думаў, думаў той чалавѣк, а потым и дагадаўса, што гэто праўда Вѣдамо, якая наша слимазарная жытка: часам лѣпш памерци, як гэ жыць.

Пересказалъ Грышко Бондаръ.

Дер. Чудинъ

29. Ведзьмак.

Мо̆о знáеце, от там калé стáва ещэ й цепéр тырчáць з вады́ пáли. Кóлись ґэто быў млын. Харóшы быў млын, малóў чуць не крýґлы ґóд. У млынѣ, вѣдамо, заўсюды чэ́рци жывýць, а ў ґэтум их так мнóґо ўплюнуласо, што бывáло ў ґлýпась нихтó не смѣў и блйзко падыцú к млы́ну. То̆лько адзúн мéльник ничóґо не баяўса й цóнгле жыў у млынѣ. Да чаґó емý бая́тца, калú éн даўнó з чарця́ми знáўса да су селя́каю гэ́таю нéчысцью. Еґó й бáцько быў дóбры ведзьмáк, наўчыў сы́на з малéнства. Алé куды́ бáцьку да сы́на! Як падрóс Ничы́пар, дак скóро бацька зґураваў. Раз ены́ чуць зубáми не ґры́злиса, ўсе спóрыли, хто з их мацнѣйшы, алé нарэ́шце бáцько здáўса, убáчыў, што сын бо̆льшы ведзьмáр. И бая́лиса-ж Ничы́пара не то каб то̆лько ў сваéм селѣ, алé й на дзéсяць миль круґóм. И чаґó то̆лько ен не рабúў! Насылáў и хварóбу, и пóжар, и ґóлад, и памо̆рак на людзéй и на ґаўя́до. Дашóў да таґó, што пачáў камéндаваць и вѣтрам, и сóнейкам, и дажджóм, и паґóдаю, и цеплóм, и марóзам. Церпѣли лю́дзи, маўчáли,— бая́лиса. Нáвет и бóязно малúлиса Бо́ґу, каб паслáў на еґó якú нéбудзь канéц. Алé ось раз усхадзúласа вéльми велúкая хвúля. Мно̆ґо ена дзеро̆ў з карéнем павыдзирáла, паламáла такúе дубы́, што мо̆о ены́ ўжэ прастая́ли кóпу веко̆ў. Спужáлиса лю́дзи, думали, што прышóў канéц свѣту. Алé ось памалéньку нéбо прачы́сциласо и трóхи супакóиласа хвúля. Вы́сунулиса лю́дзи з паґрабо̆ў, зирнýли, аж млын хвúля пераверну́ла. Спалóхалиса, што цепер Ничы́пар са злóсци ещэ ґарéйшае лúхо пашлé, алé бáчаць, аж з Ничы́пара й дух вы́перло. Рáды тые лю́дзи. Скарéй пахавáли Ничы́пара й дýмали, што тут емý капцы́. Алé то̆лько ось пришлá но̆ч, ґлядзя́ць, аж éн устáў з дамавúны да и хóдзиць па падо̆канью. Спалóхалиса лю́дзи ещэ ґарéй, бая́тца й з хáты вы́сунутца. Недзѣль дзвѣ хадзúў Ничы́пар и мо̆о хадзúў-бы й бо̆льш, каб лю́дзи не даґадáлиса прыбúць еґó асúнавым калóм. Раскапáли ены́ маґúлу, аткрывáюць

дамавину, бачаць, аж Ничыпар лежыць мордаю ўткнуўшыса ў землю. От ены й прыґваздавали еґо асинавым калом, а вочы засыпали прыскам, каб ничоґо не бачыў. От тólько з таѣ пары ўжэ больш не пашоў Ничыпар палохаць добрых людзей.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

30. Мужык и жыд.

У баґатаґо жыда-ландара служыў сабѣ адзин мужык-пьянчужка парабкам. Мбо затым ен и пиў, што нѣльґа было ўзбитца на своѣ хаджайство. Што ни рабиў Янко, ничоґо не зробиць, ґрошэй не нажыве, бо ландар то лишнюю кватэрку заличыць, та за новые, але ґнилые аборы здзерэ два злотых, та за лаплены кажушак заличыць тры рубли. От так усе наровиць, каб заўсюды Янко ўперод забраў плату за службу. Думаў, думаў Янко, як ему выбратца з лап паґанаґо жыда, перш пиў, а потым штось надумаўса. Было ґэто ў лѣтку. Пасылае ландар Янка ў сусѣднее село к ландару-ж з картаю. Трээ было Янку перайци реку бродьки. Узяў ґэто ен узапас адзежку, кинуў на беразе сваю старэнькую сермяґу й дзиравую шапку, а сам апрануўса ў новую свиту, надзѣў брыль и пашоў у сусѣднее село к сваму свату. Праґасциў там Янко тры дни й прыходзиць к свайму ландару. А той думаў, што Янко утапиўса. От вечарком, як никоґо не было ў карчме, Янко прачыниў дзверы й сунетца просто к сталу. Ландар стаяў пры сценѣ й малиўса Боґу, да як убачыў Янка, дак так спужаўса, што не можэ вымавиць и слова. Ачухаўса трохи Лейзар и пытае Янка, аткуль ен прышоў.—Аткуль! Вѣдамо аткуль. З таґо свѣту,—кажэ Янко. Ландар, бачыце, думаў, што Янко утапиўса ў рацэ, як перахoдзиў еѣ бродьки. Давай Лейзар пытаць Янка, ци не бачыў ен на том свѣце еґо бацька й матки.— Чаму не бачыў? Бачыў. На тваем бацьку чэрци смалу возяць. Ен

прасиў, каб ты прыслаў ему́ ко́ней. Ма́тка-ж прасила, каб прысла́ли ей перы́ну. бо ена́ спиць на цвикох, набитых у дошку, й ходзиць суздро́м го́лая.—Даў гэто Ле́йзар Янку пару самых лѣпших ко́ней. а жыдо́ўка но́вую перы́ну да ўселякаго адзѣня. Паѣхаў сабѣ Янко ў местэчко, прада́ў усе́. а на тые гро́шы дава́й сабѣ спраўля́ць хаджа́йство. Заве́ў гаспада́рку, але́ ось сустракае его́ Ле́йзар.—А што,—пытае,—ци атда́ў ко́ней?—А як-же? Атда́ў.—А не хлусиш?—От ещэ што! Але́ тые ко́ни падо́хли. Ба́цько твой прасиў ещэ.—Даў ещэ Ле́йзар пару ко́ней и дава́й цикава́ць, куды их Янко паведзе́. А Янко адре́заў у ко́ней хвасты й заткнуў их у зе́млю кале́ сама́ѣ карчмы́, а ко́ней паве́ў на кирмаш прадава́ць. Вышаў Ле́йзар за ка́рчму, ба́чыць, аж пра́ўда: Янко паѣхаў на той свѣт, то̆лько ко̆нские хвасты тырча́ць. Шко́да ста́ло Ле́йзару ка́ней. Пацёг ён за хвасты й вырваў их з земли.—Ой гиву́лт! хвасты атарва́лиса,—ка́жэ Ле́йзар.—А Янко спажы́ў ко́ней, зраби́ўса гаспадаро́м

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

31. Як жиды школу будавали.

Даўно, ве́льми даўно́ гэто было́. Ма́быць таго́ не памета́юць на́шы ни дзеды́, ни пра́дзеды. Мнѣ ко́лесь разка́зваў старэньки дзѣд, а ён ка́жэ ащэ бла́знам чуў ат свайго́ пра́дзеда. Ащэ ў на́шо̆м краю не было́ гэтаѣ по̆гани—жыдо̆ў. Дак ось чорт нахапаў гдзѣсь цэлыхъ дванаццаць жыдо̆ў и прывало̆к их у наш край на прыпло̆дак.

Вала́ндаютца парха́тые, бы тру́тни; рабиць ничо̆го не ўмѣюць. Сабра́лиса ўсѣ кага́лам и дава́й гергета́ць, як збудава́ць шко́лу. Гергета́ли ены́, гергета́ли—нѣ, без це́сли ничо̆го не зро́бяць. Дава́й ены́ шука́ць це́сли.

Быў там пьянчу́жка Ива́нчык; ён да ў сяго́ здо̆лны: што ни

во́зьме, ў́се́ зро́биць да ў́се́ смее́тца да ке́пики стро́иць. А кали́ ў́жэ̇ запье́ бывало Ива́нчык, дак не прасыпа́етца недзѣ́ль дзвѣ́.

От жыды́ падпайли Ива́нчыка, е́н и ў́зя́ў́са будава́ць школу. Це́лую недзѣ́лю пиў́ Ива́нчык, а як тро́хи праспа́ў́са, паве́ў́ жыдо́ў́ у лѣ́с выбира́ць дзе́раво. Иду́ць жыды́ праз лѣ́с, ажно́ пе́рад и́ми паля́нка, а на е́й цвице́ ґрэ̇чка.—Ива́нчык, до́бры чалавѣ́чак—крыча́ць жыды́,—мо́рэ̇, як ми папливо́м?—Э, хваре́ць ва́шуй ма́церы[1]—ка́жэ̇ Ива́нчык,—ґэ̇тож ґрэ̇чка, ала́дки бу́дуць.—Иду́ць ены́ да́лей и падхо́дзяць к раце́.—Ива́нцик, рака́,—як нам перараплы́ць?—Онь каладзье́ плыва́е,—ка́жэ̇ Ива́нчык,—садзѣ́цеса да й плывѣ́це.—От са́мы разу́мны жыд—е́н усе́ над бу́бляю седзѣ́ў́—аседла́ў́ кало́ду да й но́ґи прывеза́ў́ к е́й, каб не свали́тца. То́льки атапхну́ли жыды́ кало́ду ат бе́раґа, як ена́ перакруци́ласа ра́зам з жы́дам, то̄льки но́ґи тырча́ць з вады́.—Глядзи́,—ка́жуць парха́тые,—яки́ Ицко разу́мны: ещэ̇ ре́ку не перапплы́ў́, а ў́жэ̇ панчо̄хи су́шыць.—А Ицко то̄лько наґа́ми дрыгае, чуць не захлебну́ў́са, каб еґо́ Ива́нчык не вы́цяґ. Сня́ў́ Ива́нчык наґави́цы, ў́ски́нуў́ их на плѐчы й паве́ў́ жыдо́ў́ убро̄д. Сам е́н до́брэ̇ зна́е, як прайци́, а жыды́ папа́ли ў́ са́мы вир и таки́ напили́са вады́. То̄льки ены́ вы́лезли на бе́раґ, ось два жыды́ як шабулды́хнутца ў́ бабрави́ну, наси́лу их Ива́нчык вы́цяґнуў́. Пашли́ ены да́лей, а ту́т нахапи́ласа но̄ч. Зраби́ласо ў́ лѣ́се це́мно, хоць во́ко вы́каль. Баятца жыды́, каб каґо́ чорт не ў́хапи́ў́, а тут ещэ̇ их пужа́юць со́вы да еляки́.—Ива́нцик, до́бры чалавѣ́чак,—про́сятца жыды́,—палажы́ ты нас на́нач, каб нам мя́ґко було́, як на перы́не. Насцеґа́ў́ Ива́нчык сухо́ґо ело́ваґо верша́льнику, пакры́ў́ еґо́ вѣ́тками и кажэ̇: „ну, лаже́цеса“, а сам атышо́ў́са, накла́ў́ аґню́, паґрава́етца сабѣ́ да на ражэ̇ньчыку са́ло печэ̇. Разлеґли́са жыды́ на ламу́, а пастырча́ки як зако́люць им у бо́ки; жыды́ як падни́муць кры́к да зраби́ли таки́ ґарми́дар, што Ива́нчык падышо̄ў́ к им з па́плискаю й ка́жэ̇: „чаґо вы раскрыча́лиса, хи́бо каґо́ чорт ухапи́ў́“? и дава́й личы́ць ихъ па́плискаю.—Раз жыд, два жид,—да заў́ся́ким ра́зам як пераця́ґне жы́да па́плискаю. Кру́-

цятца жыды́, бы вьюны́ ў ґаршку́. Личы́ў, личы́ў Іва́нчык да й ка́жэ. „не круцѣ́цеса, бо нѣ́льґа личы́ць", и зноў пачына́е з пача́тку. Здаво́лиўса Іва́нчык, —усѣ́—ка́а: стаў и дава́й заку́рваць лю́льку.

— Іва́нчык, до́бры чалавѣ́чак — про́сяць жыды́, — палажы́ нас так, каб мы ўсѣ́ ў сера́дзину были́. —До́брэ—ка́жэ Іва́нчык и павѣ́ў жыдо́ў к велі́зазнаму муравейнику, разґро́б еґо́ й палажы́ў жыдо́ў усих ра́зам ґалава́ми, а сам пашо́ў к аґню́. То́льки е́н атышо́ў, як закрыча́ць жыды́, што вѣ́льми бло́хи куса́юць. А ґэ́то им так задали́ ды́хту мура́шки. Пашо́ў Иванчык у дру́ґае личы́ць жыдо́ў паплискаю, каб вѣ́дать, ци не ухапи́ў каґо́ чорт Паличы́ў — усѣ́ жиды́. Чэ́шутца жыды́, як у каро́сце, и про́сяць Іва́нчыка, каб е́н палажы́ў их на пала́тки, ґдзѣ́ нема́ бло́х. Павѣ́ў Іва́нчык жыдо́ў к адру́, пршста́виў астро́ґу й сказа́ў, каб ены́ лѣ́зли наве́рх. Паўзла́зили жыды́ на адзе́р и леґли́ спаць, а Іва́нчык атки́нуў астро́ґу да й пашо́ў к аґню́.

Спяць жыды́ на адры́, ра́ды, што бло́хи не куса́юць От ужэ́ й даў Боґ дзень; со́нейко падняло́со з-за лѣ́су, начына́е прыпѣ́кацъ. Ужэ́ пара́-б жыдо́м и снѣ́дать, а тут з адра́ нѣ́льґа злѣ́зци.—Іва́нчык, до́бры чалавѣ́чак—крыча́ць ены́—пада́й астро́ґа.—А Іва́нчык пражэ́ сабѣ́ са́ло на ражэ́ньчыку да маўчы́ць, як вады́ ў рот набра́ўшы Крыча́ли, крыча́ли жыды́—нихто́ не обзыва́етца. Ѣ́сци хо́чэтца, а нема́ чаґо́. Ба́чаць ены́—на адры́ улья́: от и захацѣ́ласо им мѣ́ду. Выняли ены́ з у́лья снѣ́д и до́ўжэнь,—аж шаршни́ як высыплюць з ву́лья да пачну́ць ихъ куса́ць. Пу́каютца жыды́ ат бо́ли, кача́ютца на адры́, а ўцека́ць не мо́ґуць — нема́ астро́ґи От, як тро́хи шаршни́ ўтаймава́лиса, са́мы разу́мны жыд-Бо́рух и ка́жэ: „я вазьму́са за адзе́р, а ты, Шлѣ́ма, беры́са за мене́, Ицко дзержы́са за Шлѣ́му, а Сро́ль за Ицка, таґды́ Ха́им да земли́ даста́не" Пабра́лиса жыды́ адзи́н за друґо́го, але́ Бо́рух як атарве́тца — от усѣ́ й палецѣ́ли на зе́млю. Нарабили жыды́ тако́го кры́ку, што ўжэ́ Іва́нчык не выщерпѣ́ў, шко́да ста́ло, и прышо́ў туды́.

Папра́вилиса тро́хи жыды́, и павьѣ́ў их Іва́нчык рабиць клины́

Нарабили ены клинбў мóо з вôз. Таѓды Иванчык велѣў им дóшки биць. Узберўтца жыды на дзéраво, зсекўць верх и давай биць ѓэтае дзéраво на дóшки: забиваюць свéрху клины, а друѓие жыды стаяць пад дзéравам да памаѓаюць—за ўсяким рáзам кáжуць „ѓак"! От як забьюць свéрху клины ў сук, та ены й лецяць у низ да жыдôм па ѓалавах.—Ой, гивáлт!—крычáць жыды,—Иванчык, дóбры чалавѣчак, клины узѓулялиса. — Паразбивали жыды сабѣ ѓóлавы. не выбили ни ѓóднаѣ дóшки и пашли дáлей. Идўць ены да йдўць и ўбилиса ў такую нéтру, што й свѣту Божаѓо небачнó. Прóсятца жыды, каб Иванчык вывеў ихъ з ѓэстаѓо пéкла. Павьеў их Иванчык у балóто. Сам скáчэ з кўпины на кўпину й не лыс, а жыды непападўць на кўпину, да ўсе шабóўсь у ѓразь: вымазалиса, як чэрци. Друѓи чуць не захлебнўўса ў баѓне. Падвóдзиць Иванчык жыдôў к лазѣ. Вѣдамо, лаза паѓнўўшыса расцé. Што стўпиць жыд на лазину, щакаўзнéтца наѓá, а жыд плясь у гразь Насилу пархáтые выбралиса з лазы. Дóўѓо валачылиса жыды па лѣсе, якóе беды ены не бачыли, яких стрáхаў не надрыжáлиса! Камарэча, авады й уселяки ѓнюс вóчы им павыедали. Зжáлиўса Иванчык и збудаваў жыдôм халўпу. Абжылиса трóхи жыды, акрыяли пархáтые й знóў слепицаю лѣзуць Иванчыку ў вóчы, каб ен будаваў шкóлу. Не слўхае Иванчык, да ўсé кпиць з жыдôў.—Ну, кали ён так — кáжуць жыды — накóрмим еѓó гўгелям, та ён не бўдзе мужыкóм, трáсца еѓó мáцеры. — Накармили ѓэто жыды Иванчына гўгелям, палажыли еѓó ў сваéй халўпцэ на перыны й дзвéры падпéрли калóм. Лежыць Иванчык да ўсé óйкае, што еѓó абкармили.—А што, ци дóбрэ табѣ нас не слўхаць—кажўць жыды.—Ой, ой!—крычыць Иванчык,—тôлько вы накармиўшы гўгелям, не вазѣце мене на сáнях па рали, бо таѓды я не вытрымаю.—О то-ж бўдзем вазиць—кажуць жыды. Палажыли ены Иванчыка на перыны, вынесли на руках на сáни, сами ўпраѓлиса й давай вазиць Иванчыка па рали. Беѓўць, аж пéйсы трасўтца, а Иванчык тôлько крэхчэ на перынах. Вазили-вазили, аж языки

высалапили, а Иванчык устаў з саняў, пасмеяўса з дурных жыдоў да й пашоў да ґасподы, бо вельмо скучыў без бабы. Так от як жыды школу будавали.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

32. Баязливы жыд.

Пашоў жыд у местэчко. Нахапиласа ноч. Байтца жыд, аж дрыжыць, а ярмолка расце, аж шапку падымае. Бежыць жыд калє лєсу. Аґленетца ен—хтось ґонитца ззаду. Пусцитца жыд хутчей бєґци—не астаетца той, бежыць слєдам Бєґ, бєґ жыд, чуць духи з еґо не выперло, спатыкнуўса да й упаў. Лежыць и не дышэ. Ачухаўса трохи, зирнуў—никоґо нема. Падняўса жыд, бачыць, аж ґэто за им бєґ еґо цєнь. Пашоў жыд далей. Идзэ калє лєсу: бачыць, аж мєсяц идзе поручки з им: жыд за дзєраво, и мєсяц за дзєраво; жыд стане, и мєсяц стане: жыд пабежыць, и мєсяц бежыць. Зноў спалохаўса жыд, не вєдае, што рабиць. Чуе жыд, хтось тарахциць. Гарей спалохаўса жыд, думае єдуць разбойники. Залєз жыд у канаву, лежыць, а душа ў пятки схаваласа. Зирнуў жыд, аж єдзе мужык. Давай жыд прасиць мужыка, каб ен схаваў еґо ат разбойникаў. Пасадзиў мужык жыда ў дзеруґу й кажэ: „от тут седзи смєло, разбойники не знайдуць“. Седзиць жыд. Єдзе мужык, а на сустрєк идуць маскали.—Што ты, мужык, везешь?—Пытаюць маскали.—Шкло,—кажэ мужык. Давай гэто маскали биць па дзерузе, каб пазнаць, ци праўда там шкло, а жыд седзиць, да только дзынькае.—Дзинь, дзинь!—крычыць жыд, а маскали пєраць еґо паплискаю. А мбо там ни яких и маскалеў не было, а ґэто сам мужык, каб напужаць жыда, пєрыў еґо паплискаю.—Ну, вылазь,—кажэ мужык;—разбойники схавалиса ў лєс.—Вылез жыд чуць жыў и давай дзякуваць мужыку, што ен укрыў еґо ат разбойникаў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

33. Атрабляне.

Сябер раска́зваў, што жыў у адно́м селѣ́ калду́н-ведзьма́к. Аткуль то́лько к ему́ не хадзи́ли лю́дзи! Ен и за́витки вырыва́ў, и ат усяких хваро́б вылѣ́чваў, и атрабляў, як каму́ што лихо́е ўдзѣ́яно, и ваўко́ў насыла́ў, и малако́ ў каро́ў атбираў Усѣ́ его́ баялиса й ґадзи́ли ему́, як лихо́й скулѣ́. Куды́ ни прыдзе калду́н-знахо́р, ци на весѣ́ле, ци на радзи́ны,—ўсюды его́ са́дзяць на по́куць, часту́юць, шапку́юць, як пе́рад папо́м А е́н седзи́ць, насу́нуўши ша́пку, да то́лько вачы́ма бли́скае, як воўк От раз у вадна́го чалавѣ́ка занепа́ла каро́ва. Жо́нка каза́ла папраси́ць калдуна́-зна́хара, каб пашапта́ў, а ґаспада́р не паслу́хаў жо́нки,—каро́ва на за́ўтрэ й выпруцилаcа. Беду́е мужы́к—нема дзѣ́цям ни ка́пли малака́, а каб купи́ць другу́ю каро́ву,—ґро́шэй баґи́ их мѣ́ли. Пашо́ў той мужы́к з беды́ ў карчму́, хацѣ́ў вы́пиць кватэ́рку ґаре́лки. Прыхо́дзиць туды́, ажно́ там седзи́ць за стало́м калду́н-знахо́р; седзи́ць, лю́льку паку́рвае, чака́е, паку́ль хто паўква́рты паста́виць. — Што — ка́а калду́н-знахо́р – неща́сце, Сцепа́не?—Эґэ-ж, неща́сце.—Ґе́то, ма́быць, удзѣ́яно, трэ́э на зо́ры паґлядзѣ́ць,—Глянь на́ Баґа, Ничы́пар, паґлядзи́ на зо́ры, хто ґэ́то мнѣ́ удзѣ́яў, каб ему́ дабра́ не было́.—Ничо́ґо, не бо́йса, я атрабмю́—ка́жэ калду́н-знахо́р. Паста́виў ґэ́то ему́ Сцепа́н паўква́рты, а другу́ю ўзя́ў у кишэ́ню й паве́ў Ничы́пара да ґаспо́ды. Спраґла́ ґэ́то жо́нка е́ечню,—часту́юць калдуна́-зна́хара. Напи́ўса Ничы́пар, наѣ́ўса й лѐґ спаць. Але́ ось у са́мую ґлу́пась устаў и пытае Сцепа́на, ци е́н спиць. Сцепа́н абазва́ўса, што не спиць.—Спи—ка́а Ничы́пар—спи, ничо́ґо не бо́йса,—а сам и пашо́ў з ха́ты ґлядзѣ́ць на зо́ры. Так трэ́йко е́н хадзи́ў ґлядзѣ́ць на зо́ры. Але́ ось на за́ўтрэ, ещэ́ чуць свѣ́т, чу́юць, аж у сусѣ́дзей ба́бы ґало́сяць: са́мая лѣ́пшая, зда́ровая каро́ва ў ве́чар наѣ́ласа, а к свѣ́ту й вы́пруцилаcа.—А што́—ка́а калду́н-знахо́р — от и атра-

бiў.—Даваŭ ужэ тые сусѣдзи прасиць Ничыпара к сабѣ: ґодзяць, частуюць. От так, як и ў Сцепана, напиўса, наѣўса ў их Ничыпар, да й леґ спаць. Ночу ен устаў, пытае,—ци вы спицё?—Нѣ,— кажуць—не спимо — Спѣце, спѣце, ничоґо не бойцеса, я тольки паґляджў на зоры. — И пасунуў з хаты на двор. А ў за печку лежаў хлапчук, ґэтак ґадоў дванаццаци падшпарак, да вельми цикавы. Хочетца ему вѣдаць, як ґэто Ничыпар ґлядзиць на зоры. Вылез ґэто ен з запечка й циxенько вышаў з хаты да й прытаiўса за ўґломъ. Бачыць, што Ничыпар пастаяў на вулицы да й пашоў азираючыса къ сусѣду на двор. Доўґо стаяй хлапчук, хацѣў ужэ йци ў хату, алé ось чуе, штось у сусѣда ў хлевѣ вельми моцко стукае. Падбѣґ ґэто хлапчук к сусѣду пад акно, пабарабаниў у абалонку да й кажэ: „Дзяцько, Микита, о, дзяцько, Микита, поґлядзи тко-бо, штось у тваем хлевѣ вельми моцко стукае. Запалиў Микита лучыну, ўстурхаў парабка да й пашли ены ў хлѣў: бачаць, ажно Ничыпар седзиць на самум лѣпшом валу да зацуркоўвае ему ґорло, а вол лежыць да тольки наґами дрыґае —Што ты—каа,—ґад, робишъ!? Дак ґэто ты ґэтак атрабляеш! — И даваŭ еґо лупцаваць чымъ папало. Нарабили крыку Збѣґласо паў села. Насилу атратавали вала, а Ничыпара калдуна-знахара так прыбили, што думали ен ужэ больш неўстане. Алé жывуч ґад, як кот,—палежаў трохи без памеци, а потым и ачухаўса, дастаў з кишэни бутэлячку ґарелки да як пацяґнуў, дак и на ноґи падняўса. Бачыць, што еґо выкинули за плот, як сцерву, от ен циxенько й папоўз у суварaты. Тамъ мабыць атлежаўса й саўсим ускарабкаўса. Алé ґодзи с таѣ пары калдаваць да атрабляць. Дак от як Ничыпар калдун-знахор ґлядзѣў на зоры да прырабляў и атрабляў. А моо й усѣ ены ґэтак атрабляюць, чарты их вѣдаюць, не перад начу кажучы.

Пересказалъ Г. Бохматъ.

Дер. Чудинъ.

34. Про́ща.

У ґлухо̃м Палѣси, за бало́там, за тако́ю тхла́нью, што атту́ль и свѣ́ту Бо́жаґо не видно́, было сельцэ́. У то̃м сельцы́ была́ цэ́рква старэ́нькая, зкрывиу̃шаяса. Недале́ко ат цэ́ркви стая́ла карчма́ такая́ж стара́я, аблу́пленая, без страхи́, с заґа́таю й падпо̃рками. Бѣ́дны быу̃ там по̃п, бѣ́дны й ранда́р: бо кали́ нема́ дахо́ду папу́, та нема́ й рандару́. Але́ ранда́р быу̃ ве́льми хы́тры жыд. Тры дни е́н седзѣ́у̃, ни пи́у̃шы, ни ѣ́у̃шы, у̃се ду́мау̃, як-бы ему́ разбаґацѣ́ць Спало́халаса жыдо̃у̃ка, ду́мае, што мо̃жэ Абру́мка намеша́у̃са То́льки от на трэ́йици дзень Абра́м сказа́у̃. „рэхт“ и пашо́у̃ к папу́. По̃зно ен седзѣ́у̃ у папа́, не́маль да тре́йцих пѣ́у̃няу̃, усе́ штось ґавары́у̃ папу́. От прышле́пау̃ Абра́м да ґаспо́ды, а на други́ дзень паѣ́хау̃ у местэ́чко.

От прайшла́ недзѣ́ля, а мо́о дзвѣ́. Пачали́ каси́ць. Было̃ паґо̃днае лѣто От вечарко́м у недзѣ́лю седзя́ць лю́дзи та на пры́збах, та пад ли́пами кале́ цэ́ркви, седзя́ць, жу́пяць, лю́льки ку́рaць. Тут жэ, кале́ са́маґо села́, пры раце́ ґуля́юць дзѣ́ци. Ве́чар паґо̃дны, цеплы От пачало́ цемнѣ́ць; на не́бе заґаре́лиса зо̃рки Ось беґу́ць дзѣ́ци й крыча́ць: „сюды́, сюды́, вонь на раце́ плыву́ць зо̃рки!“ Падняли́са мужыки́, ба́чаць, аж пра́у̃да на раце́ штось плыве́ з вадо́ю й круґо́м еґо́ як-бы свѣ́чачки ґара́ць. Пабѣ́ґли сказа́ць аб то̃м папу́. Прышо́у̃ по̃п, паґлядзѣ́у̃ и кажэ́, што ґэ́то цуд. Палѣ́з ста́раста на званни́цу й дава́й звани́ць, як на вели́кдзень. Вы́сыпало у̃се́ село́ к раце́. Пабѣ́г по̃п у цэ́ркау̃, адзѣ́у̃са у̃ ры́зы да й пашо́у̃ з пратэ́самы к раце́ сустрака́ць той цуд. Падышли́ лю́дзи ближе́й к раце́, ба́чаць, ажно́ плыве́ стара́я до́шка, а на е́й лежы́ць абразо́к памиж свѣ́чачак. Ци́хо, як у ву́се, свѣ́чачки гара́ць ро̃у̃но, бы у̃ цэ́ркви. Падплыла́ до́шка к бе́раґу, заплу́талaса пами́ж кали́так да й ста́ла. Узя́у̃ ґэ́то по̃п абразо́к на бе́раґ, паста́виу̃ на ка́мени й дава́й служы́ць мале́бен. Усю́ды заґавары́ли, што у̃ то̃м селѣ́ объявиу̃са цуд, и павали́ли атусю́ль лю́дзи к то̃у̃ про́щы.

Несу́ць ахвя́ру, хто што мо́жэ. Разжы́ўса скоро по̂п, але́ ещэ́ бо̂льш папа́ разжы́ўса рандар, бо, ве̂дамо, хто аткуль ни прыхо́дзиць, та ўсе-ж дасць рандару ўтарґава́ць. И сла́витца та́я про́ща, на ўвесь све̂т. Але́ ка́жуць, што ґэты цуд зрабиў рандар, намо́виўшыса з папо́м. А Бо̂ґ еґо́ святы́ ве̂дае! Ка́жуць, што з местэ́чка крамар пазна́ў, ба́тцэ ґэто той абразо́к, што ў еґо́ рандар купиў, нибы для папа́ Мо́о й пра́ўда!

Пересказалъ Рѣдкій.

С Б Рожинъ.

---

35. Аб то̂м, як ксендзы́ вылечылиса.

Тры ґла́дкие, аты́лые кзендзы́ сабрали́са е̂хаць на во́ды лечы́тца. Ены́ растаўсце̂ли, як атко́рмленые вапруки. Чаґо́ ены́ не рабили, яки́х зельеў не прыма́ли—ничо́ґо не памаґае. Дахтуре́ ка́жуць, што им трэ́э е̂хаць на во́ды, дак там ло́ю збу́дзе. Пае̂хали ксендзы́ па пано̂х збира́ць ґро́шэй на даро́ґу. От прыезджа́юць ены́ к аднаму па́ну й жа́лятца ему́ на сваю́ беду́. Про́сиць пан ксендзо̂ў пасилкава́тца да пераначава́ць. Заначава́ли ксендзы́. От пасадзиў пан их вечэ́раць да так участава́ў, што ксендзы́ й засну́ли пры стале̂. Храпу́ць ксендзы́ на ўсе̂ застаўки, спяць так мо̂цно, што хаць з ґарма́т страля́й—не пачу́юць. От пан веле̂ў их раздзе̂ць, перанесци́ ў бро́вар да й палажы́ць там ра́зам з браварськими рабо̂тниками. Прачу́халиса на за́ўтрэ тро́хи ксендзы́, але́ не ве̂дають, ґдзе̂ ены́ Але́ ось и бу́дзяць дзецюко̂ў набива́ць картапля́ник. Паднялиса ксендзы́ й нехаце̂ли йци на рабо̂ту, але́ як пераце̂х их наме̂сник бизуно́м, небо̂сь, пашли́. Ро́бяць ксендзы́ ра́зам з друґими ўсе, што трэ́э ў бро́вары, ра́зам еду́ць, ра́зам спяць и ни як не мо́ґуць з бро́вара вы́рватца. От прахо́дзиць недзе̂ля - друґа́я, й пачало з ксендзо̂ў спада́ць сало, а це́раз недзе̂ль пяць ены́ падґи́ндзилиса як харты. Паґлядзя́ць ены́ адзи́н на друґо́ґо й пазна́ць не мо́ґуць, так вы́петрали за ґэ́тые пяць недзе̂ль. Ду́мали ўжэ ксендзы́, што ґэто

их чэрци ўхапи́ли да й засадзи́ли ў бро́вар на паку́ту; ду́мали, што ўжэ им нико́ли аттуль не вы́бавитца. От раз велѣ́ў пан дать браварськи́м рабо̌тникам ведро́ ґарэ́лки, а ксендзо̌м—лѣ́пшае ґарэ́лки, са́маѣ мо̌цнаѣ. Напили́са ены́ й без па́меци пазсо́вались ў бро́вары кале́ катла́. От як кзендзы́ мо̌цно заснýли, пан велѣ́ў перане́сци́ их у ахвицы́ну й палажы́ць там, ґдзѣ ены́ лежа́ли пе́ршую но̌ч. Прахапи́лиса на за́ўтрэ ксензы́ й трасýтца, спало́халиса, што по̌зно спа́ли; бая́тца, каб намѣ́сник не лупцава́ў их бизуно́м; ста́ли скаре́й апрана́тца, але́ ба́чаць, аж кале́ их лежы́ць ксендзо̌ўськая адзе́жа. Дзи́вятца ксендзы́ й ачо̌м не вѣ́рать. Адзѣ́лиса ены́, але́ ось прыхо́дзиць пан, заве́ ґарба́ту пиць. Ста́ў ґэто пан частава́ць ксендзо̌ў да й пыта́е, куды́ ены́ ду́мають ѣ́хаць на во́ды.—Нѣ́—ка́жуць кзендзы́ ў вадзи́н го́лас — цепе́р не трэ́ба ѣ́хаць на во́ды, бо мы ўжэ вы́лечылиса —От як пан вы́лечыў ксендзо̌ў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

36. Ка́таржник и стараста.

Не раби лихо́го й не бойса нико́го.
Пра́уда наве́рх выдзе. (Прыказки).

Даўно́. Я ещэ́ быў падшпа́ркам.—Што ему́ до́ма раби́ць,—ка́жэ ба́цько, вѣ́чны пако̌й, — неха́й бѣ́ґае ў Михаля́ падпа́сычам. — И атда́ў мене́ ба́цько на ўсе лѣ́то к старо́му пастуху́. Пасту́х Миха́ль быў ужэ ве́льми стары́. Ен усе́ жы́це па́сьциў ґаўя́до. От так, як и мене́, еґо ко́лись ещэ́ малы́м атда́ў ба́цько падпа́сычам. Падня́ўса Миха́ль на но́ґи, але́ к то̌й пары́ ба́цько паме́р, хаджа́йство знищылась; й ста́ў е́н сам па́сьциць ґаўя́до, перш у селѣ́, а по́тым кашару ў лѣ́се. Це́лае лѣ́цячко дну́е й нача́е з ґаўя́дам у лѣ́се, а ў зи́мку слу́жыць у каґо́-не́буць. Была́ адна́ маско́ўка. Мо́жэ ґадо́к не пажыла́ з ґаспадаро́м, як ены́ пабра́лиса, але́ ось и забра́ли еґо́ ў маскали́. Вѣ́дамо, яка́я даўнѣ́й была́ слу́жба: два́дцать пяць ґадо̌ў

служы́ли. Прапа́ў ґаспада́р. Заґна́ли еґо́ ґдзе́сь на Капка́з, ци што. Бува́ло й карту прысыла́ў у ґо́д раз, а по́тым и саўси́м не ве́дамо, што з им ста́ласо. Схла́, схла́ маладзи́ца: й за́муж не мо́жна йци, бо нихто́ не зна́е, мо́о ещэ́ й жыў ґаспада́р, и так жыць цяжко. От и ўзела́ та́я маско́ўка к сабе́ Михаля́ памаґа́ць у хаджа́йстве. Бува́ло я адзи́н астаюса ў каша́ры, а Миха́ль по́йдзе памаґа́ць маско́ўцэ се́но рабі́ць, або́ жаць, ци ара́ць. От так и прайшла́ Михаля́ ўся жы́тка. От бува́ло нахо́дзимса за дзень па ўселя́куй не́тры, заґо́ним ґаўя́до ў каша́ру да й седзимо́ кале́ аґню. Я ла́пци плету́, а Миха́ль ку́рыць лю́льку да ка́жэ ка́ски. И яки́х то́лько ка́зак ён незнаў! Гэ́то ён наслу́хаўса ат старо́ґо пастуха́, як быў у еґо́ падпа́сычам. Але́ не то́льки ка́ски, ён бува́ло раска́зваў и пра́ўду. От як цепе́р памета́ю, ку́рыць Миха́ль лю́льку й ка́жэ, што на еґо́ па́меци жыў у сусе́днюм селе́ ўжэ стары́ чалаве́к. Гэ́то быў са́мы баґа́ты мужы́к ва ўсе́й акру́зе. До́бры быў чалаве́к, ве́к ззжыў, а нико́ґо не скры́ўдзиў. Усе́ паважа́ли еґо́ й вы́брали ста́растаю. Але́ ось пры́ехаў станавы́, саґна́ў людзе́й и ка́жэ, што яки́сь ка́таржник прызна́ўса пе́рад нача́лствам, што ён ве́дае ме́йсцо, ґдзе́ схо́вано мно́ґо ґро́шей. Прывели́ й таґо́ ка́таржнаґо. Чуць на наґа́х трыма́етца стары́ ка́таржник. Разґлядзе́ўса ён у селе́ й паве́ў людзе́й у ле́с к то́ўстаму ду́бу. — От тут, — ка́жэ, — схо́ваны ґро́шы, а от кале́ тае́ хвои закопан ку́пец, як еґо́ аґра́били От ён, — и ка́таржны паказа́ў на ста́расту, — адзи́н упра́виўса з купцэ́м и хаце́ў забра́ць сабе́ ўсе́ ґро́шы, але́ мабыць то́лько ухваци́ў адну́ жме́ню, бо я еґо́ як пырну́ў нажэ́м у бо́к, дак ён и пакаци́ўса, як сно́п. Пе́ўне и цепе́р ещэ́ е знак на баку́, бо я еґо́ до́брэ пачастава́ў. Ки́нули мы еґо́ як саба́ку, закапа́ли купца́, а ґро́шы схава́ли пад ду́бам, да ско́ро нас злави́ли. Мае́ тава́рышы паўмира́ли ў Сибе́ры, а я адзи́н аста́ўса й захаце́ў, каб дарэ́мне ґро́шы не прапада́ли й каб супако́иць ду́шу купца́, а то ён усе́ мне́ сни́тца, про́сиць, каб пахава́ли на мо́ґлицах.—Пабеле́ў ста́раста, як палатно́, трасе́тца, бы аси́на. Паґлядзе́ў на еґо́ станавы́,

зирнуў и ещэ якись пан, мабыць дохтур Пашапталиса ены прамиж себе й велели старасце скинуць сарочку. Спусциў стараста сарочку, глянь, аж на баку писух с далоню. Давай гэто людзи капаць кале хвои. От пракапали ены па калено ямку, бачаць, аж там праўда чалавечые косци. Ужэ саўсим пагнили. Як убачыў тое стараста, так чуць не абамлеў. Годзи тайтца: й прызнаўса, расказаў усе, як было. Цяжко было глядзець, як стараста валяўса к нагам кожнаго чалавека, што там были й ўсе прасиў, каб даравали ему суседзи, што ен усю жытну баяўса кары, не прызнаваўса, да падманьваў добрыхъ людзей. Пазбирали гэто косци купца й отвезли ў каплицу, пакуль зрабили дамавину, каб пахаваць на моглицах. А пад дубам колько ни капали, ничого не нашли: мабыць хтось уперод наткнуўса на грошы й забраў. От звезали старасту й павели судзиць, а потым его кудысь саслали, моо ў Сибер. Так от як Бог доўго церпеў, а только к старасци пакараў старасту за грех. Катаржны-ж скоро захвареў и памер у сваем селе. Его й пахавали на моглицах радам з тым купцэм. Даўно гэто было, ой як даўно. Я ўжэ састареўса, а мне аб гэтом расказваў Михаль тагды, як я ещэ быў у его падпасычам.

Пересказалъ Микита Капачъ.

Дер. Заполье

37. Чорт и баба.

Жыли сабе дзед да баба. Жыли ены ў згодзе да ў ладу, николи не сварылиса, не зневажали адно другого. Так пражыли ены ўсю жыдку й дажыли да старасци. Чорт хацеў спакусиць их. Двананцаць гадоў седзеў ен у падпечку, але ничого не зробиць. Вы-петраў чорт, бы шкурат. А дзед з бабаю жывуць сабе ладком да Бога хваляць. Хацеў ужэ чорт кинуць гэстых людзей да йци спакушаць другиx, але ось раз чуе, што людзи кажуць: гдзе чорт не

йме̂, там ба́бу пашле́. Пачу́ў ґэто чорт и пашо́ў шука́ць тако́ѣ ба́бы, каб ена́ звела́ ґэтых праўдзи́вых людзе́й. Не до́ўґо прышло́со чо́рту шука́ць тако́ѣ ба́бы: чуць то̂лько е́н вы́сунуўса на ву́лицу, як ба́чыць, ажно́ бежы́ць за мужыко́м з качарґою падты́каная ба́ба й ду́басиць еґо́ па паты́лицы й па чо̂м папа́ло да крычы́ць на ўсе село́, — ось жэ табѣ́, хварэ́ць тваей ма́тары!.. Я табѣ́ пакажу́, як збо̂жэ ў карчму́ цяґа́ць... Я табѣ́ пакажу́, валацу́ґа ты ґэтаки. Ат мене́ не ўто́ишса. Я што захачу́, та зраблю́. Хибо ты забы́ўса, што ба́ба й чо́рта перахитру́е! — Лу́пиць ба́ба качарґо́ю мужыка́, а чо́рт и рад. — От, — ду́мае, — ґэтая ба́ба ўсе зро́биць, што зхочэ, трэ̂э то̂лько к ей падкаци́тца. От чорт, каб задо́брыць ба́бу, хацѣ́ў е́й прыслужы́тца да й ухапи́ў мужыка́ за каўнѣ́р, каб прытрыма́ць еґо́. — Ахъ ты сяки́-таки́! — наки́нуласа ба́ба на чо́рта. — Свой сечы́са, руба́йса, а чужы́ не меша́йса. Што́ но̂с уваткну́ў у чужу́ю за́дницу?.. И дава́й чо́рта пере́сциць качарґо́ю. Наси́лу чорт вы́рваўса да ў но́ґи. То̂льки на заґуме́чи тро́хи ачу́хаўса чорт, стайць да паскре́баетца, бо ба́ба ему́ не́маль усѣ́ ко́сци паламала. Пастая́ў чорт и верну́ўса ў село́. От нашо́ў ту́ю ба́бу й дава́й еѣ́ праси́ць, каб памаґла́ спакуси́ць тых праўдзи́вых людзе́й. — До́брэ, — зґаджа́етца ба́ба, — то̂лько за тэ́е дай ты мнѣ́ ша́пку ґро́шэй. — Чорт абеца́ў даць ба́бе по́ўную ша́пку ґро́шэй, абы́ ена́ то̂лько так зраби́ла, каб дзѣ́д з ба́баю пасвары́лиса. — Што, каб пасварылиса! — ка́жэ ба́ба, — я так зраблю́, што за́ўтрэ дзѣ́д не то̂лько абла́е ба́бу, але́ й павало́чыць за ко́сы.

Рад чорт. Зно́ў залѣ́з пад пѣ́ч и седзи́ць, чака́е, што ґэто ба́ба зро́биць. От ґэтая сердзи́тая ба́ба, бы не знаро̂к бежы́ць з ведро́м и сустрака́е жо̂нку таґо́ праўдзи́ваґо чалавѣ́ка. Ста́ли ены́ пасеро̂д ву́лицы й дава́й саката́ць. Вѣ́дамо, ба́бы, як сы́дутца, та датуль бу́дуць лапата́ць, паку́ль аб усе̂м не пераґаво́рапь. От пыта́ютца ены́ одна́ ў друґо́ѣ, ци лю́бяць их ґаспадары́, ци до́брэ з и́ми жыву́ць. — Мо̂й ґаспада́р, — ка́жэ сердзи́тая ба́ба, — хаць и пья́ница, хаць и ла́етца й зневажа́е, але́ так лю́биць, так лю́биць... — А та́я ка́жэ,

што ены́ з сваи́м ґаспадаро́м так до́брэ, так зґо́дно жыву́ць, што дай Бо́ґ так жыць усим до́брым лю́дзям.—Але́ твой ґаспада́р цебе́ ма́быць не лю́биць, кали́ нико́ли не абла́яў, або не вы́цяў, ци мо́о ен ужэ неўздо́лее? — Пры ґэ́тых славах ба́ба приґну́ласа к ву́ху й што́сь шапну́ла сусе́дцэ. — Эґэ́-ж, пра́ўду ты ка́жэш, — жа́литца жо́нка праўдзи́ваґо чалаве́ка,—ґэ́то мае́ нешча́сце.— Ий, ро́дная! кали́ зхо́чэш, я научу́, што зраби́ць, дак не то́лько штоб што, але́ й не ната́лиш! — Ой баю́са я, ро́дная, мо́о ещэ́ зашко́дзиць. — Не́, не зашко́дзиць, ты то́лько слу́хай, зраби́, што я табе́ скажу́. Гэ́то, ба́чыш, усе нешча́сце, што ў тваґо́ ґаспадара́ пад барадо́ю вы́расли сухи́е валасы́: от каб ты их вы́разала, то́лько, каб ґаспада́р аб то́м не ве́даў, таґды́-б вы были́ так щасли́вы, так щасли́вы, што-б вам усе́ лю́дзи зави́дували.— Як жэ ґэ́то зраби́ць, каб ґаспада́р не ве́даў?—А от як. Купи́ ґаре́лки, спечы́ яе́чню да й напо́й сваи́ґо́ ґаспадара́, а як ен ля́жэ да засне́, вазьми́ нож, паґастры́ аб пры́пек, плюнь трэ́йко пад пе́ч да й вы́раж ты́е сухи́е валасы́. Ены́ так и стырча́ць про́циў шэ́рсцы. — Дзя́куй табе́, ро́дная! — Так ґлядзи́ж, зраби́ сеґо́днячы, та за́ўтрэ ещэ́ не так падзя́куеш: здаво́лишса, ўсю но́ч спаць не дась, як з за́маладу, хи, хи, хи!.. — И ба́ба засмея́ласа да й пашла́ да ґаспо́ды.

От то́лько со́нейко се́ло за ле́с, жо́нка праўдзи́ваґо чалаве́ка збе́ґала ў карчму́, прынесла́ ква́рту мо́цнае ґаре́лки й дава́й праґци́ яе́чню. Тым ча́сам та́я ба́ба сустре́ла таґо́ праўдзи́ваґо чалаве́ка да й ка́жэ ему́, што еґо́ сеґо́днячы хо́чэ жо́нка заре́заць. Той не ве́рыць, але́ ена́ клине́тца на чо́м све́т стаи́ць, што пра́ўда. — От жэ, — ка́а— паба́чыш, ена́ цебе́ сеґо́днячы падпо́иць, а як ты ля́жэш спаць, та ена́ цебе́ заре́жэ. От паба́чым. То́лько ты сеґо́днячы ўле́зеш да ґаспо́ды, ена́ паста́виць на сто́л яе́чню й пля́жку ґаре́лки Гэ́то, каб ты ўпи́ўса да не ске́миў, што ена́ ли́хо замышля́е. А ты то́льки прыки́нса, ба́тцэ спиш, та паба́чыш, што ена́ бу́дзе рабиць —Брэ́шэш, патаску́ха! за што мене́ мая́ ба́ба бу́дзе ре́заць, кали́ мы так до́брэ жыво́м,—маўля́ў справедли́вы чалаве́к и: пацёґса

да ґаспóды, каб скарэ́й аб тŏм сказáць жŏнцэ, алé тŏлько ён пераступиў парŏґ и зирнýў, што жŏнка ўпрáўду пражэ́ яéчню, дак и прыкусиў язык.—Эґэ,—дýмае,—мáбыць паґáная бáба не брахáла.— И прыкúнуўса éн, (што) бáтцэ ничóґо не вѣдае, каб паґлядзѣць, што з ґэстаґо выдзе. Пазирáе éн; ось жŏнка спеклá яéчню, пастáвила на стŏл пля́жку ґарéлки й кáжэ: „Пасилкýўса“. — Што ґэто ты, бáбо? Хибо сеґóдня свя́то, ци што?—Нѣ, ґэто кумá мнѣ далá... Выпи, не калú тóе бýдзе.— Выпиў ён чáрак зóтры ґарéлки, зъѣў яéчню да й выцяґса на лáве, нибыто заснýў. Храпé, бáтцэ спиць, а адным вóкам пазирáе. Бáчыць, аж жŏнка ўзелá велúзазны нŏж и давáй еґó вайстрыць аб прыпек. — Ну,—дýмае,—прáўду казáла паґáная бáба. — От навайстрыла жŏнка нŏж, плю́нула трэ́йко пад прыпек так, што аж вóчы чóрту заплевáла, и падхóдзиць к ґаспадарý. Тŏльки енá ўзелá ґаспадарá за бóраду, а той як усхвáцитца, хóпиць её за кóсы да пачнé перéсциць па чŏм папáло. Крычыць бáба на прамúлы Бŏґ: „лю́дзи дóбрые ратýйце!“ А ён лýпиць, як Сúдараву казý. — Ось я табѣ, хварéць тваймý бáцьку да стаґнáць тваéй мáцеры, ось я табѣ пакажý, як ґаспадарá рéзаць!—Чуць не забиў дзѣд бáбу, алé сусѣдзи пачýли крык, збѣґлиса й абратавáли. Рад чорт, вылез з падпѣчка, працёр вóчы да тŏлько хвастóм виля́е. И панёс ён бáбе ґрóшы. Прыпёр цéлы мѣх. А бáба пастáвила ўверх дном велúзазную бóчку, прарéзала ў днѣ дзúрку, а на её палажыла дзирáвую шáпку. Сыпаў, сыпаў чорт у шáпку грóшы — ни я́к не напóўниць. Знаў ён, ґдзѣ ў землú схóваны ґрóшы. Палецѣў, прыцёґ ещэ мѣх. Сыпаў, сыпаў, а шáпка ўсе непóўна. Падня́ў ён трóхи шáпку, бáчыць, аж бáба еґó перахитрыла. Як закмѣў тэе чóрт, дак и кúнуўса к бáбе з кулакáми. Ухапúла бáба вúлы да й кáжэ: „ну, падлѣсь, дак я табѣ атрáзу бѣльма выкалю“. Спужáўса чорт и перaскóчыў цераз плŏт. Бáба за им. А чорт ухапиў óжах и абараня́етса.— От,—кáжэ бáба,—пакýль ты мнѣ зрóбиш óжаґамаднý дзúрку, та я табѣ вúлами дзвѣ. — Давáй меня́тца, — кáжэ чорт.—Давáй.—Паменя́лиса ены́ й давáй битца. От бáба што пырнé

óжаґам праз плŏт, та ўсе ў чóрта пападзé, а чорт пырáў, пырáў, да ўсе вíлы ў плóце застраюць. Бáчыць чорт, што ничóґо з бáбаю не зрóбиць, а енá еґó скóро зрóбиць як рэшато, и давáй прасíтца.— Гóдзи, бáбо! Давáй памíрымса. Я ещэ дам мѣх ґрóшэй, тŏльки скажы ты мнѣ, ў чŏм ґэто ў баб седзíць сíла. — Дóбрэ, — кáжэ бáба. Палецѣў чорт и па немáлŏм чáсе чуць плíщыць мѣх ґрóшэй. Атдáў бáбе ґрóшы да й пытáе: „ну, ў чŏм вáша сила?“ — От у чŏм, — кáжэ бáба. Тут енá поднелá падŏл и паказáла чóрту свае зѣлье. У таґó аж вóчы на лоп вы́перло. От чорт туды́ да й сха- ваўса, тŏльки падŏл у бáбы скалыхнýўса. От з таѣ пары́ й седзíць там у бáбы чорт. Лю́дзи ўсе выґаняюць еґó аттýль óжаґам, да не мóґуць вы́перци.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

38. Хаўрус.

Налавиў мужы́к вéльмо харóшаѣ ры́бы и панéс у двŏр к пáну. Чуць плíщыць мужы́к ры́бу, а насустрéк бежы́ць жыд. — Сто ты, Янко, несéш? — Ры́бу. — Ну, каму ты еѣ несéш? — Панесу пану ґасцинца, мóо што дась.—Ну, цўес, Янко, вазьмí менé ў хаўрýс.— Хадзѣм, кáли хóчэш, — кáжэ Янко. От прыхóдзяць ены́ ў двŏр к пану. Забѣґ мужы́к у пекáрню й разсказáў, як прычапíўса к емý жыд, каб узяў еґó ў хаўрýс. Пачуў тóе лѐкай и сказáў пáну. От пазвáли мужыкá с жыдам к пану. Мужы́к стаў упéрад, а жыд ззаду. — Дзеньдóбры пáну! — А цо пóвеш, Янко? — Усе, дóбрае, панóчку. — А па дóбрум цо? — От прынéс пáну ґасцíнца рыбы.— Дóбжэ, кохáнку. — А ты, Ицко, цо пóвеш? — Я рáзам, панóцку.— Як рáзам?—У хаўрýсе, паноцку.—А, ну, то дóбжэ. Цо-ж тóбе дацъ за ры́ба? — пытáе пан Янка.— А што пáньськая ля́ска.—Дам тóбе пулкóрца пшаницы. — Э, дзя́куваць, панóчку, але й маѣ дзѣци

нико́ли не е́ли пираго́ў. На што мнѣ пшани́ца, — ка́жэ мужы́к. А Ицко стайи́ць збо́ку да шту́рхае мужыка́. — Янко, ду́рень, беры́ пшани́ца. — Не́хцэш, — ка́жэ пан. — Ну, то дам то́бе ко́ня. — Э, куды́ мнѣ, пано́чку, паньськи ко́нь. Ещэ́ разтрасе́ маѣ ко́стачки — Музы́к, ду́рень, беры́ каня́, — шэ́пчэ Янку Ицко. — Ну, то дам то́бе дзе́сенць ру́бли. — Э, куды́ мнѣ, пано́чку, таки́е гро́ши. Ещэ хто забье́ Маѣ, й бацьки́ нико́ли не мѣ́ли то́лько гро́шей. — Музы́к, ду́рень, варо́на беры́ гро́си, — шэ́пчэ жыд. — От як закрычы́ць пан, — дак цож я то́бе дам, галган? — Пшани́цы не́хцэш, ко́ня не́хцэш, пене́ндзы не́хцэш, так я то́бе дам пендзе́сент бизу́нов! — Дзя́куваць, пано́чку! От гэ́то бра́ли маѣ бацьки́ й дзѣды́. — От павели́ мужыка́ с жыдам на ста́йню, расцегну́ли й дава́й лупи́ць. Палажы́ли мужыка́ ближэ́й, а жыда да́лей. От хурма́н размахне́тца, размахне́тца, да як смальне́ жыда, дак таму аж зо́рки з ачу́ пасыплютца, а па мужыку́ бизуно́м и нерацягне. Кру́цитца жыд, як на гара́чум жалѣ́зе, ла́е да климе́ мужыка́, а Янко раве́ ваўсе го́рло, нибы́то ему́ ве́льмо боля́чо. Атличы́ли жы́ду два́дцать пяць. Усхапиўса ен, схвацйу сваѣ́ плюндры да наўцекача́, то́льки панто́пли миту́сятца. Заплацйу пан мужыку́ за ры́бу й ещэ даў гасци́нца. Идзе́ сабѣ́ Янко да лю́лячку паку́рвае; ба́чыць, аж бежы́ць на сустре́к Ицко. — А сто, тра́сца тваей ма́церы, музы́к, хам, — крычы́ць Ицко, — не хацѣ́ў пшани́ца, не хацѣ́ў конь и гро́сики не хацѣ́ў, дак от табѣ́ ў сра́ка! — Да й табѣ-ж ма́быць тро́хи ўсы́пали ў аза́дак. — Сто мнѣ, сто мнѣ? Мене́ то́лько кон-цикам, а цебе́ ўсим бузуно́м. — Гэ, кали́ хаўру́с, дак хаўру́с. Трэ́э каб было́ парбу́ну, — ка́жэ Янко, — хадзѣ́м хи́бо ещэ к па́ну. — Падня́ў гэ́то Ицко лапсарда́к да як суну́ў, дак и кане́м не даго́ниш. Атбѣ́гса тро́хи й крычы́ць: але́ мене́ то́лько ко́нцикам, а цебе́ ўсим бузуно́м!..

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

39. Медзвѣдзь.

Ци вѣдаеце, скуль узяўса медзвѣдзь? Медзвѣдзь перш быў такі-ж сáмы мужык, як и ўсѣ мы гарапáшники. Даўно тóе былó. Людзéй былó мáло. Гэто цепéр так нарóду намнóжыласо, што чуць земля их паднимáе. Каб не ўмерли, таб небо падперли. А даўнѣй людзи жыли сям-там па лѣсе: лавили звѣра, птўшак, а ў азéра да ў рéках — рыбу. У лѣтку збирáли ягады, грыбы, абó капáли карéне й запáсили на зиму Бóльш усегó запáсили арéхи й мед. Пчóл тагды былó багáцько. Ены сáми вадзилиса у дўплях и ў земли ў нóрах. Па лѣсе й цепéр ещэ е пчóлы ў дўплях. Их называюць слепат. Людзи шукáли пчóл у дўплях, и хто пéршы знайшóў, тагó й были тые пчолы. Ен абвязваў тóе дзераво, гдзе знайшóў пчолы й ужэ нихтó не май прáва их чапáць Але быў адзин гультаеваты мужык. Ему не хацѣласо самóму шукáць пчóл, дак ен выдзираў чужые Тóлько цяжко былó ему ўзлáзиць на дзéраво. От и пачаў ен шукáць такóго калдунá, каб так удзѣяў, штоб легчѣй было лáзиць на дзéраво. За семю лѣсáми да за семю балатáми жыў таки калдун, што ўсе мóг рабиць. Пашóў той чалавѣк к таму калдуну. Идзé ен да йдзé лѣсам, бáчыць—липа абвязана, дўмае—пчóлы Падышóў ближéй, зирнé, аж дуплé суздрóм низко, а ў ем мед. Выдраў ен тые пчóлы й пашóў дáлей. Бáчыць другóе дзéраво абвязано. Выдраў ен и тые пчóлы. Падхóдзиць ен к землянцэ тагó калдунá. А калдунá немá дóма. Глядзиць ен, аж тут-же пры сáмой землянцэ ў дзéраве пчóлы. Давáй гэто ен их драць. Але ось идзé калдун. Зирнуў калдун на тагó чалавѣка да й кáжэ: „ну, з гэстаѣ пары й ты, й тваѣ дзѣци, й усе тваѣ кóтло бўдзеце тóльки пчóл драць“. И абернуў калдун тагó чалавѣка ў медзвѣдзя Так от аткуль узяўса медзвѣдзь.

Пересказалъ Рѣдкій

С. Б Рожинъ

40. Ластаўки.

Даўнѣй ещэ земля́ не была́ така́я ґрѐшная, як цепе́р. Сам Бо̀ґ хадзи́ў па земли́ й учы́ў людзе́й, учы́ў, што лю́дзи ўсѐ браты́ й што ены́ павинны й жыць у зго́дзе, як браты́. Але́ лю́дзи чым да́лей, тым ґаре́й ґрашы́ли й не захацѐли слу́хаць Бо́ґа. Нашли́са й таки́е лю́дзи, што гавары́ли, што саўси́м Бо́ґа нема́-ш; а як прышо́ў на зе́млю Хрысто́с, дак паґа́ные жыды́ ўзду́мали Еґо раскрыжава́ць От зраби́ли ены́ крыж и дава́й кава́ць ґвазды, каб и́ми прыби́ць к кры́жу но́ги й ру́ки Хрыста́. Накава́ли ены́ ґвазде́ў и ўжэ хацѐли прыби́ць Хрыста́; але́ тым ча́сам прылецѐли ла́стаўки й расхапа́ли ўсѐ ты́е ґвазды. Жыды́ ў друґае накава́ли ґвазде́ў цѐлую ку́чу. Зноў налецѐло ла́ставак, бы це́мная хма́ра, й расхапа́ли ены́ ты́е ґвазды́ У тре́йци раз накава́ли жыды́ ґвазде́ў. От падлецѐли ла́стаўки, ка́б расхапа́ць ты́е ґвазды́, але́ им Бо̀ґ велѐў не чапа́ць. Паднели́са ла́стаўки высо́ко, высо́ко к не́бу й паднели́ таки́ плач и крык, што Бо̀ґ зжа́лиўса над и́ми й сказа́ў им, што за то́е, што ены́ разбира́ли ґвазды́, нихто́ з людзе́й нико́ли не бу́дзе их чапа́ць. С таѐ пары́ ла́стаўки смѐло жыву́ць и ро́бляць сваѐ ґнезде́чка пад стре́хами, й нихто́ их не чапа́е. А ча́сам и да ґэтаѐ пары́ узлета́юць ла́стаўки высо́ко, высо́ко к не́бу й крыча́ць, пла́чуць, сва́ратца з Бо́гам, на што Ен непазво́лиў им расхапа́ць ґвазды́, й паґа́ные жыды́ и́ми прыби́ли Хрыста́ к кры́жу. От чаму́ ґрѣх чапа́ць ла́ставак, бо ґэто бо́жая пту́шка.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

41. Цыган.

Прычапиуса к мужыку цыга́н.—Дай мнѣ́, ба́тю, са́ла; дай ме́ду; дай круп. — Берэ́ цыга́н у мужыка́ у́се, што ни у́ба́чыць. Нѣ́льга аткаса́тца ат цыга́на́, сле́пням у во́чы лѣ́зе.—Нема́ у́ мене́ са́ла,— ка́жэ мужы́к, — нема́ ни ме́ду, ни круп. От хиба́ кали́ у́жэ ты так пражэ́шса лизнуць ме́ду, та хадзѣ́м ткале́ падгля́дацъ пчо́лы.— Хадзѣ́м, хадзѣ́м, ба́тю! — ка́жэ цыган. Узя́у́ мужы́к липау́ку й зу́бленку, й пашли ены́ з цыга́но́м у лѣ́с. Со́нейко стаяло на пау́дни Печэ́, як у пе́чы.—Ото́-ж сма́лиць,—ка́жэ мужы́к,—и дава́й падо́лам саро́чки выцира́ть лы́сину. От падышли ены́ к ду́бу. На ду́бе высо́ко у́сця́гнуты у́лей. Мужы́к прыставиу́ астро́гу.—Ну, лѣ́зь,—ка́жэ цыга́ну́, — падгля́двацъ пчо́лы. — Палѣ́з цыга́н. Узабра́у́са к у́лью, прывеза́у́ себе́ поясам к ра́лу й дава́й атчыня́ць до́у́жень. То́льки е́н прыатчыни́у́, а аттуль як вы́сыплюць шаршне́ да пачну́ць цыга́на́ пекци́: кру́цитца цыга́н, бы вьюн у гаршку́. — Ба́тю, пада́й тэ́е!— крычы́ць мужыку́. Мужы́к узя́у́ липау́ку й хо́чэ лѣ́зци па астро́зе.— Нѣ́! пада́й тэ́э!—Мужы́к узя́у́са за сакѣ́ру.—Нѣ́, батю, пада́й тэ́е! — нѣ́мым го́ласам крычы́ць цыга́н. А тут шаршне́ ре́жуць его́, бы нажэ́м. — Ба́тю, жыу́ не бу́ду, — крычыць цыга́н, — пада́й тэ́е!—Ен хацѣ́у́ каб мужы́к скаре́й пада́у́ зу́бленку, але́ забы́у́са, як ена́ называ́етса. — А чарты́ цебе́ вѣ́даюць, — ка́жэ мужы́к, — што табѣ́ трэ́э, — й узя́у́са за зу́бленку. — Тэ́э, тэ... — кры́кнуу́ цыга́н и гры-ману́у́са далбу́, чуць печанцы́ сабѣ́ не атсадзи́у́. Насилу ачу́хау́са цыга́н. Але́ як мину́ласа бо́ль, та й забы́ласа, й цыга́н астау́са цыга́но́м: што у́ба́чыць, то́е й ця́гне, а кали́ не дао́ць, та сле́пням у во́чы лѣ́зе.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

42. Пŏп.

Быў адзін пŏп, да такі паґаны, што як еґó й земля насіла. Прóсто драў з людзéй шкýру. А да баб быў такі пáдки, што нéмаль усіх маладзіц перапрóбуваў Ужэ збірáлиса дзецюкі абстрыґци емý кóсу, да паперабивáць нóґи, алé баялиса ґрахý. Жыў у тŏм селѣ хлóпец, сиратá, алé вéльми ўдáлы, да ўсеґó здáтны. Перш ен слýжыў, пáрабкам, а пóтым зарабіў грóшэй, пабудавáў сабѣ хáту й завéў хаджáйство. Алé, вѣдамо, што ґумнó плáчэ без ґаспадарá, а хáта без ґаспадыни. Так и емý кéпсько без ґаспадыни. От давáй éн свáтаць сабѣ дзѣўку. Выбраў сабѣ сáмую ґóжую дзѣўку, а на вѣшняґо Микóлу ены й пабрáлиса. Жывýць Сéмко з Матрýнаю да Бóґа хвáляць. Матрýна ещэ пахарашéла. Убáчыў еѣ пŏп—и нижыў. трасéтца, бы асина, алé ничóґе не зрóбиць, бо Матрýна вельми любиць свайґó Сéмка. Алé ось пéрад дзисятухаю выладзила Матрýна свайґó Сéмка ў балóто рабиць сѣно Енá й самá хацѣла ѣхаць з им, алé ен кáжэ, што немá камý астáтца ў дамŏўцэ. Паѣхаў Сéмко адзін на цéлых дзвѣ недзѣли. Асталáса Матрýна аднá. Сýмно éй аднŏй У дзень ещэ ничаґýсьсенько, а прыдзе нŏчка—седзиць Матрýна да плáчэ От даў Бŏґ недзѣльку. Даґлéдзела Матрýна ґаспадáрку, сѣла калé акнá, пазирáе на заґумéчэ, як там дзѣўки з хлóпцами жартýюць, смеютца, пѣсни паюць, а сáмŏй так калé серца й завилó: апанавáў такі жаль, што не мóжэ вытрымаць — седзиць и плáчэ. Алé ось идзé пŏп и пытáе, чаґó енá плáчэ. — Так, бáцюшко, з дóбраґо рáю, — кáжэ Матрýна. Пŏп зайшóў у хáту, разсѣўса на лáве, пазирáе на Матрýну да ўсé кивáе ґалавóю.—Што гэто—кáа—Сéмко нарабиў?! Што-ж ґэто бýдзе?! — Спужáласа Матрýна, а пŏп кáжэ: „Як же ґэто мŏжна? Гэто-ж Сéмко недарабиў дзиця, ґэто-ж енó бýдзе без ґалавы“. Што-ж тут рабиць, бáцюшко? — пытáе Матрýна. — Што рабиць... Хибо ось я памалюса да дараблю табѣ дзиця.—И пачáў пŏп малитца да дзиця дарабляць да так захадзиўса, што Матрýна аж началá крычáць. Здавóлиўса пŏп и пашóў да

ґаспо́ды. Тым ча́сам зыска́ўса да ґаспо́ды Се́мко, а Матру́на й навали́ласа на еґо́, што ґэто́ е́н нарабі́ў. — До́брэ—ка́жэ—што по́п дарабі́ў дзіця, а то было-б без ґалавы́.—Даґада́ўса Се́мко, як по́п накпі́ў над еґо́ жо́нкаю й дава́й е́н ду́маць, я́к-бы замсці́тца пацу́. Ко́нчыласо лѣто. Узялі́са лю́дзи сѣяць жыто. Ба́чыць раз Семко, што по́п на аґаро́дзе берэ́ кано́пли; падхо́дзиць е́н бліжэ́й и про́сиць пажы́чыць бо́рану. —До́брэ,—ка́жэ по́п,—вазьми́ хаць абѣ́дзьве. Онь у павѣ́ци стаяць бо́раны. Там кале́ свиро́нка, мабыць, мату́ля з пане́нкаю мак бьюць. Скажы́ им, неха́й даду́ць абѣ́дзьве бараны́. Прышо́ў Се́мко к пападзі́ да й ка́жэ: „мату́лько, велѣ́ў ба́цюшко, каб вы й пане́нка далі́ мнѣ́ обѣ́дзьве“.—Што ты ґаво́рыш,—ка́жэ пападзя́, — не мо́жэ ґэто быць?! — Папыта́йцеса ў ба́цюшки,—ка́жэ Се́мко. Пападзя́ кі́нула пра́ник, падышла́ к пло́ту й пыта́е папа́: „а ци даць Се́мку?“—Да́йце, да́йце,—ка́жэ по́п,—да́йте обѣ́дзьве.— А што́? я каза́ў. — Ничо́ґо не зро́биш,—трэ́ба ба́цюшки слу́хаць.— Павелі́ ґэто ены́ Се́мка ў свиро́нак и далі́ обѣ́дзьве: перш пападзя́, а по́тым—пападзя́нка. Пападзя́-ж ничаґу́сьсенько, на́вет вѣ́льми даво́лна, — спадабала́со, а пападзя́нка такі́ аж заплака́ла, не хацѣ́ла дава́ць Се́мку. Ма́быць у єѣ́ бы́ў якись сво́й пани́ч. Спра́виўса Се́мко да й пашо́ў да ґаспо́ды. Седзі́ць пападзя́ з дачко́ю, маўча́ць: со́рам им адна́ друґо́й у во́чы зирну́ць. Ось прыхо́дзиць по́п. Не ўспѣ́ў е́н пераступі́ць це́раз паро́ґ, як на еґо́ накі́нуласа пападзя, як жыды́ на ґа́мана, крычы́ць: сякі́, такі, ты! Неха́й то ужэ́ мене́ знева́жыў, дак нашто́-ж ты сказа́ў, каб ещэ́ й Ма́ша дала́. Тут по́п даґада́ўса, што еґо́ Се́мко падману́ў, прасі́ў баро́н, а ўзя́ў жо́нку й дачку́ й рабі́ў з і́ми, што сам хацѣ́ў. Злу́е по́п, як сам себе́ за сра́ку не ўку́сиць, але́ ўжэ́ ничо́ґо не зро́биць От на друґі́ дзень, сустрака́е е́н Семка, параўня́ўса й ка́жэ: „Дзеньдо́бры, Се́мко. баро́н пазыча́ўшы!“ А Се́мко: —дзеньдо́бры, ба́цюшко, дзецѐй дарабля́ўшы.—Прыкусі́ў по́п язы́к и пасу́нуў да́лей.

Пересказалъ Яковъ Керножицкій.

Сел. Бѣлое Болото.

43. Вельми навучны.

Жыў сабѣ жыд слаўны да ґучны да вельми навучны Ен ничоґо не ґлядзѣў, тольки на библи седзѣў, бо таки розум маў, што й на свѣт не пазираў; на земли й пад землею ўсе бачыў, усе знаў и никоґо не пытаў. Раз мужык падняў драбины да й паставиў их к страсѣ. Думаў, як жыды навучнаґо рабѣя там абступяць, та с страхи йґруш ен натрасе. Да жыды ўбачыли драбины, а на их дзиўнае дзиво: над страхою верх драбин карова абмарала. Жыды думали, думали, судзили да к такому дзиву розуму не прылажыли. Доўґо гергетали да й па вельми навучнаґо паслали. Падышоў ен пад драбины, прыцис к илбу палец и стайць, мыслюе. А тым часам сверху свѣжы ґной цечэ з страхи да долу да й якраз навучнаму на морду. Тут ен цыцальникам уцер трохи морду да й прамовиў слово, да такое слово, што аж пах пашоў. Жыды слухаюць ушами, нюхаюць насами. А круґом той запах ходзиць, бы ў хлевѣ весною. От сказаў той жыд вельми навучны: „карова стала на лоб, уперласа на роґи, а хвастом сверху закруцíласа да й намарала на драбины“. Жыды пацмокали, пакивали ґалавами да й павели пад руки вельми навучнаґо рабѣя ў хату. Идзе рабѣй и ноґ не падымае, тольки шмыґае пантоплями. „Ой, яки-ж ен разумны, яки-ж ен письменны“—кажуць жыды. Тым часам рабѣй залѣз пантоплями ў самую кучу. Тут пашоў ещэ лѣпш таки пах, што й жыды насы пазатыкали.—Ой, яки ен навучны, яки ен разумны!.. Гэто ен зрабиў, каб паказаць, што мы проциў еґо—пфэ!—Тут падышоў мужык, ен паґлядзѣў, паслухаў да й кажэ: „Пархуцьки вы, пархуцьки паґаные, разам з сваим рабѣям! Ен таки письменны таки навучны таки разумны, што за розумам и свѣту не бачыць“.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

44. Мудры Салимон.

Не было́ на све́це разумне́й чалаве́ка, як Му́дры Салимо̆н. Салимо̆н знаў усе́, што ро́битца на не́бе и ў земли́, знаў зачы́м и дзеля чаго́ усе́ на све́це так, як е. То̆лько трох рэ́чэй не знаў Салимо̆н, ѓэто—на што на све́це павук, ѓад и блаха (ско̆чка). И ду́маў Салимо̆н, што Бо̆ѓ абману́ўса й сатвары́ў павука́, ѓа́да й ско̆чку, а што ены́ на све́це не патрэ́бны.

Але ось у ца́рстве Му́драго Салимо̆на быў меце́ж. Салимо̆н сабра́ў во̆йсько и пашо̆ў на меце́жникаў, але́ к тым падышо̆ў не́прияцель. Во̆йська ў его́, як це́мная хма́ра. Би́ўса, би́ўса Салимо̆н,—ничо̆го не збро̆биць: его во̆йсько кладзе́тца, бы трава́ пад касо́ю. Ба́чыць Салимо̆н, што прышла́ беда́, ки́нуў е́н во̆йсько, а сам пабе́ѓ у ѓоры. Ба́чыць не́прыяцель, што Салимо̆н уце́к у ѓоры й паѓна́ўса за им. Бе́ѓ, бе́ѓ Салимо̆н, спатыка́етца, зады́хаўса, да́лей бе́ѓци не мо́жэ; от и зале́з ен у печо́ру. Седзи́ць там, дрыжы́ць,—баитца, каб не́прыяцель не закме́ў его́ ў печо́ры. Тым ча́сам паву́к дава́й наця́ѓваць свае́ павуце́не ў прахо́дзе ў печо́ру. Ду́хам сплёў паву́к павуце́не да й чака́е, паку́ль прылеци́ць му́ха. Падбе́ѓ не́прыяцель к печо́ры, ба́чыць, што там павуце́не — не́, — ду́мае.— тут нема́ нико́го даўно, бо ўжэ паву́к зацяѓну́ў павуце́не,— й пабе́ѓ да́лей. Пражда́ў Салимо̆н, паку́ль прабе́ѓ не́прыяцель, вылез з печо́ры й пашо̆ў да́лей. Идзе́ е́н да йдзе, ўтами́ўса й ле́ѓ атды́хаць. Ле́ѓ и засну́ў. Спиць Салимо̆н, не чу́е, што не́прыяцель ужэ́ саўси́м бли́зко падышо̆ў. От, от убачыць не́прыяцель Салимо́на й забъе́ его́. То̆лько ось ско̆чка вельми мо̆цно ўкуси́ла Салимо́на за са́мае балю́чае ме́йсцо. Салимо̆н прахапи́ўса ат бо́ли. Чу́е, аж не́прыяцель бли́зко, бежы́ць, аж земля́ сто́ѓне. Усхапи́ўса Салимо̆н да як пу́сцитца наўцекача́,—то̆льки его́ й ба́чыли. Уце́к Салимо̆н, а не́прыяцель усе́ таки́ бежы́ць за им. Бе́ѓ, бе́ѓ Салимо̆н, спатыкну́ўса й пакаци́ўса з ѓары́ ў до̆л. Усхапи́ўса Салимо̆н, пабе́ѓ да́лей. Ба́чыць

ён, аж у далине только ґаду, што аж кишыць. Хуценько прабѣґ Салимон, только раздранжиў ґадзюк, але ены не ўкусили. Тут слѣдам за Салимонам бежыць непрыяцель. Толко ен сунуўса ў далину, а тут як нападуць на еґо сердзитые ґадзюки, дак ён и звиўса ат боли. Бачыць Салимон, што непрыяцелю прышли капцы, вернуўса ў сваё царство й зноў пачаў царствуваць. С таѣ пары Салимон даґадаўса, на што Боґ сатварыў павука, ґада й скочку, даґадаўса, што ён и Мудры Салимон, а боскаѣ моцы не знае. Даґадаўса, што ўсе на свѣце патрэбно, бо свѣт не можэ стаяць, кали-б не было й таґо, што нам здаетца лихим. Праўду кажуць, што без лиха нема й дабра.

Пересказалъ Ив. Аземша.

С Лучицы

45. Писар.

Быў адзин лихи пан. Цяжко пад им жылосо людзям: цѣлы тыдзень хадзи на паньщыну, а што зробиш у недзѣльку, й тое атдай пану. Та ему давай сушаных ґрыббоў, та назбирай рыжкоў, та яґад—усе ему трэ. Даўнѣй, як дасць Боґ зиму, цѣлы абоз хурманак плищаць уселякае дабро ў мѣсто, або ў други двор. Самоґо пана немаль николи не бачно было, бо ён усе ѣздзиў заґраницу, ци ў Аршаву. Раз доўґо пана не было ў дваре, й пашла чутка, што пан суздром не вернетца, што ён прадаў маентак якомусь друґому пану. Хто их там вѣдае, мо й праўда, — кажуць, батцэ той пан за пару заґраничных коней и петок яких-сь сабак атдаў увесь маентак с людзьми. Але ось па немалом часе приѣхаў новы пан. Сабраласа ґрумада й давай радзитца, як тут далей жыць, вельми-ж цяжко было жыць пад тым панам, ци не можна упрасиць новаґо пана, каб ён трохи збавиў паньщыну да падатки. Радзиласа, радзиласа ґрумада й прыґаварыла прасиць новаґо пана, а каб усе добрэ сказаць—вѣдамо, мужык цемны, не скажэ, як трэ—

прыгаварыли написаць пану ўсе на папѣры. Алé як жэ тут написаць, кали нихто не ўмѣе. Карбавадь ены ещэ добрэ ўмѣюць, алé писаць,—ани ў зуб. Прачули ены, што ў местэчку е якись пьянчужка писар и што ён умѣе вельми добрэ писаць. Пишэ дробно, бы макам сыпле, а гдзѣ трэ—кругло, бы яйца й так накруциць, што только вельми письменны бачыць, што там написано. От прывезли ены таго писара, паставили ему кварту гарелки й просяць, чапкуюць, каб ён ужэ добрэ написаў пану. Только писар цѣлы тыдзень пиў да ѣў яечни, а писаць не браўса.—Трэ ўперод нажэндзе—кажэ писар. Папѣру аркуш хлопцы купили ў местэчку ў кромцэ. Тым часам писар велѣў назбираць дубовых арешкаў да насушыць их, а сам пашоў у кузню. набраў там с пад тачыла вады, налиў еѣ ў гарщок, насыпаў туды дубовых арешкаў и паставиў гарщок на пѣч Праз тры дни ўзяў ён той гарщок, аж там атрамант, чорны, бы сажа. От нанесли гэто писару су сего села гусинаго пѣрья. Нарабиў ён сабѣ цѣлы пук пѣрьеў.—Ну,—кажэ,—цепер давайце ещэ гарелки, каб легчей рука хадзила. Дали ему гарелки. Писар выпиў с паўкварты, агурком закусиў и давай писаць. Сышласа грумада людзей. Адзин кажэ: „напишы, каб пан даў на дым па пяци коп жэрдзя на плот“.—Пишы, каб пан збавиў падатки—кажэ други. Много гаварыли мужыки писару. каб ён писаў. А ён пацягне з пляжки гарелки да так пишэ, што перо скрыпиць, бы не мазаные калеса Пишэ писар, аж пот на йлбу выступиў, батцэ не пером, а сакѣраю дрова пляжыць. А лоб у его велизазны, й галава голая, хаць боб малаци. Написаў писар. Мужыки паставили крыжы й дзякуюць писару. Сабрали ему су сего села курэй, яец, арехаў, меду, сала,—хто што мѣў. Паехаў сабѣ писар да гасподы, а мужыки сабралиса й гуртом пашли к пану. Вышаў пан на ганак и пытае, чаго ены прышли. Мужыки целюх пану ў ноги й падаюць прашэне. Узяў пан у руки папѣр, перачытаў и кажэ: „дзякуй ваш хлопцы, што вы мнѣ даецé з дыму на валу, па копѣ яец и па асьмине аўса“. Пераглядваютца му-

жыки́, насилу разшалопали, што ґэто пан кажэ. Доґадалиса ены́, што писар их абмануў, але ничоґо не зробиш,—трэа атдаць пану, што написали. Пашли мужыки да ґасподы, аж кудлы дзеруць, так им шкода дабра. Идуць, а адзин и кажэ „э, хвареўць вашуй ма тары, падвели й мене. Я таґды знаў, што ен пишэ. Бачу—пишэ великае да й закруцицъ. Ну, думаю, ґэто валы крутароґие. Пишэ круґлае. От ґэто вам яйца, а дробнае—от вам авес“. — Чамуж ты таґды не казаў?—Крычаць мужыки, й давай еґо лупцаваць. Пабилиса мужыки, пабожкали й пашли збираць пану аўес и яйца

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы.

---

46. Дзеды.

Стары, як малы Усѣ людзи на старасци дзецинеюць. И сабака на старасци не брэщэ. Пастарэў, та й сапсѣў.
Прыказки.

Вѣдамо, ў самае жниво ўсѣ пашли на работу; асталиса ў селѣ только старые, да малые. Малые перасыпаюць песочак, або з еґо аладки пекуць, ци ямачки капаюць, а старые седзяць ў кажушкох на прызбах да ґреютца на сонейку, бо вѣдамо, на старасци дак и ў лѣтку холадно.

От высунулиса сабѣ два старэнькие дзеды-сусѣдзи, ґреютца на сонейку да ґледзяць, як дзѣци ґуляюць. Напрыкрало им седзѣць без работы, от адзин и кажэ,—паведом коней на пашу.—Добрэ,— кажэ друґи,—только давай мы будзем ґаварыць, бы дзѣци, мбо ещэ й памаладзѣем.—Добле—кажэ друґи дзэд. Узели ены́ коней, вывели за село ў хмызник и пусцили на пашу, а сами сѣли й давай перасыпаць песочак. — Дай злобим жыжу.—Злобим да спеком яеценьку.—Добле, спеком. Наклали ены́ аґню й давай пекци яечню. Спекласа яечня. От адзин и кажэ: „збѣґай ты, паґлядзи, ґдзѣ коси“. Пабѣґ адзин дзэд за кусты, ґлядзѣць коней, а друґи тым часам и

ззѣў яёчню. Прыхóдзиць пóтым той и пытáе: „а ґдзѣ-ж яéценька?“— Зи́жа ззѣла—кáжэ другі́ дзѣд. Прамаўчáў той, а пóтым кáжэ: збѣґай, паґлядзи́, ґдзѣ коси.—Другі́ дзѣд скинуў свóй кажу́х и пацéґса за кусты́ ґлядзѣць кóней. Гэ́ты дзѣд тым чáсам ускинуў кажу́х другóґо дзѣда на аґóнь и дрóў падлажы́ў. Зґарэ́ў кажу́х, як перó. Прыхóдзиць той дзѣд и пытáе: „а ґдзѣ-ж мóй казусóк?“— Зи́жа ззѣла—кáжэ дзѣд. Тут давáй ены́ ту́затца за каўту́ны́ да лáятца на чóм свѣт стайи́ць. Забы́лиса, што й ґавары́ли, бы дзѣци. Пабили́са дзеды́ й пашли́ на суд. Су́дзьи пытáюць, за што ены́ били́са Раскáзваюць дзѣды́, як былó. Адзи́н кáжэ, што другі́ дзѣд спалиў еґó кажу́х.—Кали́ ж тóе былó?—Пытáе другі́.—Хибá ж ты не паметáеш? А як мы ещэ гаварыли, бы дзѣци.—Як жэ тóе былó— пытáюць судзьи.—От перасыпáли,—кáжэ дзѣд,—мы песóчак, а пóтым зрабили жы́жу й давáй пекци́ яёченьку. Спекли́ яёченьку: я пашóў паґледзѣць кóней, а éн ускинуў мóй кажу́х на аґóнь и кáжэ, што еґó жы́жа ззѣла.—Пасмея́лиса судзьи, што дзеды́ здзеци́нели й на стáрасци узду́мали аб тóм судзи́тца, што ещэ таґды́ былó, як ены́ ґавары́ли́, бы дзѣци.— Идзѣце вы, старэ́нькие за пѣч да седзѣце там ци́хенько—кáжуць судзьи. Так ничóґо й не парáдзили дзеды́. не слу́хаюць их да й тóлько.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

47. Мужык и Пан.

Быў сабѣ адзи́н пан да таки́ паґáны, злóсны, што прóсто бедá. Ніхтó не мóґ ему ўґадзи́ць. Усѣ еґó баялиса, бы чóрта. Бывáло як пры́дзе к ему́ хто чаґó кóльвек прасиць, а éн раптóўне й кры́кне: „што скáжэш?“—Той кáа: „ўсé дóбрае, панóчку“,—а сам дрыжы́ць, бы асина.—А па дóбрум што?—Закрычы́ць пан.—На канюшню еґó галгана.—От так не дась и слóва прамóвиць. Инáчей éн и не

ўмѣў з людзьми́ ґаварыць. И баялиса-ж людзи ґаварыць таму пану, што нибуць кепськае, не пад ґумар, — засечэ, ўсю шкуру зниме, кали хто не патрапиць сказаць ему так, як ен хочэ, а скажэ не па шэрсци. Тольки быў адзин нехлемяжы мужычок, дражнили еґо Стопкам, той умѣў з тым панам ґаварыць. От раз той пан иґраў у карты да й выиґраў вельми харошы маентак. От ґэтак весною, кале Миколы паѣхаў пан аґлядаць той маентак да й астаўса там на ўсе лѣто. Бачыш, ему вельми спадабаўса той маентак. Праўду-ж кажуць, што новае ситко на калочку висиць, а старое пад лаваю лежыць. Бачыць акамон, што доўго немаш пана, а тут у двары беда на бездзѣ ѣдзе да й бедою паґаняе, от ен стаў думаць, як бы завѣдамиць пана. Думаў-думаў да й надумаўса паслаць к пану пасланца. Тольки не вѣдае, каго паслаць, каб ен добрэ расказаў пану пра ўсе нещасце. Каґо ен ни пашле, ўсѣ не слухаюць, — баятца пана, каб за праўду не засѣк. Абецаў ен велики ґасцинец таму, хто пойдзе к пану. Перабраў усе село — нема ахвотника. Не знае акамон, што рабиць, — седзиць да ломиць руки. Прачуў пра тое Стопак, пашоў к акамону й кажэ: „я пайду к пану й усе ему скажу; я ўмѣю, як з им ґаварыць“. Рад акамон, чуць не цалуе Стопка. От акамон даў Стопку цѣлую жменю ґрошэй, чобаты с сваих нох и пасылае еґо к пану ў новы маентак. Идзе Стопак и ни аднаѣ карчмы не минае. Ци доўґо ен ишоў, ци мало, тольки ось прышоў у новы двор. Падходзиць к пакоям, аж там сустракае еґо лѣкай. — Ты чаґо тут шляешса, валацуґа! — крыкнуў лѣкай на Стопка й давай еґо цкаваць сабаками. Стопак дастаў з веренькі кусок сала й кинуў еґо сабакам. Сабаки ґодзи брахаць. Тым часам Стопак узышоў на ганак. — Што табѣ трэба? — Пытае лѣкай у другае. — Мнѣ трээ бачытца з панам, — кажэ Стопак. — Прышоў я, паночку, з стараґо паньскаґо двара. — Добрэ, — кажэ лѣкай, — я скажу пану аб табѣ, але скажы-ж ты мнѣ, аткуль ты знаеш, што я пан? — Атуль знаю — бачу. Ты пан — не пан, а так сабѣ — палупанак, бо ў цебѣ нос низки, лоп слизки, от и бачно, што лизаў паньские

палумиски.—Хацѣў тут лёкай ухвациць Стопка за каўтуны да, як кажуць, пасла́ць его з валасяного апраўленя да ў земськи суд, але тут як раз лёкая пазваў к сабѣ пан.—Яки там хлоп?—пытае лёкая пан. — То посланы от пани з панськаго маентку, — кажэ лёкай —А позваць его до крадэнсу.—Пабѣґ лёкай зваць Стопка к пану. А Стопак тым часам дастаў капшук, напхаў у люльку цюцюну, выняў з маґалѣйки ґубку й краменец, узяў цаґало й давай красаць аґонь. От выкрасаў ен аґню й давай курыць люлячку, курыць сабѣ да паплеўвае на чысты памост — Идзи, — цебе пан заве,—кажэ лекай.—Не трасца трасе. нехай абажджэ,—кажэ Стопак и пакурвае сабѣ люлячку — Прандзэй пдзи! - - Зараз, зараз, только люльку дакуру.—Ждаў, ждаў пан Стопка -не даждаўса. Гониць у друґае лекая па Стопка. А Стопак аґинаетца да шавелитца, бы мокрае ґарыць. От ен дакурыў люльку, выбиў з еѣ попел и схаваў за пазуху, й только таґды памаленьку пасунуўса к пану ў крэданс. Лёкай, бы сабака, бежыць па перадзе да атчыняе дзвёры. От улѣз Стопак к пану ў крэданс да й закашляўса. Рыґае Стопак, а пан чакае да тольки вусы круциць.—Дзеньдобры, паночку!—А цо новеш?—пытаетца пан.--Усе добрае, паночку.—А па добрум цо?—Да от, паночку, мене прыслаў акамон . Паньськи сцизорык зламаўса.—Яки сцизорык?—Да ґэто-ж, мабыць, той, што пану перья рабили.—Як жэ его зламали?—Кажуць жэ, пане, што без нажэндзя й вошы не забьеш. Але ўселякае нажэндзе пры рабоце псуетца. От так и паньськи сцизорык. Хацѣли пану на боты злупиць з выжла шкуру. узели сцизорык.. Але на паньськум выжлу вельми-ж моцная шкура... Сцизорык и зламаўса.—Якего выжла? Цо ты плецеш, галган!—Паньськи выжал; той самы, можэ пан паметае, ен ещэ ўскочыў у калодзесь, а Микиту паслали даставаць да ен и ўтапиўса там. Эґэ ж, той самы выжал, што пан любиў его браць на палеване. Э-ж, дай Божэ памець, здаетца мнѣ, што пан атдаў за таґо выжла сусѣдняму пану трох мужыкоў.—Цо ж, мой выжэл здэх?—Здох, пане. — З чэго-ш он здэх? — Кажуць, паночку, быў здарбў,

але́ як кани́ны абъѣ́уса, дак ра́зам и но́ґи вы́пруциў. — Якей кони́ны?—Да мья́са-ж жарабца́.—Яке́го жжэ́бца?—Па́ньськаґо-ж була́наґо жарабца́, з лысинкаю. — Цо ж, и он здэх? Здох, пано́чку. А шко́да—до́бры быў жарабе́ц. — Я несченсли́вы' — Э, па́не, чаґо́ вѣ́льми турбава́тца? Ужэ-ш вѣ́дамо, кали́ жарабья́тко ўро́дзитца з лысинкаю, та ено́ ци здо́хне, ци еґо́ воўк ззѣ́сць.—З чэ́го-ш жжэ́бец здэх?—Падарва́ўса, ма́быць.—Цо-ж на ним роби́ли? Прэ́нтко ездзи́ли, чы со?—Нѣ́, па́не, на е́м не ѣ́здзили; за́ўжды е́н стая́ў на ста́йни. — А цо-ж? — Во́ду, па́не, вази́ли. — Але-ж на́ цо была та во́да?—Лю́дзи-ж ка́жуць, пано́чку, што як то́пишса, та й за брытву хо́пишса. От як заґаре́ўса ў двары свину́х, дак акамо̆н велѣ́ў и на жарабцу́ во́ду вази́ць.—Цо-ж и свину́х спа́лилсе?—Зґаре́ў, пано́чку.— Як-жэ он запа́лилсе?—Ба́чыж, па́не, е́н быў бли́зко кале́ або́ры, от ат еѣ́ й заґаре́ўса.—То й або́ра пали́ла сен?—Гаре́ла, пане, як свѣ́чка.—С чэ́го-ж она запали́ласен?—От ґэ́таґо, пано́чку, до́брэ не вѣ́даю, ци ат або̆зни, ци мо̆о ат пако́яў.—Езус Ма́рья! то й поко́и зпали́лы сен?— Зґаре́ли, па́не, суздро́м усе змо́кло. от як-бы хто языко́м злиза́ў.—И вшы́стэк дво̆р зпа́лил сен?—Уве́сь, па́не: чысто, ґла́дко, хаць рѣ́пу сѣ́й.—Ухвациўса тут пан за ґо́лаў и дава́й бо́жкаць.—Але́ з чэ́го-ш запали́лы сен поко́и,—пыта́е зноў пан Сто́пка.— Ат свѣ́чак, па́не,—ка́жэ Сто́пак.—Для чэ́го-ж пали́лы свѣ́цы?—Ну, як-жэ, па́не? Вѣ́дамо, заўсю́ды свѣ́чки па́ляць, як хто памрэ́.— Кто̆-ж там зма́рл?—Вѣ́чны пако̆й, каб е́й на то̆м свѣ́це ле́хко икну́ласо,—па́ни паме́рла.—Цо, цо? Цо ты га́даш? Па́ни зма́рла? О, я несченсли́вы!..—Дава́й тут пан пла́каць, убива́тпа.—Чаґо́-ж пан пла́чэ? Па́ну-ж Бо̆г даў и прыбы́так.—Яки? Гада́й прэ́ндзэй!—Пану Бо̆ґ даў уну́ка. Бо̆льшая па́ньськая пане́нка сы́на мѣ́ла. Го́жы, ка́жуць, хлапчу́к, ци бо пани́ч, от рыхтык як вы́литы па́ньськи хўрман Мики́та.—Пачу́ўшы то́е пан звалиуса з кре́сла, а Сто́пак пашо́ў сабѣ́ ў пека́рню падвечо̆ркуваць. Дак от яки́ быў Сто́пак и як ӗн умѣ́ў з пана́ми ґавары́ць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ.

48. Асилак.

Жыли́ сабѣ́ дзѣд да ба́ба. Жыли́ ены́ ў зго́дзе: любилиса-каха́лиса ўсе жы́це. Ра́зам ґарава́ли, працава́ли, ра́зам атдыха́ли. И былі́ щасли́выє, то̆льки ў адно̆м не да́ў Бо̆ґ им уцѣ́хи — пражылі́ ўвесь вѣк и не ма́ли дзецей.—Хто нам на ста́расци вады́ пада́сь?—Часто ґавары́ла ба́ба й хвартухо́м уцира́ла слёзы.—Не плач, ба́бо—развaжа́ў еѣ́ дзѣд,—нихто́, як Бо̆ґ. Ён ми́ласливы, мо ещэ́ й пара́дуе нас на ста́расци.—Ба́ба пакида́ла пла́каць и ци́хенько смея́ласа. Быва́ло еѣ́ во̆чки блища́ць ат ра́дасци, дармо́, што твар бы раля́ ўвесь змо́рщыўса. Вѣ́дамо, чалавѣ́к нико́ли не ки́дае надзѣ́и на щасце, бо без надзѣ́и нѣ́льга жыць на свѣ́це. Ча́сто маладзи́цы праси́ли ба́бу, каб ена́ ба́била ў их дзецей. Але́ ба́ба ўсе атпира́ласа, бо вѣ́дамо, ена́ бая́ласа, што як ро́дзитца ў еѣ́ дзиця́, та еґо́ бу́дуць звaць ба́бичам да пасмиха́тца. От раз дзѣ́д быў на ґумнѣ́, а ба́ба ўхаджа́ласа кале́ пе́чы, пекла́ ала́дки. То̆льки ось клубо́к аґню́ ўско́чыў праз вакно́ да й кача́етца па ха́це. Спало́халаса ба́ба, не вѣ́дае, што раби́ць. Кача́ўса-кача́ўса клубо́к аґню́ да й падкаци́ўса ба́бе пад но́ґи. Ба́ба ўхваци́ласа за падо̆л, але́ чу́е—штось у еѣ́ памиж но̆ґ шалпо́чэ. Не паспѣ́ла ба́ба ачухатца, як чу́е, што ў еѣ́ штось залѣ́зло да й вару́шытца у ланѣ́. И ста́ло ба́бе так до́брэ, што ена́ аж прысѣ́ла. Млосць узела́ ба́бу. Дацяґла́са ена́ да по́лу да й прылеґла. Ци до́ўґо, ци ма́ло ена́ лежа́ла, то̆льки ось ачу́халаса трохи да й дзи́витца, штоб ґэто было́. То̆льки ось зажада́ласо ба́бе, як жыво́е вады́ та аселе́нца, та тара́на́, та о́цту. Заґаня́ла ена́ дзѣ́да, каб е́н даставáў е́й усе́, чаґо ена́ пражэ́тца. Пачала́ ба́ба ґавары́ць маладзи́цам, чаґо́ е́й жада́етца, а ты́е й ка́жуць, што ґэто на маладзе́е. Пасми́хаютца маладзи́цы з старо́ѣ ба́бы, а ена́ ўсе не вѣ́рыць. Але́ ось жыво̆т пача́ў круґлѣ́ць. Павѣ́рыла ба́ба, што ена́ чарава́тая й ра́да, бы на свѣ́т нарадзи́ласа. Але́ ось и радзи́ўса ў еѣ́ таки́ ґо́жы хлапчу́к, што ўсѣ́ й надзиви́тца не мо́ґуць. Узели́ еґо́ ба́биць; ба́чаць, аж у еґо́ тры чо́ртавы рабра́. От ба́тцэ абручы́

так и тырчáць. Падзивíлиса бáбы да й кáжуць, што мáбыць ґэто бýдзе асíлак. От расьцé хлапчýк да сíлы набирáетца. И скóро éн стаў такí дýжы, што еґó ни адзíн сáмы здаравéнны мужчына не мажэ пабарóць Вырас асíлак, вабрáўса ў сíлу й давáй éн збирáтца ў свѣт. Як ни ўпрашáли дзѣд з бáбаю, каб ен не пакидáў их на стáрасци,—кудыí там.—Немá чаґó мнѣ тут з вáми седзѣць да курэй заґаняць. Я пайдý шукáць вараґóў и ци сам заґíну, ци вараґóў заґублю Немá чаґó рабíць—прыбрáли дзѣд з бáбаю свайґó сынкá ў велíкую дарóґу й с плáчам правелí еґó за селó Тут енí папращáлиса й вернýлиса да ґаспóды, бо дáлей не маґлí йци,—вéльми ўжэ былí старэнькие Вайшóў Асíлак—так еґó ўсѣ называ́ли—у цéмны лѣс да так засвистáў, што аж лíсце пасыпаласо Спалóхалиса птáшки, пахавáлиса ў вѣтки, абó ў лом. Спалóхалиса дзíкие зверы, пахавáлиса, хто кудыí мóґ Жылó у ґэстóм лѣсе сем братóў, сем разбóйникаў. И нихтó не смѣў прайцí, абó праѣхаць праз той лѣс. Жылí енí там и никóґо не баялиса. От начýли разбóйники той свист и пашлí прóсто на Асíлка. Тым чáсам Асíлак вышаў на парасéльку, наклáў аґню, седзíць сабѣ да на ражэньчыку печэ сáло. Тут еґó разбóйники й абступíли атусюль.

Якие вы людзи й што вам трэ̄э—пытáе Асíлак.—Хто ты такí, што пасмѣў прыцí ў наш лѣс?—пытае старшы разбóйник.—Хто я—пазнáеш, як памѣраешса са мнóю сíлаю, а лѣс не твой, а божы а й. Бóґ даў лѣс на наґрэбу ўсим людзям — Гэто наш лѣс; ґэто нáшэ пáньство. Мы тут тýбальцы с дáўных час.— Вы разбóйники. Вы разбóям запанавáли ґэтым лѣсам. А я прышóў, каб атабрáць у вас бóжую пýшчу й даць усíм людзям.—Гэ, які ты мóцны' Давáй перш пабóрэмоса, хто з нас дужéйшы.—Давай.—Узяў старшы разбóйник залѣзную булавý ў дзесяць пудóў и стаў пéрад Асíлкам. Асíлак азирнýўса круґóм, бáчыць—непадалéчку стайць велíзазны дуб, што ў трох не абняць. Ухвацíў ґэто Асíлак таґó дýба да й вырваў з карéнем. Убáчыли тóе разбóйники, спалóхалиса й давай прасíтца, каб éн не ґубиў их.—Будзь у нас старшым и таґдыí мы

ўсим свѣтам запануем.—Нѣ—кáжэ Асилак,—не затым я прышоў, каб свѣтам панавáць, а затым, каб аслабаниць свѣт ат панбў, бо ўселяки чалавѣк сам сабѣ пан. А хто хóчэ быць пáнам над другими людзьми, той мóй вóраг.—И давáй тые сѣм братбў, сѣм разбóйникаў прасиітца, каб Асилак узяў их к сабѣ ў тавáрышы — Дóбрэ—кáжэ Асилак. И пашли ены рáзам. Идуць сабѣ ены да йдуць ат аднагó селá да другóго. И ўсюды Асилак усé аднó кáжэ, што ўсѣ людзи сáми сабѣ паны, што ўсе Бóг даў на патрэ́бу ўсим людзям У егó аднá прымóўка былá. Ен еѣ зáўжды гаварыў — ѣж хлѣб и людзям дай. И — живи, спажывáй, да людзéй неўжывáй. Вѣдамо, хто любиць кусáтца, та й тагó другие кусáюць. И пачáў Асилак навучáць, каб людзи жыли ў згóдзе да ў лáсцэ.—Тагды—кáжэ — нияка́е лихо з ими не спрáвитца, бо згóдная грумáда, бы адзин велики чалавѣк, велики багатыр, дужéйшы ўсих багатырбў. Пашлá тáя прачутка на ўсему свѣту. Спужáлиса паны й давáй лавиць Асилка. Дóўго ены шукали егó да ўсе не магли знайци. Алé ось тые сѣм братбў, сѣм разбóйникаў захацѣли сáми быць панáми, от ены згаварылиса й выдали Асилка Паны рáды, называюць разбóйникаў сваими братáми, чапкуюць пéрад ими й даюць им маéнтки, мнóго грóшэй и ўселякагó дабрá Давáй гэто разбóйники падмаўляць людзéй, каб ены выдали мецѣжника-Асилка. Адных падмóвили, других застрáшыли, а трэ́йких падпаили. Вѣдамо, зáўжды мнóго знайдзетца дурных людзéй, што ены гатóвы сáми ў верóўку лѣзци. Ены й сказáли панбм, гдзѣ живé Асилак. Набрáли гэто паны маскалéў и напáли на Асилка. А вѣдамо маскáль. Ему як прыкáжуць, та ен и рбднагó бáцька зарéжэ. Асилак тым чáсам ничóго не вѣдаў и лéг на супачынак Тут маскалѣ напáли на егó, скрампавáли верóўками й ведуць к панбм. Сабралóсо мнóго людзей. Шкóда им Асилка, да немá чагó рабиць Не магуць агабрáць у маскалéў дóбрагó чалавѣка. Ведуць маскали Асилка ў двбр, а людзи цягнутца ззáду. Мужыки маўчáць, апусциўшы гóлавы, а бáбы плáчуць да бóжкаюць. „На кагó-ж ты нас пакидáеш? Хто-ж нам скáжэ дóбрае

славе́чко?" Тым ча́сам сабрало́со пано̆ў, што хаць ґаць ґаци да па ґалава́х хадзи́. Бы ваўки́ над па́длам завыли, што Аси́лка злави́ли. Смею́тца, жу́пяць, ру́ки пацира́юць да яку́ю прыду́маць ка́ру выбира́юць. Адзи́н ка́жэ—шку́ру з жыво́ґо садра́ць; друґи́ кажэ — ганталеў у цѣло назаґаняць; трэ́йци ка́жэ — павѣсиць за язык, каб увѣть свѣт знаў, што пан, та не мужы́к; чацьво́рты ка́жэ — язык атрѣзаць да но́ґи перабиць, каб не мо̆ґ па свѣту хадзи́ць, не мо̆ґ ґаварыць да людзе́й вучы́ць. Паку́ль ены́ крычали да ка́ру прыдумля́ли, Аси́лак страпену́уса, веро́ўки парва́ў да й да людзей сказа́ў: „братки́, кали́-б пано̆ў чорт узя́ў, таб свѣт беды́ не маў, а без ґарапа́шникаў мужыко̆ў не было́-б ни хлѣба, ни асьмако̆ў. А каб ґэтае ли́хо злама́ць, трэ̄э ўсим, як адзи́н чалавѣк стаць; не ґры́зциса прами́ж сабо́ю, да ат вараґо̆ў барани́тца ґурбо́ю". — Так сказа́ў Аси́лак и зник; то̆льки клубо́к аґню з таґо́ мѣ́йсца пакаци́ўса па земли́. Спало́халиса паны́ й маскали́; стая́ць да дрыжа́ць. Ачу́халиса ены́, азира́ютца, бы ваўки́ ў ваўкаўни́. А Аси́лак ка́жуць и датых час па свѣту ґуля́е да людзе́й навуча́е. Але вѣ́дамо, мужыки́ дурны́е прами́ж сабо́ю ґрызу́тца, пе́рад панами-вараґа́ми ґну́тца, са́ми себе́ за ґубы́ трыма́юць и дабра́ не ма́юць. Але́ пе́ўне ху́тко то́е бу́дзе, што ко̆жын сам сабѣ́ па́нам бу́дзе. Усѣ лю́дзи бу́дуць ро̆ўно ґарава́ць, бу́дуць ро̆ўно панава́ць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

---

49. Висельник.

Пе́ўне зна́еце Дани́ла Канцаве́йка з Пира́чыч. Дак от з ґэ́стым са́мым Дани́лам мы набра́лиса тако́ґо страху́, што й цепе́р валасы́ паднима́ютца, як узду́маю. Ґэ́то было́ па веснѣ́, от я́кось по́сле Мико́лы. Быў я ў Лютави́чах,—паклада́ў там бычко̆ў да по́сле таґо́ забала́каўса з до́брыми людзьми́. Вѣ́дамо, тро́хи вы́пили. Я саўсим

быў цьверóзы, другі́е трóхи падпиўшы—непущáли менé нá нач ици да ґаспóды. Вѣ́даеце-ж бо, мнѣ́ трэ йци лѣ́тникам цéраз ґрэ́блю да калé мóґлиць на барóк; а там кáжуць заўжды пужáе ви́сельникъ, бо екрáз за ґрэ́белькаю кóлись тут завѣ́сиўса адзи́н чалавѣ́к. Еґó там и закапáли нéмаль пры сáмôй дарóзе. Ещэ́ й цепéр е капéц. На еґó наки́дали лóму, бо хто йдзе тут, та што кóльвек ки́не на капéц. Кáжуць, што таґды́ ви́сельник не бýдзе пужáць. У дзéнь мôжна абайци́ ґэ́тае мѣ́йсцо. Там цéраз балôтцо палóжаны бéрвы. Алé пóўначы на бéрвах не мôжна прайци́: цéмно, ничóґо не бачнó, от так и ўсýнешса ў выжáрыну па сáмые вýшы, а то й суздром у ґрази́ заґи́неш. От сóнейко ўжэ захóдзиць. Я збирáюса йци. Дзецюки́ не пущáюць, кáжуць: „дзѣ́ду, начýй у нас. Хибá ты не байшса ви́сельника?“ Кажý—не баю́са. Я то трóхи пабáйваўса, алé таґды́ сóрам былó казáць.—Да ґэ́то éн хвабры́тца,—кáжуць на менé дзецюки́. Ат ґэ́тых слôў менé злóсць узелá.—От жэ—дýмаю,—я вам пакажý, што пе хвабрýса, а ўпрáўду пайдý й не баю́са ви́сельника. От надзѣ́ў я на плéчы тóрбу, ўзяў кий да й вы́шаў з карчóмки, нибыто хачý йци, а самóґо страх берэ́, да сóрам прызнáтца. Зирнýў ґэ́то я на шляґ,—аж хтось ѣ́дзе.—Хтось ѣ́дзе—кажý,—пачакáю, мóо падвезé.—Стаю з дзецюкáми да ки́ем зéмлю калупáю. Аднó-ж падъезджае к карчóмцы Дани́ло Канцавейко.—Дабры́ вечар!—Дабры́ вечар, сябрэ! —Куды́ Бóг несé?—А от ѣ́ду з кáртаю ў Гаўры́льчычы, да баю́са нáнач адзи́н ѣ́хаць,—тут вéльми стрáшно.—Падвези́,—кажý,—менé. Я от збирáўса адзи́н ици́.—Дóбрэ, дзѣ́ду. У двóх смелѣ́й.—Рад я, што так трáпиласо От пакýль кабы́лка атды́хала, зайшли́ мы ў карчóмку, вы́пили ещэ́ па кватэ́рцэ, абó друґóй да й паѣ́хали. Тым чáсам ужэ́ й дóбрэ сцемнѣ́ло. От ѣ́дзем мы памалéньку, люльки́ пакýрваем да жýпимо сабѣ́. Тôльки ось кабы́ла запы́рхала й ни з мѣ́йсца. Сцебанýў Дани́ло пýґаю,—куды́ там: брыкáетца, храпé, вéрне ў бôк з дарóґи. Што там за ли́хо!.. Пачали́ мы пры́ґлядватца, аж сперáду стаи́ць на дарóзѣ бѣ́лы барáн. Ён блеé да ґалавóю матаé. Злѣ́зли мы з

во́за. То̆льки я чу́ю—лещо̆тки ў мене́ са́ми вы́сунулиса з то́рбы да ґрук да до́лу.— Што за дзи́во — ду́маю сабѣ́. Падня́ў я лещо̆тки палажы́ў их у то́рбу й зайшо́ў упе́рад кабы́лки. Сцебану́ў Дани́ло барана́ пу́ґаю, дак з его́ аж и́скры пасы́палиса. Спужа́ўса Дани́ло й ру́ки апусці́ў, не можэ́ ен прамо́виць и сло́ва. А ў мене́ кий асма́лены с двух канцо̆ў. Тако́ґо кия уселя́кая не́чысь баитца Узя́ў ґэто я кий да як сперазаў таго́ барана́, дак е́н и разсы́паўса на дро́бные кусо́чки. То̆льки на даро́зе бы жа́рам пасы́пано. Сѣ́ли ґэто мы на во̆з: сцебану́ў Дани́ло па кабы́лцэ, а ена як рване́тца ўпе́рад, да суне́, дак чуць мы з во́за не паскида́лиса. От мину́ли мы мо́ґлицы, узъѣ́хали на ґрэ́бельку. Зирну́ я ўбо̆к да й нижы́ў. Ба́чу, аж на бало́це, ґдзѣ́ й сам чорт не мажэ́ прабра́тца, йдзе вели́зазны чалавѣ́к, от бы хво́я, йдзе й да бало́та не датыка́етца. Идзе́ е́н, от як-бы нас перайма́е. Штурхану́ў я Дани́ла пад бо̆к да й пыта́ю,— ци ты ничо́ґо не бачыш?— Ничо́ґо.— А што ґэто онь там?—паказваю ему́. Данило прылажы́ў ру́ку к ачу́ й дава́й прыґля́датца. Ба́чыш,—кажу́,—онь па бало́це йдзе яки́ вели́зазны чалавѣ́к.—Ой ба́чу, — прашапта́ў Дани́ло. — Гэто-ж там не бало́то, а во́зеро.— Аджэ́ш во́зеро.—Мы дава́й паґаня́ць кабы́лку да вѣ́дамо, на ґрэ́бли не пабежыш. Да й куды́ там абаґна́ць ви́сельника А е́н хуче́й узсу́нуўса на ґрэ́блю да й пхне́тца пе́рад на́ми. От узъѣ́хали мы на масто́к. Ско́ро ўжэ й капе́ц ви́сельника. Ба́чым мы, аж вели́зазны чалавѣ́к зверну́ў з даро́ґи да й пашо́ў на капе́ц.—Ну,—ду́маем—аткасну́ўса. Дак ґдзѣ табѣ́! То̆льки мы параўня́лиса з капцо́м, як ось аттуль вы́скачыць ви́сельник и про́сто на нас и са́дзиць. Мы па кабы́ле, а е́н за на́ми слѣ́дам так и прэ́. От ужэ́ саў̆си́м бли́зко. Галава́ целепа́етца, язы́к вы́сунуў, бы лапа́ту; во́чы наве́рх павыла́зили, от бы ў Бе́рка лудатаґо. Седзимо́ мы, чуць жы́вы, то̆льки за аґлаби́на трыма́емса, каб з во́за не ски́нутца. А кабы́лка прэ суса, аж з еѣ́ пѣ́на ва́лиць. Але́ кабы́лка прабѣ́ґла ґанбў двое па ро̆ўнуй даро́зе, а там пашли́ кулдо́бины да брадки́. Падска́кваюць драби́нки ўверх, або́ па́даюць у во́ду. Азирно̆мса

мы—ви́сельник прэ за на́ми сусі́х нôґ. Тым ча́сам павыска́квали за́ґваздки, кале́са й скаци́лиса пасерŏд брадка́. Кабы́лка ста́ла храпе́ да рве́тца. Зирну́ў я наза́д, аж и ви́сельник супыни́ўса: стаи́ць да сапе́, язы́к вывáлиўшы. — Ну, ду́маю, — што Бôґ дась... дай ткале́, вы́красаю аґню. Узя́ў я цаґало́ да й пача́ў краса́ць. Искры сы́плютца, а ґу́ба не ґары́ць. Наси́лу выкрасаў и дава́й дзьму́хаць. На вôзе было́ трôхи салốмы. Я й запали́ў жмак. Зирну́ў наза́д, аж ви́сельник чорт вѣ́дае, ґдзѣ й дзѣ́ўса. От, бы ў зе́млю правали́ўса. Пазнахо́дзили мы калеса, спра́вили драби́нки да й пераѣ́хали брŏд. Я ўсе не зваджу́ аґо́нь. И сабѣ́, й ґаўя́ду смелѣ́й. Падъѣ́хали мы к зава́лам да к верша́льникам и накла́ли аґню́. Седзимо́; кабы́лка стаи́ць, жуе́ сѣ́но да ат камарŏў абґаня́етца. Мы ўжэ ду́мали, прайшо́ў увесь страх и хацѣ́ли ѣ́хаць да́лей. Тŏльки ось чу́ем, идзе хтось па лѣ́се, аж земля́ сто́ґне. Идзе́, сви́щэ, ло́миць маладни́к и про́сто на нас и са́дзиць. Дани́ло кру́цитца, бы вьюн та ву́шы наста́виць у той бŏк, ґдзѣ трашчы́ць не́чысь, та зирне́ та на мене́, та на кабы́лку. Бо й ена́ паки́нула хру́маць и дава́й стры́ґци вуша́ми да храпці́. Узя́ў ґэто я ґалаве́шку да й абчарци́ў круґо́м ŏґница.—Цепе́р—кажу́ Дани́лу—хваро́бу праберэ́тца хаць яка́я не́чысь.— А Дани́ло спало́хаўса, не мажэ́ прамовиць ни сло́ва. От падышла́ та́я не́чысь, скрыґи́чэ да ля́скае зуба́ми, аж по́шчак идзе́ па лѣ́се, але́ не мажэ́ пераступи́ць на ŏґнищэ. От свиста́ла ена́, свиста́ла, раўла́-раўла́ нѣ́мымъ го́ласамъ да й пашла́ да́лей, тŏльки лѣс трашчы́ць. Так и пераседзѣ́ли мы ўсю нŏч кале́ аґню́. А як даў Бôґ дзене́к, да ўзышло́ со́нейко, паѣ́хали да́лей. Каза́ли дзецюки́, што ў ту́ю нŏч ены́ недале́ко атту́ль на начлѣ́зе пасцили ко́ней и перадрыжа́ли ўсю́сеньку нŏчку й ачŏў не звели́, бо ўсе пужа́ла их яка́ясь не́чысь. Дак от як мене́ пало́хаў ви́сельник.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

---

50. Страх.

Пашо́ў ґэтак вечарко́м, ужэ змро́кам адзи́н чалаве́к шука́ць ко́ней. Абышо́ў ён су́вараты, пахадзи́ў па хмызнику але́ вы́ґана—нема́. Што тут раби́ць? Пашо́ў ён у ле́с. Идзе́, ко́ськае. По́щак так и разсыпа́етца па ле́се. Со́нейко даўно́ ўжэ зайшло́. Ве́чар це́плы, паґо́дны. Гэто было ў петро́ўку. Хадзи́ў, хадзи́ў той чалаве́к, дале́ко зайшоў у ле́с, а ко́ней нема́ш.—Ко́ся, ко́ся, дам абро́ку — крычы́ць ён; а па ле́се по́щак абзыва́етца: ся, ся, абро́ку, абро́ку. Тым ча́сам так сцемне́ло, што ў ле́се, хаць во́ко вы́каль. Су́мно ста́ло чалаве́ку ў ґэстуў не́тры. Хаце́ў ён верну́тца наза́д, да не ве́дае, куды́ йци, заблудзи́ўса, блука́ючы ў ле́се. Хаце́ў паґлядзе́ць на зо́ры, да за ґалье́м ничо́ґо не вида́ць. Стаи́ць чалаве́к и ду́мае, як з ле́су вы́битца. А ве́дамо, пакуль ишо́ў, та знаў, ґдзе́ ґаспо́да, а як стаў, та й зґуби́ў сле́д. Ду́маў — ничо́ґо не мажэ́ пара́дзиць. И таки́ на еґо́ страх напа́ў, што от валасы́ расту́ць, як та́я ша́пка не скинетца. Ужэ хаце́ў ён ле́сци на дзе́раво, але́ нияк не мажэ́, падня́тца—лытки дрыжа́ць, а ў рука́х си́лы нема́. Папро́буваў ґука́ць—у ґо́рле сци́сло. Беда́. Хаць лажы́са да й памира́й. Пачака́ў ён тро́хи, паслу́хаў. У ле́се ци́хо, як у ву́се. Гукну́ў ен так мо́цно, што мо за ми́лю чува́ць До́ўго лескатаў по́щак па ле́се, а як заци́х, чу́е—хтось абазва́ўса саўси́м бли́зко. Той чалаве́к дава́й зноў ґука́ць Зноў абзыва́етца. От ён ґука́е й идзе́ па ґо́ласу на сустре́ч. Идзе́, спатыка́етца на каладзье да на зава́лы. А тут ґущэ́ча во́чы выдзира́е Узби́ўса на вы́скаць, чуць ґалавы́ не скруци́ў От зале́з ен у таку́ю не́тру, што й вы́карапкатца не мажэ́. — Зґинь мара́, прападзи́. Мо—ду́мае—ґэто лихи́ мене́ сюды́ завье́ў. Даста́ў ґэто ён з маґале́йки крамене́ц да ґу́бку й хаце́ў вы́красаць аґню́. Мац за по́яс—цаґала́ нема́. По́чапка це́лая й пеце́лька завя́зана, як была́, а цаґало́ чорт ухапи́ў. Давай ґэто ён хрысци́тца. Чуе, аж чорт атлеце́ў с паўґандо́ў, узби́ўса на але́шыну да так жа́ласливо пла́чэ, аж залива́етца. Узя́ў таґо́ чалаве́ка страх; не ве́дае, што рабиць.

Пастаяў ён трохи, пастаяў, ачўхаўса, папрaвиў за плечыма торбу, мацнўў, ци е за пóясам сакѣрка да памалёчачку бóкам-бóкам давáй атхóдзиць аттуль назáд Тóлько выбраўса ён з ґущэчы на праґáлину. чуе, хтось цúхенько высунуў у еґó с-за пóяса сакѣрку да й ґоп еѣ да дóлу. Абернўўса чалавѣк, падняў сакѣрку, чўе, аж ззáду чорт раґóчэ, бы жарабéц.— Чаґó там раґатáць — думае чалавѣк.— от велúкае дзúво зрабúў, што выцяґ сакѣрку с-за пóяса.—Тым чáсам чорт мáбыць даґадáўса, што так падўмаў чалавѣк, забѣґ уперóд да й разсыпаўса на палянатцы, бы жар. От так и ґарыць уся земля, тóльки немá ни пóламя, ни дыму.—Дак ґэто ён—дўмае чалавѣк—украў у мене цаґалó да ещэ хочэ мене спалúць. Майм сáлам да па моей шкўры мáжэ.—Тут чалавѣк успóмняў, што ў еґó ў маґалѣйцы павúнно быць малéнькае цаґалó. Мацнўў ён, аж цаґалó целепáетца на прывязцэ калé пóяса. От ён выкрасаў аґню, раздўў да й упьёк вершáлину. Пóтым узяў ґалавéшку, абчарцúў круґóм и лёґ сабѣ калé аґню да тóлько дрóва падклáдвае. Бáчыць чорт, што чалавѣк не байтца ў крўзе й давáй еґó аттўль выманьваць. От лежыць чалавѣк кале агню да й бачыць, што от тут жэ па землú разсыпано зóлато, блищыць ат аґню, бы жар зьяе. Паґледзѣў чалавѣк да й кáжэ: „дóбрэ, нехáй лежыць; калú енó сўджано мнѣ, та еґó нихтó не вазьмé — маé майм бўдзе". Лежыць сабѣ да люлячку пакўрвае. А чорт та зараґóчэ, бы кóнь, та бѣґае па лѣсе як апантаны да ґрукацúць капытáми аб карéне да аб каладзье. Альбó залѣзе ў куст, шамацúць, трэ еґó, аж úскры сыплютца. Алé бáчыць, што чалавѣк седзúць пры аґнú, а з крўґа не выхóдзиць, чорт ещэ трóхи пасвистáў, пабѣґаў и аткаснўўса ат таґó чалавѣка. Тым чáсам даў Бóґ дзень. От тóльки стáло занимáтца на свѣт, птўшачки запѣли ўселякими ґаласáми, лѣс ажыў, заґаманúў. От так здаéтца, як-бы ґрумáда паднелáса й збирáетца на рабóту. Устáў той чалавѣк. Бáчыць, аґóнь даґарэў.—Неўэш-то я—дўмае—задрамáў: Бáтцэ не спаў усю нóч и яких тóлько стрáхаў не нацерпѣўса. — Зирнé ён, аж начавáў от калé сáмаѣ дарóґи, ґанбў

трое ат села́. Плюнуў чалаве́к да й пашо́ў да ґаспо́ды. Идзе́ е́н паўз паля́начку; ба́чыць, аж еґо́ ко́ни пераско́чыли це́раз зава́лу да й пасу́тца сабе́ ў ваўсе́.—Неўэ́ж—ду́мае—ґэ́то не чорт, а ены́ раґата́ли. А баґи́ их ве́даюць!.. С тых ча́саў той чалаве́к пача́ў так баятца стра́хаў, што як зме́ркне, та ни за што́ адзи́н не по́йдзе ў лѣс.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

51. Смерць.

Жыли́ сабе́ старэ́нькие дзе́д з ба́баю. Жыли́ ены́ до́ўґо, до́ўґо але́ им здава́ласо, што ены́ пражыли́ ма́ло Паку́ль Бо́ґ дава́ў здаро́ве, им так жыло́со, што ены́ й ничо́ґо не памета́юць с свайґо жыця й здае́тца, што была́ каро́ткая жы́тка. Але́ пад ста́рась пачало́ ўсе бале́ць: ко́сци трэ, спи́ну ло́мицъ, но́ґи й ру́ки мле́юць, ка́шэль ду́шыць, во́чы не ба́чаць, ву́шы не чу́юць, а на языку́ смаку́ нема́ Е́сци хо́чэтца, а палажы́ ў рот — душа́ не прыма́е. Ойкаюць да сто́ґнуць дзе́д з ба́баю; а тут ещэ́ трэ́э ґарава́ць, бо не даў Бо́ґ им пло́ду. Были́ ў их дзе́тки й уну́ки да ўсих пабра́ў Бо́ґ к сабе́. Ця́жко жыць на ста́расци дзе́ду з ба́баю без памо́ґи. Адно́ крэ́хчэ на пе́чы да жа́литца, што не дае́ Бо́ґ сме́рци. Друґо́е сабе́-ж сто́ґне на палу́ да на Бо́ґа наракае, што лю́дзи ўмира́юць и маладые, а еґо́ й на ста́расци Бо́ґ не хо́чэ прыбра́ць, све́т апраста́ць. Саўсим сдзеци́нели дзе́д з ба́баю, а ўсе жыву́ць да жыву́ць. Але́ ось раз пале́тку, вы́сунулиса сабе́ дзе́д з ба́баю з ха́ты, седзя́ць на пры́зьбе да на со́нейку ґре́ютца. На ву́лицы ґрабу́тца ку́ры: хо́дзяць сви́не да ў лу́жах ке́ўзаютца; вала́ндаютца ґу́си да праз пло́т с аґаро́даў щыпа́юць траву́; дзе́ци перакида́ютца да перасыпа́юць песо́чак, або́ ле́пяць ала́дки. Со́нейко печэ́, а дзе́д з ба́баю седзя́ць у кажу́шках да й то им хо́ладно. Падышо́ў къ им сусе́д да й пытае пра здаро́ве.—Ой, яко́е на́шэ здаро́ве!—ка́жэ дзе́д,—

як так жыць, лѣпи гниць, да от Боѓ атступиўса й не дае́ сме́рци.— Эй, дзѣду, не ѓрашы́ Бо́ѓу! Боѓ вѣ́дае, што ро́биць. Жыць ва́жко, а памира́ць ещэ́ ѓаре́й.—Тут ба́ба пачала́ жалитца, што Боѓ атступиўса ат их и не дае́ сме́рци. не апраста́е земли́. Тым ча́сам к тамў чалавѣ́ку падбѣѓ еѓо́ хлапчучо́к. — Злаби мнѣ ха́тьку, бацько́, — прыстае́ ён и дава́й ла́щытца да праси́ць.—До́брэ, до́брэ, зраблю́,— ка́жэ чалавѣк и пача́ў ѓла́дзиць сынка́ па ку́дзерках. Ве́село ста́ло ба́бе; ўсмиха́етца ена́ й сама́ дава́й пѣ́сциць хлапчука́. Зирну́ў дзѣд на ба́бу й узду́маў ту́ю по́ру, ак еѓо́ ба́ба пѣ́сцила сваи́х дзѣ́так; узду́маў и так ра́дасно ему́ ста́ло на се́рцу, што й сам паѓла́дзиў хлапчука́ От пача́ў сусѣ́д з ще́пачак будава́ць ха́тку, а дзѣд з ба́баю седзя́ць на пры́збе, пазира́юць та на я́снае со́нейко, та на дзеце́й, слу́хаюць, як ены́ смею́тца да ве́село щабе́чуць и самы́м ра́дасно ста́ло. Тым ча́сам ѓусь падышла́ к ба́бе й дава́й еѣ щыпа́ць за кажушо́к.—Чаѓо́ ена́ прычапи́ласа,—крычы́ць ба́ба. А сусѣ́д да й ка́жэ—ѓэто, ба́бо, смерць прышла́ па цебе́ — Спало́халаса ба́ба, не хо́чэ памира́ць, атпиха́е ат себе́ гусь и крычы́ць— аѓи́ль да дзѣда. А дзѣд крычы́ць—аѓи́ль да ба́бы. От так ѓаня́юць ены́ ѓусь адно́ к друго́му, бо нико́му не хо́чэтца памира́ць. Засмея́ўса сусѣ́д, пазва́ў ѓусь да й ка́жэ — жыць ва́жко, а памира́ць ѓаре́й.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

52. Цыганъ.

Вѣ́дамо, цыѓа́н вало́чытца па свѣ́це, свайѓо́ хаджа́йства не ма́е, а то́е ў́жыва́е, што ѓдзѣ́ запарве́ або вы́дурыць А як ничо́ѓо не даста́не та й ѓо́ладам падыха́е. От ду́мае цыѓа́н, — каб да каня́ку ат еды́ атучы́ць, таб до́брэ было́ на свѣ́це жыць. Сам туды́-сюды́ пахиста́ўса, — ѓдзѣ ку́со́чак са́лца, ѓдзѣ сарва́ў каўба́ску, ѓдзѣ блинцэ́ або́ ала́дки — от и нализа́ўса. А каня́це́ то́льки й дбай да што дзень сенцо́ бы ру́ту падава́й. Да й то ещэ́ раѓо́чэ—аўса́ хо́чэ.

Пачакай, я розуму вазьму, каняку ат корму атвучу. — И давай цыган мудравáць, сваю каняку ат корму атвучáць. От ён дзень и два не дае каняцэ ни жмени сѣна, ни аўса. Сам цыган сего-таго назбираўса, выпиў квасу, аблизаўса да й клопату не мае, што каняка галадае. А ена зубами звониць да грызе салому — Эй, цыган,— смеютца людзи,—бач твая кабылка ржэ—рагочэ, моо корму хочэ.—Нехай прывыкае, — цыган бае. От с недзѣлю каняка ничога неѣла, а потым и сакалѣла.—От кали-б ещэ з дзенечак пажыла. таб прывыкла й заўжды-б без корму была, да здохла,—цыган сказаў и з каняки шкуру садраў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

53. Не вѣр ачòм.

Пашоў адзин чалавѣк на кармаш. Нема ў его ничого на прадане. Нема й грошэй. А тут хочэтца выпиць кватэрку гарелки. От ён злавиў на вулицы певуна, запхаў его за пазуху да й панес на кармаш Ещэ не дайшоў да кармашу, як тут ужэ сустракаюць жыдаўки да жыды; ены пытаюць, ци нема чаго да спраданя.— Е—кажэ той чалавѣк,— купи певуна.— Яки гэто певун,— кажуць жыдаўки,—гэтож заяц.—Смеютца, хварець их матары,—думае мужык и пашоў далей. Идзе ён да йдзе, а на сустрек усе пытаюць, ци нема чаго на продаж. И каму не пакажэ певуна, ўсѣ кажуць, што гэто заяц.—А мо й заяц—думае мужык, — не вѣр ачòм. Мабыць праўда, кали ўсѣ кажуць, бы згаварыўшыса.—Але ось прыходзиць ён на кармаш. Вѣдамо як на кармашу—людзей многа. Жыдаўки крычаць, хватаюць за полы да цягнуць к сабѣ ў крамку. Людзи крычаць на чом свѣт стайць, божатца, клинутца, каб ашукаць адзин другого Там су сеѣ силы лупяць у сковарады, у штабы, або ў косы й тым зазываюць к сабѣ. Другие крычаць: „шапки, шапки“, крычаць, аж ахрыпли. Першы раз той чалавѣк быў на

кармáшу; éн никóли не чуў и не бáчыў такóґо ґáму. Тȏльки ось éн трóхи ачýхаўса, дастáў с-за пáзухи певунá, трымáе аґó да й крычы́ць: „купе̂це зáйца, зáйца!“ Тут к ему й прычапи́ласа адна́ жыдȏвачка.— Які-ж ґэто зáяць—кáжэ ена́.— От зáяц да й усé,— упéрса мужы́к. Калé их сабралáса кýчка людзéй. Смеютца з жыдȏвачки й кáжуць· аджэ́ш зáяц. Тут ужэ́ чалаве̂к саусим паве̂рыў, што ен прынес на кармáш зáйца, а не невунá И што еґó ни ўґаварáли—не слýхае да й тȏльки. Пасмея́лиса лю́дзи з шалапавáтаґо чалаве̂ка й узялиса за свае́ дзе̂ло. А éн хадзиў, хадзиў цéлы дзень з певунóм й ўсе ему́ здавáласо, што ґэто зáяць. Дак от які прыпáдак быў з тым чалаве̂кам. Бо, ве̂дамо калі све̂т захóчэ, та й разýмнаґо здýрыць. Не то дýрэнь, каґó завýць дýрням, а то дýрэнь хтó чужы́м рóзумам жывé. Бо прáўду казáли старые людзи: людзéй слýхай, а свȏй рóзум май и ни на кóґо не ўважáй

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

54. Поп и пустэльник *).

Калі тóе былó — не ве̂даю. Мáбыць вéльми даўнó, бо от ужэ́ мне̂ бȏльш капы́ ґадȏў, а я ещэ́ без партóк бе̂ґаў, як бывáло мȏй дзе̂д, каб ему́ ле̂ґенько йкнýласо на тȏм све̂це, зле̂зе з печы, апранé кажýшак да высунетца з хáты на пры́збу, ся́дзе на сóнейку да й кáжэ нам кáзки. А мы падшпáрки абстýпим еґó атусю́ль и лýхаемо ты́я кáски. Старэ́ньки, вéльми старэ́ньки быў мȏй дзе̂д. От як и запамятáю, éн ужэ́ никýды не хадзиў з ґаспóды. Тȏльки ў ле̂тку памалéньку, з киéчкам выцяґáўса з хáты на пры́збу, абó на прыґумéчэ, гдзе̂ ў нас были́ пчóлы. Бо éн, бáчыце, вéльми любиў пчȏл. Тȏльки напасле̂дак éн ужэ ничóґо не бáчыў: пазирáе бáло на я́снае сóнейко й не жмýрытца. Алé éн да сáмае смéрци любиў

*) Эта сказка записана мною въ 1883 году, когда похожій по содержанію разсказъ Л Толстого „Три Старика“ еще не появлялся въ печати.

казáць кáзки да так ґóжэ казáў, што еґó слýхали стары́е й малые. Я мнóґо знаў тых кáзак, алé шмат ужэ́ пазабывáласо. Вѣ́дамо, цепéр не той свѣт настáў, каб бáйки слýхаць. Прáўду кáжуць людзи, што ўсе забýдзеш, калú хлѣ́ба не дабýдзеш

Дак паслýхайце, от скажý вам кáзку свайґó дзѣ́да. Гэто не кáзка, алé прáўда. Тóльки даўнó тóе былó Даў Бóґ вельми харóшы, ураджáйны ґóд Такóґо ґóда нихтó й не запамятáе. Усю вéсну йшоў цихи, цéплы дож, а з Микóлы стáла такáя паґóда, што от здаéтца, насадзи́ на ралю дзицá, та й енó вы́расце Усé расцé ў пóли, як на дрóжджах. Кáжуць жэ бо: мóкрая веснá да цеплы май, та бýдзе пашня як ґай. Бáчаць людзи, што калú Бóґ убераже́ ат ґрáду, та бýдзе вéльми велúки ўраджáй. Алé вѣ́дамо, тýтачки ў ґэстум пéкле людзи так прывы́кли ґаравáць и заўжды жыць у бедзѣ́, што харóшы ўраджай не рáдуе, бо ўсѣ́ дýмаюць, што ґэто не на дабрó. И пашлá прачутка, што велúки ураджáй, алé не бýдзе камý ѣ́сци, не бýдзе камý спажывáць И начали разскáзваць, што йшоў якúсь убóґи да й казáў, бáтцэ ў ваднóм селѣ́ бáчыли на заґумéчы вéльми стрáшную бáбу с адны́м вóкам. Кáжуць, што ґэто пóшасць и што енá хýтко прыдзе на людзéй и на ґаўя́до, А тут аднá маладзúца пашлá ў лѣс па ґрыбы́, ци мóо рваць я́ґады да й сустрéла там такóе дзúво, што й не разсказáць. Идзé ґэто енá й бáчыць, аж седзúць на кáмени вéльми ґóжая маладзúца. Енá трымáе на ланѣ́ снóп бýйнаґо жы́та да так плáчэ, што аж заливáетца Маладзúца папытáла, чаґó енá плáчэ, а тáя й кáжэ — як жэ мнѣ́ не плакаць, калú я вѣ́даю, што бýдзе велúки ураджáй, алé не бýдзе камý еґó спажывáць. — Спалóхаласа тáя маладзúца да й пытáе, што рабúць? — Малѣ́цеса—кáжэ ґóжая маладзúца,—малѣ́цеса, як умѣ́еце. И я бýду за вас малúтца.—И знúкла. Прышлá тáя маладзúца да ґаспóды да й разскáзвае, якóе енá бáчыла дзúво. Даґадáлиса людзи, што ґэто былá Бóжая Маци. От давáй ены́ малúтца, як хто ўмѣ́е. А, вѣ́дамо, цёмные людзи й малитца як трэ́э не маґýць. Прачýў пра тóе пóп и кáжэ—вы не так мóлицеса, як трэ́э. От вы хадзѣ́це ў цэр-

каў да тут ат мене́ учёцеса малитца, да давайце на хвалу Божую.— Вѣдамо, папу трэ̀э, каб людзи хадзили ў цэркаў да больш давали папу дахоѓу. От и пачаў поп немаль што дзень ззываць людзей на талаку к сабѣ й там нибыто ўчыў их малитца да за работу, кожын дзень служыў малебен Ходзяць людзи ў цэркаў и к папу да й несуць ему, што хто мае: хто воўну, хто лен, хто воск або мед, хто сало, масло, сыры, хто палатно, а хто пабаѓацѣй, той с павасьминку аўса, або жыта ци ячменю запрэ. Рад поп Служыць малебены штодзень и кажэ—мабыць ужэ канец свѣту настаў, бо пишуць, што объявиўса антыхрыст. — Ещэ ѓарей заклапацилиса людзи, сумно стало на сэрцу. Пакинули работу, да тольки молятца да плачуць. Тым часам жыў там адзин чалавѣк. Ен не слухаў папа не хадзиў ни ў цэркаў, ни к папу на толаку. Бало смеетца да пѣсни пае. Пѣў ен якиясь усе нехарошые пѣсни, та смѣшные — веселые, та пра папоў, альбо пра паноў. Неўзлюбиў поп таѓо чалавѣка празваў еѓо шалапаватым. От раз идзе поп па селѣ, а шалапаваты сустракае еѓо да й пае: каму клапатно, а папу палатно. Поп служыць не дзеля Йсуса, а дзеля хлѣба куса. Людзи памирають,— семья плачэ, тольки поп да дзяк пае да скачэ. — Хацѣў тут поп пераця́ѓнуць шалапаватаго киям, але той высалапиў язык, паказаў папу хвиѓу да й сунуў на загумечэ. Съ тых часаў зник шалапаваты; нихто не вѣдаў, куды ен дзѣўса. Тольки ось па немалум часе объявиўса ў лѣсе велики пустэльник. И атусюль, пашли к ему людзи на параду. Пашли людзи й з таѓо села, ѓдзѣ быў перш шалапаваты, пашли да й бачаць, што ѓэто таму шалапаватаму Бог даў такую моц, што ен и хворым памаѓае, й у клапоце дае скутак. Адбилиса людзи ат папа й ат цэркви—ўсе ходзяць к таму пустэльнику. Бачыць поп, што людзи атбилиса, дак ему нема дахоѓу, от и пашоў ен паѓлядзѣць, яки-таки там пустэльник; ци неможна еѓо пасадзиць у вастроѓ, каб ен не чмуциў людзей и не атбиваў ат папоў. От пасылае поп пападзю на село к бабам развѣдаць, гдзѣ жыве той пустэльник. Пашла пападзя да й давай

распытваць у баб. Вѣдамо бабы—усе й разсказали. —Ой, матулько — кажуць бабы, — такі святы. такі святы, што аж сарамацѣня не закрывае, так у ваднои доугуй, порванои сарочцэ й ходзиць. Медзьведзи ему ѣсци носяць, а ен сабѣ скачэ да скачэ цераз калоду да усе кажэ: табѣ Божэ й мнѣ Божэ. Пачуу тое поп, сабрауса да й пашоу шукаць таго пустэльника Идзе ен да йдзе цемным лѣсам и забрауса у такую гущэчу, што не вѣдае, як аттуль вылезци. Хацѣу ужэ ен вернутца да гасподы, але заблудзиуса й не разшалопае. куды йци. Стайць поп пад дзеравам да чэпэ патылицу. Тым часам чуе ен, аж равуць медзьведзи. Равуць и падходзяць усе ближэй. Кинууса поп на дзераво, падлѣз сажон два, да абламаласа голька, й ен скациуса далоу Узняуса поп. чухае боки да як зирне у гущэчу, аж там стаяць два велизазные медзьведзи на задних лапах; стаяць, равуць да зубами ляскочуць. Спалохауса поп. Адна поуна, а другая як завезаць. Не вѣдае поп, што рабиць. Але ось прыглядзѣуса ен и бачыць, аж кале медзьведзей стайць якись чалавѣк у доугой бѣлой саротцэ. Стайць поп, прытайуса кале дзерава да пазирае, што робиць той чалавѣк. Бачыць, аж ен усе скачэ цераз калоду Дагадауса поп, што гэто пустэльник и давай памаленьку падходзиць ближэй. Скакау, скакау пустэльник, закмѣу папа. кинуу скакаць да й пашоу на сустрек. Бачыць поп, што гэто той самы шалапаваты чалавѣк, штe ен хацѣу его удырыць кием. Бачыць, што за им идуць два велизазные медзьведзи да цягнуць на лубку свѣжые плястры меду — Дабры дзень—кажэ пустэльник, а поп маучыць, зубы сцяушы Так ен спалохауса медзьведзей, што душа у пятки залѣзла да там схаваласа. — Не бойса, медзьведзи не зачепяць, — кажэ пустэльник и павьеу папа у свой станок. Бачыць поп, аж пустэльник зрабиу сабѣ лагво пад выскацью й захистау трохи гальем да берoстаю. Узяу пустэльник у медзьведзей з лубка плястар меду й частуе папа, а таму ат страху й перасѣло у горле Але ось памаленьку ачухауса поп и давай перци мед за абѣдзьве щоки, тольки барада трасетца, бы у казла

Наѣўса пöп да й пытáе пустэ́льника, што ен тут рóбиць.—Малюса,— кáжэ пустэ́льник —Як жэ ты мóлишса?—Пытáе пöп.—А от як.— Тут пустэ́льник падняўса, падняў сваю сарóчку да й давай скакáць цéраз калóду да прымаўляць: Табѣ Бóжэ й мнѣ Бóжэ!—Не дóбрэ ты мóлишса,—кáжэ пöп.—Лѣпш неўмѣю —Малиса так. Давай ґэто пöп учыць пустэ́льника малитца. Наўчыўса пустэ́льник трóхи малитца па письмéннаму да й павьеў папá цéраз лѣс на дарóґу. От идуць ены да йдуць цéмным лѣсам и падышли к рацэ́ Пустэ́льник спусцпўса з бéраґа да й пашóў цéраз рéку па вадзѣ, бы на сýху А пöп тöльки ступиў ат бéраґа, як шабулдых у вóду па сáмые вýши —Ратуй!—крычыць пустэ́льнику. Той абернуўса, ўхвациў папá за кýдлы да й выцяґ з вады на бéраґ. Тут пустэ́льник скинуў з себé сарóчку, насла́ў еѣ на вóду да й перавьéз папá за рéку, бы на плыце. Вышли ены на бéраґ, а пустэ́льник и кáжэ—забыўса я малитца. Павучы ещэ́ трóхи.—Ѣачыць тóе пöп да й кáжэ — малиса, як малиўса; мáбыць твая малитва прыéмней Бóґу, кали ты хóдзиш па вадзѣ.—Паклаииўса ґэто пöп пустэ́льнику да земли да й пашóў да ґаспóды. А пустэ́льник зноў пачáў скакáць цéраз калóду.

Пересказалъ Дударъ.

Дер Чудинъ

55. Пану навука.

Слýхайце-бо! Скажу вам не кáску, а щырую прáўду. Гдзѣ тóе было́—цепéр я забыўса, бо ўжэ, бáчыце, стáрась. А вѣ́дамо, кали з чупрыны ґинуць валасы, та й пáмяць—з ґалавы. От я забыўса, што сеґóнячы абѣдаў. Не памятáю. А мóо й ничóґо. Трапляетца й ґэ. Кáжуць-жэ: чáсам з квáсам, а парóю з бедóю, ци бо з вадóю. Цепéр лихо, жáлятца, маладзички, а даўнѣй было́ ґарéй. Вы таґó не памятáеце. Не вéльми даўнó тóе было́, ещэ́ за пáньщыну. За пáньщынаю было́ дóбрэ, кали трапляўса дóбры пан. Было́ так дóбрэ, так дóбрэ, што не трэ й памирáць. Дóбры пан даґлядáў

сваи́х мужыко̆ў, як ро̆дны ба́цько. Але́ ґдзѣ трапля́лиса таки́е до́брые паны́? Бо́льш были́ не паны́, а зверъе́ паґа́нае. От як тра́питца таки́ паґа́ны пан, та хаць лажы́са да й памира́й — ничы́м ему́ не ўґо́дзиш. Ка́жуць-жэ. зачыни́ чо́рту дзве́ры, та ен вакно́. Гэ й лихи́ пан. Ты ему́ ґо́дзиш, щы́ро ро́биш, а ен табѣ́ ўсе крычы́ць: не так шэ́льма, не так га́лга́н, не так пся крэў,—и ѣсь цебе́ по́едам, ѣсь, знева́жа́е, здзѣ́куетца. А чуць што — жыўцэ́м шку́ру злу́пиць. Ой, ця́жко, ве́льми ця́жко было́ за лихи́ми пана́ми. А лихи́е паны́ не́маль были́ ўсѣ Эгэ-ж. От у вадно̆м двары́ быў такі́ лихи́ пан. Чаґо́ то̆льки е́н не вычвара́ў! Як то̆льки е́н не наздзѣ́куваўса над людзьми́. Сѣк е́н и мужыко̆ў и баб, стары́х и малы́х. Разця́ґнуць ба́ло маладзи́цу, або́ дзѣ́ўку, камыса́р ты́чэ па́лцам да й ка́жэ: па́не, о!—Лупи́ па о,—ка́жэ пан, и ху́рман начне́ пере́сциць, што аж па́ра ва́лиць. Не аднаґо́ ен засѣ́к на смерць и нико́ґо не бая́ўса. А людзе́й е́н личы́ў ґаре́й саба́к... Што е́н вычвара́ў над маладзи́цами да дзѣ́ўками, дак со́рам и каза́ць. Не мо̆ґ той паґа́ны пан ужэ́ бо̆льш ничо́ґо прыду́маць, каб паздзѣ́куватца над людзьми, от и велѣ́ў ен, каб мужыки́ прыво́дзили на про́даж вало̆ў то̆лько ў дво̆р; а па канцо̆х села́ паста́виў раґа́тки да й не пазво́лиў праѣ́хаць к мужыко̆м ни я́каму купцу́ От и павели́ ли́дзи ў дво̆р вало̆ў на про́даж Але́ прыведзе́ хто вала́, а пан и ка́жэ: што-ж ты прывьѐў, асе́л? Гэ́то-ж не во̆л, а казе́л.—И запла́циць, бы за казла́, а то ещэ́ пашле́ на ста́йню да ўсы́пле ў седзи́бу паўсотни ґара́чых. До́ўґо му́чылиса бѣ́дные мужыки́ з таки́м паґа́ным па́нам; до́ўґо церпѣ́ли, бо што зро́биш, каму́ пажа́лишса!? Вѣ́дамо, паны́ за па́нами й ця́ґнуць. Але́ ось знайшо́ўса адзи́н чалавѣ́к, што атплаци́ў таму́ па́ну за ўсѣ люцки́е слѐзы да за крыўду́. Дак от як то́е было́. Быў там уда́лы, здо́тны хло́пец. Ра́но е́н асирацѣ́ў, але́ й адзи́н узбиўса таки́ на хаджайство. Га́рды быў хло́пец. Нихто́ еґо́ нико́ли й па́лцам не зачапи́ў. То̆лки от е́н прыво́дзиць у дво̆р на про́даж вала́. Убачы́ў пан, вы́шаў на га́нак, да й ка́жэ: што-ж ты прывьѐў, асе́л! то-ж не во̆л, да казе́л.—Пазирну́ў той дзецю́к, што бли́зко

никóго немá калé пáна, паказáў емý пáплиску да й пытас: што ґэто, пáне, берóза ци лазá? Я-ж прывьéў к табѣ́ валá не казлá... И давáй перéсциць, давáй дубáсиць пáна тóю пáплискаю. Рéзаў рéзаў, пакýль сам здавóлиўса.—От-жэ табѣ́, пáне, за тóе, што ты людзéй мýчыш Калú вычухаеш ґэто, та чакáй мене́ ещэ́ трэ́йко Трэ́йко я здымý з цебé шкýру.—Сказáў ґэто тóе дзецюк да й уцéк у лѣс. А вѣ́дамо, якúе даўнѣ́й былú цéмные да ґустые лесы́. У их жывú кóлько хóчэш, нихтó цебé не трáпиць Нашлá двóрня пáна без пáмяци, так еґó вымесиў той дзецюк. Тóлько на трэ́йци дзень трóхи ачýхаўса пан и велѣ́ў злавúць Рымшу—так звáли таґó дзецюкá. Да куды́ там—еґó й слѣд вѣ́грам замелó. Нéмаль недзѣ́ль сéм пракачáўса пан: чуць чóрту дýшу не атдáў. Якúх тóлько дахтурóў не справаджáли — ничóґо не парáдзяць, бо емý мáбыць Рымша атсадзиў печанцы́. А што ўлóжыць хам, та не выме й пан. Алé ось па не мáлум чáсе прыѣ́хаў у двóр якúсь венґéрац. У еґó ўселя́ких зельéў, уселя́каѣ лекóбы. Рад пан, чапкýе, прóсиць таґó венґéрца, каб еґó палечы́ў. Паґасцявáў венґéрац у двары́ да й давáй лечыць пáна. Велѣ́ў ґэто ен напалúць лáзню: павьéў пáна туды́; пасадзиў еґо на лáўцы да й велѣ́ў абѣ́ручки дзержáтца за жэ́рдачку, а сам пачáў нацирáць пáна ўселя́кими мáзями. Седзúць пан. трымáетца абѣ́ручки за жэ́рдачку да тóльки крэ́хчэ. Але не дóўґо ён так седзѣ́ў: выцяґ венґéрац з кишэ́ни сурóмец, прывязáў им к жэ́рдацы пáньские рýки, заткнýў пáну вѣ́хцям ґóрло, ўзяў хварасцúну да й кáжэ: што ґэто пáне, берóза, ци лазá?—Я-ж прадáў табѣ́ валá, не казлá.—Бáчыць пан, што ґэто Рымша, а не венґерац, хóчэ крычáць, да не мажэ́, бо вѣ́хаць у роце. Крýцитца пан, бы вьюн на ґарáчóй скаварадзѣ́, а Рымша дастáў з пад палы канчýк и давáй хрысцúць паґáнаґо пáна па чóм папáло. Лупиў, лупиў, нéмаль усю шкýру садрáў да й давáй пасыпáць пáна сóлью. Самлѣ́ў пан ат бóлю. А Рымша сѣ́ў на кóней да й паѣ́хаў сабѣ́. Тóльки еґó й бáчыли. Дóўґо хварéў пан, чуць не паўґóда пракачáўса. Усѣ́ дýмали, што ўжэ́ емý прышлú капцы́. Алé лихóґо й

смерць не берэ: к веснѣ трохи вычухаўса пан и хацѣў ѣхаць заґраницу на воды. да, бачыце, ґрошэй нема. От и ўздумаў ен прадаць лѣс Пашла поґаласка, й пачали купцэ аґлядваць лѣс. Тарґавалиса ены, тарґавалиса, дак не сходзятца аб цану, бо пан вельми даражыўса Тольки ось прыѣхаў якись бачно вельми баґаты купец Павьеў еґо пан аґлядаць лѣс. От пан хвалиць лѣс, а купец тольки ўсе атводзиць пана ў ґущарню да ў нетру Забралиса ены ў такую ґущэчу, што й свѣту Божаґо не бачно: от купец давай абдымаць хвои, сажням мѣраць таўщыну. Абхапиў и пан адну хваину, а купец хуцечько выхапиў з кишэни суромец да й прывезаў пана к хвои Бачыць пан, што тут не перэлиўки й хацѣў крычаць, звадь на ратунак, але так спалохаўса, што нема ґоласу Але ось купец наказаў ему паплиску да й пытае: што ґэто, бероза ци лаза? Я-ж, каа, прадаў табѣ вала, не казла. — Тут пан даґадаўса, што ґэто Рымша, да аж у калошы напусциў. Тым часам Рымша запхаў пану мохам рот да й давай пересциць па чом папало да прыказваць, каб больш не здзѣкуваўса над людзьми. Биў, биў Рымша пана, чуць на смерць не забиў да так и кинуў прывязаным к хвои, бы падло. Так да вечара й усюсеньку ноч прависѣў пан на хвои. чуць еґо нудзьґа не зъѣла, пакуль дворня нашла От тут ужэ пан целы ґод пракачаўса: ўсе не мажэ выздаравѣць. Нема ачунку; от и радзяць пану ѣхаць на воды Прадаў ґэто пан лѣс, прадаў зббжэ да ґаўядо Сабраў много ґрошэй да й давай выладжватца на воды. Тым часам Рымша ўсе цикуе за панам От тольки пан выехаў з двара да ўѣхаў у лѣс, як Рымша ўжэ зрабиў на еґо пастку От ен паставиў на дарозе ґандў на трое адзин ат друґоґо двух конных хлапчукоў с доўґими паплисками Тольки падъѣхаў пан, як перша хлапчук трасе паплиску да й крычыць: што ґэто пане, бероза, ци лаза? А сам па каню да й наўцекача. — Лапайце, лапайце! — крычыць пан, — то-ж галган Рымша. Хурман атрезаў пастронки, сѣў на каня да й паґнаўса за хлапчуком. Алѣ той сунуў у лѣс и чорт вѣдае, куды дзѣўса. А хурман

папьéр дарóґаю ўпéрад мóо верстóў дзéсяць. Тым чáсам заéхаў уперóд пéрад пáнам другí хлапчýк, паказáў пáплиску да й пытáе: што ґэто, пáне, берóза, ци лазá? — Лапáй, лапáй еґо галгáна! — крычыць пан на лéкая, — то-ж Рымша. — Узскóчыў лéкай на другóґо каня да й паґнáўса за хлапчукóм. Астáўса пан адзи́н. Тут Рымша высунуўса с-за выскаци да й паказáў пáну пáплиску: што ґэто, пáне, берóза, ци лазá? — Я-ж, — кажэ, — прадáў табѣ вáла, а не казлá. — И давáй дубáсиць да пѣрыць пáна тóю пáплискаю Збиў Рымша пáна на ґóркае яблыко, забрáў усѣ ґрóшы да й пашóў сабѣ у лѣс, у сваю землянку. Кáжуць пóтым Рымша мнóґо дабрá рабиў людзям. Ещэ да тых час у цéмнум лѣсе серóд балóта стайць ґарá Ей называюць Рымшаваю Гарóю Гэто памиж Запóльем и Навóселками (Мозырскаго уѣзда) Мóо вѣдаеце Дак кáжуць — там жыў той Рымша. Ен ґдзѣсь схаваў мнóґо ґрóшэй, алé нѣльґа знайци. Землянку та я сам бáчыў, як хадзиў туды ат пáна з кáртаю Каб пашукáць, мóо и ґрóшы е.

Пересказалъ Дударъ.

Дер. Чудинъ

56. Лихая Доля.

Жыли-были два браты, два рóдные браты Ены рáзам радзилиса, рáзам хрысцилиса, адзин бáцько з мáткаю их ґадаваў, да не аднáкую им Боґ дóлю даў. За што стáршы ни вазьмéтца, ўсе ему йметца. А малóдшы што ни рóбиць, як ни бъетца, а ему ничóґо не даéтца. Памъéр бáцько, а за им и мáтка. И пашлá па миж братáми звáдка. Мóо ены ещé й ужыли-б у лáду, да прамиж жанкáми немá слáду. Як дзвѣ мáтки ў ўльи, так и дзвѣ жанчыны ў хáце не ўжывýтца цихо да робляць лихо: перш пра миж сабóю падзерýтца; пóтым к мужыкóм прыстáнуць. Тые цéраз баб и сáми ламацýюць лбáми. — Ну, браткó, — сказáў тут брат малóдшы, — чым праз баб нам наґдырáтца да не ў зґóдзе жыць, тóльки Бóґу ґрашыць

да людзéй смешы́ць, давáй лéпей не сварéмса да па прáўдзе падзеле́мса.—Дóбрэ, брáце, кáжэш—стáршы брат на тóе абазвáўса да й за падзе́л узя́ўса. От щабéчущь бáбы, бы сарóки; а браты́ як трэ́ба падзели́ли ўсе ат ни́тки да кусóчка хле́ба Ци́хо разышли́са да й жыву́ць браты́, ґару́юць да працу́юць, зарабля́юць хто як мóжэ на кусóчак хле́ба. Бо́льшы брат што дзень, та баґаце́е, а малóдшы, як ен ни працу́е, а што дзень, та ўсе бедне́е То карóва ґóлаў падвернýла, та ў жанчы́ны се́ла скýла· не́каму ни жаць ни абе́д падáць. Ко́жын дзень — неўзґóда; ко́жын крок — прыґóда. — Бо́ская воля. Такáя - -кажэ—мая дóля.

От ґэ-ж мéньшы брат би́ўса, би́ўса да й саўси́м пражы́ўса. Трэ тóрбу на плéчы браць да куски́ збирáць. Бáба лáе, зневажáе: сваяки́ дзьмýтца, усе́дзи смеютца. Кали́ дóли немá—пни́са, не пни́са, ничóґо не парáдзиш, хаць ты засили́са. От идзé раз бе́дны, бáчыць, аж браци́ха — немá éй ли́ха — на палянцы жы́то дажынáе, а пад хрэ́щыкам ее́ калы́шку дзе́вачка хистáе. — Дзе́вачка, чыя́ ты? — бе́дны тут ее́ пытáе.—Дзя́ннина я дóля—тáя атмаўля́е·

Гарéй ця́жко бе́днаму на сéрцу тóе слýхаць, тóе знáць, што еґó дóля ему́ не хóчэ прыя́ць, И пацеґса ён па пóли шукáць сваѣ дóли. От идзé ён да йдзе с дзеля́нки на дзеля́нку, с паля́нки на паля́нку; сустракáе ў гаю пад вербóю старóґо дзедóчка з си́ваю барадóю. Падышóў, схили́ўса да дзедóчку паклани́ўса. А дзедóчак пазирáе да й еґó пытáе: чалаве́чэ, Бо́жы, чаґó тут блукáеш? Чаґó па ґаю шукáеш?—А ён атмаўля́е, што дóли не мáе, та ее́ й шукáе.—Твая́ дóля—валацýґа, па ґáю ґуля́е да пе́сни спевáе.—На киéчак да й идзи́ па пóлю та й убáчыш сваю́ дóлю. От падзя́куваўшы дзе́ду, кий узя́ўшы ў рýку, пашóў бе́дны па пóлю шукáць сваю́ ґо́ркую дóлю. Ось идзé да йдзе ён, круґóм пазирáе; бáчыць, аж пад дýбам еґó доля ґрáе. Бáчыць—ґóлая дзеўчы́на лы́нды бье на мя́ґкуў трáўцы да хистáетца на ґо́льцы. От схапиў беднáк ее́ за кóсы да давáй перéсциць кием да давáй вучы́ць, як на све́це жыць. Дóля прóсиць, абецáе, што с таѣ пары́ енá старэ́ннаю быць мáе. От ведзé ён дóлю ґóлую па

полю. Сорам стало без адзёжы. Доля цяѓне к лѣсу, цяѓне, каб закрытца. Увайшли ены ў ѓущэчу да прысѣли на калодзе. Бѣдны кажэ: доля, доля, паѓаворымо-ж мы а прыѓодзе.—Не ўбивайса, не лекайса,—на тое доля сказала да й пацалавала. Бѣдны азирнуўса да й ачӧм не вѣрыць—доля сыпле ему ў полы прыѓаршчами ѓрошы.—Беры, не лекайса, спажывай як воля — кажэ доля, — ѓэто нашы ѓрошы, мӧй харошы.—Доля зникла, бы туман, а золато зъяе. Зѓрӧб еѓо ён да кишэни да й кажэ: от цепер я—пан. Да й пусциўса да ѓасподы. Ен идзе, аж лѣс ѓудзе; пад сабою ноѓ не чуе, бо ў кишэни ѓрошы чуе. От с таѣ пары пачаў ён добрэ жыць да Боѓа хвалиць. Гэ-ж, бо на свѣце тӧльки той щасце мае, каму доля спрыяе, а бо хто сваю долю да ў руках трымае. Бо без ущунку й ат доли нема ратунку.

Пересказалъ Дударъ.

Д. Чудинъ.

---

57. Кавалиха.

Жыў сабѣ адзин каваль ни ѓадки, да на еѓо лихо, была ў еѓо жӧнка кавалиха. Паѓаная была баба. Заѣла ена каваля й немӧѓ ён з ею справитца. А вѣдамо, каваль,—заўжды седзиць у карчме, або ў кузни. А прыдзе да ѓасподы—чорны як мурын; хочэ жӧнку пацалаваць, а тая як навалитца, бы жыды на Гамана, да ўчепитца ў ѓиру, да пачне вадзиць па хаце, дак Каваль не рад, што й зачапиў лихую бабу. А такая была дужая да ўпраўная, што ни яки мужчына не мӧѓ пабароць. Наѓараваўса Каваль з тою лихою бабаю, да ничоѓо не парадзиць,—не кабыла, не праменяе. Жалитца Каваль мужчынам, а тые смеютца да строяць кепики.— От дак Каваль,—кажуць,—и сарама ему нема: жонка цягае за чупрыну, скоро барадою бы вѣникам будзе пѣч вымѣтаць.—А Кавалю не да смѣху, кали з лихою сладу нема. Мужчыны смеютца, а Каваль чуць не плачэ. Папробуваў ён маўчаць да не чапаць лихую бабу.

Дак ґдзѣ там! - ещэ́ ґаре́й захадзи́ласа.—Што ты—ка́а — маўчы́ш бы пень, што цебе́ й не чува́ць —Верацьіцр ба́ба на ўсе село́ Со́рам Кавалю́, а не вѣ́дае, што пача́ць. Абры́дла ему́ свая́ ха́та, свой прыту́лак· хо́дзиць та з ку́зни ў ка́рчму, та з карчмы́ ў ку́зню Але́ ба́ба й тут его́ тра́пила да й дава́й зневажа́ць да пере́сциць пры лю́дзях Суздро́м ашалѣ́ла ба́ба, не пуска́е Кава́ля й да ґаспо́ды.—Ну—ду́мае Кава́ль,—пачака́й-жэ, хваре́ць тваей ма́тары, пайду́ да й утаплю́са Паба́чымо, як ты таґды́ бу́дзеш хвабры́тца.—Пашо́ў Кава́ль к раце́, ўзяў до́ўги ражо́н да й ты́кае ў во́ду, выбира́е, ґдзѣ ґлыбѣ́й. Ты́каў е́н, ты́каў, да й напа́ў на чо́ртаво ґнездо́. Спало́хаўса чорт· ба́чыць, што Кава́ль у его́ дзеце́й павыни́звае во́чы, вы́скачыў з вады́ да й пыта́е—Кава́ль, што ты тут ро́биш?—От хачу́ тут цэ́ркаў будава́ць —Дава́й тут чорт праси́ць Каваля́, каб е́н не чапа́ў ґэтаго мѣ́йсца —Дам --ка́жэ,—табѣ́, што зхо́чэш, то́льки йдзи ты атсю́ль ʼДам табѣ́ мно́го зо́лата.—На ли́хо мнѣ зо́лато? Вѣ́даеш. што ў Каваля́ ру́ки па ло́кацъ у зо́лаце.—Пабуду́ю табѣ́ но́вую ха́ту.—На што́ мнѣ ха́та, кали́ мене́ й ў сваю́ халу́пу жо́нка не пушча́е —Дам па́ру харо́шых ко́ней.—Нѣ, нѣ! --замаха́ў Кава́ль рука́ми,—таґды́ жо́нка суздро́м супако́ю не дась: будзе ґры́зци, каб вазиў жыдо̀ў, або́ пано̀ў —Дак чаґо-ж ты хо́чэш?—Зраби́, каб жо́нка не ґры́зласа —Гэ, таґо́ й чорт не мажэ́ пара́дзиць!—А ґдзѣ чорт не йме, там ба́бу пашле́ —Хиба́ ґэ—кажэ чорт,—клин кли́на выґаня́е До́брэ, я пашука́ю таку́ю ба́бу, каб ена́ сунела́ тваю́ жо́нку.—На то̂м ены́ й разышли́са. Чорт палецѣ́ў шука́ць тако́е ба́бы, каб ена́ спыни́ла Кавали́ху, а Кава́ль паду́маў, што ўтапи́тца ешэ́ паспѣ́е, да й пацеґса ў ка́рчму Тым ча́сам аглядзѣ́ласа Кавали́ха, што Каваля́ нема́ ни ў кармѣ́, ни ў ку́зни. бѣ́ґае па селу́ з качарґо́ю, бы апанта́ная, ко́сы на сабѣ́ рве да крычы́ць на ўвесь свѣт. Сабрали́са лю́дзи да й ка́жуць, што ма́быць суздро́м ускруци́ласа Кавали́ха. А чорт тут аґина́етца да то̂льки хвасто́м пакру́чвае, так ему́ ве́село пазира́ць на шаленую ба́бу. Стайць чорт, прыслухо́ўваетца, што ґаво́рацъ лю́дзи. Адзи́н ка́жэ,

што лѣпш засилитца, чым з такою бабаю ажанитца Другі кажэ, што лѣпш зґниць, чым з лихою бабаю жыць. Слухала, слухала тут адна маладзица да й кажэ: „я-б ееѣ атразу атучыла, каб я была еѣ ґаспадарэм". Пасмеялиса мужыки, пастроили кепики съ такоѣ хвабраѣ маладзицы да й давай расходзитца на работу. Тым часам чорт и прычапиўса к той маладзицы.—Наўчы да наўчы, штоб ты зрабила, каб суняць Кавалиху —А што-ж ты за тое даси?—Пытае маладзица — Дам цѣлую шапку ґрошэй.— Нѣ, на што мнѣ цѣлая шапка ґрошей. Ты дай мнѣ хацѧ не цѣлую шапку золата.—Гэто ещэ лѣпш—думае чорт да й кажэ,—добрэ, дам не цѣлую шапку золата —Зґода—кажэ маладзица,—прынеси золато, та я наўчу, што зрабиць з Кавалихаю.—Палецѣў чорт збираць золато, а баба ўзела жлукту, паставила еѣ над пограбам, а наверх паклала дзираву шапку. От прынес чорт золато, сыпануў у шапку, а ено тольки зазвинѣло да чорт вѣдае куды й дзѣласо Палецѣў чорт удруґае, набраў тольки золата, што чуць прыцис. Але сыпаў ён, сыпаў, а ў шапцы ничоґо не астаетца — Абшукала ты мене — кажэ чорт.— Як абшукала? На то быў уґавор. Ты казаў, што даси не цѣлую шапку ґрошэй? Казаў ци нѣ?—Казаў.—Шапка не цѣлая?—Не цѣлая.—Дак як жэ я цебе абшукала? Гэто ты мабыць хацѣў мене абшукаць.—И давай маладзица пересциць чорта. Чуць той вырваўса Атрокса й золата да сунуў, падаґнуўшы хвост От прыбеґае чорт к Кавалю да й кажэ, што знайшоў такую маладзицу, але ена вельми хитрая й так и так мене абшукала.—Малайцом маладзица,—думае Каваль и пытае чорта, ґдзѣ ена живе. Чорт сказаў.—Пачакай,—кажэ Каваль,— хибо я сам з ею паґаманю.— От чорт палецѣў на свайму дзѣлу, а Каваль пашоў к той маладзицы Вѣдамо, ў лѣтку, ўсѣ пашли на работу, а маладзица сказала гаспадару, што балиць жывот и асталаса ў хаце личыць тые ґрошы, што прынес чорт. Прышоў Каваль, пакалякаў з маладзицаю да й падкациўса к ей. Спадабаласа ему маладзица да й ен спадабаўса. Вѣдамо, ґулящы чалавѣк да ядраны, бо свая лихая баба. Нацѣшыўса Ка-

вáль за цéлы дзень, нéмаль да сáмаѓо змрóку, алé ўздýмаў. што трэ й да ѓаспóды.—Заѣсь мене́,—кáжэ е́н,—мая́ лихáя бáба.—А маладзи́ца й наўчы́ла еѓо, што зрабíць з бáбаю Рад Кавáль. Ещэ́ раз у падзя́ку ўѓадзиў маладзи́цы да й пашóў смѣ́ло да ѓаспóды. Ось и ўбáчыла еѓó жóнка да пачне́ веращáць, да пачне́ зневажáць.—Гдзѣ ты валóчышса, валацýѓа?—Пытае енá да слепи́цаю ў вóчы лѣ́зе.—Пачакáй бо, бабо—кáжэ Кавáль,—я быў у вóласци. Мене́ хóчуць вы́браць старшынóю да от не ўмѣ́ю, як нóѓи за карак залажы́ць.—Гэй, сяки́-таки́—кажэ Кавали́ха,—ось паѓлядзи́, я цебé наўчý.—Сѣ́ла ѓэто бáба на пóл, шамеля́х спадни́цу на ѓóлаў да й залажы́ла нóѓи за кáрак. Тут Кавáль узя́ў трапкáч, звезáў éй нóѓи да давáй вучы́ць папрýжкаю па зáдницы. Качáетца Кавали́ха бы клубóк да вы́слабанитца не мажэ́. А Кавáль памóчвае папрýжку да лýпиць бáбу па ѓóлуй зáдницы. Заклелáса да забажы́ласа Кавали́ха, што бóльш не бýдзе сварытца, што бýдзе пакарáтца ѓаспадарý. Здавóлиўса Кавáль и развезáў лихýю бáбу. С таѣ пары стала Кавали́ха мя́ккая, хаць у вýхо ўлажы́. А мо й за тымъ ещэ́ енá стáла дóбрая, што Кавáль вéльми пачáў учащáць к тóй маладзи́цы. А вѣ́дамо, люби́ жóнку щы́ро, та енá й на кáракъ ся́дзе.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

58. Бортникъ.

Былó вéльми лаѓóднае надвóръе: от так паведзи языкóм—бы мéд. Гэто ўжэ я́кась па веснѣ́ пéрад лѣ́там. Вѣ́дамо,—паѓóда харóшая, сóнейко зъяе, аб нóчы прайшóў цéплы дóжджык; земля́ вы́купаласа, напилáса вады́—ўсе расцé, бы на дрóжджах. От так прылажы́ вýхо к травѣ́, дак и чувáць, як енá расцé. А квѣ́тки цвитýць, бы жар ѓары́ць. Ад их так цеплóм и пышэ, й таки́ пах идзé, што от усе-б нюхаў и никóли-б не нанюхаўса. З рáна вы́пала ме-

до́вая раса́ да й разлила́са па кве̂тках, па траве̂ й па земли́, ба́тцэ ўзя́ў хто да сыто́ю й апы́рскаў усю́ зе́млю Со́нейко паднело́со ўго́ру да так прыгре́ло, што з земли́ аж па́ра клу́бам пашла́, павалила бы з гаршка́. А со́нейко ўсе гре́е, ўсе печэ́. Куды́ ни глянь— усе блищы́ць, палыску́етца да так и трасе́тца, бы гарщо́к у пе́чы, як у е́м кипи́ць вада́. Раса́ вы́сахла, а ме́д так и аста́ўса на траве̂ да на кве̂ткахъ. Чмели́, пчо́лы й матыли́ лета́юць, гуду́ць над кве̂тками да ссуць мед. Бортник панюхаў паве̂трае, лизну́ў языко́м— чу́е, аж со́латко, й паце́гса ў лѣс, гдзѣ на адро́х стая́ли пчо́лы. Идзе е́н да йдзе; аж чуе — раву́ць пчо́лы нѣмым го́ласам, аж лѣс дрыжы́ць. Прыслухо́ўваетца Бо́ртник, аж мармы́чуць медзьве́дзи.— Ну—ду́мае.—гэ́то ены́ напа́ли на пчо́лы.—Пабе̂г Бо́ртник ратава́ць. Бежы́ць е́н дзень, бежы́ць други́—чу́е: пчо́лы раву́ць, медзьве́дзи мармы́чуць, а дабе̂гци не мажэ́. То̂льки на тре́йци дзень дабе̂г е́н да таго́ мѣ́йсца; ба́чыць, аж два медзьве́дзи напа́ли на пчалу́, задра́ли еѣ, а са́ми лежа́ць да смо́кчуць ме́д. Вы́смактали ены́ пчалу́. то̂льки дрэ́бы астали́са. Падбега́е тут Бо́ртник, а медзьве́дзи ста́ли на за́дние ла́пы да на его́ й ки́нулиса Падбе̂г адзи́н медзьве̂дзь, разя́виўса да на Бо́ртника, а той ухвациў адно́ю руко́ю за язы́к, а другу́ю засу́нуў у го́рло па са́мае плечо́, учапи́ўса за хво̂ст да як паце́г, дак и вы́вернуў медзьведзя трыбуха́ми наве́рх. Раве́ той медзьве̂дзь не сваи́м го́ласам, а други́, як уба́чыў то́е, дак пусци́ўса наўцекача́. Бо́ртник за им. Медзьве̂дзь дабе̂г да раки́, ки́нуўса ў во́ду да й перапльі́ў на други́ бо̂к Падбе̂г Бо́ртник к раце́ Як тут перайци́? Глыбо́ко, а плыва́ць е́н не мажэ́. Ду́маў, ду́маў Бо́ртник. ухапи́ў себе́ за чуб да як шыбану́ў, дак и пераки́нуў це́раз ре́ку. Спало́хаўса медзьве̂дзь, бежы́ць да то̂льки хвасто́м кру́ціць. Але́ ось дагна́ў его́ Бо́ртник, ухапи́ў за хво̂ст да й дава́й маха́ць круго́м себе́. Маха́ў, маха́ў: тым ча́сам ось як атарве́тца хво̂ст да палеци́ць медзьве̂дзь, да ўре́жэтца галаво́ю аб дуб, дак и дух з его́ вы́перло. Злупи́ў Бо́ртник з гэ́стаго медзьве́дзя шку́ру, разве̂сиў еѣ на дзе́раве й па́шоў к пе́ршаму медзьве́дзю. Прыхо́дзиць е́н, аж тут назбира́-

ласо на медзьве́дзя крумькачъя́ бы хма́ра, клюю́ць ены́ ў медзьве́дзя вантро́бы. а ен кача́етца да раве́ От Бо́ртник атаѓна́ў крумкачо́ў. дабиў медзьведзя, а з еѓо шку́ры зрабиў сабѣ кажу́х. От разѓля́дае Бо́ртник ту́ю пчалу́, што медзьве́дзи задра́ли,—ба́чыць, аж ѓэто еѓо́ пчала́. Узя́ў ѓэто е́н еѣ дрэ́бы да й дава́й их палива́ць медо́вымъ со́кам з квѣ́так. Абливае да абливае, а ко́сци ўсе абро́стаюць мя́сам. От пчала́ заварушы́ласа й ажыла́. Ажыла́ ена́, распра́вила кры́ла да й дзя́куе Бо́ртнику, што спас еѣ ат сме́рци.— Я табѣ́ — ка́жэ,—прыѓаджу́са ў прыѓо́дзи,—а сама́, бзым' да й палецѣ́ла. Пашо́ў Бо́ртник да́лей и зайшо́ў у це́мны ѓусты́ лѣ́с. Але́ ось усхадзи́ласа хви́ля Траццы́ць лѣс, ломитца, а хви́ля так и кру́цица. так и кладзе́ дзерау́ля́ки к са́муй земли́. Але́ ось заѓрымацѣ́ло. бли́снула мала́нка, а перу́н адзи́н за адны́м так и сма́лиць, так и ѓре́е. Ек тре́сне ў ду́ба, або ў хво́ю, дак и разпало́суе ат са́маѓо ве́рху аж да ни́зу.— Ну,—ду́мае Бо́ртник,— сеѓо́нячы Илья́ мно́ѓо чарце́й напалю́е.—То́льки от лину́ў дож да таки́, што бы з ведра́ Куды́ тут схава́тца. Ба́чыць Бо́ртник, што яки́сь птах звиў сабѣ́ ѓнездо́ на семи́ дубо́х. От и палѣ́з е́н туды́, каб схава́тца ат да-жджу́. Падла́зиць, аж там це́лые пала́цы. От куды́ там лѣ́пш, як у на́шаѓо па́на. Улѣ́з Бо́ртник у ты́е пала́цы й азира́етца круѓо́м, каб чаѓо́ не замара́ць, так там усе́ блищы́ць и зъя́е, аж палы-ску́етца. От е́н прасла́ў свой кажу́шак, лѐѓ да й паку́рвае сабѣ́ люлячку. Тым ча́сам дож лу́пиць, бы з латака́ лье. Зраби́ласо це́мно, як посеро́д ночы. То́льки як бли́зне, бли́сне мала́нка, дак аж во́чы слѣ́пиць. А як тре́сне перу́н да заѓрымаци́ць да прыци́сне. дак аж пала́цы трасу́тца, ба́тцэ их тра́сца калоциць. Перахрысциу́са Бо́ртник, бо ста́ло ему́ ве́льми су́мно. Але́ ось так забли́скало, што ста́ло сау́сим видно́. Зирне́ Бо́ртник, аж пе́рад им стаи́ць такая ѓо́-жая дзеу́чы́на, што ни ў ка́зцы сказа́ць, ни перо́м написа́ць. Стаи́ць ѓо́лая ў чо́м ма́ци радзи́ла, то́льки ко́сами закры́ла сарамацѣ́не. А ко́сы ў еѣ́ до́уѓие, аж да пъят. Стаи́ць ена́ да ко́сы перабира́е.— Ма́быць ѓэто руса́лка—ду́мае Бо́ртник. Ен чу́у ат людзе́й, што ў

лѣсе русалки падманьваюць мужчын: абдымаютца, цалуютца да казлычуць цыцками да тых час, пакуль не заказлычуць на смерць. Або падманьваюць пѣснями к рацé й там топяць ласых да баб дурных дзецюкоў. Зирнуў Бортник, аж у таѣ дзеўчыны цыцки от так и тырчаць, бы сабачые мордачки; тырчаць и падымаютца кверху, батцэ што разнюхоўваюць. Спалохаўса Бортник, зняў з себé крыжык да й накинуў на тую дзеўчыну. Тольки ен гэто зрабиў, як ена й кажэ— не бойса мене, добры чалавѣче. Я табѣ не зраблю лиха. Цепер я буду табѣ служыць усé жыце. Тольки ты вызваль мене з ґэстаѣ неволи.— И пачала ена расказваць, што за синим морэм, за высокими гарами, за балотами да за лесами е великае царство. Там жывуць людзи ўсе ґожые: бѣлые да румъяные, бы кроў з малаком. Там и ена жыла ў роднаґо бацька, руднаґо бацька—слаўнаґо цара: ў роднаѣ матки, роднаѣ матки—слаўнаѣ царыцы. Да налецѣў на тое царство за синее морэ, за высокие ґоры, за балота да за лесы велики змѣй и хватаў людзей самых гожых да ўдалых, хватаў и ѣў, або ўносиў за синее морэ, за высокие ґоры, за балота да за лесы й там раскидаў их па свѣце. Много людзей асирациў ен у том царстве, много ен там пралиў люцких слез. Сжалиўса над людзьми слаўны цар— мой родны бацюшко й абъявиў усим баґатыром и силачом, што хто гаґо змѣя паборэ да зловиць, за таґо слаўны цар —мой родны бацюшко атдась мене замуж. Прачуў тое страшны змѣй, прачуў да пранюхаў, пабиў войсько храбрае, паламаў засовы залѣзные, павысаджваў дзверы дубовые да й ухапиў мене ат слаўнаґо цара—роднаго бацюшка, ат слаўнаѣ царыцы—роднаѣ матачки й панес мене за синее морэ, за высокие горы, за великие балота да за цемные лесы, прынес сюды да й схаваў у ґэтумъ палацы. Сам и да тых час улетае да людзей цяґае. Была тут адна божая пчолка. Ена кожын дзень ка мнѣ летала да вѣстачки насила ат слаўнаґо цара— роднаґо бацюшка да ат слаўнаѣ царыцы—роднаѣ матачки. Тольки от ужэ дзенькой тры прайшло, як еѣ нема. Чула я—раўли медзьведзи, раўли страшно, аж земля дрыжала. Чула я -крычала пчолка,

нѣмым ґоласам крычáла да прасúласа ратýнку. Крычáла-крычáла да й зацúхла Мáбыць медзьвéдзи маю́ пчóлку задрáли.

— Задрáць ены́ задрáли,—кажэ Бортник,—пчóлку задрáли, да за тóе сваѣ шкýры мнѣ атдáли. О, ґэто й шкýра с аднаґо медзьвéдзя,—паказáў Бóртник на свóй кажýшак. Царэўна ўхвацúла той кажýшак да й надзѣла на себé. Бáчыць енá, аж у медзьведжóй шэрсци асталáса тáя писýлька, што неслá пчалá. Перачытáла енá тýю кáрту да й кáжэ: пишуць слáўны цар—мóй рóдны бáцюшко да слáўная цары́ца—мая́ рóдная мáтачка, каб я ў змѣя вы́ведала, чаґó éн байтца й хто еґó мажэ пабарóць. Да як мнѣ еґó пытáци, калú éн не хóчэ й размаўляци?

— Не турбýйса,—кажэ Бóртник—мая крáля, бо я хаць заґúну, цебé не пакúну.

— Ой, сакóле мóй ясны, як табѣ с змѣям цяґáтца, калú еґó ўсѣ людзú баятца?

Тым чáсам зацúхли ґрымóты; паказáласо сóнейко с-за хмáры. Так и зазъяли залатые палáцы Алé ось знóў усхадзúласа хвúля.
—Ой, хавáйса, сакóле мóй я́сны!—кажэ Бортнику царэўна,—ґэтож лецúць сюды́ змѣй.

Спалóхаласа царэўна, пачапúласа Бóртнику на шы́ю да й вúсиць, бы непрытóмная. Ухапúў Бóртник еѣ на берэме да давáй Бóґ нóґи: вы́скачыў з палáцаў да й папéрса ў ґущэчу. Ци дóўґо, ци мáло éн пéр царэўну, тóльки ўтамиўса да й прысѣў пад дýбам, каб атдыхатца хаць трóхи. Тым часам вернуўса змѣй у сваѣ палáцы. Чýе—чужы́м дýхам пáхне. Давáй ен шукáць царэўну. Бáчыць, аж атчы́няны дзвéры. Даґадáўса змѣй, што хтóсь украў царэўну, абазлиўса, ґрызенуў себé за хвóст да й палецѣў даґаняць. Лецúць змѣй, а ат таґó úмпату пад им аж лѣс ґарыць. Чýе Бóртник, што змѣй ужэ блúзко, ўхапиў царэўну на берэме да й пуспиўса на балóто. Грáзко—вѣдамо балóто, тóльки памúж дрыґвы́ кýпины тырчáць. Царэўна мóцно ўхапúласа за шы́ю да й трымáетца, бы клѣщ. А Бóртник скáчэ сабѣ да скáчэ з кýпины на кýпину. Так и дабрáўса éн да астраўкá.

Тым часам далецѣў змѣй да балота да й думае, што мабыць зґубиў слѣд, бо цераз балото нихто не мажэ прайци. Вернуўса змѣй у палацы да давай аттуль нюхаць слѣд да йци за Бортникам. Бачыць Бортник, што змѣй зґубиў слѣд, зрабиў на астраўку з вѣтак кубельцэ да й леґ з царэўнаю спаць, бо ўже ноч нахапиласа. Лежаць ены сабѣ да калякаюць, а тым часам и ночка прайшла. Вѣдамо, ў лѣтку, якая ноч. Заснули ены, як ужэ ўзышло сонейко. От ужэ пачало прыпекаць, а ены спяць, бы змарлые, спяць и не чуюць, што змѣй прэ цераз балото просто на астравок. Прыпекло сонейко, загули чмели да пчолы над квѣтками — збираюць мед. А Бортник спиць и ничоґо не чуе. От ужэ змѣй на астраўку, от-от нападзе на кубельцэ да й пажрэ Бортника разам с царэўнаю адным хламам. Першы спалохаўса змѣя зайчык баязливы, ўсхапиўса с пад куста, прылажыў вушы да як суне, да ат страху наскочыў на самае кубельцэ, якраз к Бортнику на нос. Чмыхнуў Бортник да й прахапиўса. Прахапиўса ен — чуе, аж змѣй близко; ўзштурхаў ен царэўну, хапиў еѣ на берэме да й папер далей цераз балото. Бѣґ-бѣґ, дабѣґ да раки. Рака ґлыбокая й шырокая. Як тут перабратца на другi бок! Стаиць ен на беразе да й думае, бачыць, аж у рацэ ґрае щупак.

— Щупак, о щупак! — просиць Бортник, — перавези нас на друґи бок раки.

— Нѣкали мнѣ, — трэ лавиць плотак. — Вильнуў хвастомъ да й паплыў.

Ось лециць шуляк. Бортник давай еґо прасиць, — шуляк, шуляк, перанеси нас на друґи бераґ.

— Нѣкали мнѣ, — трээ лавиць птушак да кармиць дзѣтак. — Махнуў шуляк крылами да й палецѣў. Прылецѣла к рацэ пчолка пиць воду. Бортпикъ и просиць еѣ; — пчолка, пчолка! перапраў нас на друґи бераґ. — Добрэ, — кажэ пчолка, — я ўвесь вѣк раблю на людзей и на Боґа Садзѣцеса на мене. Сѣли Бортник з царэўнаю на пчолку, а ена растапырыла крылца да вум! и пералецѣла цераз реку.

Дабѣ́г змѣ́й да ракі́ да давай рабі́ць мо́ст. Навырываў з карэ́нем дубо́ў, нацяга́ў у рэ́ку да й загаці́ў во́ду ата дна аж да ве́рху. Ещэ й да тых час там лежа́ць на днѣ́ ракі́ цэ́лые дубы́. Тым ча́сам Бо́ртник дабра́ўса да гаспо́ды. А вѣ́дамо, ў гаспо́дзе ко́жын смелѣ́й. То́льки ось па нема́лум ча́се и прэ змѣ́й. Што тут рабі́ць' Ухапі́ў Бо́ртник зубе́ль, запалі́ў его́ да й выскачыў з ха́ты Змѣ́й тут на его́ й напа́ў, а Бо́ртник и ўсадзі́ў зубе́ль змѣ́ю ў го́рло да дава́й з им бітца. Ци до́ўго, ци ма́ло ены́ біліса, то́льки змѣ́й нача́ў над Бо́ртникам браць верх. Ба́чыць Бо́ртник, што ему́ прыхо́дзяць капцы́, ўзду́маў пра ту́ю пчалу́, што атратава́ў ат смэ́рци, да й пазва́ў еѣ́ на по́мач. То́льки ен клі́кнуў,—пчала́, пчала́, памажы́ ў прыго́дзе,—як сыпне́ сюды́ цэ́лы ро́й пчо́л, да як нападу́ць ены́ на змѣ́я, да пачну́ць его́ куса́ць, да пачну́ць грэ́ць. Круциўса, круциўса змѣ́й да й звиўса бы вужа́ка. Усхапиўса Бо́ртник, ухваціў сакѣ́ру да й атсѣ́к змѣ́ю го́лаў. До́ўго круциўса змѣ́й без галавы́, круциўса, аж я́му вы́капаў. Падзя́куваў Бо́ртник пчалѣ́, дабиў змѣ́я да й садра́ў з его́ перэ́стую шку́ру. Ра́да царэ́ўна, бы на свѣ́т нарадзі́ласа, дзя́куе Бо́ртнику й про́сиць его́, каб ен пашоў з ею ў то́е сла́ўнае ца́рство, к сла́ўнаму цару́—к еѣ́ ро́днаму ба́цьку, к сла́ўнуй царыцы—к еѣ́ ро́днуй ма́тцэ, каб пашо́ў туды́. Сабра́ўса Бо́ртник у вели́кую даро́гу, узя́ў з сабо́ю ко́пу лапцё́ў, цагало́, крамене́ц да гу́бку, палажы́ў у то́рбу змейную шку́ру да й пашо́ў з царэ́ўнаю ў сла́ўнае ца́рство, за синее мо́ре, за высо́кие го́ры, за вели́кие бало́та, за цё́мные лесы́. Иду́ць ены́ да йду́ць; перайшли́ лесы́, перайшли бало́та, падхо́дзяць к гара́м. А го́ры высо́кие аж да не́ба. Пачали́ ены́ лѣ́зци на го́ры. Лѣ́зли, лѣ́зли, дак и канца́ нема́. Ба́чаць ены́, аж на ду́бе арли́нае гнездо́, а ў гнездзѣ́ малы́е арленя́тка. Седзя́ць арленя́тки, раты́ разева́юць да ѣ́сци про́сяць. От накарми́ли ены́ арленя́так, а са́ми сѣ́ли атдыха́ць. Тым ча́сам на гнездо́ напа́ла куни́ца. Ена́ хацѣ́ла паѣ́сци арленя́так. Тут Бо́ртник як перацѣ́г па́плискаю куни́цу, дак ена́ й выпруцилаcа На гэ́ты час налета́е арол. Уба́чыў е́н, што Бо́ртник абратава́ў малы́х

дзе̂так и ка́жэ — праси́, чаѓо́ хо́чэш. — Перанеси́ нас це́раз ѓэ́тыя ѓо́ры, — про́сиць Бо́ртник. — До́брэ, садзе̂цеса на мене́. Се̂ли ѓэ́то ены́ на арла́, а той и перамча́ў их це́раз высо́кие ѓо́ры да це́раз синее мо́рэ. Падзя́кували ены́ арлу́ да й пашли́ к сла́ўнаму ца́ру да к цары́цы. Иду́ць да йду́ць, распыто́ўваюць даро́ѓу. Нарэ́шце прышли́ ены́ к ца́рским пала́цам. Прывели́ их к цару́ й к цары́цы.

— Якие вы лю́дзи? — Пыта́е цар — атку́ль вы прышли́?

Не вазна́ў ен сваѐ дачки́, так ена́ пахудзе̂ла ў зме̂я да змени́ласа. Але́ як учу́ла цары́ца ѓо́лас, дак и пазна́ла дачку́. Тут ена́ ки́нуласа к е́й на шы́ю й дава́й цалава́ць да абдыма́ць. Тым ча́сам Бо́ртник даста́ў з ка́йстры шку́ру зме̂я да й прасла́ў еѐ на земли́. Спало́халиса ат аднаѐ шку́ры ўсѐ тут князи́ да бая́ры. От дава́й цар пыта́ць Бо́ртника, як е́н вы́звалиў царэ́ўну. Разсказа́ў Бо́ртник, а цар з цары́цаю пасадзи́ли еѓо́ з сабо́ю за сто́л и дава́й частава́ць. Па нема́лум ча́се атда́ў цар за Бо́ртника сваю́ дачку́ — пракра́сную царэ́ўну, й ста́ли ены́ жыць да пажыва́ць да людзе́й не забыва́ць. А па сме́рци цара́ ста́ў ца́рстваваць у то̂м ца́рстве Бо́ртник. Пры ем до́брэ было́ ўсим лю́дзям, бо е́н памета́ў, што той са́мы дуже́йшы, хто ро́биць дзе́ля людзе́й и дзе́ля Бо́ѓа.

Пересказалъ Болбатъ.

Д. Чудинъ.

59. Кавальчук и панич.

Жыў сабѐ адзи́н ве́льми цика́вы пан. Захаце̂ласо ему́ знаць, што бу́дзе з малы́м дзи́цем, кали́-б еѓо́ не так ѓадава́ць, як усѐ ѓаду́юць. Тым ча́сам якра́з у адну́ по́ру абрадзи́ниласа па́ни й кавали́ха. Абе̂дзьве прывели́ ѓо́жых хлапчуко́ў. От пан ци́хенько й паменя́ў ѓэ́тых дзеце́й: сабѐ ўзяў кавальчука́, а кавалю́ атда́ў свайѓо хлапчука́. Расту́ць дзе̂ци. Ве̂дамо, за паничо́м хо́дзяць ма́мки, ня́ньки й уся дво́рня. Жыве́ кавальчу́к у раско́шы, а па́ньськи сын

напрэтца бу́льбы, або́ сухо́го хле́ба да й по́ўзае ў ґрази́ па ву́лицы. От прайшло ґадо́ў мо пъяць, або ше́сь, па́ньськи сын падро́с, и атпраўля́юць его́ пасци́ свине́й А кавальчука́ ў двары́ адуку́юць ґубарна́нтки да пе́сцятца з им, як з лихо́ю ску́лаю. Але́ ось паѣхаў раз пан з па́няю на по́ле Узели́ ены́ з сабо́ю й панича́. Ѣдуць ены́ кале́ села́ паўз вы́ґан, але́ ось и ба́чыць пан, што его́ сын пасе́ кавале́вые сви́не. От хлапчу́к атаґна́ў свине́й ат шко́ды, сѣў кале́ даро́ґи, прасла́ў на земли́ хусци́нку, даста́ў з ка́йстрачки кусо́к хлѣба й пе́чанаѣ бу́льбы, палажы́ў на хусці́нку да й ѣсь. Падъѣхаў туды́ пан. От хлапчу́к уста́ў и низенько пакланиўса па́ну.—Бачно́, што па́ньскае дзиця,—ду́мае пан. А па́ни й пыта́е ў ху́рмана,—чый ґэто та́ки пажо́ндны хло́пец?—Кавалеў, па́ни—ка́жэ ху́рман.—Брэ́шэш,—ду́мае пан, але́ маўчю́ць, зу́бы сця́ўшы Паѣхали ены́ да́лей. Падъезджджа́юць к лѣсу. Зирну́ла па́ни на лѣс да й ка́жэ,—я́ке ла́днэ джэ́во.—Штоб ты з его́ зрабиў?—пыта́е пан у панича́. Той паґлядзѣў на лѣс да й ка́жэ—спалиў-бы, от до́брае-б уґо́лье было́.—Ду́рэнь е́стэсь!—ка́жэ пан, а сам ду́мае,—які́ ба́цько, таки́ й сын. Кавальчу́к кавальчуко́м.

От паѣхали ены́ наза́д; параўня́лиса з тым мѣ́йсцам, ґдзѣ па́ньськи сын па́сциць свиней, дак па́ни падазва́ла кавалеваґо хлапчука́, зирну́ла на его́ й паказа́ласо е́й, што хлапчу́к ве́льми падо́бен да ее́ От и про́сиць ена́ па́на, каб е́н узя́ў кавалеваго хлапчука́ ў двор ґэдава́ць и адукава́ць ра́зам з паничо́м Пан з ра́дасцю ўзяў ат каваля́ сваййо́ сына ў дво́р. От пачали́ их адукава́ць Кавальчу́к до́брэ берэ́тца, а пани́ч усе бѣ́ґае на пека́рню да с дваро́выми хло́пцами ґрае. Зпрактыкава́ў пан, што мужы́к мужыко́м на вѣ́ки веко́м да й прызна́ўса пани, што паменя́ў хлапчуко́ў ещэ мале́нькими. Праґна́ла па́ни панича́ к кавалю́ свине́й па́сциць, бо на друґо́е е́н не ґо́ж.

Пересказалъ Дудка.

Д Чудинъ

60. Новы чорт.

Быў сабѣ адзи́н по̆п, да ве́льми хсци́вы да маладзи́ц. Вѣ́дамо, з ґульни́ то̆льки а ба́бах и ду́мае. Наѣ́сца, напъе́тца, вы́спитца ў вахво́ту, а тут ат са́ла шку́ра пу́каетца. По̆йдуць лю́дзи на рабо́ту, а е́н и цику́е, ци не прыдзе́ яка́я маладзи́ца зачы́м ко́львек да ґаспо́ды Як пакмѣ́цiць, дак и прыста́не, бы шаўцо̆ўська́я смала́ Перш маладзи́цы хава́лиса ат паґа́наґо папа́, а по́тым, як пача́ў ен навуча́ць, што по̆п светы́, бо́ ен пасвѣ́чаны, дак маладзи́цы й ду́маюць—мо й пра́ўда, што хто зна́етца з папо́м, та й ґраху́ нема, бо е́н светы́. Ужэ́ хацѣ́ли мужчы́ны абрэ́заць ему́ ку́длы да папе-рабива́ць но́ґи, але́ по̆п напужа́ў их, што не дась прыча́сця да пажа́литца станаво́му, каб ены́ як недавѣ́рки, пагнили́ ў вастро́зе. Баятца мужыки́, маўча́ць. То̆льки ось вельми ча́сто пана́дзиўса по̆п к адно̆й маладзи́цы. Еѣ́ ґаспада́р маў яку́юсь до́хленькую кабылку й вазиў на е́й жыдо̆ў. То̆льки я́кась прыкмѣ́циў е́н, што як то̆льки е́н з двара́, дак по̆п у ха́ту. От раз запро̆ґ той ґаспада́р кабы́лку, накла́ў на во̆з мно̆ґо сѣ́на, нибы́то ѣ́дзе ў вели́кую даро́ґу, й пап-ха́ўса за село́. Гэ́то ўжэ было́ пе́рад змро́кам. От як ужэ́ до́брэ сцемнѣ́ло, ґаспада́р верну́ўса да ґаспо́ды, да и сту́кае ў дзьве́ры, каб жо̆нка атчыни́ла. Тым ча́сам у жо̆нки начава́ў по̆п. Схапи́ўса ен с пасце́ли да так без парто́к и бѣ́ґае па ха́це, не вѣ́дае, куды́ схава́тца. А тут у сѣ́нячках стая́ла кадушка з пѣ́ръем. По̆п шаме-ля́х у ту́ю каду́шку да и прыкры́ўса пѣ́ръем. Атчыни́ла жо̆нка дзве́ры, а ґаспада́р чуў, што по̆п схава́ўса ў каду́шку, не й́дзе ў ха́ту, да й ка́жэ жо̆нцэ,—дай дзеру́ґу,—я паѣ́ду на кармаш. Дала́ жо̆нка дзеру́ґу, а ґаспада́р наки́нуў еѣ́ на каду́шку да й абвеза́ў веро́ўкаю.— Павезу́, прада́м пѣ́ръе. Неха́й дармо́ не валя́етца. Ба́-чыць маладзи́ца, што нѣ́льґа ничо́ґо пара́дзиць, маўчы́ць, бы вады́ ў рот набра́ўшы. Узвалиў ґаспада́р кадушку з папо́м на во̆з да й папе́р на карма́ш.

— Куды́ ты, ся́брэ?—пыта́юць сусѣ́дзи.

— Паѣду на кармаш прадавацць нóваѓо чóрта — кáжэ той чалавѣк.

Дзивятца людзи, яки там таки нóвы чорт. Прóсяць каб ен наказáў тýю пачвáру.

— Немóжне браткí —ўцечэ.

Назбирáласо мнóѓо людзéй. Хóчэтца им паѓлядзѣць таѓó дзива. Запраглí енý кóней и паѣхали разам на кармáш. Ци дóўѓо, ци мáло енý ѣхали, тóльки ось прыезджáюць над цэркаў на кармаш. Пашлá там чýтка, што чалавѣк прывъéз нóваѓо чóрта, сабралóсо людзéй, што аж кишыць. Вышли папý з цэркви да й тые тыщ тудý, паѓлядзѣць на такое дзиво. А пóп, вѣдамо, дóўѓо седзѣў у кадýшцы й усé рабиў пад себé, дак так абмарáўса, так у кýдлы набиласо пѣрья, што саўсим стаў пахóж на чóрта. От папý да панý абступили вóз и прóсяць таѓó чалавѣка, каб ен наказáў чóрта — Заплацѣце — кáжэ — за маю турбáцаю. Я дýмаў, што хто кýпиць.

От панý да жыдý насыпали тамý чалавѣку пóўную шáпку ѓрóшэй. Пачалí й мужыкí развязваць сваѣ маѓалѣйки да даставáць аттýль медзякí. Назбирáў той чалавѣк тóлько грóшэй, кóлько не былó ещэ ни ў еѓó, ни ў еѓó бáцька. От стаў ен на вóзе, паставиў там кадýшку да й развезáў дзерýѓу.— Ну,—кáжэ—вылáзь атсюль, нóвы чóрце,—й давáй еѓó штýрхаць киям. Падняўса пóп з кадýшки. Зирнýць людзи, аж ѓэто якóесь страшыдло: высóки, худý, с дóўѓими кýдлами да з велизазнаю барадóю, цыѓлáты, ў вадной сарóтцы без партóк да так умáзаўса да ўкачáўса ў пѣрье, што рыхтык чорт. Кинулиса перш людзи ат вóза, алé хтось и кáжэ,— ѓэто-ж наш бáцюшко. Зирнýць усѣ, аж прáўда — ѓэто пóп. Сóрам тамý папý, саскóчыў éн з вóза да й сунýў, куды вóчы гледзяць. С таѣ парý ѓóдзи éн хадзиць к маладзицам.

Пересказаль И. Аземша.

С. Лучицы.

61. С чаго лихо на свѣце.

Цепе́р куды́ ни зирни́, ўсю́ды ли́хо на свѣ́це. Ка́жуць—служы́ў адзи́н па́рабак и ўсе его́ застаўля́ли мало́ць у жо́рна Ме́ле ен да ме́ле, прыслу́хаетца, дак мле́н у кло́паце ўсе ка́жэ: там лѣпш, там лѣпш! Наслу́хаўса таго́ па́рабак, паки́нуў тут хаджа́ина да й пашо́ў туды́, ґдзѣ лѣпш. Прышо́ў ен и наня́ўса к друго́му хаджа́ину. Але́ й там заста́вили па́рабка мало́ць у жо́рна. Мало́ў е́н мало́ў да й дава́й прыслухо́ўватца, што ка́жуць жо́рна. Чу́е, аж мле́н у кло́паце ўсе ка́жэ: як и там, так и тут! Як и там так и тут! Ки́нуў па́рабак и таго ґаспадара́ да й пашо́ў шука́ць, ґдзѣ лѣпш. Але ко̂льки ен ни хадзиў, усю́ды застаўля́юць мало́ць у жо́рна й ены́ ўсе кажуць: як и там, так и тут! Як и там, так и тут!—Цепе́р усю́ды парабко̂м ли́хо на свѣ́це—ка́жэ па́рабак Пачу́ў то́е хаджа́ин, пакива́ў ґалаво́ю да й ка́жэ—нѣ, ма́быць цепе́р усі́м и ўсю́ды ли́хо на свѣ́це. Дак от я раскажу́ вам с чаго́ ли́хо на свѣ́це. Кали́ пра́ўду скажу́—смека́йце, а прыхлушу́—не меша́йце да прабача́йце, бо як уста́рытца, та й пра́ўда бу́дзе.

Даўны́м даўно́ спрадвѣ́ку жыли́ сабѣ́ лю́дзи, пажыва́ли, ния́каго ли́ха не зна́ли. Свѣт велики: ўсю́ды во̂лно; як патрудзиўса, так и пажывиўса. Не было́ таґды́ ни пано̂ў, ни мужыко̂ў, а так сабѣ́ лю́дзи жыли—пажыва́ли да Бо́ґа выхваля́ли, а ни аб чо̂м ены́ не клапаси́лиса. А Бо̂ґ таґды́ ещэ́ жыў на земли́, прыхо́дзиў к лю́дзям, бы сво̂й брат, вучы́ў их, як на свѣ́це жыць да дзѣ́так пладзи́ць, дзѣ́так пладзи́ць да ґадава́ць да зе́млю напаўня́ць. И не было́ на земли́ ни ли́ха, ни дабра́. Лю́дзи бы квѣ́тки цвили́; жыли́ бы пту́шки ў не́бе, ци ры́ба ў вадзѣ́; жыли́, што стре́ли, та ўжыва́ли—ни ща́сця, ни беды́ не ма́ли. Але́ што тако́е жы́це? Так жыве́ й звере́ па лѣ́се; так жыве́ й дзераўля́ка. Бо̂ґ уба́чыў то́е да й пача́ў учы́ць людзе́й, як латвѣ́й даста́ць йм жы́ўнасць, як зраби́ць

сабѣ адзѣжу, як схаватца ў непаґоду, як лавиць рыбу да зверъе да птушак. И пазнали тагды людзи, што каму ўлажыў Бог розум, той мажэ рабиць, што хочэ.— Гэ, мы й сами з вусами — кажуць людзи,—што захочэм, тое зробим. Мы й сами, бы баґи, тольки Бог затым не даў нам силы, ўладзы, што байтца, каб землею заўладаўшы, мы не ўздумали й самоґо Боґа сапхнуць з неба И атступиўса тагды Бог ат ґардых людзей и пашоў сабѣ на небо. Але пачали святые анелы прасиць Боґа, каб не ґубиў людзей. И сказаў им Бог, што дае ен людзям уладзу на землю: на ўсе, што расце на земли на ўселякае зверъе, што жыве па лѣсе, па палях, балотах. на земли й пад землею; над птушками, што купаютца пад небам; над рыбами, што ў вадзѣ ґуляюць волно. И будуць маць людзи ўладзу над усим, што е ў земли й на земли. И будзе людзям добрэ жыць на свѣце, кали ены не захочуць маць уладзу адзин над друґим, а кали ўздумаюць над людзьми панаваць, та пазнаюць и дабро й лихо й датуль будзе лихо, пакуль людзи будуць маць уладзу над людзьми. Але я даў людзям розум, каб ены сами пазнали, с чаґо лихо на свѣце. И розум пакажэ людзям дароґу, як лихо адалѣць и як так жыць и маць уладзу над усим на земли. каб усим было добрэ и каб не было лиха. И просяць Боґа святые анелы, каб ен паслаў их на землю служыць людзям и бараниц их ат лиха. И пазволиў Бог анелам сцераґци людзей, а сам велѣў яснаму сонейку свециць людзям, каб ат таґо свѣту ены набиралиса розуму, таґо великаґо розуму, што мацнѣй усеґо на свѣце. Пакланилиса анелы Боґу да й палецѣли на землю сцераґци людзей. Тым часове, пакуль святые анелы блаґали Боґа, шатан не спаў. Убачыў ен, што Бог атступиўса ат людзей и пакинуў землю, давай ґэто падбиваць дужэйшых, каб ены брали ўладзу над слабѣйшыми. Давай ґэто дужейшые атбираць ат слабѣйшых, што тые зробляць, давай их прымушаць рабиць на себе, давай ими ўладаць, бы свайм дабром. От ґэ шатан дужейшых да хитрейшых зрабиў панами й атдаў им у руки ўсих слабѣйшых людзей. И пашло с таѣ пары лихо

на земли́, пашло́ тако́е ли́хо, што й сказа́ць не мо̆жне. Пачалі́ паны́ лави́ць людзе́й, бы зверье́, пачали́ их мэ́нчыць да здзе̃кується, ба́тцэ ґэто й не лю́дзи, а ґаўя́до. Прылецѣ́ли светы́е ане́лы, су́нулиса туды́-сюды́, пачалі́ падбухтэ́рваць людзе́й, каб ены́ не слу́хали пано̆ў. Дак куды́ там!—ста́ло ещэ́ ґаре́й: паны́ ўзели́ ўла́дзу на зе́млю, пачали́ мары́ць людзе́й ґо́ладам, пачали́ их биць да забива́ць, да адзи́н на друґо́ґо насыла́ць. Папро́бували светы́е анелы сказа́ць, што е Бо̆ґ на не́бе, што Ен усе́ ба́чыць и чу́е, што за тако́е ли́хо Ен пакара́е пано̆ў. Слу́хали-слу́хали то́е паны́ да й ка́жуць—э, што вы нам ба́еце! Вы там седзѣ́ли на не́бе й ничо́ґо не зна́еце, што тут ро́битца на земли́. Мужы́к без па́на абайци́са не мо́жэ: бъе́тца, дзерэ́тца—сцеражы́, ты Бо́жэ! Над мужыко́м трӭэ стая́ць з бизуно́м над ка́ркам да ещэ́ трыма́ць во̆з лазы́ за хвальва́ркам, бо ў мужыка́ така́я нату́ра, што без бизуна́ свербі́ць шку́ра. Ен бы свиня́ напрэ́тца, нажрэ́тца, ўлѣ́зе ў ґразь да й ду́мае, што князь. Мужы́к без ущу́нку не зна́йдзе сабѣ́ рату́нку, бо е́н да па́ньськаґо дабра́ хци́вы, а на работу—лени́вы; бу́дзе ат ґо́ладу падыха́ць, а на баку́ лежа́ць. Адно́ ли́хо на свѣ́це бу́дзе, як мужы́к во̆лнась дабу́дзе. Свѣ́т переведзе́тца—адна беда́ астанетца.

Учу́ўшы то́е светы́е ане́лы палецѣ́ли к Бо́ґу на ска́ргу. Тым часо́ве паны́ запанава́ли й ли́ха-б не зна́ли, кали́-б не пачалі́ вымышля́ць да адзи́н друґо́ґо ѣ́сци, пажыра́ць. Паны́ прами́ж сабо́ю бъю́тца--дзеру́тца, а ў мужыко̆ў ґи́ры трасу́тца, да йлбы́ траща́ць, аж скі́вицы вища́ць. И пасла́ў Бо̆ґ на зе́млю светы́х ане́лаў с чарця́ми ваева́ць, а светы́х праро́каў—людзе́й навуча́ць. Але́ ни ане́лы, ни праро́ки ничо́ґо не зраби́ли, бо ены́ слаўцо́м, а ли́хо дубцо́м. Ены́ па бо́жаму пра́ўду ла́дзяць, а паны́ ў вус смею́тца да чэ́рава ґла́дзяць. Так да тых час мужыки́ ґару́юць, мужыки́ працу́юць, а хлѣ́ба не ма́юць, часам ґо́ладам падыха́юць, бо што ни зро́бляць, та паны́ здзира́юць. А паны́ пану́юць, ничо́ґо ие ро́бляць да ли́хо вымышля́юць, бо за сабо́ю чо́ртаву си́лу ма́юць. И нема́ рату́нку ат тако́ґо жыця́, бо ено́ ўсе, бы камѣ́ня ку́ча, сверху ця́жкае ка-

мѣ́не дрѣ́бных на песо́к расцѐрло до́ле; свѐрху их ґнету́ць друґие а на тых лежа́ць и ци́снуць до́лу ещэ́ цяжѐйшые; свѐрху-ж лёґ адзи́н велики ка́мень. От ґэ спрадвѣ́ку й да тых час ли́хо людзѐй да́виць. ли́хо ци́сне людзѐй свѐрху к долу́, бы ў ку́чы тѐй камѣ́не. Тращы́ць ку́ча, трэ камѣ́не, на жарству́ их трэ на до́ле: тращы́ць и ху́тко аседа́е, аседа́е ни́жэ-ни́жэ да ўсе ни́жытца да до́лу. Ма́быць ско́ро затраща́ць падпо́рки й разсы́плетца ўся ку́ча. Так и ў жыццю: ўсе ґарѐй-ґарѐй бѣ́дным лю́дзям, бо наро́д мно́жытца, а свѣт адзи́н. И так цѣ́сно лю́дзям на земли́. а тут и то́е, што е слимаза́рнае, дужѐйшые лю́дзи захваци́ли да й трыма́юць, бы воўк зуба́ми. Забива́юць, паеда́юць лю́дзи адзи́н друґо́ґо ґарѐй, як звѣр звѣ́ра. Ены не зна́юць таґо, што адзи́н чалавѣ́к не ма́е мо́цы, бы чарвя́к, бы та́я были́нка ў по́ли: налеци́ць вѣ́цер, закру́цицъ хвиля да й сатрэ́, зраўну́е з землёю. Быў чалавѣ́к—пхх! й нема́, бы й на свѣт не радзиўса. То́льки таґды́ чалавѣ́к мо́цны, як ён не адзи́н, а жыве з друґи́ми людзьми́ ў зґо́дзе да ў ладу́. И чаґо́ то́льки не зро́бляць лю́дзи, кали́ во́зьмутца за дзѣ́ло грама́даю, бы адзи́н чалавѣ́к. Але́ от ґэ́таго й не зна́ли лю́дзи, не зна́ли як жыць на свѣ́це, каб усим было́ до́брэ. Ко́жын цёґ да себе́, ко́жын ко́шкаў к сабѣ́, ко́жын на друґи́х, як на вараґо́ў пазира́ў и ко́жын друґи́х вараґа́ми маў. И затра́цили лю́дзи ўсѣ сваѣ си́лы то́льки на то́е, каб адалѣ́ць сваи́х вараґо́ў—таки́х са́мых людзѐй, як и ены́. Так спрадвѣ́ку би́лиса лю́дзи, ни́щыли адны́ друґи́х. От атчаґо́ ли́хо на свѣ́це. Але́ як сказа́ў Боґ, так и ста́ласо: радзиўса на свѣ́це ясны ро́зум и пача́ў расци́: то́льки расце́ ён так ци́хо, так памале́чку, што чалавѣ́к вѣк пражыве́, а ро́зуму чуць на крыху прыбу́дзе. Адны́ лю́дзи ўмира́юць, друґие раджа́ютца. Ены пражыву́ць вѣк и аслабаня́юць мѣ́йсцо друґи́м. Ты́е гэ-ж спло́дзяць дзецѐй и памру́ць. Так и жыву́ць лю́дзи, бы вада́ цечэ́ ў рацэ́. А ро́зум хаць ци́хо, памале́чку, да ўсе расце́, расце́ й паднима́етца на но́ґи. От як вы́расце той, ясны бы со́нейко ро́зум да пачне́ свеци́ць лю́дзям у вочы, та таґды́ ўсѣ пазна́юць, с чаґо́ ли́хо на свѣ́це, пазна́юць праўду, падни́мутца ў зґо́дзе,

бы адзин чалавѣ́к, праѓо́няць паѓа́ную нѐчысь и зажывў́ць на землі́, бы ў раю. Мы ўжэ не даждо̆́мса таѓо́, але́ мо́о на́шы дзѣ́цп ци ўну́ки таки́ дачака́юць.

Пересказалъ Михаль Кравецъ.

Лер Гаврильчицы.

62. Калатня.

Была́ ў аднаѓо́ чалавѣ́ка жо̆нка вѐльми языка́тая да така́я зая́длая, што як пачне́ сварытца, дак и хаджа́йство забў́дзе: кі́не рабо́ту да ўсе крычы́ць, зневажа́е, аж запѣ́нитца, бы кру́чаны саба́ка. Неха́й то̆льки хто зачѐпиць, дак ена́ ѓато́ва ни пиць, ни ѣ́сци, а ўсе сварытца. Гаспада́р знаў еѣ́ но́раў и маўча́ў, бы сцена́ або́ йшоў сабѣ́ на рабо́ту. Ба́ба пакрычы́ць-пакрычы́ць у тако̆м ра́зе, паку́ль ей жыво̆т не забали́ць, нарэ́шце й суни́метца. Але́ от таѓды́ беда́, як щѐпитца ена́ сварытца з сусѣ́дками: таѓды́ хаць вадо́ю разлива́й, бы саба́к. Вѣ́дамо, ба́бы, адна́ друѓо̆й не змаўча́ць: пад ни́муць калатню́ на ўсе село́. Збеѓу́тца лю́дзи, смею́тца да кпи́нки стро́яць, а ба́бы да ты́х час сва́ратца да зневажа́юць адна́ друѓу́ю на чо́м свѣ́т стаиць и выдумо́ўваюць, што было́, чаѓо́ й не было́, поку́ль так уто́мятца й так ахры́пнуць, што ѓо́ласу нема́. От раз щапі́ласа та́я ба́ба сварытца з сусѣ́дкаю Сусѣ́дка така́я-ж была́ языка́тая. От як начали́ ены́ з ра́на калаци́тца, дак забы́ли, што трэй у пѐчах пали́ць да абѣ́д вары́ць. Учу́ў ѓаспада́р, што еѓо́ ба́ба заўзела́са сварытца, прыбѣ́ѓ туды́ да й ка́жэ сваей паѓа́нуй жо̆нцэ— ѓэй, ба́бо! Ты ўжэ ўтамі́ласа й ахры́пла. Дава́й я за цебе́ бу́ду сварытца, а ты йдзи абѣ́д вары́ць.—И пача́ў тут той чалавѣ́к калаци́тца з чужо́ю ба́баю.—Да ты така́я, як твая́ сестра́... Да й ма́ци твая́ така́я... Да й ба́цько тво̆й таки́.. Да й цетка твая́ така́я... Да й дзя́цько тво̆й таки́... Уве́сь ро̆д тво̆й таки́... Усѣ́ вы такие.. Паслу́хала жо̆нка, што еѣ́ ѓаспада́р ѓо́жэ сва́рытца, да й пашла́ мо́ўчки вары́ць абѣ́д. Навары́ла ена́, выняла страву з пѐчы, паста́-

віла на стол да й выбеґла на вулицу паслухаць, як ґаспадар зневажае суседку. аж той стаіць да курыць люльку, а суседка палентуе на ўсе село да так вычварае, што аж сорам казаць. Тут жонка накінуласа на свайго гаспадара, чаму не лаетца. От ен скажэ слово „такая твая й матка“ да й плюне. А баба крычыць, аж пукаетца. Ена ахрыпла, ўся пасінела, а ўсе крычыць да кліне́тца. Нарэшце павернуўса ґаспадар к жонцы да й кажэ. „ну, бабо, я ўтаміўса. цепер пайду абедаць да атдыхаць, а ты сабе сварыса на здаровейко! — Усе вы такие!“ — сказаў ен бабам да й пашоў да ґасподы.

Перессказалъ Крукъ.

Хут Млынокъ

---

63. Падарожны.

Ішоў здалека адзін падарожны, ўтаміўса, праґаладаўса й просітца на нач. Абышоў усе село—ніхто не прымае, такие там жылі паґаные людзи. Што тут рабіць? Хаць начуй пад плотам! Стаіць ґэто падарожны серод вулицы да й думае, што тут парадзіць. Тым часам ідзе старац—здаравенны мужык, чырваны, бы рыжок. Падарожны зняў шапку да к ему. Так и так,—кажэ,—ніхто не прымае на нач. Памажы ўпрасіць людзей. Што хочэш дам, тольки паратуй у бедзе.—Добрэ—кажэ старац—тольки ты дай мне за тое саракоўку. Шкода падарожнаму ґрошэй, але нема чаґо рабіць. Дастаў ен калиту, выняў саракоўку й атдаў старцу.—Ну—кажэ старац,—я буду нібыто слепы, а ты будзь маім павадырэм.—Узяўса старац за кий и пашлі ены ў адну хату. Улазяць ены, аж там ґосци. Заспеваў старац сваё жаласлівые песни, а падарожны нібыто памаґае. Зацихли ґосци—слухаюць да ўздыхаюць. Паспеваў трохи старац да й просітца на нач.—Да начуйце-ж божые людзи—кажэ ґаспадар и давай ґаняць бабу, каб ена скарей падала им пачостку. От тольки пасадзілі их за стол, а ґосци пачали расходзітца, пры-

лядáетца ґаспадáр к падарóжнаму да й кáжэ—ґэ, чалавѣ́чэ, ты нас падмáньваеш: ты не ўбóґи, а той падарóжны, што недáўно прасиўса нá нач Бáчыць падарóжны, што папáўса да й прызнáўса ва ўсéм.—Ну—кáжэ ґаспадáр,—нехáй цебé баґи любяць! Начавáць—начўй, а за тóе, што зхацѣ́ў нас абшукáць, аставáйса без вечэ́ры Падзя́куваў падарóжны й за тóе да й прылеґ сабѣ́ на лáве спачывáць. Тым часам ён бáчыць, як частўюць стáрца, бáчыць, куды ґаспадына хавáе тую пачóстку, што асталáса ат ґасцéй. От напéрса стáрац, падзя́куваў за пачóстку, да й леґли ены ўсѣ спачывáць Як леґли, так и захрапли—спяць, бы забитые Тóлько падарóжнаму не спитца. Вѣ́дамо, ґалóдны. Варóчаўса ен, варóчаўса, а потымъ цихенько ўстаў, забрáўса туды, ґдзѣ ґаспадына пахавáла пачóстку да ўсе й улáдуваў, а крóшками сыра абсыпаў да яéчняю вымазаў стáрцу бóраду. Пóсле таґó лéґ сабѣ́ падарóжны спачывáць. От даў Бóґ дзень: узштўрхалиса лю́дзи. Устáла ґаспадына ўздўла лучыну да як зирне́ на стáрцаву бóраду да паґлядзи́ць, што немá ни яéчни, ни сыра, да пачне́ стáрца зневажáць, да пачне́ хрысци́ць еґó кавенёю, дак той аж невѣ́дае, куды дзэ́тца й давáй прасиць у падарóжнаґо ратўнку. От падарóжны й кáжэ—а бáчыш, як дóбрэ брáць ґрóшы з людзéй, кали ены ў прыґóдзе.—Атдáм и ґрóшы, тóльки ратўй ат лихóѣ бáбы. А тáя перéсциць еґó кавенёю. Тут падарóжны ўхапиў за каўнѣ́р стáрца да й вымчаў еґó з хáты. Атдáў стáрац саракóўку да ещэ́ й падзя́нуваў падарóжнаму, што ён укрыў еґó ат лихóѣ бáбы. Дак от у дарóзе ўсе трапля́етца.

Пересказалъ Крукъ.

Хут. Млынокъ.

64. Знáхадка.

Гэ́то былó мóо ўжэ за вáшу пáмец от тут не далéко, калé Слўцька. Мóо вѣ́даеце, там на шляхў стаи́ць карчóмка. Эгэ́! Дак от у ґэ́стóй карчóмцы жыў Мéндаль—ат сабѣ́ жыдóк. Як жэ кáжуць—

як спиць, ѣсци, пиць не пр́осиць. Але́ вѣ́дамо жыд—за ґро́шы павѣ́ситца. Пра́ўду ка́жуць лю́дзи, што кõжын жыд шы́беницы варт. Так той и Ме́ндаль. Але́ ось я раскажу́ вам усе́ папара́дку, як то́е было́. Мо́о чу́ли, быў там ве́льми ва́жны пан. Ён быў маршалкам и ча́сто ѣ́здзиў да Арша́вы. Вѣ́дамо, за даўнѣ́йшые ча́сы чаґу́нки ещэ́ не было́, да й шашэ́й ещэ́ не раби́ли; бо там, ба́чыце, цепе́р идзе́ шашэ́й з Бабру́йська да Арша́вы. Даўнѣ́й усе́ ѣ́здзили шля́хам паўз Ме́ндаляву карчо́мку. От раз ґэ́ты пан марша́лак якось у пя́тницу ѣ́хаў шля́хам да Арша́вы. Ён ве́з з сабо́ю ве́льми ва́жные папѣ́ры й мно́ґо ґро́шэй. От кале́ са́маѣ карчо́мки атвеза́ласа вали́за, й пан зґубиў папѣ́ры й ґро́шы. Праѣ́хаў пан мо́о миль дзвѣ́ й таґды́ то́льки аґле́дзяўса, што нема́ вали́зы. Ён наза́д шука́ць ґро́шэй. Тым ча́сам Ме́ндаль вы́сунуўса на шлях, ўба́чыў вали́зу, прывало́к еѣ́ ў карчо́мку да як разрэ́заў да ўба́чыў мно́ґо ґро́шэй, дак аж затро́сса. Схава́ў ґэ́то е́н ґро́шы, а папѣ́ры й вали́зу завало́к к са́жалцы, накла́ў туды́ камѣ́ня да й затапиў у во́ду.—Ну, Хайка,— ка́жэ жо́нцы,—цепе́р ми ой, ой якие вели́кие паны́. А ты маўчы́, ни ко́му не казы́, каб ни хто́ не знаў, што я канцы́ ў вада́ схава́ў.—Так усю но́ч и на за́ўтрэ ўвесь дзень то́льки й гергета́ли прамі́ж себе́ Ме́ндаль з Ха́йкаю пра па́ньськие ґро́шы. Хо́дзяць, ничо́ґо не ро́бляць, бы шале́ные. Тым ча́сам усю́ды, бы ў бу́бен бъюць, усе́ ґаво́рацъ, што пан зґубиў ве́льми мно́ґо ґро́шэй. Вернуўса пан, шука́ў-шука́ў—прапа́ли ґро́шы, бы ка́мень у во́ду. Але́ ось у ша́баш прыхо́дзиць у карчо́мку з села́ дзѣ́ўка Маръя́на дайць каро́ву. Вѣ́дамо, жыдо́м у сыбо́ту немо́жна ничо́ґо раби́ць. От пашла́ Маръя́на ў хлѣ́ў да й пачала́ дайць каро́ву; тым ча́сам падышла́ туды́ Ха́йка да й ка́жэ—Маръя́на, а Маръя́на! Спасли́вы, цу́ес, той цалавѣ́к, хто знайсо́ў тые ґро́сыки.—А хто-ж, апры́ч ва́шых—ка́жэ Маръя́на. Гэ́тым ена́ хацѣ́ла сказа́ць, што хто-ж друґи́ знайшо́ў ґро́шы, апры́ч жыдо́ў. Ены́ вало́чатца па шляху́, та пе́ўне паднели́ й ґро́шы. Але́ Ха́йка нс зразумѣ́ла рэ́чи Маръя́ны да й ка́жэ—Сты́ги ґэрт! Атку́ль ты зна́еш? Хи́бо табѣ́ Ме́ндаль сказа́ў?—Аўжэ́-ж

сказа́ў—пашуткава́ла Маръяна.—Цу́ес, Маръяна, маўцы́,—дам табѣ сто рубли́.—Да хава́й Бо́жэ, каб я маўча́ла, а по́ґань спажыва́ла тые ґро́шы. Пайду́ да й скажу́ пану́.

Тут Ха́йка пабѣ́ґла к Ме́ндалю, каб сказа́ць, што Маръяна ўсе зна́е. Але́ не знайшла́ Ме́ндаля у карчо́мцы, бо е́н не выцерпеў и пашо́ў к сусѣ́ду, каб наґавары́тца пра ґро́шыки. Тым ча́сам Маръяна падайла каро́ву да беґо́м у двор к па́ну. Так и так—усе́ й вылажыла. Пан барздже́й ки́нуўса ў карчо́мку и велѣ́ў звеза́ць Ме́ндаля. Звеза́ли Ме́ндаля й прывели́ к па́ну.—Ах вы галга́ны—як закрычыць пан на слуґ,—за цо вы звяза́ли е́го? То-ж мо́й па́ктар, пожо́ндны жы́дэк. Развье́нзаць его!—Развяза́ли Ме́ндаля, а пан пасадзиў еґо́ ра́зам з сабо́ю за сто́л да й пыта́е, ґдзѣ е́н схава́ў ґро́шы.—У або́зни пано́цку—ка́жэ Ме́ндаль.—А папѣ́ры?—пыта́е пан.—Затапиў у са́жалка, пано́цку!—По́каж, гдзе! Павъе́ў Ме́ндаль, паказа́ў, ґдзѣ схо́ваны й ґро́шы, й папѣ́ры. Палѣ́з сам пан у во́ду па са́мы по́яс и даста́ў папѣ́ры. От забра́ў пан ґро́шы й папѣ́ры да й сказа́ў слу́ґам, каб ены́ зноў звеза́ли Ме́ндаля да й завезли́ да Слу́цька ў вастро́ґ, а Маръяне велѣ́ў даць па́ру вало́ў, каня́, дзвѣ каро́вы й сто рубле́ў.

Пересказалъ Кравецъ.

Дер. Мазали.

65. Смѣлы.

Собрали́са раз мужчыны й пачали́ спрача́тца, хто з их смелѣ́йшы. До́ўґо ены́ спрача́лиса й разска́звали, якие з и́ми были́ стра́хи й што ены́ не пало́хались. Седзѣ́ў тут адзи́н чалавѣ́к; е́н мо́ўчки куры́ў лю́льку да слу́хаў, як выхваля́ютса смельчаки́. Чаґо́ то́льки ены́ не разска́звали. Адзи́н ка́жэ, што еґо́ як апанава́ли чэ́рди ў лѣ́се, дак е́н атбива́ўса ат их усю но́ч, аж да свѣ́ту. Други́ разска́звае, што еґо́ раз апанава́ла ў Пили́паўку во́ўчая ґанья́ й што

ґэто мáбыць былú ваўкалакú. Та ось якúсь смельчáк разскáзвае, як за им ґаняўса небо̆щык на мо́ґлицах. Слу́хаў, слу́хаў той чалавѣ́к, маўчáў, маўчáў да й кáжэ—ґо́дзи вам хлусúць, ґо́дзи выхвалятца, бо ўсѣ́ вы еднакóво баязлúвые й не то, каб што, алé от нихтó з вас не асмѣ́литца пайцú цепéр на мо́ґлицы й убúць ко̆л у маґúлу ведзьмарá. Пачалú тут хлусы́ выхвалятца адзúн пéрад друґúм и ґаварыць, што небаятца ведзьмарá й смѣ́ло забъюць у еґó маґúлу ко̆л, алé як прышлóсо ґэтае зрабúць, та ўсѣ́ пачалú ўвúльваць, то̆льки адзúн сáмы смѣ́лы вы́зваўса таґды́-ж пайцú на мо́ґлицы по́ўначы да й забúць ко̆л. От и пашлú тут дзецюкú ў заклáд на ґáрнец ґарéлки. Дзѣ́ло былó аб óсени. Но́чы цéмные, хаць вóко вы́каль—ничо́ґо не бачнó. Узяў той смѣ́лы чалавѣ́к ко̆л да й пашо́ў адзúн на мо́ґлицы. Мо́ґлицы былú не далéко ат селá на ўзґо́рачку калé ракú. Пашо̆ў éн, а мужчы́ны ўзелú зу́бленку да цúхенько за им слѣ́дам да назиркам. Идзé сабѣ́ той смельчáк, калóм размáхвае да, каб былó смелѣ́й, бурчыць пад но̆с пѣ́сню. Падышóў к мо́ґлицам, пастаяў трóхи, паслу́хаў, а по́тым пералѣ́з цéраз пло̆т да й пашóў шукáць маґúлы ведзьмарá. Енá былá калé сáмаґо таґó ду́ба, што на éм завѣ́сиўса адзúн чалавѣ́к. Падышóў смѣ́лы дзецю́к к сáмуй маґúле, прысѣ́ў на ко̆ртачки, абмáцаў капéц и давáй убивáць у зéмлю ко̆л От забиў éн мо̆цно ко̆л и хацѣ́ў устáць да йци к дзецюко̆м, алé не мажэ паднятца. От éн ту́затца туды́-сюды́—немá рáды: ведзьмар трымáе бы зубáми. Спалóхаўса наш смельчáк и давáй крычáць нѣ́мым ґо́ласам, бáтцэ еґó хто рéжэ. Пачу́ли тóе дзецюкú, засвецúли зу́бленку да туды́. Бáчаць ены́, аж смельчáк прыбиў калóм к землú палу свао̆ свиты да й качáетца калé капцá. Убáчыў éн дзецюхо̆ў да й не вѣ́рыць, што ґэто лю́дзи, так éн спалóхаўса. Насúлу дзецюкú ўґаварыли еґó да прывелú да ґаспóды. Алé éн так спалóхаўса, што чуць не памъéр. Дак от якие мы смѣ́лые. Мо́о й усѣ́ ґэ? Што вы скáжэце?

Пересказалъ Кравецъ.

Дер. Мазали

66. Адукóваны бычок.

Жыли сабѣ́ дзѣд да бáба й не былó ў их дзецéй. Чаѓó ни рабйла бáба, к якѝм знáхарõм и знахõркам енá не хадзйла, якѝх зельеў не пилá — ничóѓо не памаѓáе: немá дзецéй да й тõльки Абхадзйла енá ўсѣ́ прóщы. Нарэ́шце парáила аднá маладзйца, каб енá пашлá на рáду к папу́.—Бáчыш, папóдзи плõдныя, бы свѝне— кáжэ тáя маладзйца,—схадзѝ к нáшаму папу́, занеся́ ему́ ѓасцйнца да папрасѝ еѓó ѓóжэнько, мóо й ублаѓáеш. Ён ужэ́ мнõѓим памõѓ. Цепéр дзя́куюць. — Адзѣ́ласа ѓэ́то тáя бáба, бы ў свя́то. набрáла ѓасцйнцаў да й пашлá к папу́. Атдалá енá папу́ ѓасцйнцы да й прызнáласа ва ўсéм, бы на спóведзи. От пõп трóхи паблаѓатаў и давáй лечыць бáбу. Лечы́ў ён, лечы́ў, аж еѣ́ саѓрэ́ў да й сам спацѣ́ў.—Ну—кáжэ,—прыхадзѝ, бáбо, паштó дзень цѣ́лы ты́дзень. Хóдзиць бáба к папу́ кõжын дзень. А пõп еѣ́ ўсе лѣ́чыць. Быў у папá шалапаваты пáрабак. Бѣ́дамо, папы́ лю́бяць дзержáць шалапавáтых парабкõў, бо ены́ не берýць ѓрóшэй, а слу́жаць дармó. От и падѓлéдзяў той шалапавáты пáрабак, як пõп лѣ́чыць бáбу да й кáжэ—бáцюшко, ѓэ й я ўмѣ́ю лечы́ць, як бáцюшко. От лѣ́тась як палечы́ў нáшу целѝцу. дак бáчыш, якóѓо енá прывелá ѓóжаѓо бычкá. Паплевáў тут пõп, палáяў шалапавáтаѓо пáрабка, ўзяў таѓó бычкá, завъёз у лѣ́с да й кѝнуў, каб ён там заѓѝнуў Алé ось пáсцили ў лѣ́се пастухѝ ѓаўя́до, спаткáли таѓó бычкá да й прыѓнáли ў селó. Прыбиўса ён к ѓаўя́ду таѓó дзѣ́да з бáбаю да й прыцéгса на двõр. От седзя́ць дзѣд з бáбаю на пры́збе да свáю бедý развáжáюць. Тым чáсам падхóдзиць к им убõѓи. Пачáў ён малѝтца да выспѣ́ўваць свáѣ пѣ́сни. От абдары́ла бáба таѓó ўбõѓато й давáй заѓаня́ць ѓаўя́до. Зирнé енá, аж якѝсь бычóк, як убáчыў еѣ́, дак падбõѓ, лáщытца, трэ́тца калé хвартухá, от бы дзицá. А ѓэ́то той сáмы бычóк, што пõп завъéў у лѣ́с Бáчыце, шалапавáты пáрабак лáщыў таѓó бычкá да й прывучы́ў еѓó к рукáм. Хóдзиць бычóк за бáбаю хвастóм, бы дзиця́. Убáчыў тóе ўбõѓи да й кáжэ.—От разу́мнае

целя́, бы дзіцця́: з его́ бу́дуць лю́дзи. Падзя́куваў ўбо́ги да й пашо́ў да́лей. А дзѣд з ба́баю ўсе ду́маюць, што-б гэто сказаа́ў убо́ги. Ма́быць гэто Бо́г даў нам не целя́, а дзіця́; то́льки лихие лю́дзи абярну́ли его́ ў целя́. От дава́й ены́ гадава́ць таго́ бычка́, бы свае́ дзіця́. Расце́ бычо́к, бы на дро́жджах, а дзѣд з ба́баю са́ми не даеду́ць, а ўсе его́ ко́рмяць. Ху́тко вы́рас таки́ го́жы бык, што хаць у со́ху запрага́й. Не нара́дуютца дзѣд з ба́баю; ня́ньчатца з быко́м, бы з дзі́цем. Усе ду́маюць ены́, што гэто заклято́, што им даў Бо́г сы́на, а лихие ведзьмаки́ так прырабили, што дзіця́ ста́ло бычко́м. От и пачали́ дзѣд з ба́баю жу́пиць да ра́дзитца, гдзѣ-б им найцци́ тако́го чалавѣ́ка, тако́го мо́цнаго знахара́, каб е́н атрабиў и абярну́ў бычка́ ў чалавѣ́ка. Жу́пили ены́, жу́пили прами́ж сабо́ю да й на-ра́дзилиса атда́ць свайго́ бычка́ ў адука́цу, каб з его́ были́ лю́дзи. От сабра́ўса дзѣд у даро́гу, залыга́ў бычка́ да й павъе́ў у свѣт, шука́ць тако́го мо́цнаго везьмара́, каб е́н выадукаваў и перарабиў таго́ бычка́. Иду́ць ены́ да йдуць, але́ ось сустрака́е их яки́сь ча-лавѣ́к и пыта́е, куды́ дзѣд ведзе свайго́ бычка́.

— У адука́цу, мо́й саколику. Гэто, ба́чыш, не бычо́к, а мо́й сын, да то́льки закляли́ его́ лихие лю́дзи, каб им хваре́ць да стагна́ць да й на то́м свѣ́це дабра́ не маць. Закляли́, от я й шука́ю тако́го чалавѣ́ка, каб е́н атрабиў да выадукаваў майго сы́на.

— Гэ, дзѣ́ду!—ка́жэ той—я з гэ́стаго то́льки й жыву́. Дава́й мнѣ свайго́ бычка́,—з его́ бу́дуць лю́дзи. Я ўсе атраблю́ да так выадукую, што ты то́льки падзи́вишса.

— Ой, мо́й ле́бедзику, да як ещэ́ бу́ду дзя́куваць. Беры́ да й раби́, што тре́.

От и пашли́ ены́ ра́зам. Пры́шли́ да га́спо́ды таго́ ведзьмара́, а тут и но́ч нахапи́ласа. Аста́ўса дзѣд начава́ць. Усю но́ч ведзьма́р пазира́ў на зо́ры—ўсе гада́ў да разга́дваў, як гэто заклято́ бычка́. Па ра́нку павъе́ў ведзьма́р дзѣ́да й бычка́ ў лѣс, напаи́ць вадо́ю з свенцо́наѣ крыни́цы. От спуска́ютца ены́ с узго́рачка ў дали́ну, аж пад таўщэ́разным ду́бам крыни́ца. Ена́ не вели́чкая, бы рэ́шато,

але́ з еѣ так и бъе вада́ чы́стая бы слеза́ да халŏдная бы лед Перш ведзьма́р што́сь шапта́ў, заґава́рваў ту́ю во́ду, по́тым напиу́са сам и напайу́ дзѣда. От падво́дзиць е́н к крыни́цы бычка́, а той упира́етца, не хо́чэ. Вѣ́дамо, ґаўя́до не лю́биць крыни́чнаѣ вады́, бо ена́ ве́льми халŏдная. Але́ як ни круциу́са бычо́к, ведзьма́р таки́ таўкануу́ его́ мо́рдаю у́ во́ду. Абма́чыў бык пыски да тŏльки зачмы́хаў. От павели́ ены́ бычка́ наза́д да ґаспо́ды. Дзѣд ведзе́ за павадо́к, а ведзьма́р идзе́ о́бак. Иду́ць ены́ да йдуць, але́ штось бычо́к упира́етца. Тузану́ў дзѣд за павадо́к, пацо́каў—бычо́к упира́етца. Азирне́тца ен, аж ззаду на павадку́ таки́ ґо́жы, высо́ки хлапчу́к за́мест бычка́. Падзивиу́са дзѣд, а ведзьма́р и ка́жэ—ґэтож я атрабиу́. От зирни́, яки́ твŏй сын. Тŏльки цепе́р трѐ его́ адукава́ць. Заґаманиу́ было́ дзѣд к хлапчуку́, але́ той маўчы́ць, бы пень.— Нѣ, дзѣ́ду,— ка́жэ ведзьма́р,— пе́рш трѐ адукава́ць. От прышли́ ены́ к ведзьмару́ да гаспо́ды. Дзя́куе дзѣд, дае́ ведзьмару́ ґро́шы да абеца́е бŏльш прынесци́ да й вертáетца да ґаспо́ды. Прышоу́ дзѣд да ґаспо́ды да й разска́звае сваéй ба́бе, якóе з им было́ дзи́во. Ра́да ба́ба, аж падско́квае.—А што, ци я не каза́ла—крычы́ць ена́ на у́се село́,—ци я не каза́ла, што ґэто хлŏпец, а не бычо́к. Цн я не каза́ла, што ґэто ба́цюшко зрабиу́, ба́цюшко вы́прасиу́ у Бо́ґа нам пацѣ́ху на ста́расци.

Бѣ́ґае ба́ба па селу́ да крычы́ць, лямантýе, па дзе́сяць раз разска́звае лю́дзям, як пŏп еѣ лечы́ў, як малиу́са й як Бŏґ пасла́ў е́й бычка́ да што то не бычо́к, а хлапчу́к. Дзи́вятца лю́дзи да й ка́жуць—на у́се бŏская мŏц. Насилу дзѣд трŏхи у́няў ба́бу, сабра́ў ґро́шэй, нала́дуваў це́лы вŏз уселя́каґо дабра́ да й павъе́з таму́ ведзьмару́, каб ен до́брэ даґляда́ў да шчы́лно адукава́ў хлапчука́. Ба́чыць, аж хлапчу́к ужэ́ стаў дзецюко́м, да таки́м ґо́жым, разу́мным да у́да́лым, што й не у́вазна́ць. От ѣ́здзиў, ѣ́здзиў адзи́н дзѣд, але́ нарэ́шце пачала́ праґци́са ба́ба, каб е́н и еѣ у́зяў з сабо́ю паґлядзѣ́ць дзецюка́. От сабра́ўса дзѣд да й паѣ́хаў з ба́баю. Прыезджа́юць ены́ к та́му ведзьмару́ й пыта́юць, ґдзѣ их дзецю́к. А

ведзьма́р да й ка́жэ - ѓэ, мае̂ сако́лики, ваш дзецю́к цепе́р таки́ вели́ки пан. што ў его́ й кру́кам но́са не даста́ць.

— Гдзе̂-ж е́н?—пыта́юць стары́е.—А онь у дваре́—камыса́рам. Мене́ й знаць нехо́чэ—ка́жэ ведзьма́р.

От и нае̂хали дзе̂д з ба́баю ў двор шука́ць таѓо́ камыса́ра. Дапыта́лиса ены́ й ле̂зуць про́сто ў ста́нцаю Ба́ба, дак та́я плі-щыць цэ́лы прыпо́л куско́ў хле̂ба, каб пакармі́ць сваі́ѓо бычка́, як ена́ карміла еѓо́ ко́лись. Камыса́р седзе̂ў за стало́м и пераѓарта́ў якиесь папе̂ры: але́ ўба́чыў дзе̂да з ба́баю да як закрычы́ць на их, што им тре́. чаѓо́ ены́ сюды́ ле̂зуць.

— Бач, яки́ сердзі́ты—ка́жэ ба́ба к дзе̂ду.—Але́ рыхтых бы-чо́к,—на́ват лысинка астала́са. То́льки той цене̂й рыка́ў.

От трасе́ ба́ба прыпо́лам, падхо́дзиць ближе́й к сталу́ да й заве́ - бучо́к, бучо́к, бучо́к!

Пазира́е камыса́р и не мажэ́ разшало́паць, што гэ́стые людзи ѓаво́раць и чаѓо́ ены́ прышлі́.

— Бучо́к, бучо́к, бучок' на-ш бо табе̂ лу́сту хле̂ба...

— Вон!—крычы́ць камыса́р да лу́пиць кулака́ми па сталу́.

— Бэч, бэч!—ка́жэ дзе̂д. И замахну́ўса цу́ѓаю да й сперазаў камыса́ра па лысине.—Гэй, во́ўчае мя́со! Хиба́-ж ты нас не пазна́ў'— Да й дава́й лупи́ць, дава́й пере́сциць камыса́ра. Наси́лу той уце́к. Збе̂ѓласа тут уся́ дво́рня. Павелі́ дзе̂да з ба́баю к па́ну Той пыта́ў, пыта́ў и ничо́ѓо не дапыта́ўса, а паду́маў, што ѓэ́то кру́чаные лю́дзи да й веле̂ў запе́рци их у свиран. Дак от яки адуко́ваны бычо́к.

Пересказалъ Каваль.

Дер. Чудинъ.

---

67. Петро̀ Вели̂ки.

У вадно́м ца́рстве памер цар. У еѓо́ не было́ дзеце́й—не̂каму было́ ца́рствуваць над людзьмі́. И зрабиўса там велики мецеж. Пашла́ така́я развару́ха, што нико́му жы́ця нема́. Ве̂дамо, паны́

хо́чуць свайго́ пасадзи́ць на ца́рство. Князи́ свайго́. Нема́ зго́ды. Набира́юць людзе́й, ваю́юць адны́ з другими. Им ни га́дки, а лю́дзи забива́юць адны́ други́х, ни́щаць край да марну́юць дабро́. А наро́д, вѣ́дамо, дурны́, бы гаўя́до: куды́ его́ го́няць, туды́ йдзе, што ка́жуць, то́е ра́биць. Наш брат це́мны, паднево́лны, гатоў за тых, або других пано́ў и на ро́днаго ба́цька паднятца. От кру́цяць паны́ да ваю́юць прамиж сабо́ю—сваими людзьми́ да на свайх людзе́й иду́ць, забива́юць, па́ляць ве́ски да двары́, а ўсе не мо́гуць вы́браць сабѣ́ цара́. По́сле цара́ астала́са цары́ца. Але́, вѣ́дамо, ба́ба — нихто́ еѣ́ не слу́хае. От и ўцекла́ ена́ з ца́рских пала́цаў да й схава́ласа на селѣ́ ў аднаго́ до́браго чалавѣ́ка. Шука́юць паны́ цары́цу, каб еѣ́ заби́ць. Не так еѣ́ бая́лиса паны́, як таго́, каб ена́ не парадзи́ла сына. Ена́, ба́чыце, была́ то́ўстая й хадзи́ла на пары́. Шука́юць, кало́цяць паны́ па ўсих се́лах. Прыхо́дзяць ены́ й у то́е село́, гдзѣ жыла́ цары́ца. Ба́чыць той до́бры чалавѣ́к, што паны́ ўжэ бли́зко, павъе́ў е́н цары́цу ў гумно́ да й захава́ў еѣ́ у сало́му. Але́ от прышо́ў час и ў цары́цы радзиўса сын, Петро́ Вели́ки. Седзи́ць цары́ца з сынам у сало́ме, аж вараги́ прыхо́дзяць и ў гэстае гумно́. Зирну́ли ены́ туды́-сюды́ да ўжэ хацѣ́ли й да́лей ици, але́ адзи́н узяў ви́лы да й парну́ў у сало́му. Чу́юць ены́ аж Петро́ Вели́ки крычыць з сало́мы таки́м гро́мким го́ласам, што ены́ аж прысѣ́ли ат стра́ху.—Хто там по́рэ, што чуць ачо́ў не павыма́ў! Атсѣ́кци ему́ го́лаў! Спало́халиса тые мецѣ́жники, пабелѣ́ли бы палатно́, стая́ць да кало́цятца бы аси́на. Але́ ось выла́зиць з сало́мы сам Петро́ Вели́ки —хло́пец у ко́сы са́жэнь вышыне́ю. Уба́чыли его́ мецѣ́жники, паклани́лиса да земли́ да й дава́й праси́ць, дава́й мали́ць, каб е́н не гнѣ́ваўса й аста́виў их жывы́ми. Клину́тца, што бу́дуць служы́ць ему́ да са́маѣ сме́рци. Сжа́лиўса Петро́ Вели́ки, прасциў им, забра́ў ма́тку-цары́цу да й паѣ́хаў у стали́цу ца́рствуваць. Усю́ды сустрака́юць его́ лю́дзи з абраза́ми да з хлѣ́бам, а мецѣ́жники ўцека́юць, куды́ но́ги несу́ць. И пача́ў с таѣ́ пары́ Петро́ Вели́ки ца́рствуваць да варагоў пабива́ць. И пакары́лиса ему́ ўсѣ́ князи́ да карали́:

тӧльки с адны́м китае́ӯцам Петро́ Вели́ки не ваева́ӯ. Ен знаӯ, што як падни́метца китаевец, та бу́дзе кане́ц свѣ́ту.

Пересказалъ Грышко.

Дер Чудинъ

68. Дваранин.

Быӯ сабѣ́ адзи́н дварани́н, на прӧзвиско Петрӧӯськи. Ен не маӯ ни двара́, ни падда́ных, а так сабѣ́ валачы́ӯса ат аднаго́ па́на к другóму. Гдзѣ прыста́не к панӧм на палева́не, гдзѣ тро́хи паслу́жыць намѣ́сникам, або акамо́нам. От так и жывиӯса це́лы вѣ́к. Бо,—як жэ ка́жуць—ен ат хаджа́йства атбиӯса, ат земли́ атарва́ӯса, але́ й не́ба не даста́ӯ да так и пелепа́етца пами́ж не́бам и земле́ю, бы бараноӯвы яйца. Але́, вѣ́дамо, дварани́н,—е́н усе таки́ спагане́е па́нство. Дармо́, што ӯ его́ ча́сам у гаршку́ тра́сца кипи́ць, за то на назѣ́ чабӧт рыпи́ць. А на на́шаго бра́та мужыка́ йнак не пазира́е, бы як на гаӯя́до. Ба́ло на палева́ни ци што, крычы́ць—мужы́к, гад! У цебе́ ӯ ро́це чо́рно. Дак от яки́ то дварани́н быӯ, бо не маӯ сваѣ́ ха́ты, а бы саба́ка, на дваре́ жыӯ да на людзе́й браха́ӯ, ба́тцэ-б свае́ дабро́ абера́га́ӯ. Але́ як е́н ни круциӯса, да таки́ да ли́ха дажы́ӯса, як ты́е паля́ки, што ни хлѣ́ба, ни таба́ки. А вѣ́дамо як трыво́га, та й да Бо́га. От пан Петрӧӯськи пашо́ӯ да касце́ла, ӯкле́нчыӯ да й мо́литца: „па́не Езу Хры́ста, дай мнѣ́ ру́бли тры́ста, але́ й без една́го не вэ́зма". Хо́дзиць е́н кӧжын дзень да касце́ла да ӯсе мо́литца, ӯсе про́сиць ру́бли тры́ста, ни на шэ́ляг не збаӯля́е. Падслу́хаӯ то́е ксе́ндз и велѣ́ӯ арганистаму зраби́ць прӧбу, што з таго́ бу́дзе, даць Петрӧӯськаму без аднаго́ тры́ста рублеӯ. От як Петрӧӯськи ӯкленчыӯшы малиӯса—па́не Езу Хры́ста, дай мнѣ́ ру́бли тры́ста. Без една́го не вэ́зма,—арганисты залѣ́з на хо́ры да й спусциӯ аттӯль на ни́тачцэ дзвѣ́ста дзевятдзися́т дзе́вяць рубле́ӯ у Петрӧӯсь-

каґо пе́рад са́мым но́сам Петро̆ўськи пераличы́ў грошы, палажы́ў их у кишэ́ню да й ка́жэ— ке́ды пан Езус Хры́ста даў рўбли тры́ста без еднэ́го, то дась и ўшы́стко. Дзенько́вяць за бо́скую ла́ску. Пры ґэ́тых славах Петро̆ўськи падня́ўса на ноґи й хацӗў ици́, але́ чўе, хтось ка́жэ—хаць жэ пан Петро̆ўськи шля́хциц, але́ кеп!— Гэто сказа́ў ксе́ндз, бо ему́ шко́да ста́ло ґро́шэй. А Петро̆ўськи паду́маў, што ґэ́то ка́жэ Езус. Закипӗў Петро̆ўськи, аж затро̆сса ат зло́сци да й крычы́ць на ўвесь касцел—цо, цо? Я кеп. З ла́ски бо́ской е́стэм пан Петро̆ўськи, радави́ты шля́хциц да пато́пу да прзы́тым и двожа́нин гэро́льдэм утвердзо́ны, а ты з жы́дковъ.— И пашо́ў з касце́ла. Дак от які́ бы́ў ґанаро́вы дварани́н пан Петро̆ўськи.

Пересказалъ Раман Стайковы.

С. Комаровичи

---

69. Паморак.

Яко́ӗ то̆льки пля́ґи нема́ на людзе́й! От так беда́ на бедзӗ ӗдзе да ещэ́ бедо́ю паґаня́е. Пастайш — беда́ наґо́ниць; пабежы́ш — на беду́ налеци́ш. И жыве́ш усе́ жы́це, бы звӗр у лихо̆м о́ступе: куды́ ни су́нса,—бедзӗ ў зу́бы. Там зирне́ш—беда́ ат Бо́ґа: та нахапи́ўса маро̆з и памаро́зиў сады́, аґаро́ды, а то й хлӗб на по́ли да траву́ на сенажа́ци; та ґрад атбиў усе́, што вы́хавалась ат маро́зу, або си́веру; та нахо́питца скло́ка да й пакру́циць, пало́миць усе́ збо̆жэ; та по̆йдзе абло̆жны дож и да тых час лье, паку́ль усе́ заґи́не й на по́ли й на сенажа́ци; та прыпечэ́ со́нейко, й земля́ ґара́чая бы прысак, хаць ты ў е́й яйца печы́. А то дась Бо̆г харо́шае лӗцечко, дак тут атку́ль во́зьмутца ўселя́кие по́шасци да пам̆орак на ґаўя́до, або й на людзе́й. Але́ ка́жуць, што ґэ́то не ат Бо́ґа, што ґэ́то насыла́юць лихие лю́дзи. От я вамъ разскажу́, як то́е было́ ў адно̆м мӗйсцы. Была́ ра́нняя, але́ ве́льми ґо́жая весна́. Ко̆жную но́чку

йдзе ціхи, цёплы дóжджык, а ў дзень свѣціць яснае сóнейко да ґрéе зéмлю, бáтцэ мáтка хýкае да пѣстуе свае дзіцятко. А павѣтрае такóе лаґóднае, што от здаéтца, пасадзі на полі дзіця, та енó й вырасце, бы ґарбýз на аґарóдзе. Бáчаць людзи, што ўсе расцé от бы на дрóжджах Настáло лѣто: Бóґ крыў ат ґрáду, й так зарадзіло, што й дзевáць нѣкуды. Алé не рáды людзи зраджáю, бо вѣдамо, наш брат так прывык к уселякóў бедзѣ, што еґó й дóбрае палохае. От и пашлá прачýтка, што хаць Бóґ даў вялікі зраджáй, алé бýдзе памбрак, и нѣкаму бýдзе спажываць. Спалóхалиса людзи ўраджáю ґарéй сáмаѣ беды. Хóдзяць ены засмуцóные, бы ў вóду апýщаны. Тóльки ось па вóсени й пачáў памбрак касіць перш ґаўядо, а пóтым и людзéй. Былó там аднó селó, куды ешэ не дабрáўса памбрак. Жывýць там людзи пад стрáхам и кóжную часіну чакáюць беды, бы вол дóўбни А каб хварóба не забрáласа ў их селó, пачали бераґциса. А кáжуць жэ, што беражóнаґо й Бóґ беражэ. Так и тые людзи. Пашлі ены перш усім селóм у лѣс, звалілі там сáмую высóкую да вынéслую хвóю, зрабілі з еѣ крыж, мóо сажóн дзéсяць, на сабѣ вынесли з лѣсу, саматýґам прывезлі ў селó, пастáвили на ўзґóрачку, каб атусюль видáць былó. Тым чáсам дзецюкі палажылі калé крыжа брусóк ясеню, а друґім наперемѣнку пачали еґó цéрци; цéрли ены, цéрли да туль, пакýль прылажылі ґýбку, дак тáя й заґарéласа. От узелі людзи таґó аґню ва ўсѣ хаты да й никóчи не переводзили еґó. А на тóм мѣйсцы, ґдзѣ дастáли аґонь и па канцóх ýлицы пачали дзень и нóч паліць кастры, каб памбрак не мóґ вайці ў селó. Гаўядо-ж ены заґнáли далéко ат селá ў цéмные лесы, на астраўкі за балóто, парабілі там кашáры й пасцили статак да сáмаѣ зимы. Рáно й вéчар кóжнаґо дня абкýрвали ґаўядо тхарынаю: палóжаць на ўґóлье кускі сýшанаѣ тхарыны да й падкýрваюць ґаўядо. Круґóм расхóдзитца такі смурóд, што аж нóс зрывáе Тут ни якая хварóба, ни якая пóшасць не вытрымае. От ужэ даў Бóґ и вóсень; скóро й зáмаразки. Круґóм памбрак лóскам кладзé ґаўядо, кóсиць людзéй, бы

касóю, а ў тóе селó не мажэ ўплíшчытца. От ен пусциўса на хитрасьʼ: скúнуўса старóю бáбаю да й цяѓнетца ѓлухóю сцéжкаю к селў. Цяѓнетца енá; аж наѓаняе тўю хварóбу адзúн чалавѣк.

— Куды́, бáбо, йдзеш?—пытáе ен тўю стрáшную бáбу.

— Иду́, ѓóлубе. ў тóе селó, ѓдзѣ немáшака памбрку.

Даѓадáўса тут чалавѣк, што ѓэто й е той сáмы памбрак, спалóхаўса, чуць жыў, але сащапиў зýбы, прамаўчáў да й кáжэ—хадзѣм рáзам. От идýць ены́ да йдуць, прышлú к ѓрáзкаму балóту. Цéраз балóто трэ йци па бéрвам и кладкам.

— Идзú ты, бáбо, ўпéрадь да дзержы́са за мóй кий—кажэ чалавѣк.

Сýнетца бáба, абирáетца на бéрвам да мóцно трымáетца за кий. От тóльки ўзышлú ены́ на клáдки ў сáмуй прóрве. а чалавѣк як хиснé бáбу, дак тáя й шўснула ў ѓрязь. А мѣйсцо тóе былó паѓáнае, такóе ѓрáзкае да ѓлыбóкае, што й дна не дастáць. Утапиўса памбрак у ѓрязú, што й щýрачки не пашлú. Кúнуўса той чалавѣк беѓóм да ѓаспóды да й разскáзвае. як было, як памбрак хацѣў прыйцú ў селó Пачýли тóе люодзи да й давáй пилно пилнавáць, каб непусцúць памбрку. Алé от паѣхаў з таѓó селá адзúн чалавѣк на ѓрудок па сѣно Развершы́ў éн стажóк и давáй клáсци на вôз сѣно. Тóлько вы́таптаў драбúнки, аж ось вы́сунуўса з хмы́знику якúсь стрáшны дзѣд з дóўѓаю, касмáтаю барадóю, с адны́м вóкам да й падхóдзиць к вóзу, апирáючыса на киéчак. Зирну́ў той чалавѣк да й спалóхаўса: ещэ никóли éн не бáчыў такóѓо страшнаѓо дзѣда й падýмаў, што хúбо ѓэто памбрак. Тым чáсам палýпаў дзѣд адны́м вóкам да й прóсиць падвезцú еѓó да селá. Падýмаў той чалавѣк да й кáжэ—давезцú та я давезý, тóльки мóо нáшы люодзи не пýсцяць цебé ў селó, бо. бáчыш, ены вартуюць. каб у селó с ким кóльвек не праплíшчыўса й памбрак.

— Э, мóй лéбедзину,—кáжэ, дзѣд,—я ўбóѓи: я несý люодзям щáсце, якóѓо ены́ не мáюць, пóкуль жывýць.

— Якóе-ж ты несéш щáсце?

— Такóе щáсце, такóе щáсце, якóе бýдуць мѣ́ць и сáмые багáтые, й сáмые здарóвые, й самые слáўные людзи, якóе ўжывýць и паны́, й каралí, й—апóшни ўбóги.

Як прамóвиў ён астатнее слово, дак чалавѣ́к и дагадáўса, што дзѣд несé смерць. Бо, вѣ́дамо,—енá ўсих берэ́, енá ўсим дае рóўнае щáсце: й каралéм, и мужыкóм. Дагадáўса чалавѣ́к да й кажэ: ну, дзѣ́ду, лѣзь на вóз, а я прыкидаю цебé сѣ́нам, та хибá таким спóсабам увезý ў селó.

Узабрáўса дзѣд на вóз, а чалавѣ́к закры́ў егó сѣ́нам, прыцис рублéм да й павёз у сваé селó. Падвóзиць ён к вы́гану, гдзѣ стаяла вáрта й гарэ́ў стóс дроў, да й шапнýў дзецюкóм, што везé памóрак. От ты́е й пытáюць—мужы́к, што ты везéш?

— Дрóва.

— Якие дрóва. Гэ́то-ж сѣ́но.

— На што-ж пытáеш, калí знáеш.

— А ў сѣ́ни што?

— Што? Мóо шы́шки да шыпýльки.

— Гэ, ты ещэ ўздýмаў над нáми кпиць!.. Хлóпцы, берéцеса за вóз,—нéхáй идзé на хвáлу бóскую.

Тут падхапили хлóпцы пад трайню да пад падгэрац, дак сѣ́но й шýснуло на касцéр. От як вы́бухне агóнь, дак рóўно з лѣ́сам. А тут хлóпцы ещэ́ прýцьем пашавéльваюць сухóе сѣ́но да падкидваюць на агонь дроў. Круциўса, круциўса памóрак да чуць не задóхса. Спалили людзи той памóрак, спалили так, што й кóстачак не асталóсо. Алé, вѣ́дамо, нéчысь и ў вагнí не гары́ць: перш згарéла, а пóтым ажылá. От с таѣ́ пары́ гóдзи ат таго памóрку людзи памирáць и дóхнуць гаўя́до. Мáбыць такí дóбрэ спалóхаўса памóрак, як далí ему такýю лáзню, спалóхаўса да й уцёк за сíнее мóрэ, за высóкие гóры ў далéки край да там и астáўса. Чáсам ён навѣ́дваетца туды́, парéжэ трóхи гаўя́да, пакóсиць людзéй да й уцекáе назад, каб егó зноў не злавили да не падсмалили.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

70. Жáласливая пáни.

Гэто было́ ещэ́ за пáньщыну Вы у́жэ не памятáеце, бо пе́у́не таѓды́ ещэ́ не раздзі́лиса на свѣт. Да й які́ то быу́ свѣт. Хибá то свѣт, што дзися́так або́ другі́ пано́у́ да баѓáтых людзе́й панавáло, а наш брат, ѓарапáшник так му́чыу́са, што не рад быу́ и жыцю. И на што то́льки Бо́ѓ так дау́ на свѣ́це, што той, хто жыве́ прáу́даю да ѓару́е—му́чытца, а хто ли́хам да круцѣ́льствам—пану́е. Але́ мáбыць таѓды́ Бо́ѓ атступиу́са ат людзе́й и атдáу́ их у ру́ки чарто́у́ да пано́у́. И чаѓо́ то́лько паны́ не вычварáли, як ены́ не му́чыли людзе́й, як не здзѣкувалиса над ими. Але́ мо́о вы ду́маеце што паны́ были́ лихие, што ены́ немáли жáласци у́ се́рдцу й затым так вычварáли? Нѣ, маѣ́ братки́,—паны́ были́ такие-ж лю́дзи, як и мы з вáми, были́ жáласливые мо́о бо́льш нас и такие добрые да лаѓо́дные, бы ане́лы, але́ ѓэто то́льки к свайму́ брáту, к во́лнаму, а не к мужыку́. Бáчыце, чорт, а мо́о бацьки закры́ли им во́чы, зацемни́ли ро́зум и ены́ не вѣ́дали да й не хацѣ́ли вѣ́даць, што й мужы́к таки-ж чалавѣ́к, як и ены́. Але што ѓавары́ць—таѓды́, кали́ ещэ́ й цепе́р паны́ мужыко́у́ не ли́чаць за людзе́й и ро́бляць пе́рад людзьми́ такое, што со́рам и казáць, ро́бляць и не саро́меютца. Раз, ужэ́ былá во́лнась; ѣ́хала якáясь пáни; прыѣ́хала енá с ху́рманам у нáшэ село́ на пáры ко́ней да й заначавáла у́ менѣ́. Бáчыце, таѓды́ ва у́се́м селѣ́ то́льки у́ мене́ былá чи́стая хáта з ко́минам, а другие седзѣ́ли ещэ́ у́ ку́рниках. Заначавáла пáни, а рáненько хацѣ́ла ѣ́хаць дáлей. Але́ ось чуць свѣт улáзиць у хáту ху́рман да й кáжэ, што ко́ни вы́прущилиса. Што тут раби́ць! От пáни нанелá мене́, каб я еѣ́ звазиу́ у адзи́н дво́р на свае́й кабы́лцы. Запро́г я кабы́лку, вы́таптау́ драби́нки сало́маю, пасадзиу́ пáняю да й павъе́з. Гэто я́кось было́ па лѣ́ту, у́ Петро́у́ку, ци што. От ѣ́дам мы да ѣ́дам, то́льки пáни седзи́ць на во́зе да у́се чу́хаетца Мáбыць у сало́ме было́ мно́ѓо ско́чак. Чу́халаса енá, чу́халаса да й давáй знимáць з себе́ у́се адзѣ́не. Ѣдзе пáни ѓолая, у чо́м мáци

радзи́ла, тӧльки парасо́ликам закрыва́етца, а тым ча́сам насустрѐк иду́ць або́ ѐдуць лю́дзи. Дак ничаѓу́сьсенько,—па́ни не саро́меетца людзе́й, да ўсе ло́виць ско́чки ѓдзѣ папа́ло. Але́, ось захацѣ́ласо е́й да вѣтру. Ка́жэ ена́, каб я супыниў кабы́лку. Я супыниў. Злѣзла ѓэто ена́ ѓо́лая з во́за да й прысѐла на даро́зе, але́ немажэ́ ўдзе́р-жатца—хиста́етца: от, от упадзе́. От и заве́ ена́ мене́. Падышо́ў я, а ена́ ўчапи́ласа за маѣ́ ру́ки, зраби́ла, што трэ да й палѣзла на вӧз. Дак от ѓэ ѐхала па́ни не́маль увесь дзень и не саро́меласа ни мене́, ни друѓи́х людзе́й—мужыко́ў, бо ена́ их не ли́чыць людзьми а ѓаўядам, а вѣ́дамо, ѓаўя́да нихто́ не саро́меетца. Дак от я ха́чу разсказа́ць вам пра адну́ жа́ласливую па́няю, яка́я ена́ была́ ли-тасци́вая да до́брая. Эѓэ, дак, дай Божэ па́мяць, быў сабѣ́ адзин пан з па́няю. Ены́ не мѣ́ли дзецей. Вѣ́дамо, паны́, што ены́ не вы-рабля́юць з ве́ськими дзеўка́ми з са́маѓо мале́нства, чаѓо ены́ не спро́буюць, каб мац сa̋мы велики сло́дыч, а як пры́дзетца жыць з па́няю, дак и по́йдзе ўселя́кае ли́хо да хваро́бы. А па́ни сабѣ́-ж наро́вяць, каб тӧльки мац сло́дыч да каб хараства́ не зѓуби́ць. Дак от ѓэ й ты́е паны́, тӧльки й зна́ли, што прые́мнасци шука́ли.

Жыў кале́ таѓо́ села́ адзи́н шляхту́н. Ён маў малы́ кусо́к земли́ й ѓарава́ў на е́й, як и мужыки́. Але́, вѣ́дамо, як во́лнаму чалавѣ́ку, ему́ ат сабѣ́ жыло́со, ек-жэ ка́жуць, што ўбиў, та ўѐхаў Тӧльки даў Бо́ѓ ему́ нешча́сце: паме́рла жо́нка й паки́нула мало́ѓо хлапчука́. Пахава́ли жо́нку. Убива́етца шляхту́н, з ѓлу́зду вы́биўса й ро́зуму не прыло́жыць, што ему́ раби́ць з малы́м дзи́цем. Уба́чыла ѓэто адна́ маладзи́ца—ў еѣ́ як раз аб то́й пары́ Бо́ѓ узя́ў маленькае дзиця́тко—пашкадава́ла шляхтуно́ваѓо хлапчука́ да й узела́ еѓо́ карми́ць цыц-каю. Вы́кармила ена́ хлапчука́ да й пакаха́ла еѓо, як свае́ ро́днае дзиця́. Гаду́етца шляхту́н на селѣ́, ѓра́е з дзецьми́, а тым ча́сам паме́р еѓо́ й ба́цько. Пачу́ў то́е пан да й узя́ў ѓэ́стаѓо хлапчука́ ў двӧр, каб на селѣ́ не прапада́ло во́лнае дзиця́. Таѓды́ ўжэ быў ѓо́жы хлапчу́к; ему́ было́ не́маль дзе́сяць ѓадо́ў. Жыве́ шляхтуне́ц у двары́, адуку́етца ра́зам з па́ньскими дзецьми́, але ўсе не за-

бываe таѣ маладзицы, што его выгадавала, не забываe свайго таварыства й усе бѣгае на село. От так и вырас ён у дварьі, выадукаваўса лѣпш панича. И зрабиў пан маладого шляхтуна камысарам и хацѣў атдаць за его сваю дачку; але камысар не схацѣў, бо ен вельми спадабаў дачку таѣ маладзицы, што его выгадавала. Пранюхаў тое пан да й велѣў атдаць тую дзѣўку замуж за свинапаса. Давай тут камысар прасиць пана, каб ён прадаў тую дзѣўку ему; дае много грошэй и ўсю сваю земельку, што дасталаса ат бацька. Але куды там—пан и слухаць не хочэ, зарубиў свае. да хаць ты ему кол чашы на галавѣ. А свинапас быў ужэ стары да самы ледащы, гультай, пъяньчужка. Кажуць людзи, што ён бало пъяны так биў, так здзѣкуваўса над першаю жонкаю, што тая, як пашла на реку палакаць плацье, дак аттуль и не вернуласа; нихто не вѣдаў, куды й дзѣласа. Тольки прас тыдзень усплыла наверх, и рыбаки валачком выцягли на бераг. От як пачула тая дзѣўка, што пан велиць атдаць еѣ замуж за такого ледащаго чалавѣка, дак спалохаласа й та галосиць, та рагочэ, бы кручаная. Бачыць камысар, што ничого не будзе, што загубяць его дзеўчыну, сабраўса, забраў еѣ да й пашли ены ў свѣт невѣдамо куды. Аглядзяўса пан, што нема дзѣўки, нема й камысара да так разсердзиўса, што й дух выперло.

Тым часам хутко за панам памерла й пани. Астаўса тольки адзин панич; той самы, што адукаваўса разам с камысарам. И пачаў панич сам рондзиць, пачаў такое рабиць, што людзям жыцця нема, гарей стало, як пры старом пану. Стары пан быў хаджаин. Ён клапациўса, каб зрабиць гаспадарку лѣпш, як у сусѣдзей, шкадаваў сваих людзей, як свае гаўядо, бо, вѣдамо, личыў людзей сваим дабром. Малады-ж пан не глядзѣў на хаджайство, а тольки думаў аб том, каб ужыць слодыч. И пачаў ён зганяць у двор гожых дзевок да маладзиць, велѣў им скидаць усю адзежу й голым гуляць у саду. Тым часам ён зваў к сабѣ сусѣдних паноў да ўселяких палупанкаў, бѣгаў з ими за дзеўками з бизуном у руках и,

як сам вычварáў, што хацѣў, так и друѓие паны́. Але от напры́крыли ему́ вéськие дзеўчáта й маладзи́цы й давáй ён атўсю́ль прывóзиць рŏзных панéнтак. Усѣ́ пакóи запагáниў. Вѣ́дамо, без ѓаспадарá хаджáйство хўтко зни́шчыласо. Енó й пры старŏм пáну дзержáласо тŏльки камысáрам. Малады-ж пан зрабиў камысáрам свайѓó хўрмана. Гэтаѓо хўрмана пан палюбиў за тóе, што ён пры ѓасця́х раз спрáвиўса с двананáнцацю дзеўкáми да й казáў, што ещэ́ не задаволиўса. Хўрман так пачáў рóндзиць, што хўтко ў пáна ничóѓо не асталóсо. Бáчыць ён, што саўси́м прашы́каўса, от и давáй шукáць баѓáтаѣ жŏнки. Па сусѣ́дству там быў вéльми багáты пан. У еѓó былá тŏльки адна́ дачка́. А прáўду кáжуць лю́дзи, што кали́ еднáчка, та кўрва, ци лайдáчка. Так и тáя панéтка. Гадавáласа ена́ ў раскóпы, ниякаѣ рабóты не знáла: от як вы́расла, дак и пачалá так вычварáць, што сóрам и казáць. Алé дармá,—бáцько личы́ў, што харашéй и лѐпш его дачки́ никóѓо немá й на свѣце. Пачали́ паничы́ свáтатца. Вѣ́дамо, к баѓáтŏй панéнтцэ зáўжды нахóдзитца баѓáцько жанихŏў. Алé куды́ там! Пан дўмае, што еѣ́ вазьмé князь. Тым часóве жанихи́ ўсе ѣ́здзяць у залéты к ѓэстŏй панéтцэ, алé ничоѓо не парáдзяць, бо от спадабáетца éй пани́ч, паѓавóрыць ена́ з им—усé дóбрэ, алé як памáцае еѓó да знáйдзе ў парткŏх, дак и праѓóниць. От и пашлá прачўтка, што тáя панéнтка шукáе такóѓо жаниха́, каб у еѓó ничóѓо не былó ў парткŏх. От наслўхаўса той пани́ч, зашмарѓнўў матузкóм я́йца, залыѓáў петуха́, прывезáў его да й паѣхаў у сваты́ к тŏй панéтцы. Памáцала ена́ панича́ — немá ў парткŏх ничóѓо; от и зѓадзи́ласа ена́ йцп за еѓó зáмуж. Рада панéнтка, кли́чэ к сабѣ́ панича́ кŏжын дзень. Ѣ́здзиць той к панéнтцы пашто дзень, а яец усé не атвя́звае. От ужэ́ парá рабиць и лад, алé бáцько не хóчэ за ѓалышá атдавáць сваѣ́ дачки́. Тым чáсам панéнтка пражэ́тца зáмуж за таѓó панича́, як жывóѣ вады́. Бáчыць пан, што ничóѓо не мŏжне зрабиць з шалéнаю дачкóю, спрáвиў весѐлье, атдáў зя́цю грóшы, а сам паѣхаў да Аршáвы да там и заѓи́нуў. Жывé малады́ пап з жŏнкаю, не чапáе еѣ́ да й рад, што

й ена́ еѓо́ не займа́е, бо е́н ужэ́ не мажэ́ мацъ з жанчы́нами дачыне́не—еду́ць еѓо́ пра́нцы. От пакача́ўса пан ѓадо́ў са тры да й здырдзиўса. От тут и пачала́ та́я па́ни сама́ ро́ндзиць мае́нткам.

Тым ча́сам у камыса́ра паме́рла та́я жо́нка, што е́н узя́ў у ѓэ́сто́м селѣ́. Пакинула ена́ дво́е малы́х дзѣ́так. Ду́маў, думаў камыса́р, што рабиць да й верну́ўса ў свой хвальварак Пачу́ла па́ни, што верну́ўса той камыса́р, што ве́льми до́брэ ро́ндзиў маенткам пры старо́м па́ну й пачала́ еѓо́ прасиць, каб е́н и ў еѐ стаў камыса́рам. Паду́маў той да й зѓадзиўса. Прыѣ́хаў е́н у двор к па́ни да й ухо́дзиць у пако́и. Зирне́ е́н, аж там по́ўны пако́и ѓасце́й: усе́ па́ни да пане́нтки́. Усѣ́ паскида́ли су́кни, расплели́ ко́сы да так ѓо́лые й хо́дзяць па пако́ях. От пашо́ў камыса́р да́лей шука́ць па́няю, ўсу́нуўса е́н у друѓу́ю ста́нцаю, аж там це́лая чарада́ ѓо́лыхъ хло́пцаў, а пами́ж их трэ́тца й сама́ па́ни, вищы́ць, смее́тца, бѣ́ѓае за ты́ми мужчы́нами да наро́виць абсѣ́ч им крапиво́ю сарамацѣ́не. Уба́чыў то́е камыса́р, плю́нуў да й пашо́ў вон. Па́ни за им: про́сиць, блаѓа́е, каб аста́ўса.—Ѓе́тож—ка́жэ ена́,—маѣ́ имени́ны. Аста́ўса камыса́р и пача́ў хадзи́ць з па́няю па ўсих пако́ях. Тым ча́сам паничы́ сышли́са з пане́нтками да з па́нями да й пашли́ раѓата́ць да бѣ́ѓаць паўси́х пако́ях, бы ко́ни. Чаѓо́ то́льки ены́ не вычвара́ли. Але́ ось павела́ па́ни камыса́ра ў сад. А там ена́ велѣ́ла саѓна́ць з села́ малады́хъ мужчы́н и жано́к да дзѣ́вак, напайла их ѓаре́лкаю, нанела́ музы́ку й зраби́ла заба́ву. Панапива́лиса ўсѣ́: перш ены́ скака́ли да спева́ли пѣ́сни, а по́тым паскида́ли адзе́жу да бы й паны́ дава́й ѓаса́ць па саду́ да валя́тца ў кусто́х да на травѣ́. Тым ча́сам паны́ й пане́нтки вы́беѓли з пако́яў у сад да й памеша́лиса з мужыка́ми й мужы́чками. Ка́жуць, што дзе́ля ѓэ́таѣ рэ́чи мужыки́ смачнѣ́й. Но́чка была́ лѣ́тняя, це́плая, аж па́рыло. Ужэ́ й даў Бо́ѓ дзень. Со́нейко падняло́со высо́ко, а ў саду́ ещэ́ не ўсе заци́хло. И пача́ў камыса́р с тых ча́саў аѓляда́ць хаджа́йство. Але́ куды́ ни зирне́, ўсе не палю́цку: по́ле не засѣ́яно, сенажа́ць запу́щана, зарасла́ ни́цаю лазо́ю да хмы́зникам, будо́ўля асу́нуласа, сцѣ́ны па-

крывилиса, стрехи пагнили, або вецер паздзираў, тольки дрэбы тырчаць, бы косци з дохлаго каня. Гаўядо звелосо; у коней тольки шкура да косци. Мужыки абеднели, пухнуць ат голаду, бо некали хлеба зрабиць: пани зганяе па што дзень у двор. Тут ена велела будаваць харомы й даглядаць катоў, сабак да старых коней. Ена, бачыце, вельми жаласливая надъ гэстым жыўелам; ена атусюль назбирала коп пяць уселяких катоў,—и сама не даесь, а их даглядае. Назбирала валачащых сабак, кормиць их, мые, чэшэ да абшывае. Цалюсьсенькие дни даглядае гэстую погань сама й трымае на том дзеле ўсих баб. А здохлым канякам дак ена збудавала стайни прыставила к гэстаму падлу людзей и велела служыць. А як здохне кот, сабака, або здыхлина—каняка, та пани плачэ, бы па родном бацьку, велиць плакаць и другим, а потым робиць труну, хавае, бы людзей и над магилаю кладзе прыклад. Уся дворня да й усе село тольки й рабило на гэстую пошкуць А пани была такая жаласливая, такая жаласливая над катами да сабаками, што часам з маладзиц да з дзевак шкуру здзирала, кали ены не добрэ даглядали таго жыўела. Вельми ена карала тых маладзиц, што шкадавали свайх дзецей и украткн кармили их сваими цыцками, а не катоў, ци сабак, як велела пани. Дак от якая была то жаласливая пани. Але кажуць, што забег у той двор кручаны кот да й пакусаў других катоў и сабак Прышоў маладзик, и пакруцилиса каты й сабаки. От як напали ены на тую паняю, дак и загрызли ее на смерць. Стали людзи збиваць тую пошкудзь, але ўсе таки много й людзей пашалело.

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы

71. Иванко Прастачо́к.

У яко̆м тось краю́ жылі́ лю́дзи бы ў раю́: ґарава́ли, працава́ли да й беды́ не ма́ли. Свѣт велі́ки; землі́ мно̆ґо; ўсю́ды во̆лно, — працу́й на хлѣб, рабі́ да Бо́ґа хвалі́. И жылі́ там лю́дзи ў ла́сцэ, ў зґо́дзе, весь дзене́чак ґарава́ли, працава́ли, а аб но́чы атдыха́ли. А прыдзе́ беда́,—ў зґо́дзе ратава́лиса ў прыґо́дзе: бѣ́дным, хво́рым памаґа́ли, дак и ўсѣ беды́ не ма́ли. То̆льки ось атку́ль узя́ўса й пача́ў сюды́ лета́ць стра́шны Змѣ́й; пача́ў лета́ць, пача́ў дабро́ цеґа́ць, а на рэ́шце й людзе́й хвата́ць да к сабѣ́ цеґа́ць. Нахвата́ў ён людзе́й и дава́й будава́ць сабѣ́ харо́мы. Нахвата́е атусю́ль людзе́й, зґо́ниць их у вадно́ мѣ́йсцо да й прымуша́е будава́ць харо́мы. ако́пваць их кана́вами, абсыпа́ць ва́лами да абґаро́джваць частако́лам, каб нихто́ не мо̆ґ туды́ ўлѣ́зци. Буду́юць людзи, капа́юць кана́вы, насыпа́юць ва́лы землі́ бы ґо́ры й пату́ль ґару́юць, паку́ль там и заґі́нуць. А Змѣ́й хвата́е да вало́чыць туды́ ўсе но́вых дэ но́вых людзе́й. От набудава́ў ён мно̆ґо таки́х аґаро́даў, пралажы́ў памиж их шляхі́, лета́е па их да цеґа́е ў ва ґаро́ды й людзе́й и люцко́е дабро́. Працу́юць лю́дзи, заґару́юць што ко́львек, а тут налеці́ць Змѣ́й, аберэ́ ўсе бы по́жар да й запрэ́ к сабѣ́ ў ва ґаро́ды, а лю́дзи пу́хнуць ат ґо́ладу да мруць, бы му́хи. И чым да́лей, тым ґаре́й: нема́ спасо́бу, нема рату́нку ат лихо́ґо Змѣ́я. Тым ча́сам тые лю́дзи, што их Змѣ́й навалачы́ў у сваѣ́ харо́мы, жару́ць сабѣ́ люцко́е дабро́, ничо̆ґо не ро́бляць да то̆лько са́ло ґаду́юць. Дак от не то̆лько Змѣ́й, але́ й ены́, забы́ўшы сваи́х бацько̆ў да брато̆ў, пачалі́ па шляхо̆х выла́зиць з аґаро́даў, бы мура́шки з мураве́йника, пачалі́ хадзі́ць па свѣ́ту да атбира́ць у людзе́й их дабро́. И ста́ло лю́дзям ґарэ́й ат людзе́й, як ат Змѣ́я, бо, вѣ́дамо, гэ́стых лихи́х слуґ Змѣ́я ве́льми мно̆ґо. Ены́ бы пло̆йма ўсю́ды нахо́дзяць людзе́й и атбира́юць у их што запарву́ць. Нема́ ў их лі́тасци—з жыво́ґо шку́ру дзеру́ць. И пачалі́ ены́ личы́ць людзе́й ґаре́й ґаўя́да, пачалі́ саро́мятца, што са́ми ены́ лю́дзи, пачалі́ выдумо́ўваць сабѣ́

ўселякия назвиска. Хто назваў себе змеям, хто воўкам або медзьведзям ци другим зверам, хто арлом, коршакам ци другою птушкаю, хто яким кольвек дзеравам, и гэ ены ўсе дали сабе назвиска. Тольки людзей называюць ены просто людзьми, батцэ гэто самае гарейшае имя. Дак от скуль узелиса паны Свиньские, Ваўки й другие. Тым часам пастарэў Змей, абезсилеў и лежыць бы падло. Лежыць ен на адном баку цисячу гадоў; и пачаў ен гнисци, пачаў так смердзець, што аж нос верне. Разышоўса той смурод па ўсих харомах, запаганиў увесь агарод. Свежаму чалавеку нельга падыци близко к агароду, таки аттуль верне смурод, таки лихи импат идзе ат таго Змея. Але паны абнюхалиса да й кажуць, што гэто пах, што гэто тольки дурные мужыки не знаютца, што смердзиць, а што пахне. Тым часам Змей усе гние да гние й так запаганиў агарод, што там и паном жыць не можна. Пачали ены атсекаць у Змея гнилыя ноги, або што другое. Атсекуць адно, а на замест таго вырасце пъяць, а то й больш. От бы аднолетки на пню. И разрозса той Змей бы гара, разрозса й абняў увесь агарод. Загниўса агарод, пашла вонь на ўвесь свет. Прасмердзелиса паны да й пачали сами гнисци бы падло. Ещэ гарей стало людзям, бо паны гниюць, едзяць их чэрви, точаць их жуки; а што здаровые, тые ловяць людзей, цягаюць у вагароджу да прыказваюць абмываць той гной да кармиць гэстае падло. От служаць людзи дохламу Змею, служаць тым гнилым паном, атдаюць им апошняе, а сами ходзяць галодные, халодные да тольки за працаю свету Божаго не бачаць. Гэ й жывуць ены ат веку да веку. Адны умираюць, другие раджаютца й немашака ниякае палегки. И да таго дажылиса людзи, да таго падурели, што й не думаюць аб лепшом жыцю. Им здаетца, што гэ й трэ, што йнак жыць, дак и свет зведзетца.—Гэ жыли нашы прадзеды й дзеды; трээ й нам уступиць у их следы—кажуць людзи да й ничого не робляць, каб зрабиць лепшае жыце. Але ось радзиўса ў том краю хлапчук. Быў ен вельми благеньки, вельми худы: да от так як занепаў з маленства, дак так и астаўса на ўсе жыце.

Ни паны́, нихто́ его́ нечапа́е, бо ен таки́ нехлемя́жы, што нико́му непатрэ́бен. От е́н и вы́рас ужэ́, але́ ў́се ґра́е з дзецьми́ бы маленьки. И празва́ли его́ лю́дзи Ива́нкам Прастачко́м. От у зи́мку седзи́ць сабе́ Ива́нко Прастачо́к на пе́чы да з лучы́начак ца́цки скла́двае, а па ле́тку песо́чак перасыпа́е з дзецьми́. Такъ пражы́ў ен ґадо́ў тры́ццаць. От раз седзи́ць Ива́нко Прастачо́к на земли́ кале́ пры́збы да перасыпа́е песо́чак, аж иду́ць тры старцы́. Прышли́ ены́ к ха́це да й се́ли на пры́збе атдыха́ць. У селе́ ни жыво́е душы́— пан усих вы́ґнаў на рабо́ту. Пу́сто, хаць падпали́. Седзя́ць старцы́ на пры́збе, атдыха́юць да насыпа́юць у лю́льки́ цюцюну́. Хапи́лиса ены́, аж нема́ аґню́ да й про́сяць Ива́нка, каб е́н даста́ў аґню́ лю́льки́ закуры́ць. Пабе́ґ Ива́нко ў ха́ту, набра́ў у пры́ґарщы жа́ру да й пры́но́сиць старцо́м. Закуры́ли ты́е лю́льки́, падзя́кували Ива́нку да й пыта́юць его́, што е́н ро́биць.—Песо́чак перасыпа́ю— ка́жэ Ива́нко,—бо што ни раби́ць, та ў́се на пано́ў тахци́ць. А на́шы лю́дзи дурны́е, ця́ґнуць жы́лы да са ў́сее́ си́лы пну́тца, дзе́ло спраўля́юць, а ли́хо ма́юць, бо паны́ ў́се́ к сабе́ ґрабу́ць, з мужыко́ў шку́ры дзеру́ць, а то й саў́сим их к сабе́ беру́ць, за све́т заґаня́юць, бъюць, кале́чаць, му́чаць, забива́юць и ли́тасци не ма́юць.

Паслу́хали то́е старцы́, ґалава́ми пакива́ли, ў́зели́са за штруме́нты да й заґра́ли. Пе́ршы раз загра́ли — Иванку ро́зум да́ли; друґи́ раз заґра́ли—ў се́рцэ жа́ласци наґна́ли; трэ́ци раз ены́ заґра́ли—язы́к Ива́нку развяза́ли. Зни́кли старцы́, а Ива́нко Прастачо́к стаў ужэ́ не дурачо́к, стаў за дзе́ло бра́тца да й у све́т збира́тца. Зрабиў ду́дку-веселу́шку да заґра́ў сабе́ так жа́ласливо да так ґо́жэ, што не то́льки лю́дзи, а зверы́ й пту́шки ста́ли его́ слу́хаць, ста́ли ў́кру́ґ збира́тца. И пача́ў Ива́нко Прастачо́к па све́це хадзи́ць, у ду́дачку ґраць, людзе́й збира́ць да им пра́ўду каза́ць. Як загра́е, дак и ў́ба́чаць лю́дзи, што вели́кая кры́у́да на све́це, што адны́ пану́юць, друґие ґару́юць; адны баґа́тству ли́чбы не ма́юць, друґие з ґо́ладу падыха́юць. И разне́сса ат Ива́нкава́е ду́дки ґолас

па ўсемў свѣту. Пачалѝ людзи к тамў ґоласу прыслухатца да розуму набиратца: пачалѝ дўмаць да ґадаць, як за праўду пастаяць. От учўли па палацах той велики ґолас да и спалохалиса слўґи Змѣя, пачалѝ енѝ войсько збираць да Иванка Прастачка шукаць. Чўюць ґолас на ўсходзе—шамелях енѝ тудѝ. Палашѝ блищаць, пики бы лѣс тырчаць, ґарматы ґрымацяць, а Иванка не видаць. Стануць цихо, бы на палевани, слўхаюць, стаяць. Аж тым часам чўюць ґолас на заходзе—ґрае дўдка-веселўшка, ґрае, людзей навучае. Идзе пощак ат села да села, па полю, па лѣсе ат краю да краю. Кинутца енѝ на захад; ґоняць коней, беґўць сами, шаблями звиняць, на зви вѣцер з ґармат страляюць, дак Иванка не спаймаюць. Гудзе дўдка, ґрае: та засвищэ, та бы бусел заляскочэ, та зацяґне тонко, от бы павуцина, та так дробненько щабечэ, што ў паноў аж лытки затрасўтца, а мароз бежыць па спине, батцэ мыш тудѝ залѣзла да й скрабетца пазурами. От с тых часаў слўґам Змѣя ни ўдзень, ни ў ночы ани збла спакою, бо бедѝ енѝ сабѣ чакаюць, бы вол доўбни. Дўдка свищэ, дўдка ґрае; пощак па свѣту ґуляе, людзей навучае. Еґо ни злавиць, ни з ґармат не забиць. Ён волно па свѣту ґуляе, ниякихъ заґародак не знае; хаць сам без цѣла, да великую силу мае. Грае, ґрае, а як прыдзе час, дак усих ён параўняе. Ой ты дўдка мая, веселўшка мая!

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

72. Каваль.

У якомъ тось царстве быў колись велики голад, и не было чым жывитца не толки ґаўяду, але й людзям. Паѣли енѝ й той корм, што жывиласо жыўело. От памираюць людзи з ґоладу, бы аб осень мўхи. Але аднѝ памираюць, а другие раджаютца. И чым ґарейшы голад, тым больш раджаетца дзецей. И велѣў цар забиваць малых дзецей, каб не множылиса людзи, бо й ґэстым нема чаґо ѣсци. От

хо́дзяць ца́рские слу́ги да й забива́юць дзеце́й, або́ то́пяць их у ďацé, бы щаня́т. Пла́чуць, убива́ютца ма́тки, ло́мяць ру́ки да рвуць на сабѣ́ ко́сы. Вѣ́дамо, ма́ткам заўжды дзеце́й шко́да. Але́ ца́рские слу́ґи не ма́юць лі́тасци,—забива́юць дзеце́й, льюць ане́льскую кроў

Отъ у то̆мъ ца́рстве таґды́ жыла́ сабѣ́ адна́ жанчы́на. Ена́ ўжэ была́ то́ўста, як еѣ́ ґаспадара́ забра́ли ў маскалѣ́. Ба́чыць ена́, што ўжэ хо́дзиць на часо́х да й байтца, каб ца́рские слу́ґи не забили еѣ́ дзиця́ци. Што тут раби́ць. Куды́ тут схава́ць дзиця, як ено́ ро́дзитца? Ду́мала ена́, ду́мала да й наду́малаcа. Надра́ла ґэто ена́ пеле́нак, накла́ла ў лубя́нку, заки́нула еѣ́ за плéчы да й пашла́ ў лѣс.

Вѣ́дамо, лѣс вели́к—нема́ ему́ ни канца́, ни кра́ю. Жыви́ ў е́м хаць вѣк,—нихто́ не тра́пиць. От идзé тая маладзи́ца да йдзé, назбира́е яґад, праґо́ниць сма́ґу да й да́лей. И забра́ласа ена́ ў таку́ю ґущарню, што мо́о там нихто́ й зро́ду не быў. Наґледзѣ́ла ена́ сабѣ́ дупленáтае дзе́раво, вы́калупала ў е́м парахню да й зраби́ла там сабѣ́ ха́тку. Тут непадале́чку была́ крыни́ца, а ў е́й така́я чы́стая вада́, бы слеза́. Жывé сабѣ́ ў то̆м дупли́ маладзи́ца. З крыни́цы пъе во́ду, а ѣсь я́ґады да ґрыбы́. Назапа́сила ена́ тро́хи сабѣ́ ґрыбо́ў да я́ґад, назбира́ла аре́хаў да ўселя́каґо каре́ня й чака́е, по́ки пры́дзе пара́. От седзи́ць ена́ ў дупли́ да шы́е сабѣ́ саро́чку. Тым ча́сам вы́шаў увéсь запа́с ґрыбо́ў да я́ґад и нема́ чым пасилкава́тца. Вы́сунуласа ена́ з дзе́рава, узела́ на плéчы лубя́нку да й пашла́ шука́ць ґрыбо́ў. Идзé ена́ да йдзе, да й узби́ласа 'на мдзьвéджае ло́ґво. Медзьвéдзица пашла́ шука́ць жы́ўнасци, а тым ча́сам на медзьведзеня́т напа́ў шуля́к и дава́й ихъ дзеўба́ць. Уба́чыла то́е маладзи́ца,—шко́да е́й малы́х дзѣ́так,—ухапи́ла ена ламá́чыну да як спераза́ла таго́ шуляка́, дак ён и но́ґи вы́пруциў. Тым ча́сам падбеґа́е медзьвéдзица. Уба́чыла ена́, што жанчы́на абратава́ла медзьведзеня́т и дзя́куе е́й: прыпада́е к наґа́м да ли́жэ их, равé, а сле́зы з ачо́ў так и цеку́ць. Отъ пашла́ маладзи́ца ў сваю́ ха́тку, а медзьвéдзица тымъ ча́сам на́зиркам за е́ю. Уба́чыла, куды́ ўлѣ́зла

маладзи́ца, да й пашла́ к свайм дзе́ткам. Седзи́ць сабе́ маладзица, перабира́е ґрыбы́ да пае́ пе́сни. То̂льки ось зирне́ ена́, аж медзьве́дзица су́нетца з кусто̂ў про́сто к дуплена́таму дзе́раву. Спужа́ласа маладзи́ца, аж у жывату́ забурча́ло,—не ве́дае, што раби́ць. Тым ча́сам медзьве́дзица падышла́ к са́маму дуплю́, прыцяґла́ маладзи́цы на лубку́ све́жых пля́страў ме́ду, палажы́ла тут, а сама́ паўзко́м папаўзла́ назад. Уба́чыла то́е маладзи́ца да й даґада́ласа, што ґэ́то медзьве́дзица ў падзя́ку дала́ ґасци́нца. От жыве́ сабе́ маладзи́ца ў дуплена́тум дзе́раве й не ґа́дки: медзьве́дзица ко̂жын дзень прыця́ґне меду. По́тымъ ена́ пачала́ насиц пташэ́чые я́йца й друґу́ю жы́ўнась. Але́ ось прышла́ пара́ й парадзи́ла та́я маладзи́ца ґо́жаґо хло́пца. Зирне́ ена́, аж у еґо́ спе́раду на ґалаве́ со́нейко, а з за́ду ме́сячык Зьяе со́нейко, аж во́чы сле́пиць, не́льґа ґлядзе́ць. От абвеза́ла маладзи́ца ґало̂ўку сваймў сынку́ ху́стачкаю да так и не здыма́е ее́ ни ў дзень, ни ў но̂чы. Расце хлапчу́к бы на дро́жджах: што дзень, та на пу́шку вы́расце; ў адно́ ле́цячко зраўня́ўса з ма́ткаю. Тым ча́сам наси́ла, наси́ла медзьве́дзица им жы́ўнась, а на рэ́шце й сама́ съ медзьведзеня́тами перабра́ласа к таму́ дуплена́тому дзе́раву да й зраби́ла кале́ еґо́ сабе́ лаґво́. Гра́е сабе́ хлапчу́к съ медзьведзеня́тами, ся́дзе на их верхо́м да й е́здзиць, бы на каня́цэ. К во́сени медзьведзеня́та зраўнялиса з ма́ткаю й пашли́ са́ми шукаць жы́ўнасци. Таґды́ хлапчу́к дава́й е́здзиць на медзьве́дзицы. Спадаба́ласо ему́ ґэто. От паса́дзиць е́н на медзьве́дзицу сваю́ ма́тку, ўско́чыць сам и дава́й ґаса́ць па ле́се Гэ пражыли́ ены́ ле́то. Падхо́дзиць во́сень. Начына́ютца халады́. От и ўзду́мала маладзи́ца йци ў сва́е село́. Сабралиса ены́, зложы́ли сва́е дабро́ ў лубяны́е каро́бки да й пашли́ да ґаспо́ды; а тут медзьве́дзи ўвеза́лиса й не пакида́юць ни на крок. Отъ ены павесили сва́е клу́нки на аднаґо́ маладо́ґо медзьве́дзя, маладзица се́ла на медзьве́дзицу, а хло́пец на друґо́ґо медзьведзюка да й пае́хали. Вы́бралиса ены́ з ле́су на по́ле да й падъезджа́юць к селу́. Уба́чыли людзи медзьве́дзей, спало́халиса да на ўцекача. Побе́гли ўсе́ з села́, куды́ во́чы ґлядзя́ць.

Падъѣхала маладзица к сваей хатцэ, ажно ена пустая. От злѣзли ены з медзьвѣдзей, зняли сваѣ клунки да й пачали аглядаць хату. Тым часам медзьвѣдзи панюхали сѣльськае павѣтрае да й патрухали ў лѣс. Пачали збиратца людзи да й не надзивятца, што вернуласа маладзица й прывела такого гожаго хлопца. Отъ жыве маладзица з сынам у сваей хатцэ да даглядае хаджайства. Тым часам еѣ хлапчук пачаў плескаць у кузни да й зрабиўса добрым кавалём Пашла аб тём прачутка й дайшла да царских слуг. Ужэ даў Бог зраджай, перастали забиваць дзецей, але царськие слуги кажуць, што Каваля трэ забиць, бо ен тагды радзиўса, як велено было нищыць дзецей и што винавата матка, нашто ена хавала й гадавала свайго сына. От судзили, судзили царськие слуги да й прысудзили забиць таго Каваля. Пачула тое матка,—плачэ, руки ломиць, рве на сабѣ косы да ўбиваетца, да галосиць на ўсе село. А Каваль ани гатки: пае пѣсни, смеетца да разважае сваю матку. Тёльки ось чуе ен, што ўжэ йдуць царськие слуги с вёйськам, каб его знищыць От выкаваў ен сабѣ булаву ў дзесяць пудёў, падкинуў еѣ ўверх да й падставиў калѣно. Удырыласа булава аб калѣно да й сагнуласа ў дугу. Узяў ен больш залѣза, выкаваў булаву ў сорак пудёў, падкинуў еѣ ўверх, наставиў калѣно да й чакае, што будзе. Чакаў, чакаў, аж нема булавы,—ена ўсе лециць уверх. Чакаў ен з рана аж да паўдня; тёльки чуе—гудзѣ ў небе, бы грём грымиць, гудзе, лециць тая булава ўниз. От ужэ сонейко заходзиць за лѣс, як тая булава, падлецѣла да й удырыласа аб калѣно. Бачыць Каваль, што ў ей тёльки ручка трохи пагнуласа. От узяў ен тую булаву, заткнуў еѣ сабѣ за пояс да й пашоў шукаць добраго каня, каб на ем ѣхаць у свѣт. Шукаў ен, шукаў, але якого каня не знайдзе, як паложыць ему на спину сваю далоню, дак кёнь и падзе на калѣни,—немажэ выдзержаць. Што тут рабиць? Не хочэ Каваль пѣшки йци ў свѣт, а немажэ падабраць сабѣ каняку. Тёльки ось ѣдзе анучник; а ў его каросливая кабылка. Падышоў Каваль да й палажыў ей на спину сваю руку.—Стаиць кабылка й не ва-

рухнетца. Тагды Каваль палажыў ей на спину сваю булаву. Стаиць карѣсливая кабылка, тольки трохи вушами пакивала. И прыстаў Каваль к анучнику, каб ен прадаў кабылку. От ўзяў анучник за тую кабылку сто рублеў. Ён и зроду не мѣў тольки ґрошэй. Пашоў анучник падскакваючы. Тым часам Каваль сѣў на карѣсливую кабылку, прывезаў к седлу сваю булаву, папращаўса з маткаю да й паѣхаў сустракаць царськие слуґ и войсько От ѣдзе ен шляхам, а на сусрэк увесь шлях заняло войсько.—На бок, на бок!—крычаць ему. А ен кажэ—не великие паны, й сами звѣрнеце.—Тут накинулиса на Каваля маскалѣ, а ен ухапиў аднаґо за чуб да як замахнетца круґом себе, дак войсько пластам лажытца. Убачыли, друґие што беда да наўцекача. Тым часам Каваль, як ѣхаў пamаленьку, дак так и паѣхаў далей. От ѣдзе еп да ѣдзе й падъезджае к высокуй ґары: нема як ѣхаць далей. Злѣз ен з кабылки, пусциў еѣ пасциса, а самъ леґ супачыць, падлажыўшы булаву пад ґолаў. Спиць сабѣ каваль и не чуе, што на кабылку напало двананцаць ваўкоў, Апанавали ены кабылку атусюль и давай на еѣ кидатца. Заржала кабылка, заве Каваля на помач Прахапиўса той, ухапиў булаву да як пусциць у ваўкоў дак усих разам и паклаў, а булава з разґону як урезаласа аб камѣнную ґору, дак ґара затрасласа да й разсѣласа на двое. От Каваль сѣў на кабылку да й паѣхэў у тую щылину ўсерэдзину ґары. Уѣхаў ен туды, аж там цемно, хаць ты воко выкаль от ещэ ўзсунешса на якое падло. Развезаў тут Каваль сперaду ґолаў, и заблисцѣло сонейко, стало видно, хаць ты ґолки збирай. От ѣдзе ен да ѣзде; зирне ў перад, аж бачыць,—там ґарыць аґонь. Паѣхаў ен туды, подъезджае ближей, аж ґэто зьяе дъямант. Лежыць еґо кусок, бы ґарбуз, да так зьяе, батцэ аґонь ґарыць. Забраў Каваль той дъямант да й паѣхаў далей. Але ось скоро падъѣхаў ен к камѣннуй сценѣ,—нельґа ѣхаць далей. От узяў ен булаву, размахнуўса да як удырыць, дак сцена ў дрэбезґи й разсыпаласа Зирне ен, аж там палацы, да такие палацы, што паґлядзи, дак аж ґалава кружытца. Злѣз Каваль з кабылки, пусциў еѣ на пашу, а сам

пашоў аглядаць тыѣ палацы. Идзе ен да йдзе съ аднаѣ станцаи да другоѣ, аж им и личбы й канца нема. У яки бок ни зирне, ўсюды палацы, ўсюды станцаи адна за другою ўрад, бы ключ гусей. Дзьвери атчыняны й адна проци другоѣ; дак як зирнеш у дзьверы, а там усе дзьверы, дзьверы, дзьверы; ўсе меньшые, меньшые, пакуль сдаютца ў кулак и драбнѣй. Але далей воко не схвациць. Тут адны станцаи кантовыя, другие доўгие да ўзкие; е круглые да такие велизазные, што й сцѣн не бачно. У адных сцѣны гладкие, крамѣнные, а ў других—батцэ туман, батцэ весновые хмарки, як праз их прасвѣчвае мѣсяц. Е й такие станцаи, што й саўсим сцѣн нема, тольки стаяць тоўстые стаўпы, батцэ то на параслй хвои, што галавами ў самае небо упираютца да з Богам жупяць. Дзиво: вокан нема, сонейка не бачно, а видно, хаць ты голки збирай. От идзе Каваль, пастуквае сабѣ булавою да туды-сюды пазирае. Прайшоў ен трохи да й заплутаўса,—стаиць, не вѣдае, аткуль нрышоў и куды трэ йци ўперод. Сумно ему стало ў пустых палацах. От стаў Каваль кале слупа да й думае. Але, вѣдамо, чым больш чалавѣк думае, тым гарей ен задурваетца й заплутваетца, бы муха ў павуцѣне. Стаиць Каваль и не вѣдае, што ему рабиць, Аж тым часам бежыць мышка. Выскачыла ена з норки, панюхала павѣтрае, палупала гойстрыми вочками, бы голками, хацѣла шукаць жыўнасци для дзѣтак, але ўбачыла Каваля, задзивиласа, прысѣла на задние лапки да й седзиць, вушки развѣсиўшы. Зирнуў Каваль, усмихнуўса з дурноѣ мышки да й наступиў ей на хвост. Ускочыла мышка рванулаcа туды-сюды,—хвост непускае. От и давай ена прасиць Каваля, каб ен пусциў еѣ, абецае памагчы ему ў прыгодзе. Усмихнуўса Каваль, што мышка думае ему, асилку памагчы ў прыгодзе; але ўсе-ж падняў ногу да й пусциў мышку. Пабѣгла ена ў сваю норку, а Каваль пашоў далей. Тольки ен высунуўса ў другую станцаю, аж чуе: йржэ его кабылка, заве на помач. Пусциўса ен бѣгци па голасу. Бѣг, бѣг, а з палацаў выбратца не можэ, бо, вѣдамо, ў харомах не разберэ, аткуль идзе голас. Ещэ гарей

заплу́тауса да й кру́цитца на аднӧм ме̂йсцы. А кабылка йржа́ла, йржа́ла да й заци́хла. Ма́быць ее̂ ва́укі заре́зали. Што тут рабі́ць? Шко́да кабылки, а тут з пала́цаў не̂льза выбратца. Схапиў ґэто Кава́ль булавў да дава́й малаці́ць у сце̂ны Як замахне́тца да ре́зне, дак каме̂нные слупы́ да сце̂ны сыплютца, бы пад це́рницаю кастрыца. От праклада́ў е́н, праклада́ў сабе̂ даро́ґу, паку́ль аж выбиўса з пала́цаў. Дава́й тут Кава́ль шука́ць сваѣ кабылки, але́ нияк немажэ знайци́. Стаи́ць да чэ́шэ чупры́ну. Але́ ось и бежыць мышка. Вильну́ла ена́ хвасто́м да й ка́жэ—хадзи́ за мно́ю; я пакажу́ тваю кабылку. Але́ ее̂ ва́укі заре́зали да й бе́бахи выпусцили.—Пашо́ў Кава́ль за мышкаю; прайшли́ ены́ ганӧў двои, аж ат кавале́ваѣ кабылки тӧльки дрэ́бы лежа́ць, а за́мяст трыбухо́ў паву́к аснава́ў павуце̂не да й чака́е, по́куль прылеци́ць пчала́, або му́ха. Шко́да Кавалю́ кабылки, така́я шкӧда, што чуць е́н не запла́каў. От седзи́ць Кава́ль кале́ сваѣ кабылки да пазира́е, што е̂й ужэ мура́шки во́чы выели. Тым ча́сам леце̂ла бо́жая пчӧлка, шука́ла ў кве̂тках медку́ да й заплуталаса ў павуце̂ни. Бъе́тца, ґудзе́ пчӧлка, трапе́чэ нӧжками да маха́е крылцами й усе бӧльш заплу́тваетца ў павуце̂не. А тут уба́чыў то́е паву́к, ки́нуўса на пчӧлку й дава́й ее̂ ґрызци. Раве́ пчӧлка, аж ле̂с дрыжыць. Пачу́ў то́е Кава́ль, забыў и свае́ ли́хо да й ки́нуўса ратава́ць бо́жую пчӧлку. Ухапиў ґэто е́н абе̂ручки павука́ за хво́ст да дава́й еґо́ вадзи́ць круґо́м себе́; вадзиў, вадзиў да як ре́зне ґалаво́ю аб ду́ба, дак у павука́ й маски́ выскачыли. Выпруциўса паву́к, тӧльки наґами дрыґае. Дрыґаў е́н, дрыґай, аж у по́яс выґраб я́му да й сакале̂ў. А Кава́ль тым часо́ве пача́ў разрыва́ць на пчӧлцы павуце̂не й аслабаниў ее̂. Дзя́куе пчала́ да й ка́жэ—за то́е, што ты мене́ выратаваў з беды́, хадзе̂м, я пакажу́ табе̂ крыницу з жыво́ю вадо́ю.—Падня́ўса Кава́ль да й пашо́ў за пчӧлкаю, а ена́ леци́ць уперо́д да тӧльки ґудзе́. Тым часо́ве мышка зале̂зла сабе̂ к Кавалю́ ў кишэ́ню да й седзи́ць там, бы ў нӧрцы. От и пры̀во́дзиць пчӧлка Каваля́ пад высо́кую ґо́ру. Зирну́ў е́н на верх

ґары́, дак аж ша́пка звали́ласа, хацѣ́ў лѣ́зци на ґо́ру, дак нема́ за што ўчапи́тца. От пчо́лка пасадзі́ла еґо́ к сабѣ́ на пле́чы да й папе́рла на ґо́ру. Учапиўса Кава́ль абѣ́ручки за пчо́лку, седзи́ць да тѣ́льки у́хкае ат стра́ху,—нико́ли е́н ґэ высо́ко не быў. От узнесла́ пчо́лка Каваля́ на высачэ́нную ґо́ру, спусци́ласа на зе́млю да й пака́звае на крыни́цу. Зирне́ Кава́ль, аж з ґары́ зпад ка́меня жыва́я вада́ от так и сви́щэ ўверх, бы з ду́дки. Набра́ў Кава́ль у пля́шачку таѣ́ вады́, напиўса сам и мы́шку напаиў. Пасадзи́ла их пчо́лка зно́ў на пле́чы да й папе́рла назад. Тѣ́льки ены́ ўзнели́са, аж и ўсхадзі́ласа така́я бу́ра, што дубы́ вырыва́е з каре́нем, варо́чае камѣ́не й аж ґо́ры хиста́е. Ухваци́ла та́я бу́ра пчо́лку ра́зам з Кавале́м и з мы́шкаю, ухваци́ла, закруци́ла, заверцѣ́ла да й памча́ла чорт вѣ́дае куды́. Прэ, аж табѣ́ ў вачу́ рабі́ць. Несе их бу́ра бы перцэ́, а Кавалю́ здае́тца, што е́н на мѣ́йсцу, а ґэ́то друґо́е ўсе бежы́ць, леци́ць, як ґо́лаў не скру́ціць Беґу́ць ґо́ры высо́кие, беґу́ць мо́ры ґлыбо́кие, беґу́ць лесы́ це́мные. сенажа́ци вя́зкие, бало́та ґра́зкие, беґу́ць палѣ́тки пере́стые да хаты ку́рные. Тѣ́льки со́нейко я́снае стаи́ць, бы ўко́пано. И ста́ло ено́ сму́тнае, крыва́вае, запла́кало во́чки я́сные да й ли́нуло слезки ґара́чые. Лью́тца ены́, бы́ з ведра́ Свѣ́ту Бо́жаґо пе бачно́. Дава́й дож прыбива́ць их уни́з к земли́. От леця́ць ены́ ўниз, бы камень. Падлецѣ́ли ўжэ саўси́м ни́зко. Кава́ль ду́маў, што як ґры́мнутца ены́ аб зе́млю, та й з кѣ́стачак тѣ́льки клѐк пацечэ́. Тым ча́сам пчо́лка растапы́рыла кры́лца да як заґудзэ́, дак и супыни́ласа да й памча́ла Каваля́ з мы́шкаю праци́ вѣ́тру. От спусци́ласа ена́ ў чужо́м кра́и, ў далёкум ца́рстве, ссадзи́ла Каваля́ й мы́шку з плѣ́ч да й ка́жэ,—як бу́дзе патрэ́ба, та пазавѣ́це мене́, а цепе́р палечу́ я медо́к зби́ра́ць да ў пля́стры налива́ць.—Пры ґэ́стыхъ сло́вах ввум да й палецѣ́ла. Пашо́ў Кава́ль з мы́шкаю, куды́ во́чы ґледзя́ць. Идзе́ е́н, разґля́дае незнае́мы край, аж и сустрака́юць еґо́ та́машные лю́дзи, Вѣ́дамо, лю́дзи—па ўсему́ свѣ́ту еднако́вые лю́дзи: ўсю́дыхъ жыву́ць, ґару́юць, працу́юць, ма́юць свѐй кло́пат, сваю́ пля́ґу. Адны́ ро́дзятца,

друѓие памира́юць. Бо кали́-б лю́дзи не ўмира́ли, таб их тȍльки напладзи́ласо-б, што й земля́-б не стрыма́ла. Кȍжын хо́чэ маць дзе̂так: хо́чэ каб ены́ карми́ли на ста́расци, каб пры сме́рци закры́ли во́чы да каб мали́лиса да памина́ли. Але́ от жыў у тȍм краю́ цар. У еѓо́ быў уда́лы да прыѓо́жы адзи́н сын да ве́льми ѓо́жая дачка́. Цар хаце̂ў паки́нуць сы́ну сва́е ца́рство, а датпы́ выбира́ў прыѓо́жаѓо да ўда́лаѓо жаниха́. Тȍльки не было́ ў тȍм ца́рстве тако́го малайца́, каб е́н спадаба́ўса царэ́ўне. И пачали́ прыезджа́ць к ей жанихи́ з чужы́х ца́рстваў, пачали́ сва́татца; але́ царэ́ўна ўсе не зѓаджа́ласа. Тым ча́сам пашла́ раз царэ́ўна ў сад ѓуля́ць. От ѓуля́е ена́, рве кве̂тки, спева́е да плеце́ сабе̂ вено́к. Сплела́ ена́ вено́к, надзе̂ла на ѓо́лаў да й хаце̂ла йци ў пала́цы; тȍльки ось аткý́ль ни вазьми́са Ба́ба-Яѓа́, касцяна́я наѓа́ на сту́пе е̂дзе, таўкачо́м паѓаня́е да памяло́м сле̂д замета́е. Падъе̂хала ена́ к царэ́ўне, схапи́ла ее̂ ў сту́пу да й памча́ла неве̂дамо куды́. Разска́зваюць ѓэ́то лю́дзи Кавалю́ да й ка́жуць, што пача́ў цар сзыва́ць баѓатырȍў да аси́лкаў, абеца́ў таму́, хто ве́рне царэ́ўну, атда́ць ее̂ за́муж и зраби́ць нача́льникам над уси́м ца́рствам. Разышли́са баѓатыры́ да аси́лки па ўсем све̂це, але́ аб их нема́ й прачу́тки. Тым ча́сам царэ́вич падабра́ў сабе̂ двана́нцаць дзецюкȍў, двана́нцаць малайцȍў са́мых зда́тных да й пашȍў з и́ми ў све̂т шука́ць сестры́—пракра́снае̂ царэ́ўны. До́ўѓо не было́ аб е́н прачу́тки, але́ о́сь верну́ўса адзин дзецюк, верну́ўса з лихо́ю ве̂сцью: разсказа́ў е́н, што Ба́ба-Яѓа́ завезла́ царэ́ўну к Каще́ю Безсме́ртнаму. Той запе́р и трыма́е ее̂ ў каме̂нных пала́цах пад двана́нцацю замка́ми. Ки́нуўса туды́ царэ́вич з сваи́ми малайца́ми, а Каще́й Безсме́ртны як дыхну́ў, дак ены́ ўсе̂ двана́нцаць и ста́ли каме̂нем, а што тȍльки е́н адзи́н стая́ў за вуѓло́м и спа́сса. Пачу́ў то́е цар и запла́каў з жа́лю, але́ не ве̂дае, што пара́дзиць. Пачу́ў то́е Кава́ль и захаце̂ласо ему́ найци́ да аслабани́ць царэ́ўну. Як заду́маў то́е, дак не мажэ́ ни пиць, ни е̂сци, й сон еѓо́ не берэ́. От лежы́ць е́н падлажы́ўшы пад ѓо́лаў булаву́, лежы́ць да ўсе ду́мае. Ду́маў ен ду́маў да й

надумаўса йци к цару, тольки не ведае, што ему сказаць. Ведамо. Каваль: ен николи й не бачыў цара, а не то, каб што. От лежыць ен, аж падбегла тая мышка да ўсе хвосцикам казлычэ его пад носам.

— Аткасниса! Чаго ты прычапиласа?—Кажэ Каваль, да й узяў ее ў жменю. Тым часам мышка высунула з жмени мордачку да й пачала гаварыць.

— Не бойса цара—кажэ ена,—ен таки-ж чалавек, бы й ты. Не бойса, тольки вазьми мене з сабою: я буду табе падказваць, бо я ведаю, гдзе царэўна. Ведамо, мне замкоў нема-ж —я ўсюдых пралезу. Царэўна ў тых палацах, гдзе ты наступиў мне на хвост. Кащей Безсмертны запъер и трымае ее, каб нихто не аслабаниў.

Абрадуваўса Каваль, пасадзиў мышку за пазуху да й пашоў к цару. Ци доўго, ци мало ен ишоў, тольки ось прыводзяць его к цару ў палацы. Спалохаўса Каваль, як убачыў цара, так спалохаўса, што не ведае, чаго ен и прышоў, але тут мышка давай ему шаптаць с-за пазухи да скрабциса, каб ен ачухаўса. Прыслухаўса Каваль, што ему падсказвае мышка да й давай казаць цару смело, бы свайму брату. Выслухаў его цар да й велеў даць ему навыбар самаго лепшаго каня. Падзякуваў Каваль да й пашоў у царськую стайню выбираць сабе каня. Тольки не мажэ выбраць, бо як палужыць на спину руку, дак кожын конь и падзе на калени. Сказали аб том цару. От той велеў атдаць Кавалю свайго каня, але мышка шэпчэ, каб Каваль прасиў таго коня, на каторум ездзила царэўна. От Каваль и давай прасиць, каб ему дали таго каня. Пачуў аб том цар, падумаў трохи,—бачыце, ему вельми шкода царэўнинаго каня,—да й велеў атдаць Кавалю таго самаго каня, на каторум ездзила царэўна. Сеў Каваль на каня, прывезаў к седлу булаву, пасадзиў за пазуху мышку да й паехаў у свет. От едуць ены да едуць. Нахапиласа ноч, а тут цемны лес кругом и канца ему немаш. Спемнело, хаць ты воко выкаль. Нельга ехаць далей. От Каваль слез з каня, прывезаў его к дубу, а сам выкрасаў

аґню, упъёк ламáчъе да й лёґ спачываць. Лёґ да й заснўў, бы кáмень. Спиць Кавáль и не чўе, што мышка з канём жўпяць. Тым чáсам разсказáла мышка каню, ґдзѣ царэ̆уна да й пасылáе еґó, каб ен збѣ́ґаў за нóч туды́ да прынёс вѣ́стачку. Рад кőнь, хóчэтца ему́ убáчыць царэ̆уну, алé не мажэ́ атарвáтца, бо Кавáль вéльми мőцно прывезáў. Тым чáсам мышка ўзлѣ́зла на дуб да й пераґрызла пóвад. Пусциўса кőнь бѣ́ґци да так сунўў, што й птўшка не даґóниць. Прыбѣ́ґ ён к тőй ґары́, ґдзѣ́ были́ палáцы Кащéя Безсмéртнаґо, да й давáй биць капытáми. Малóциць ён аб камѣ́нную ґóру, аж енá трасéтца, бы её трáсца калóциць, алé стаи́ць мőцно. Бáчыць кőнь, што ничőґо не зрóбиць, не разабъé ґары́, от и пабѣ́ґ ён шукáць, ци немá щы́лины. Вѣ́дамо, ва ўсём знайдзетца щы́лина, абó якáя скáза, тőльки трэ дóбрэ пашукáць. Забѣ́ґ ён з друґóґо бóку да й напаткáў тўю щылину, што Кавáль зрабиў як удырыў булавóю аб ґóру. Пусциўса бѣ́ґци кőнь у тўю щы́лину, ўмчáўса ў сáмые палáцы, ґрымаци́ць там, бы ґрőм. Пачўў ґэто Кащéй Безсмéртны, сѣ́ў з Бáбаю Яґóю на стўпу да й паѣ́хаў насустрéк. Тым чáсам ось кőнь и наскóчыў на их и давáй капытáми малаци́ць па чőм папáло. Бáчыць Кащéй Безсмéртны, што тут не перэ́лиўки, схапиў таўкáч да як удырыць каня́ па маскаўни́, дак з таґó й дух выперло Павалиўса кőнь, задрыґаў наґáми да й выпруциўса. Выщарыў зўбы Кащéй Безсмéртны, зараґатáў бы жарабéц да й паѣ́хаў з Бáбаю Яґóю аґлядáць сваѣ́ палáцы. От ѣ́дуць ены́ да ѣ́дуць и бáчаць, што палáцы хтóсь развернўў и ў сáмőй ґары́ зрабиў щы́лину. Давáй тут Кащéй Безсмéртны зарабля́ць тўю дзирку. От пачáў ён пéрш ламáць да цяґáць туды́ камѣ́не. Ци дőўґо ци кóратко ён тóе рабиў, тым часóве даў Бőґ дзень. Прахапиўса Кавáль да зирнўў, аж немá каня́. А мышка маўчы́ць, зўбы спяўшы, ничőґо не кáжэ,—байтца, каб Кавáль ат злőсци не забиў её. Патужы́ў, патужы́ў Кавáль, пасадзиў мы́шку за пáзуху да й пашőў пѣ́шки. Алé, вѣ́дамо, ў цéмнум лѣ́се, ў нéтры,—йдзе, йдзе и ўсе на аднőм мѣ́йсцу крўцитца. Заблудзиўса Кавáль, сѣ́ў на калóдзе да

й ду́мае а прыѓодзе. Узду́маў е́н пра пчо́лку да й дава́й ее̑ зваць на памо́ѓу. Пачу́ла пчо́лка, прылеце̑ла да й панесла́ Каваля́ з мышкаю на то́е ме̑йсцо, ѓдзе̑ лажа́ли дрэ́бы кавале́ваѣ кабы́лки От падняла́са пчо́лка паверх ле̑су, перанесла́ це́раз вели́кие бало́та, це́раз высо́кие ѓо́ры за си́нее мо́рэ да й апусци́ласа ў ле̑се кале́ ѓары́. Уба́чыў Кава́ль дрэ́бы сваѣ кабылки да аж запла́каў ат жа́лю. Даста́ў е́н з кишэ́ни пля́шачку з жыво́ю вадо́ю да й дава́й палива́ць тые ко́сци. То̑льки пакрапи́ў, аж ось так и расце́ мя́со, расце́ шку́ра, вы́расла це́лая кабы́лка, як была́. Пали́ў е́н ещэ́ раз другі́,—дак от кабы́лка пы́рхнула да й паднела́са на но́ѓи. Падзя́куваў тут Кава́ль пчо́лцы, се̑ў на кабы́лку да й пае̑хаў, куды́ пака́звала мышка. От зноў падъе̑хаў е́н к ѓары́, найшо́ў ту́ю щы́лину да й пача́ў абпратца па каме̑ню. Спатыка́етца кабы́лка, бо Кащэ́й Безсме́ртны наки́даў тут каме̑ня да й заѓарадзи́ў даро́ѓу. Схапи́ў ѓэ́то Кава́ль булаву́ да й пача́ў пракла́дваць даро́ѓу. Як ре́зне е́н булаво́ю, дак аж ѓо́ры трасу́тца. Пачу́ў то́е Кащэ́й Безсме́ртны, пачу́ў, што й на его́ прышло́ ли́хо да й пае̑хаў насустре́к. От зъе̑хались ены́ да й дава́й би́тца. Би́лиса, би́лиса, аж ѓо́ры растры́бушыли, развернули пала́цы, але́ нихто́ адзи́н друѓо́ѓо не мажэ́ асилиць. Ба́чыць Кащэ́й Безсме́ртны, што Кава́ль разби́ў сту́пу, палама́ў таўка́ч и чуць ужэ́ не ре́знуў булаво́ю Ба́бу Яѓу́, ба́чыць, што не мажэ́ адале̑ць, пусци́ўса наўцекача́, схапи́ўшы Ба́бу Яѓу́ на бере́ме. Зирну́ў Кава́ль, што Кащэ́й Безсме́ртны пусци́ўса ўцека́ць, не ки́нуўса его́ даѓаня́ць, а пае̑хаў у пала́цы, шука́ць царэ́ўны. От е̑дзе е́н да е̑дзе, а мышка пака́звае даро́ѓу, аж ба́чыць, лежы́ць вы́пруциўшыса его́ ко̑нь. Зле̑з тут Кава́ль з кабы́лки, даста́ў з кишэ́ни пля́шачку з жыво́ю вадо́ю да дава́й палива́ць е́ю каня́ Ажы́ў ко̑нь, падня́ўса на но́ѓи да й заржа́ў ат радасци. Пачу́ў то́е Кащэ́й Безсме́ртны и ба́чыць, што Кава́ль е̑дзе про́сто туды́, ѓдзе̑ на семи́ замко̑х седзе̑ла царэ́ўна, зраби́ў у пала́цах таку́ю цемна́ту, хаць ты во́ко вы́каль, ничо́ѓо не бачно́. От Кава́ль развеза́ў на ѓалаве̑ хуста́чку, дак со́нейко й засвеци́ло, стало видно́, хаць ты

ґолки збирай, да й паѣхаў далей. Але ось падъезджае ен к тым палацам, ґдзѣ царэўна, аж усѣ дзверы зачынены да й завалены камѣнем. Злѣз тут Каваль з кабылки й пачаў аткидаць тое камѣне Аткидаў трохи да й бачыць, што дзверы залѣзныя, таўщэразные, а на их па семи замкоў. Што тут рабиць. Думаў ен, думаў да й паслаў мышку праведаць, ґдзѣ царэўна. Пабѣґла мышка; вѣдамо, ена ўсюдых знайдзе щылину да й праплищытца Панемалум часе вернуласа мышка вельми смутная да й кажэ, што Баба Яґа замарозила царэўну. Пачуў тое Каваль, абазлиуса, схапиў булаву да й давай пѣрыць у сцѣну. Як рэзнуў раз-друґи, дак сцена й разсыпаласа, бы порхаўка. Кинуўса Каваль туды, аж бачыць—лежыць тут царэвич, бы пласт. Баба Яґа абернула еґо ў камень. Лежыць царэвич, бы жывы, а кале еґо поруч у рад лежаць адзинанцаць еґо дзецюкоў, удалых баґатыроў. Усѣ ены, бы зроблены з каменя. Аґледзяў Каваль, памацаў ґэтых камѣнных людзей да й пашоў к царэўне. От уходзиць ен у тые ледзяные палацы, аж там усе з леду, а моо ґэто тольки ўсе паравернуласо ў лед. От стаяць ледзяные дзераўляки; ены абиневели, батцэ ў велики марѡз. Пад ґэстыми дзераўляками стаиць ледзяная караваць, на ей полаґ, батцэ з инею сплецены. На каравацп лежыць царэуна, ена ўся й прасвѣчвае, вѣдамо ледзяная, тольки сверху паў иней. Падышоў Каваль да як ґлянуў на царэўну, дак не мажэ й ачбў атвесци ат еѣ, такая ена ґожая й так ему спадабаласа. От стаиць Каваль на аднѡм мѣйсцы, бы ўкопаны, а сонейко з ею лба так и свѣциць, так и ґрее царэўну. И пачала ена памаленьку таяць да таяць, пачаў лед перш белѣць, а потым чырванѣць. Па немалум часе лежыць царэуна, бы жывая, тольки не дышэ. Дастаў тут Каваль з кишэни пляшачку з живою вадою да й пакрапиў царэўну. Страпенуласа ена, открыла вочы да й падняласа. Тым часам растаў лед ва ўсих палацах. От адзѣласа царэуна, сѣла на свайґо каня, да й паѣхали ены туды, ґдзѣ лежаў царэвич. Убачыла царэуна брата да давай над им плакаць да ўбиватца. Думаў, думаў Каваль,

што тут парáдзиць, да ничóго не прыдýмае. От стайць éн да глядзйць, як царэўна ўбиваéтца. Тым часóве сóнейко грéе да грéе. От и пачáў кáмень мякчáць, пачáў царэвич и ўсѣ его тавáрышы зноў рабитца людзьмй. Убáчыў гэто Кавáль, дастáў з кишэни пляшачку з жывóю вадóю да як пакрапиў их, дак ены́ й ачýхалиса да й ажыли Мнóго тут было́ рáдасци, мнóго слéз. От и сабрáлиса ўсѣ ены́ ў дарóгу. А мышка зноў залѣзла к Кавалю за пáзуху да й седзйць. Вы́бралиса ены́ з палáцаў да й паѣхали лѣсам. От ѣдуць ены́ да ѣдуць. А лѣс велйки, што й канцá емý немá. Тóльки чýюць ены́, аж Кащéй Безсмéртны за и́ми гóнитца. Ат тагó и́мпату ўсхадзилаaса бýра; лѣс тращы́ць, лóмитца, от так и кладзéтца лóскам. Вы́ступиў тут на сустрéк Кавáль, аж Кащéй Безсмéртны так и кинуўса на егó да не ўспѣў насѣсци, як Кавáль сперазáў егó булавóю. Ат пéршаго рáзу ў Кащéя Безсмéртнаго трэснула галавá, да й раскалóласа на дзвѣ чáсци. От и пачали Кавáль с Кащéям тýзатца. Дóўго ены́ вадзилиса. Гдзѣ стýпяць, дак там зрóбитца такáя вы́скаць, або вóзеро, што й да тых час ещэ мóжна бáчыць их у лѣсе. Алé ось Кавáль папнýўса да й падгибáў Кащéя пад себé, наступиў емý на гóрло да й падняў булавý, каб расквáсиць емý маскаýню. Бáчыць Кащéй, што прышли емý капцы́, давáй éн прасйтца; абецáе, што бóльш никóли не бýдзе чапáтца. а пачнé жыць тóльки ў балóце. Пусциў егo Кавáль да й паѣхаў скарéй к царý, каб абрáдаваць егó, што нашлиса дачкá й сын. От прыѣхали ены́. Цар велѣў зрабиць свя́то ва ўсéм цáрстве, атдáў за Кавалá зáмуж дачкý царэўну да й зрабиў егó начáльникам над усими начáльниками. Пачáў Кавáль жыць да пажывáць да дабрá нажывáць. Тóльки мышка так и асталáса у егó за пáзухаю. Кали Кавáль рóбиць дабрó, та енá цихенько седзйць, а як пачнé рабиць лихо, та мы́шка скрабéтца за пáзухаю, аж сéрдце дрáпае вóстрыми кипдзюрáми. Дóўго жыў Кавáль, мнóго дабрá зрабиў éн у тóм цáрстве. Ещэ й цепéр егó лю́дзи паминáюць. Лю́дзи кáжуць, што Кавáль да сáмаѣ смéрци сам кавáў и других вучы́ў кавáць залѣзо.

Ен казаў, што ў каваля па локаць руки ў золаце. От с таѣ пары й пачали людзи каваць залѣзо да рабиць сабѣ ўсе, што трэ. Але як ни добрэ было Кавалю з маладою жонкаю ў томъ царстве, як ни паважали его, ен усе таки не забываў сваю радзину. От раз зрабиласо ему так мoташно, што й жыць не мажэ: ходзиць засмуцоны, бы пад землею. Пытае его жонка, чаго ен таки смутны. Маўчаў ен, маўчаў да й кажэ, што ему хочэтца правѣдаць сваю родную матку, хочэтца хаць разок зирнуць, што робитца ў родном селѣ. Давай тут жонка прасиць Каваля, каб ен паўез еѣ к сваей матцы. Сабраўса Каваль у великую дарогу, забраў з сабою жонку да й паѣхаў. Доўго ены ѣхали, доўго блукали па свѣце, нарэшце прыбилиса ў тое село, гдзѣ жыла матка. Састареласа ена, згорбиласа да й высахла ў щепку, а ўсе плакала па сыну, ўсе хацѣла ўбачыць его перад смерцю От прыѣхаў Каваль, нашоў матку ў старой хатцы да й кинуўса на шыю, давай еѣ абдымаць да цалаваць. Узрадуваласа матка, пачала плакаць,—не мажэ й слова вымаварыць ат радасци. От пагасцяваў там Каваль доўги час, научыў сусѣдзей, як каваць залѣзо да рабиць уселякае нажэндзе, а потым забраў матку да й паѣхаў у чужы край, у тое царство, гдзѣ ўсѣ людзи роўно працуюць, с працы жывуць, адзин другому памагаюць, а затым и лиха не маюць.—Моо й праўда, што е таки край и такие разумные да добрые людзи, а моо ены гдзѣ кольвек только ещэ будуць. Пабачымо ци бо пачуемо, кали будзем жывы.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

---

73. Ганья.

Бачыце, цепер у нас такая павадэнца, што пакуль цягнетца весѣлье, малады й маладая трэйко кланяютца кожнаму, каго сустрэнуць. Маладыѣ паклонятца, а стречны паблагаславиць их щасцем да доляю, трэйко пацалуетца з ими да тагды только йдзе

да́лей. Дак от слу́хайце, раскажу́ вам, атку́ль пашла́ та́я павадэ́нца

Ко́лись от тут недале́чко жыў адзі́н ве́льми баѓа́ты чалаве́к. Быў ен такі́ баѓа́ты, што й не знаў, ко́лько ў еѓо́ дабра́. Але-ж пра́ўду ка́жуць, што нема́ тако́ѓо чалаве́ка, каб е́н спрэс быў щаслі́вы. Бо калі баѓа́т, та хво́ры сам або жо́нка; а як баѓа́т и здаро́ў, та дзеце́й нема́, або́ е, да неўда́лые ци лихи́е. От ѓэ ўсе людзи ма́юць якое ко́львек нещасце. На то́м и све́т стаи́ць, бо чаѓо́-ж бы й жыць, калі́-б не было́ чаѓо́ хаце́ць? Але́ Бо́ѓ так даў, што чалаве́к за́ўжды ма́е нещасце й хо́чэ, каб еѓо́ не было́. От затым и жыве́ ў бедзе да ўсе чака́е ле́пшае жы́дки. Гэ й той баѓа́ты чалаве́к мно́ѓо маў уселя́каѓо дабра́, але ў еѓо штось дзе́ци не ѓадава́лися. Нарэ́шце асталаса адны́м-адна́ дачка́ да и та́я яка́ясь неўда́лая. Ена ўжэ была́ ў ле́цях, а за́муж нихто́ не берэ́, бо ба́цько ўсе выбира́ў сабе́ баѓа́таѓо да ўда́лаѓо зя́ця. Але́ ѓдзе знайци́ тако́ѓо малайца́, каб е́н быў и баѓа́ты, й ѓо́жы. Як баѓа́ты, та рыла́ты, а як уда́лы да ѓо́жы на вид, та ѓо́л, як бич.

Паспе́ла дзе́ўка, бы по́рхаўка, от здае́тца чапни́, дак и разсы́плетца. Ве́дамо, пры баѓа́цю да ў раско́шы дзе́ўка аж пу́каетца— хо́чэ за́муж, а малайца́ нема́ Бо не о́чы-ж драць, калі́ не хо́чуць браць. Мо́о й затым абеѓа́юць ее́, што ена́ адна́ ў ба́цька. Бо людзи ка́жуць, што едына́чка, та ку́рва ци лайда́чка. Дзе́ля таѓо́ дзе́ла мо́о хто й пасва́таў-бы, але́ ко́жын ду́мае, што баѓа́ч зрэку́зуе й не отда́сь дачки́ за бе́днаѓо. От ѓэ й астава́ласа дзе́ўка без спо́сабу. Мо́о-б ена́ ѓэ ў дзе́ўках астала́са й на ўсе жы́це, але́ ось там недале́чко жыў ме́льник. Не то, што-б ве́льми, але ат сабе́ тро́хи быў баѓа́т е́н. Ве́дамо, ме́льник; е́н за́ўжды не бе́дны, бо не ма́е лихо́ѓо ѓо́ду: ци зраджа́й, ци не зраджа́й, а ме́льнику бу́дзе. От у таѓо́ ме́льника быў дзецю́к. Ужэ-б даўно́ ему́ пара́ было́ жани́тца, але́ е́н быў якісь неўда́лы й до́ўѓо личы́уса ўсе ещэ́ падшпа́ркам. Але́ ось нарэ́шце ўзду́маў ме́льник жани́ць и сваѓо́ сы́на. Засла́ў е́н свато́ў к дзе́ўцы таѓо́ баѓача́ нибы́то знаро́к, адно́ж той и зѓадзи́уса атда́ць сваю дачку́ за ме́льникаваго сы́на.

От давáй мéльник лáдзиць весѣ́лье, давáй збирáць дружы́ну да жани́ць свайѓó дзецюкá. Назбирáласо на тóе весѣ́лье людзéй мóо з паўсвѣ́ту: бó кáжуць жэ,—ѓдзѣ чу́юць, там и начу́юць; ѓдзѣ е пачóстка, там пéўне ат ѓасцéй немá атбóю. Алé не спадабáласо ни баѓачу́, ни мéльнику, што ў их так баѓáцько ѓасцéй, што вéльми мнóѓо йдзе ўселя́каѣ пачóстки, й пачали́ ены́ ѓáрдзиць дóбрыми людзьми́. От у баѓачá да ў мéльника та немá мéду саладзéнькаѓо, та немá пи́ва хмельнéнькаѓо, та немá ту́ку, немá сáла, та ѓарéлки не стáло. И пачали́ ѓóсци ѓамани́ць да скупы́х баѓатырóў ѓудзи́ць. Пачу́ли тóе баѓачы́ да й пачали́ ѓасцéй зневажáць да з ѓаспóды выѓаня́ць. А ту́т на весѣ́льи быў якы́сь падарóжны. Нихтó не вѣ́даў, атку́ль ён и яки́ ён чалавѣ́к. Тым чáсам то быў вели́ки ведзьмáр. Заѣ́ўса ён на баѓачóў да й абярну́ў усé весѣ́лье ў ваўкалакóў. От и стáла с таѣ́ дружы́ны вóўчая ѓанья́; папéрласа ена́ з вéски перш на асéлицу, а пóтым у хмы́зник да ў лѣс. С таѣ́ пары́ аж да тых час бѣ́ѓае ѓанья́ ваўкалакóў—ѓэто тóе весѣ́лье. Убáчыли тóе лю́дзи да й пачали́ з таѓó чáсу ўсих шанавáць на весѣ́льи да частавáць та мéдам саладзéньким, та пи́вам хмельнéньким. Пачали́ з таѣ́ пары́ маладу́е ўсим клáнятца трэ́йко да земли́, каб ты́е паблаѓаслави́ли щáсцем да дóлею да вѣ́кам дóўѓим.

Дак от атку́ль у нас пашлá ѓэ́стая павадэ́нца.

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

---

74. Светы чалавѣк.

Жыў сабѣ́ адзи́н светы́ чалавѣ́к. Жыў ён як усѣ́ лю́дзи: гаравáў, працавáў, а достáткаў не маў. Жыў ён ци́хенько, ѓледзѣ́ў себé да свайго хаджáйства; никóму не раби́ў ли́ха, дак и еѓó не чапáли лю́дзи. Перш з еѓо смея́лиса, стрóили кпинки, алé ўбáчыли, што светы́ чалавѣ́к мóўчки ўсе знóсиць, заличы́ли еѓó шалапавáтым ду́рням и атчапи́лиса. Жывé ѓэ светы́ чалавѣ́к, от як-бы еѓо й на

свѣ́це немаш. Пачали́ лю́дзи бо̂льш прыґля́датца да й дагада́лиса, што ґэто светы́ чалавѣ́к, бо нихто ў селѣ́ не мо̂ґ сказа́ць ничоґо лихо́ґо пра таґо́ чалавѣ́ка. Аднаґо́ лю́дзи не магли́ разшало́паць,— чаму́ ґэто светы́ чалавѣ́к не хо́дзиць у цэ̂ркаў и не хры́сцитца, як уба́чыць папа́. От пашли́ лю́дзи к папу́ й давáй еґо́ пыта́ць, чаму́ ґэто той чалавѣ́к не хо́дзиць у цэ̂ркаў. Паслу́хаў их по̂п, распыта́ў пра таґо́ чалавѣ́ка да й ка́жэ, што е́н за то́е бу́дзе праклятьí.—Э, е́н светы́,—ка́жуць лю́дзи.—Кали-б е́н быў светы́, таб е́н хадзи́ў у цэ̂ркаў и мене́-б шанава́ў.—Паслу́хали то́е лю́дзи да й ду́маюць, што мо̂о й пра́ўду ка́же по̂п. От раз лю́дзи й пашли́ з цэ̂ркви про́сто к таму́ светóму чалавѣ́ку паґлядзѣ́ць, што е́н ро́биць у той час, як усѣ́ мо́лятца ў цэ̂ркви. Прыхо́дзяць ены́, ажно́ светы́ чалавѣ́к зайшо́ў у ґумно́, ски́нуў сви́ту, распераза́ўса да ўсе ска́чэ цераз запѣ́ру. Што ты ро́биш?—пыта́юць светóґо чалавѣ́ка лю́дзи.— Малю́са,—атка́звае той. Чаму́-ж ты малитца не йдзеш у цэ̂ркаў?— Бо там нѣ́льґа мали́тца, там лю́дзи не мо́лятца, а то̂льки ґрéшаць. Зноў пашли́ лю́дзи к папу́ да й разсказа́ли, што ены́ ба́чыли й што и́м каза́ў светы́ чалавѣ́к. От по̂п сам пашо́ў к светóму чалавѣ́ку да й давáй еґо́ ўмаўля́ць, каб ен хадзи́ў мали́тца ў цэ̂ркаў. Послу́хаў папа́ светы́ чалавѣ́к, адзену́ў но́вую ку́рту, абу́ў но́вые ла́пцы да бѣ́ленькие, бы снѣ́ґ ану́чы, падпераза́ўса по̂ясам да й пашо́ў у цэ̂ркаў. Цэ̂ркаў стая́ла за бало́там. Да еѣ́ лю́дзи йшли па ґрази́ па са́мы по̂яс. Мужчы́ны раззува́лиса, скида́ли ґанави́цы, а жанки́ паднима́ли андараки́ да саро́чки па са́мы пуп. Сам по̂п скида́й наґави́цы, падбира́ў по̂лы да й меси́ў ґрязь ґо́лыми цы́ґлами па са́мы по̂яс. А паґа́ны быў той по̂п е́н таґды́ йшоў у цэ̂ркаў, як туды йшли дзѣ́ўки й маладзи́цы. От якра́з уци́снетца памиз их да й шутку́е, як тые рука́ми закрыва́юць сарамацѣ́не. От идзе́ по̂п з жанка́ми па ґрази́ па са́мы по̂яс; выкве́цалиса ены́ ў ґразь, бы чэ̂рци, а светы́ чалавѣ́к идзе́ сабѣ́ ў сваи́х но́вых ла́пциках и ў белю́сеньких ану́чах па верх ґрази́, бы па сухо́й земли. Падзиви́ўса по̂п, спужа́ўса, аж шуткава́ць з ба́бами паки́нуў. От падышли́ ены́

к цэркви, абмыли ў калюзе трохи ґрязь, паадзевалиса да й улезли ў цэркаў. Пачаў поп служыць; пачали людзи малитца, але й поп и людзи ўсе думаюць аб том, што бачыли, як ишли ў цэркаў, пра Боґа саўсим забыли. Спрэсу ўсе хрысцятца й молятца, а думаюць аб друґом. Стаиць светы чалавек у цэркви да пазирае на людзей. Але ось зирнуў ен у куток да й бачыць, аж там чорт ухапиў наґами й зубами валовую шкуру да ўсе разцяґвае ее. Выцяґ чорт валовую шкуру, каб ена была большая да й пачаў на шкуры записваць люцкие ґрахи. Смех апанаваў светоґо чалавека, кали ўбачыў ен, як чорт крывитца да корчытца, каб расцяґнуць больш валовую шкуру. Убачыў чорт, што светы чалавек засмеяўса, хап и еґо записаў на валовуй шкуры. Значытца, й светы саґрашыў. Вышли людзи з цэркви, мужчыны паскидали ґанавицы, а жанкі пападнимали андаракі й сарочки па самы пуп да й пацяґлиса да гасподы. Брадзе й поп разам з жанками, брадзе да тольки аблизваетца. Пашоў и светы чалавек да ґасподы разам з друґими ў свайх новеньких лапциках и белюсеньких анучах. Але от тольки ен вайшоў у ґразь, як ноґи завязли чуць не па костачки. И парабиў ен у ґразь сваe новенькие лапцики й белюсенькие анучы. Пазнаў тут светы чалавек, што ен у цэркви не памалиўса, а тольки наґрашыў. От вышли ены з балота, абмылиса трохи ў калюзе, паадзевалиса й паабувалиса да й хацели йци да ґасподы, але ось поп, зирнуў на светоґо чалавека да й кажэ: „светы ґэто чалавек, бо як ен малиўса ў ґумне, та йшоў цераз балото па ґрази ў новеньких лапциках и чысценьких анучах, а як памалиўса ў цэркви, та тольки наґрашыў, бо, от бачыце, як заквецаў у ґразь сваe новенькие лапцики и беленькие, бы снеґ анучы". Пакланиўса тут поп светому чалавеку да самаe земли.—Малиса—кажэ,—як малиўса, мабыць твая малитва прыемней Боґу.

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

---

75. Чортаво балото.

Ба́чыце, яка́я тут не́тра, якая тхлань: це́лы ты́дзень идзи́, та да краю не дацяґнешса. Даўне́й тут была́ чы́стая вада́, ўсе леле́ло да блищало на со́нейку, бы шкло. Бо́ґ е́здзиў па вадзе́ ў чоўне да аґляда́ў, ґдзе зраби́ць зе́млю. От раз плыве́ Бо́ґ у чо́ўне да мерку́е, як и ґдзе што ўро́ндзиць; а тым часам чорт закме́ў Боґа да й паплы́ў за Им на́зиркам: падплыве к чоўну да ат стра́ху нырне́ ў во́ду бы нырэ́ц и зноў плыве. Ве́льми ему хо́чэтца пранюхаць, што Бо́ґ ма́е рабиць. Ба́чыць Бо́ґ, што чорт прэ́тца сле́дам, як тая мара́, бачыць да ўсе маўчы́ць. От пасе́яў Бо́ґ землю,—сыпану́ў жме́ню земли, а тут ра́зам разступи́ласа вада, й высунуласа суха́я земля з ле́сам, з полем да с сынажацями. Гледзи́ць чорт да то́льки дзи́витца, атку́ль то́е ўсе берэ́тца. От плыве́ Бо́ґ да жменяю з чоўна бы з сеўка разки́двае насе́не. Прыґледзе́ўса к таму́ чорт и ду́мае сабе́: „отож, каб мне́ даста́ць ґэстаґо насе́ня,—нараби́ў бы я мудре́й Боґа, нарабиў бы так, што сам ницы́пар пазави́дуваў бы“. Паба́чыў Бо́ґ ду́мки чорта да й пазво́лиў ему ўзяць таґо́ насе́ня От паверну́ў Бо́ґ чо́вен да яку́рат на чорта й наткну́ўса. Ско́рчыўса чорт, хаце́ў шмы́ґнуць у воду да зачапи́ўса хвасто́м за пастырча́к да й кру́цитца на виру́ бы вьюнъ. Тым ча́сам Бо́ґ атверну́ўса ў другі́ бо́к, а чо́вен плыве́ кале́ са́маґо чо́рта. Ско́рчыўса чорт, што божы човен апъе́к ему бо́к, але тым ча́сам ухапи́ў з чоўна жме́ню насе́ня, а каб Бо́г не ўба́чыў таґо́ да не атабра́ў, хуце́нько ки́нуў насе́не ў ґо́рло да й глыну́ў. Не закме́циу нибы́то Бо́г и паплы́ў да́лей. Рад чорт и ат ра́дасци суну́ў у бо́к, да́лей ат Боґа. Але ось ба́чыць чорт, што еґо чэ́раво расце́ бы на дро́жджах, расце, аж бо́ки распира́е. Расце чэ́раво ўсе бо́льш и бо́льш, расце так, што чо́рту не́льґа й ды́хаць. Дава́й ґэто е́н блева́ць да выплю́ўваць тое насе́не. Куды́ плю́не чорт, дак там и вы́расце корч або́ куст лазы́. Прэ́тца чорт па вадзе́ да так блюе́, што аж з еґо вантро́бы выпира́е А тым часам усе бо́льш и бо́льш па вадзе́ заплю́ўваетца чо́ртава

лазá. Мóташно чóрту, хóчэтца ему́ ўсе насе́не з жыватá вы́кинуць от ен снуé па вадзе́ бы паву́к да ўсе блюé. Па не мáлум часе ўся вадá закры́ласа лазóю да ракíтаю. Зачапиўса чорт за лóзу да як ры́ґнé, дак усé насе́не й вы́скачыло з жыватá ў воду, й пачалá з еґо расци́ ўселя́кая непатрэ́бная травá. Запаґáниў чорт чы́стую вóду й абернуў ее́ ў паґáнае чóртаво балóто. Зирну́ў Бóґ, што нарабиў чорт да аж за ґóлаў схапиўса. Што тут рабиць, што пачáць!? Як тут лóзу вы́ґубиць? А, ве́дамо, куды́ ўжэ лазá ўплю́нетца, дак ее́ ничы́м не вы́ґубиш. От паслаў Бóґ сóнейко, каб енó спали́ло чóртаву лозу. Прыпеклó сóнейко, наґре́ло вóду,—а лазá хаць бы што,—ещэ́ ле́пш расцé. Узелáса лазá па балóце бы везе́ль. Бáчыць сóнейко, што ничóґо не парáдзиць, ки́нуло пекци́ й пашло к Боґу на скáргу. И веле́ў Бог марóзу вы́маразиць паґáные кусты́. Хапиў марöз, тращы́ць, ґнецé. Замéрзла вадá, а лазá й ни ґáтки,—седзи́ць сабе́ да весны́ чакáе. Што ни рабиў марöз, як не сцискáў лазóвые карчы, марóзиў, аж з си́лы вы́биўса й пашóў к Богу на скáргу. Паду́маў, падумаў Бóґ да й веле́ў, каб лазá аставáласа расци́; бо, ве́дамо, пóкуль зґу́биш лихóе, та дóбрае самó зґи́не. От расцé лазá й закрывáе не тöлько балóто, але й сынажáци, а то ле́зе й на пóле. Пабáчыў чалаве́к, што лазы́ так мнöґо да й ду́мае сабе́: „ци не мöжна й з лазы́ зраби́ць што кóльвек патрэ́бнае“. От пашóў чалаве́к у чóртаво балóто, наздзирáў з лазы́ кары́ да й давáй виць вераўки. Вье да пе́сни паé. Убáчыў тое чорт и спужáўса. Падхóдзиць ен к чалаве́ку да й пытáе.—Што ты, чалаве́чэ, рóбиш?—Хибá табе́ бе́льма павылáзили, што не бáчыш,—кáжэ чалаве́к.—Бáчыць та я дóбрэ бáчу, але не ве́даю, на вöшто табе́ ґэ́тая рабóта.—А от дай пакажу́.—Узяў ґэто чалаве́к да й скрампавáў чóрта лычакóм да й прывезáў еґó к таўщэ́разнаму ду́бу.—От цепéр,—кáжэ чалаве́к,—давáй я цебе́ вы́леґчаю.—Спалóхаўса чорт да як рванéтца, дак и вы́рваў ду́ба з карéнем, вы́рваў да й сунуў наўцекачá з ду́бам рáзам. Бежы́ць па балóце, а дуб карéнем да сукáми баранýе зéмлю, тöльки вы́скаци да ґлыбóкие равы́ ззáду

астаю́тца. А чалаве́к сёў сабе́ на ра́ла таго́ ду́ба да пакрыквае на чо́рта: „верта́й на ле́во, верта́й на пра́во!“—Бе́гаў, бе́гаў чорт, узверну́ў усе́ бало́то. От ат таго́ да тых час ещэ́ стая́ць па бало́це выжары́, азеры́ны да вы́скаци. До́ўго круци́ўса чорт, паку́ль вы́лузаўса з веро́вак, а по́тым як суну́ў наўцекача́, дак чорт ве́дае куды́ й дзе́ўса. Аста́ўса тут чалаве́к и заўлада́ў чо́ртавым бало́там Дава́й ѓэто е́н цераби́ць ло́зу, драць ее́ та на ла́пци, та на лычаки. Вы́церабиў тро́хи, пабудава́ўса серо́д ле́су, ўскарпа́ў поле, вы́сек на сынажаць, але да тых час ничо́го не парадзиць з чо́ртавыми карча́ми: вы́сечэ адзин, та дзесяць вырасце. И астае́тца чортаво бало́то чо́ртавым балотам да тых час·

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

---

76. Палешук и чорт.

Лю́дзи ка́жуць,—ко́лись дак гэ: дзе́ бало́то, там и чорт Але не то штоб то́лько ў бало́це, куды́ ни зирни́, ўсю́ды тра́пиш ѓэ́стую не́чысь Вада́ ба́ло кишы́ць чарценя́тами. То́льки на Вадо́хрыщэ (Боѓоявленіе), як павыѓаня́юць чарце́й з вады́, та ены́ таўку́тца ў паве́тры да паднима́юць таку́ю хви́лю, што ни пи, ни е́ж и з хаты не ле́зь, Зaты́м-то па Вадо́хрыщы за́ўжды быва́юць ѓане́бные меце́лицы. Ча́сам усхо́дзитца така́я круце́ль да завиру́ха, што спрэ́су пазано́сиць вески. Беда́ таѓды́ ў по́ли: све́ту Бо́жаѓо не бачно́. Пападу́тца ў по́ли лю́дзи, дак нечы́сцики закру́цяць их кале́ са́маѓо села́ да й заѓу́бяць. Ба́ло баѓа́цько хвиля ни́щыла людзе́й. Цепе́р ужэ́ ре́дко быва́е ѓане́бная завиру́ха, бо меньш ста́ло чарце́й, а чарценя́та спрэ́су перавели́са: их Илья́ паби́ў ѓро́мам, а друѓи́е не раджа́ютца. Перш чэ́рци были́ ве́льми пло́дные, але Палешу́к перахитры́ў и чо́рта. От як то́е было́. Абабра́ў сабе́ Палешу́к седзи́бу пами́ж бало́та кале́ раки́ да й дава́й там раби́ць будо́ўлю. Збудава́ў е́н сабе́ перш стано́к, накла́ў аѓню́, налави́ў вьюно́ў, напье́к их,

наѣўса да й апѣкаетца сабѣ калé агню. Бáчыць чорт, што Палешук не лекáетца ни балóта, ни раки́, ни лѣ́су, от и давáй éн усюдах пужáць чалавѣ́ка, давáй рабíць ему́ ўселякую пáкась, каб вы́гнаць егó з таѣ́ седзíбы. Куды Палешу́к ни су́нетца, чорт ужэ́ там чакáе да нарóвиць, каб зрабíць якýюсь пáкась Пашоў чалавѣ́к у лѣ́с, каб нагле́дзяць здáтнаго дзéрава сабѣ́ на будóўлю, а тут чорт давáй егó вадзíць да кружыць, каб ен заблудзíўса да й загíб. Алé Палешу́к идзé сабѣ па лѣ́се да ўсе залы́свае сакѣ́ркаю дзераўля́ки. Вадзíў—вадзíў чорт Палещукá па лѣ́се, кружы́ў—кружы́ў, аж сам заплу́таўса, а той нагле́дзяў сабѣ́ здáтнаго дзéрава, надрáў лыка на лáпци да й пашóў прóсто да гаспóды, пазирáючи на залы́сленые дзераўля́ки. Бáчыць чорт, што чалавѣ́к не заблудзíўса, забѣ́г упéрад, сустрéўса да й пытáе, на што éн залы́сиў так багáцько дзераўля́чын.—Гэто мнѣ́ здáтнае дзéраво на будóўлю—кажэ Палешук. На што-ж табѣ́ так багато?—Я хачу́ забудавáць усе Палѣ́се.

— От бедá—ду́мае чорт. От и пусцíўса éн на хитрась.—Давáй, я табѣ́ бýду памагáць—кáжэ чорт—мнѣ́ серóўно немá чагó рабíць.— Дóбрэ—кáжэ Палешу́к—памагáй, та я падзя́кую. Тым чáсам чóрту тóльки тóе й трэ́ба.—Бýду памагáць—ду́мае éн,—да так нараблю́, што пападзéш ты ў маѣ́ лáпы.

От давáй Палешу́к разчыщáць зéмлю да гатóвиць дзéраво на будóўлю. Перш велѣ́ў éн чóрту разчы́сциць пу́щу. Немá чагó рабíць,—слу́хае чорт Палешукá: выдзирáе таўщэ́разнае дубъé з карéнем да сцягáе ў балóто, абó ў вóзеро. Кудэ́ю чорт цéг дубъе, там да тых час ещэ́ е равы́ да вы́скаци. Разчы́сциў чорт дóбрае лáпикло землí, от Палешу́к велѣ́ў ему́ нарабíць дарóг. Вырваў чорт велíзазнаго ду́ба, ўхапíў егó за верх да й пацѣ́г цераз лѣ́с Баранýе дуб карéнем, вырывáе дзераўля́ки й так арэ́ зéмлю, што ззаду тóльки астаютца брады́ да брадзеня́та. Нарабíў чорт такíх дарóг, што па и́х тóльки éн сам и мажэ́ прайцí, або праѣ́хаць. Зирчу́ў Палешу́к да давáй лáяць чóрта на чóм свѣт стаíць —Дзéля якóго ты—кáа—чóрта нарабíў брадóў да брадзенят? Рад чорт, што

нарабиў чалавѣку лі́ха, рад. аблі́зваетца да тōльки ці́хенько хвастóм крýциць.—Ну, давай жэ—кажэ Палешук—я на табѣ праѣду па тваі́х дарóґах. Сѣў Палешýк на чóрта да й паѣхаў цераз брады́ й брадзеня́та Бежы́ць чорт па брадōх у вадзѣ да ў ґрази́ па сáмае ґорло, а Палешýк седзі́ць на кáрку, падґибáўшы нóґи, да тōлько кирýе Ѣздзиў-ѣздзиў Палешýк на чóрту, здавóлпўса да й вернýўса да ґаспóды.—Бáчыш, дóбрые дарóґи—кажэ чорт. — Дóбрые та дóбрые,—аткáзвае Палешýк,—да чорт-бы і́х пабрáў рáзам с табóю От с таѣ пары́ й асталі́са ў Палѣси такі́е дарóґи, што па і́х тōльки на чóрту мōжна ѣхаць. Пóтым пачáў Палешýк з чóртам пляжыць лѣс да вазі́ць дзéраво на будōўлю. Збудавáў сабѣ Палешýк уселяки будынак, ускарпáў паля́нку земли́, разчы́сциў лáпикло сынажáци да й зажы́ў дóбрым хаджáйнам, а чорт рад, што емý асталі́са балóто й нéтра—пашóў туды́ да й седзі́ць там з чарценятами. От абжы́ўса Палешýк, наґадавáў ґаўя́да, нажáў збōжа, налави́ў вьюнōў—жывé й ли́ха не знáе. Тōльки ось раз малóциць Палешýк у ґумнѣ, аж и прыхóдзиць чорт да й пытáе, што ґэто чалавѣк рóбиць.—Малачý хлѣб,—кáжэ Палешýк.—Дай я памалачý. Даў Палешýк чóрту цéп, а той як пачнé биць, дак снапы́ леця́ць аж пад стрōп.—Чаму ў цебé—пытáе чорт—снапы́ лежáць на мѣйсцу, а ў менé скáчуць увéрх?—Бо я дужéйшы: як дам, дак снōп и ўли́пне ў тōк.—Аткýль у цебé такáя си́ла?—пытáе чорт.—Аткýль! бо я себé вы́леґчаў. — Вы́леґчай менé,—прóсиць чорт. Дóбрэ,—кáжэ Палешýк,— тōльки трэ цебé звезáць, бо ты ўцечэ́ш, а тóе зашкóдзиць.—Звежы́. От узя́ў Палешýк ли́ну, што цягáюць ульѣ на дзéраво, зкрампавáў éю чóрта, прывезáў еґо к тóўстаму дýбу, узя́ў серп и давáй леґчáць. Крычы́ць чорт, равé нѣмым ґóласам, а Палешýк пи́лиць серпóм. Церпѣў-церпѣў чóрт да як рванéтца, дак перш дýба вы́рваў з карéнем, а пóтым и ли́ну разарвáў, бы павуцѣне. Вы́леґчаў Палешýк чóрта да й кáжэ—ну, цепéр бýдзеш дýжы, як и я. Пацяґса чорт у балóто; ўжэ не бежы́ць, а паўзé чуць не рáкам. Паседзѣў ен там—немá рáды: кроў

льéтца, бы з вапруќа. Пацéѓса ен зноў к Палешуку́. Ба́чыць Палешу́к, што чорт ця́гнетца разкара́чыўшыса, сказа́ў жо̆нцы, каб ена́ апрану́ласа ў мущы́ньськую адзе́жу да й пашла́ ў ѓумно́ малаці́ць. Апрану́ласа ба́ба, пашла́ ў ѓумно́ да й малоциць. Прыхо́дзиць чорт. З бо́ли е́н и невазна́ў, што ѓэто не Палешу́к, а ба́ба, да й пыта́е, што чаму́ ѓэто ра́на не зажыва́е —От чаѓо́ ты захацѣ́ў,—ка́жэ ба́ба,—каб так ху́тко ра́на зажыла́. Мене́ ўжэ от два́дцаць ѓодо̆ў як вы́леѓчали, а ещэ й цепе́р не зажыло́. Пры ѓэтум ба́ба падняла́ падо̆л да й паказа́ла чо́рту сваю́ ра́ну. Зирну́ў чорт, аж пра́ўда ра́на не зажыла́.—От е́н надаѓну́ў хво̆ст да й пацéѓса ў бало́то. От з тає́ пары́ й ѓо́дзи чэ́рци пладзи́тца. Тым ча́сам Илья ко̆жнае лѣ́цячко перуно́м бъе их да ни́щыць. Усе меньш да меньш чарцей у бало́це а палешуки́ мно̆жатца да се́лятца па ўсе́м Палѣ́си. Мо́о ско́ро ўсѣ́ чэ́рци переведу́тца, таѓды́ лю́дзи заўлада́юць и бало́там и ўселя́каю не́траю.

Пересказалъ П. Грицкевичъ

С. Чучевичи.

77. Шаптуха.

У яко̆мсь сельцы́ жыла старэ́нькая ба́ба. Была́ ена́ адна́, бы та́я были́нка ў по́ли Усѣ́ ея крэ́ўные да сваяки́ даўно́ паўмира́ли, а ена́ як астала́са, дак и липи́ць, як то́е ѓнило́е да старо́е дзе́раво. Сельцэ́ было́ мале́нькае, мо̆о яки́х дымо̆ў дзе́сяць. На само̆м канцы́ стая́ла ба́бина ха́тка. Ена́ была́ така́я старэ́нькая, як и сама́ ба́ба. Скрыви́ласа да змо́рщыласа баба, пакрыви́ласа й еѣ ха́тка Нашо̆ўса яки́сь до́бры чалавѣ́к, што нараби́ў у ба́бино̆й ха́тцы падпо̆рак да аблажы́ў еѣ заѓа́таю; от и стаи́ць старэ́нькая, абро̆сшая мо́хам, бы еѣ хаджа́йка, ха́тка, стаи́ць и не варухне́тца, бо не вѣ́дае ў яки бо̆к павали́тца. Назбира́е ба́ба щэ́пачак да цурба́лкаў, падто́пиць у пѣ́чцы да й апѣ́каетца пе́рад по́ламьем. Вѣ́дамо, на ста́расци

дак и ў лѣтку хóладно. От так и жывé сабѣ старэнькая бáба: калú е што, та зъѣсь, а калú немá, дак и так абóйдзетца. Да й кōлько éй трэба? Дась хто кóльвек асýшкаў хлѣ́ба, або бýльбы, от бáба размóчыць скары́нку да й пасмóкчэ еѣ трохи беззýбым рóтам, а бýльбу спечэ́ ў пры́ску да й ѣсь. От ґэстым и жывúласа тáя бáба ўжэ́ пéўне ґадōў з сарачню́. Бáчыце, éй ужэ́ былó мōо бōльш, як ґадōў сто.

Мōо ещэ́ дōўґо-б пражылá так тáя бáба, алé от раз ѣ́хаў праз тóе сельцэ́ тáмашны пан, убачыў éн старэнькую бáбу да й здзивúўса, што ена так дōўґо жывé.

— Хиба-ж ты, бáбко, ещэ́ жы́ва?—пытáе пан.

— Жы́ва, панóчку, мōй сакóлику... От не даé Бōґ смéрци...

— Як же ты жывéш?

— Якóе маé жы́ще, панóчак мōй дараґéньки! Як так жыць, та лепей ґниць: зарабúць—неўздóлею, а дзѣтки й унýки ўсѣ даўнó паўмирáли. Нѣ́каму й вады́ падáць.

— Чамý-ж ты, бáбо, не шэ́пчэш, абō не варóжыш?

— Не ўмѣ́ю, мōй лéбедзику.

— Слýхай, бáбо, я цебé наўчý.

— Наўчы́, мōй сакóле ясны, наўчы́, каб и я не дáрам свѣт займáла.

Пан прыхилúўса к вýху да й кáжэ бáбе: „от як пазавýць цебé к хвóраму, та ты пахýкай трэ́йко на еґó да й шапчы́—сиґóлаў жыў, сиґóлаў нѣ. Пашапчы́ о ґэ трóхи, дай емý вы́пиць вады́, та éн и папрáвитца. А калú памрэ́, та сиґóлаў еґó беры́. От за тóе цебé бýдуць кармúць и паважáць“.

Падзя́кувала бáба пáну да й пачалá шаптáць, пачалá людзéй ратавáць. Але камý ни па шэ́пчэ, кōжын ачýняе.

Пашлá прачýтка мōо па ўсемý свѣ́ту, што объявúласа такáя бáба, такáя шаптýха, што енá вéльми дóбрэ лѣ́чыць людзéй и ґаўя́до. Да й не тōлько лѣ́чыць, але й усе ўґáдвае. Павалúли к тōй бáбе лю́дзи атусю́ль; несýць и везýць тōй бáбе ўселя́каґо дабрá.

Жыве́ сабѣ ба́ба ані́ ґатки. Тым ча́сам той пан, што нау́чыў ба́бу шапта́ць, чу́е аб то̆м да то̆льки смее́тца сабѣ ці́хенько з дурны́х людзе́й. Але́ ось пашо́ў якась той пан на палева́не, мно̆го ахво́ціўса, спацѣ́ў да пакрыча́ў праці́ вѣ́тру, от и зрабі́ласа ў еѓо́ ў ґо́рле ску́ла. Пан к дахтуро̆м—куды там—от, от ску́ла зада́виць и то̆льки. Жо̆нка ка́жэ, каб пазва́ли ту́ю сла́ўную ба́бу, а пан и слу́хаць не хо́чэ; але нарэ́шце як прыпе́рло лі́хо, дак згадзі́ўса каб пазва́ли й ту́ю ба́бу. Пришла́ ба́ба, а пан ужэ чуць дыхае. От дава́й ба́ба ху́каць да шапта́ць—сиґо́лаў жыў, сиґо́лаў нѣ. Прыслу́хаўса пан, да як учу́ў, што ба́ба шэ́пчэ тое, што е́н е́ѣ нау́чыў, дак еѓо́ апанава́ў такі́ смѣ́х, што не мажэ́ аж вытрымаць. А баба шэ́пчэ да шэ́пчэ. Слу́хаў, слу́хаў пан да як зараѓо́чэ,—дак ску́ла ў ґо́рле й трэ́снула. От и вы́здаравеў пан да й дава́й дзя́куваць то̆й ба́бе, што атратава́ла еѓо́ ат сме́рци.

— Ци-ж ты, ба́бко, ўсе так лѣ́чыш?—Пыта́е пан

— Эґэ-ж, мо̆й сако́лику, ўсе так.

— Ну а як жэ ты, ба́бко, ўґа́дваеш?

— Уга́дваю, бо так Бо̆ґ дае.

— Атґада́й-жэ, ба́бо, што ў мене́ ў руце́?

— Папа́ўса жу́чку ў па́ньськую ру́чку,—щыро прамо́вила ба́ба. Ена́, ба́чыце, спужа́ласа, што не вѣ́дае, як атмо́виць па́ну на еѓо́ пыта́не. Тым ча́сам пан рапто̆уне да й ка́жэ: „А не ха́й цебе́, ба́бо, баґі́ каха́юць, як жэ ты до́брэ атґа́дваеш!“ Пры ґэ́стых слава́х пан ращапи́ў ру́ку да й паказа́ў, што у еѓо́ ў жме́ни жук.

Дак от як шапта́ла да варажы́ла та́я ба́ба. Ена́ рабі́ла й лю́дзям пажытэ́чне, й сабѣ́ ўжытэ́чне.

Пересказалъ Д. Кулешъ.

Д. Чудинъ.

78. Тое, да не тое.

Мабыць вы ещэ не паметаеце, да й куды вам, блазнём, паметаць! от тут за грэбелькаю было сельцэ, дак у том сельцы жыў сабе адзин чалавек. Дак ен, бачыце, хаць быў нехлемяжы, але маў вельми ўпраўны язык: бывало як скажэ, дак бы звяжэ. Зваўса ен Змицер Змицер таки здатны быў на прысказки, так ен гожэ гаварыў, што его й паны слухали. Наш пан добрэ знаў Змитра й часто зваў его ў двор, каб ен пагаварыў да павеселиў гасцей, як ены часам зберутца, ўсе перагаворацъ и не ведаюць аб чом жупиць Змицер скажэ да прыскажэ, а паны тольки за боки хватаютца да аж пукаютца ат смеху. А то часам Змицер як скажэ, дак таго целы век не забудзеш. Але от кали зхочэ накпиць с каго, дак ужэ так накпиць, што таму сорам будзе не тольки людзям ачу паказаць, але й самому на себе паглядзець. Нашы людзи знали Змитра й нихто ўжэ его нечапаў; усе бераглиса его, як агню. Тольки ось прыехаў у двор к пану якись начальник. Кажуць,—ен быў татарын. Дак от зхацеў той татарын агледзяць паньськи маентак. От и велеў пан таму Змитру запрагци кабылку да й абвезци татарына па маентку. Пасадзиў Змицер татарына да й павез. От тольки выехали ены з двара, аж на растанцох стаиць крыж От Змицер супыниў кабылку, зняў шапку да й перахрысциўса. Паехали ены далей, але от стаиць пры дарозе слуп. Мо там быў капец, ци што. Змицер без усякае ўваги минае той слуп.

— Чаму-ж ты не перахрысциўса?—пытае Змитра татарын.

— Чаго-ж я буду хрысцитца, кали гэсто дзераво?

— Дак и то-ж было дзераво, а ты хрысциўса.

— Тое, да не тое.

— Чаму-ж не тое? Сероўно-ж дзераво.

— Я-б табе сказаў, да баюса, што ты будзеш лаятца.

— Кажы. Не буду.

— У цебе жонка е?

— Е.

— Дак пе́ўне ты, як пращáўса з е́ю, та й пацалавáў мо́о ў сáмые ґу́бы

— Аджэ-ж пацалавáў.

— Чаму-ж ты,—шану́ючы ґэстаґо дзенькá светóґо й я́снаґо сóнейка,—не пацалавáў еѣ ў сарамацѣне? Сербу́но-ж цѣло. Але́ мáбыць то́е, да не то́е.

Пересказалъ Данило Бохматъ.

Д Чудинъ

---

79. Багатыр.

И той баґаты́р, хто мáе мно́ґо уселя́каґо дабрá, й той, хто ве́льми ду́жы да здараве́нны. Чáсам дурны́е кáжуць, што абы́ ґро́шы, та й здаро́ўе бу́дзе.—Нѣ, мáбыць, трáсца табѣ не здаро́ўе бу́дзе за ґро́шы. Мáбыць ужэ так Бо́ґ даў, што баґáтаґо да замо́жнаґо дак зáўжды якáя ко́львек хваро́ба ци́сне. Бо штоб с таґо́ было́, каб ещэ баґáч да бы́ў и здаро́ў, е́н таґды́ й Бо́ґа сапхну́ў бы з не́ба. Бо́ґ знаў, што чалавѣк, як баґáты, та й ґáрды; от заты́м Бо́ґ так зраби́ў, што хто баґáты, той зáўжды нехлемя́жы, або́ хво́ры, а хто бѣдны, той здаро́вы да ду́жы. Бѣдны Бо́ґа памятáе, а баґаты́р дак уси́х забывáе.

Гэтак жэ, кáжуць, даўнѣй жыў адзи́н баґаты́р. Маў е́н то́льки ўселя́каґо дабрá, што й паличы́ць не мо́ґ. Жыў е́н у раско́шы да вы́ґадзе, не знаў ниякаѣ беды́, не маў ниякаґо ли́ха. Адно́ то́льки ґры́зло еґо, ґры́зло й не давáло ему́ ни ѣсци, ни спаць. Гры́зло еґо тое ли́хо, што кали́ до́брэ, дак хо́чэтца ещэ лѣпш, а тут нѣльґа ничо́ґо лѣпшаґо прыду́маць. От и пачáў той баґаты́р сохнуць да петре́ць, што ат дабрá нѣльґа найци́ дабрá. То́льки ось ещэ ґаре́й ему зраби́ласо, як стре́ў е́н я́кась аднаґо́ ве́льми бѣднаґо чалавѣка. Идзе́ сабѣ баґаты́р кале свайх палáцаў, идзе засмуцо́ны, што немá

на свѣ́це ўжэ лѣ́пшаґо дабра́, аж от якура́т су́нетца насустрѐк чо̀рны або̀рваны ў ла̀пиклу бѣ́дны чалавѣ́к, су́нетца да пае́ пѣ́сни, аж табѣ́ баґатыра́ сад разлеґа́етца.

— Чаму ты пае́ш?—пыта́е баґаты́р.

— А от паю́, бо здаро̀ў и весе́л.

— Чаґо-ж ты весе́л, кали ты таки́ бѣ́дны?

— А яко́ґо-ж мнѣ́ бо̀льш ражна́ трэ? Сеґо̀днячы наѣ́ўса карто́пель, а за́ўтрэ буду мацць и хлѣ́б з са́лам, бо зараби́ў тро́хи асьмако̀ў.

— Ци-ж ты таґо паеш, што здаро̀ў и наѣ́ўса?

— Нѣ, я паю́, што як ни ли́хо жыць на свѣ́це, але́ пажыву́, та мо̀о будзе й лѣ́пш.—Прамо́виў то́е бѣ́дны чалавѣ́к да й паце́ґса сабѣ́ далей, спева́ючы яку́юсь пѣ́сню.

— Уся́ беда́ ат баґа́тства,—ду́мае баґаты́р;—от атдам ткале́ лю́дзям збо̀льшаґо сває́ баґа́тство, та мо̀о й лѣ́пш бу́дзе.

Паду́маў е́н так да й дава́й крыча́ць, звацць бѣ́днаґо: „эй, чу́еш-бо' верни́са, е к табѣ́ дачыне́не“. Пачу́ў бѣ́дны чалавѣ́к, што заве́ баґаты́р да й верну́ўса. Тым ча́сам баґаты́р даста́ў з кишэни капшу́к, по́ўны чырво̀нцаў да й дае бѣ́днаму.—На,—ка,—вазьми ґэстые асьмаки́, та й табѣ́ будзе до́брэ, да й мнѣ́ лѣ́пш.

Падзякуваў бѣ́дны баґатыру́, ўзяў ґро́шы да й пашоў сабѣ́, а баґатыру́ й напра́ўду леґче́й стало на серцу, што е́н хацць раз зраби́ў до́брае дзѣ́ло. Але не до́ўго ра́дуваўса баґаты́р, бо як прышо̀ў да ґаспо́ды да як пача́ў личы́ць ґро́шы, от адра́зу еґо́ й апанава́ў жаль;—ему шко́да ста́ло тых асьмако̀ў, што е́н атда́ў бѣ́днаму. Хо́дзиць баґаты́р, як у во́ду апу́щаны, сму́тны, як пад земле́ю. Чым да́лей, тым ґаре́й марко̀тно баґатыру́ на се́рцу, марко̀тно да так мо́ташно, хацць беры́ да й засили́са. А тут ещэ́ ўби́ласо баґатыру́ ў ґо́лаў, што бу́дзе з еґо́ баґа́цьем, як е́н здырдзитца.—Як-бы ґэто зраби́ць,—ду́мае баґаты́р,—каб и па мае́й сме́рци да ўлада́ць усим сваи́м баґа́цьем.—Ду́маў е́н, ду́маў да й наду́маўса. От зраби́ў е́н у клѣ́ци пад пamо́стам по́ґраб, пры́ла́дзиў к ему так дзве́ры, што

нихто́ й не ў́цямиць. Пасклáдваў баґатыр у той по́ґраб усѣ́ сваѣ́ ґро́шы да ўсе, што ў его́ было́ сáмае дараґо́е Хо́дзиць баґаты́р у той по́ґраб да любу́етца на сваé дабро́. От ґэ раз пашо́ў ён у по́ґраб да не до́брэ зачыни́ў дзверы. Тым часам дзверы я́кась щакаўзну́лиса да й зачыни́лиса так, што баґáч немажэ́ з по́ґраба й вы́лезци. Седзи́ць баґáч у по́ґрабе да падыхáе ат ґо́ладу. Про́буваў крычáць, да нихто́ его́ не чу́е. Пазнáў тут баґáч, якáя цапá ґрашо́м и ўселя́каму баґáтству, кали немá людзе́й, кали́ тоé баґáцье нико́му не трэ: пазнáў, што тако́е ґро́шы, якáя ат их лю́дзям кары́сь, пазнáў, да не мажэ́ ничо́ґо нико́му сказáць, бо нѣ́льґа вы́лезци з по́ґраба. От седзи́ць ен и не вѣ́дае, што парáдзиць, аж бáчыць, што ўсѣ́ еґо́ ґро́шы да ўсе дабро́ аберну́ласо ў чалавѣ́чы по́т да ў кроў. Падымáетца кроў з по́там у по́ґрабе ўсе бо́льш да бо́льш. От, от ужэ́ ена́ дахо́дзиць баґачу́ па сáмае ґо́рло, от, от ен захлебнéтца у чалавѣ́чуй крыви́ Тут баґаты́р сабрáў, што е мо́цы да як кры́кне, дак чу́е, аж хтось абазвáўса да й атчыня́е дзвéры. Абрáдуваўса баґаты́р, так абрáдуваўса, як ещэ нико́ли, кали́ ўбáчыў, што ещэ́ мо́о тро́хи пажывé на свѣ́це, мо́о ещэ зирнé на я́снае со́нейко. Тым часо́ве бѣ́дны чалавѣ́к давáй разбирáць памо́ст, каб аслабани́ць баґатырá. Гэ́то, бáчыце, быў той сáмы бѣ́дны чалавѣ́к, што ему́ баґаты́р даў капшу́к асьмако́ў. Узя́ў ен таґды́ ат баґатырá ґро́шы да перш ду́маў, што з асьмакáми бу́дзе лѣ́пш. Тым чáсам стáло ґаре́й, як было: з ґрашы́ма ў дзень и ў но́чы—заў́жды стрáшно, каб хто не ўкраў, або́ не забиў. Не вѣ́дае бѣ́дны, куды́ дзевáць тые асьмаки; но́ситца з ими, бы ко́т з аселе́нцам. Не ѣ́сь, не пье, ўсе ду́мае, каб не зґу́биць тые ґро́шы; ґодзи пѣ́ць пѣ́сни, ґодзи́ ве́село жыць. Спя́траў за тые дни, але́ нарэ́шце даґадáўса, што без ґро́шэй харо́шэй, да як даґадáўса, дак схапи́ў той капшу́к з асьмакáми да й папъе́р баґатыру́ назáд. Прыне́с, аж таґо немá. Давáй бѣ́дны пытáць у людзе́й, ґдзѣ́ баґаты́р, а тые кáжуць, што мáбыць чорт на хо́рму ухапи́ў, бо ен быў у ґаспо́дзе да рáптам чорт вѣ́дае куды́ дзѣ́ўса. От стайи́ць бѣ́дны чалавѣ́к да чэ́шэ чупры́ну,

не вазьме сабѣ ў ґлузд, ґдзѣ найці баґатыра. Але якурат таґды баґатыр закрычаў у поґрабе. Бѣдны ўвазнаў его па ґоласу да й кінуўса ратаваць Дак от разабраў бѣдны памост да й раскідаў у поґрабѣ столь. Вылез баґатыр з поґраба чуць жыў да й просіць ѣсци. Дастаў бѣдны з кайстры пѣчаную картоплю да асушки хлѣба, даў баґатыру, а той накінуўса на тое, бы ґалодны воўк; жўмрыць, аж завушами трашчыць. Пасилкаваўса трохи баґатыр и давай дзякуваць бѣднаму. А той кажэ: „Боґу, а мнѣ нѣзашто. От дзякуваць табѣ за твае ґрошы. На табѣ их назад“. Тут бѣдны праця́ґнуў руку з ґрашыма. Як убачыць баґатыр тые ґрошы да як закрычыць, што то чалавѣчая кроў да пот, да як пабѣжыць ат ґрошэй наўцекача, дак тольки его пьятки мітусятца. Бѣґ, бѣґ баґатыр ат ґрошэй да й ускочыў у калодзесь. Калодзесь быў ґлыбоки. Пакуль збѣґлиса людзи да кінулиса ратаваць, дак баґатыр и залиўса. Кінуў таґды бѣдны туды-ж у калодзесь и капшук з ґрашыма, а сам пашоў сабѣ прыпеваючы, як и ў перад

Таґды пазнали людзи, што ґдзѣ баґатство там щасця немаш, што баґатыр ат баґатства ґине.

Пересказалъ Кругликъ

Д. Чудинъ.

80. Мужык и цыган.

Даўно тое было, мабыць ещэ таґды, як у наш край прышли цыганы. Ничаґусьсенько ены не ўмѣли рабиць, тольки выпрашвали, або крали да тым и жывилиса. От, кажуць, ѣдзе раз мужык да й бачыць, што цыган узлѣз на дзераво, сѣў на ґалину да й сечэ еѣ.

— Што ты робиш?—пытае мужык,—ґэтож ты ўпадзеш!

— Аткуль ты знаеш, што я ўпаду? Хиба ты прарок,—атказвае цыган да ўсе пляжыць пад сабою ґалину От ен падсѣк еѣ да

ра́птам и ґрымануўса далбў ра́зам з ґалінаю. Чуць печанцы́ не атсадзйў цыґа́н. От е́н тро́хи прачу́хаўса да й ка́жэ: „ба́чу, што ты, ба́тю, прарбк. Скажы́-ж ты мнѣ́, кали́ я памру́?“

— Таґды́ памрэ́ш,—кажэ мужы́к, як за́дница пахало́дае. Падзя́куваў цыґа́н мужыку́ да й пашбў да́лей. От идзе́ сабѣ́ цыґа́н да ўсе ма́цае за́дницу, ци не пахало́дала. Але́ ось набѣ́гла хму́рка, лину́ў дож, а по́тым падхапи́ўса вѣ́цер. Прамо́к цыґа́н да як мацну́ў за за́дницу, дак и нижы́ў: суздро́м ена́ пахало́дала. Спало́хаўса цыґа́н да беґо́м к таму́ мужыку́.

— Рату́й, ба́тю,—ка́жэ е́н мужыку́; кали́ бу́ду жыў, дак я табѣ́ ў падзя́ку дам ґаспи́нца, або атраблю́ за турба́цаю.

— Дббрэ,—ка́жэ мужы́к,—я цебе́ палечу́.

И дава́й лычако́м ґрэ́ць цыґана́ па аза́дку. Грэ́ў, ґрэ́ў, аж з таґо́ па́ра павали́ла Раве́ цыґа́н нѣ́мым ґо́ласам, раве́, але́ як мацну́ў за за́дницу, дак и абра́дуваўса: ґары́ць тая, бы аґо́нь.

— Дзя́куй табѣ́, ба́тю,—ка́жэ цыґа́н,—што атратава́ў мене́ ат смѐрци. От скажы́-ж, чым ты мене́ лечы́ў?

— Чым, хиба́-ж ты не ба́чыш. Гэ́то-ж жыви́ло,—ка́жэ мужы́к, падня́ўшы ў руцэ́ лыча́к.

— Прадай, ба́тю, мнѣ́ ґэ́тае жыви́ло

— Купи́. Дай дзе́сяць рубле́ў да й беры́. Будзеш лечы́ць себе́ й друґи́х, дак бу́дзе спо́саб да сме́рци.

Заплаци́ў цыґа́н дзе́сяць рубле́ў, ухапи́ў лыча́к да й пабѣ́ґ у село́. Прыбеґа́е е́н туды́, аж там паме́р чалавѣ́к. Пла́чуць лю́дзи, вѣ́дамо, як над пако́йникам.

— Гэ, дурны́е, чаґо́ вы пла́чэце?—ка́жэ цыґа́н.—От хи́бо да́йце я еґо́ палечу́, дак е́н ажыве́.

— Палечы́, палечы́, мо́й сако́лику!—про́сяць ба́бы.

От пераверну́ў цыґа́н пако́йника за́дницаю ўверх да дава́й еґо́ лупцава́ць лычако́м. Лупи́ў—лупиў, пама́цаў, аж за́дница ўсе халбдная. Ничо́ґо не пара́дзиць цыґа́н,—пакбйник не ажыва́е. Уба́чыли тое лю́дзи да як пачали́ лупцава́ць цыґана́ за таку́ю лекбву, дак

е́н насйлу жывы́ вы́рваўса да наўцекача́. То̃льки еѓо́ й ба́чыли Пашо́й цыѓа́н з тых ча́саў валачы́тца па свѣ́ту да там чму́цить людзе́й, ѓдзѣ еѓо́ ещэ́ не зна́юць

Пересказалъ И Аземша

С. Лучицы.

ОГЛАВЛЕНІЕ.